# Лідскі Летапісец

*Народ, які не ведае свайго мінулага, не мае будучыні*





Краязнаўчы, гістарычна-літаратурны часопіс
Выходзіць з 1997 года

№ 4 (108) КАСТРЫЧНІК - СНЕЖАНЬ 2024 г.





***Дырэктар Лідскай жаночай гімназіі Вера Навіцкая***

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава*

# Лідскі Летапісец

*Народ, які не ведае свайго мінулага, не мае будучыні*



Краязнаўчы, гістарычна-літаратурны часопіс
Выходзіць з 1997 года

№ 4 (108) КАСТРЫЧНІК - СНЕЖАНЬ 2024 г.


## У НУМАРЫ:




*Стар. 2. Дарослыя дзецям*



*Стар. 4. Кроніка Ліды*



*Стар. 7. Лідскай епархіі - 10 гадоў*



*Стар. 8. 200 гадоў Лідскага краязнаўства*



*Стар 15. Лідчына ў XVI стагоддзі*



*Стар. 25. Дроздава*



*Стар. 44. Дварышчанскія хронікі*




*Стар. 57. Ліда праўдзівая*

*Стар. 63. Яўстах Шалевіч і яго ўспаміны*



*Стар. 68. Лісты Тэадора Нарбута да Аніцэта Рэніера*


**На першай старонцы вокладкі:** *Інсталяцыя на тэму Лідскага замка ў Лідскім гарадскім парку*



Мы просім ўсіх, хто мае цікавыя матэрыялы па гісторыі Ліды і краю, дасылаць іх на адрас: 231282, Ліда-2, п/с 7, або E-mail: kajety@list.ru

Аўтары цалкам адказныя за гістарычную дакладнасць сваіх матэрыялаў


Выдаецца ў адпаведнасці з п. 7.4 артыкула 13 ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ “Аб сродках масавай інфармацыі” ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-3

Выдавец:
Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства “Пружмень”

Рэдактар:
Станіслаў Вацлававіч Суднік

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
231293, г. Ліда, вул. Лётная, 7 а.
АДРАС САЙТА:
http// nslowa.by

Наклад 150 асобнікаў
10 друк. аркушаў

Часопіс падпісаны да друку 30.12.2024 г.

Часопіс надрукаваны 14.01.2025 г.
у Лідскай друкарні.
231300, г. Ліда,
вул. Ленінская, 23..

Замова № 31.

ISSN 2218 – 1792
9 772218 179007 24004

# Дарослыя дзецям

**Падвядзены вынікі VI рэгіянальнага літаратурнага конкурсу імя Веры Навіцкай**

18 снежня 2024 года ў Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы адбылося літаратурнае свята - урачыстае падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў VI адкрытага рэгіянальнага літаратурнага конкурсу імя Веры Навіцкай "Дарослыя - дзецям". Конкурс носіць імя найбуйнейшай лідскай дзіцячай пісьменніцы Веры Навіцкай, якая ўзначальвала "Лідскую прыватную жаночую гімназію Ф.Л. і В.С. Навіцкіх" напачатку XX стагоддзя і напісала шэраг кніг для дзяцей, у тым ліку тэтралогію пра Мусю Старабельскую. Дадзены конкурс ладзіцца ў шосты раз, упершыню ён прайшоў у 2014 годзе, і па-ранейшаму прыцягвае ўвагу аматараў літаратурнай творчасці, садзейнічае раскрыццю новых талентаў, падтрымлівае і заахвочвае паэтаў і празаікаў да напісання твораў для дзяцей.

Сёлета ў конкурсе ўзялі ўдзел 10 літаратараў у жанрах: “Паэзія”, “Проза”, “Драматургія”. Усе творы, якія паступілі на конкурс, выдадзены асобным зборнікам, яго можна было набыць тут жа.

Ацэньвала паступіўшыя творы журы ў складзе: Арцём Мартынаў, дырэктар Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы, Алена Быстрыцкая - намеснік дырэк-













тара Лідскай рваённай бібліятэкі імя Янкі Купалы і Станіслаў Суднік - рэдактар лідскага літаратурнага альманаха “Ад лідскіх муроў”. Вяла імпрэзу галоўны бібліёграф бібліятэкі Галіна Курбыка, а ўручаў дыпломы і канверты дырэктар бібліятэкі Арцём Мартынаў.

Першую прэмію атрымаў літаратуразнавец,, паэт, пісьменнік і драматург, жыхар горада Слонім Сяргей Чыгрын (конкурс жа рэгіянальны) за дзве п’есы для дзяцей, другую прэмію падзялілі паміж Уладзімірам











Васько (апавяданні) і Наталляй Тананушка (замалёўкі з дзяцінства), трэцяя прэмія дасталася Ірыне Маркевіч (вершы) і Станіславе Белагаловай (вершы).

Усе астатнія, хто прымаў удзел у конкурсе, атрымалі падзячныя падарункі.

Разыначкай гэтай цырымоніі традыцыйна з’яўляецца прадстаўленне рэдкага лідскага выдання, якое рыхтуецца спецыяльна да цырымоніі. Раней гэта былі 1-я і 2-я кніжкі тэтралогіі Веры Навіцкай, чыё імя носіць конкурс, кніжачка дзіцячых вершаў Марыі Канапніцкай “Ад вясны да зімы”, фрагмент успамінаў Альжбеты Табенскай “Мы так хацелі вучыцца”. Сёлета адбылася прэзентацыя кніжачкі вершаў Камілы Юрэвіч з Нарбутаў "Калядкі Камілы Нарбут для кузінак і сябровак на 1852 год", у якой змешчаны 25 вершаў Камілы Нарбут у перакладзе Станіслава Судніка. Па пэўных прычынах гэтыя кніжкі выдаюцца невялікім накладам, але ў Лідзе іх можна знайсці ў бібліятэцы і Доме Таўлая, ёсць яны і ў Нацыянальнай бібліятэцы. Сёлетняя кніжачка разаслана ва ўсе асноўныя бібліятэкі згодна з лістом рассылкі.

Прэмія імя Веры Навіцкай на сёння - як падаецца, адзіная літаратурная прэмія, якая афіцыйна ўручаецца ў Гарадзенскай вобласці. Хаця, вельмі б хацелася памыліцца.



Літаратурнае жыццё на Лідчыне не затухае і трэба спадзявацца, што ў 2025 годзе, калі Ліда будзе прымаць Дзень пісьменства, яшчэ больш актывізуецца. Сярод іншага ўжо рыхтуецца да выдання кніжачка паэзіі Юрыя Карэйвы, найталенавітайшага лідскага паэта, які заўчасна пайшоў ад нас.

***Праслаў Грынкевіч***

# Кроніка Ліды



2 кастрычніка на 7-й нечарговай сесіі Лідскага раённага Савета дэпутатаў на пасаду старшыні Лідскага раённага выканаўчага камітэта зацверджаны Аляксандр Вярсоцкі.



У пачатку кастрычніка нагрудным знакам “Выдатнік адукацыі” ўзнагароджаны намеснік начальніка кіравання адукацыі Лідскага райвыканкама Ірына Лобан і дырэктар СШ № 1 г. Ліды Сяргей Фанасаў.




У пачатку кастрычніка выйшла ўнікальная кніга Леаніда Лаўрэша і Галіны Лаўрэш “Там, дзе спыніўся час.... Лідскія гістарычныя некропалі”, 222 с.



7 лістапада споўнілася 75 гадоў з дня нарджэння Лідскага паэта і грамадскага актывіста Міхася Мельніка.

Каманда СКА “Бердаўка” паспяхова выступіла на Чэмпіянаце свету па паўэрліфтынгу ў Маскве. Спаборніцтвы праходзілі 14-17 лістапада і сабралі 2950 атлетаў з 37 краін свету. Сярод дзяўчат да 16 гадоў залаты медаль з сусветным рэкордам у трохбор'і заваявала Дар'я Грышкевіч, золата ў двухбор’і і таксама сусветны рэкорд у Паліны Грышкевіч, золата ў двухбор’і і ў Паліны Дземяндзеевай.

Сярод юнакоў да 16 гадоў у двухбор’і срэбны медаль заваяваў Павел Дземяндзееў.

У стрытліфтынгу сярод ветэранаў 60-69 гадоў залаты медаль у Сяргея Страхаліса.






З 3 снежня намеснікам старшыні Лідскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях прызначаны Ігар Кашкевіч.

З 3 снежня начальнікам Аддзела ўнутраных спраў Лідскага райвыканкама прызначаны Дзмітрый Фомчанкаў.





У пачатку снежня прайшлі апошнія выпрабаванні пасля капітальнага рамонту моста цераз раку Нёман каля Бярозаўкі.




21 снежня ў Лідскай ЦРБ запушчаны ў эксплуатацыю апарат МРТ, адзіны на вялікі рэгіён.

У канцы снежня Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы выпусціла “Краязнаўчы каляндар” на 2025 год







У канцы снежня Лідскі гістарычна-мастацкі музей выпусціў чарговы каляндар з серыі “Скарбы Лідчыны”.

# Лідскай епархіі - 10 гадоў

Лідская епархія была заснавана ў 2014 годзе шляхам выдзялення са складу Наваградскай епархіі і складаецца з 47 прыходаў на тэрыторыі Лідскага, Іўеўскага, Астравецкага, Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў Гарадзенскай вобласці. Усе гэтыя гады яе ўзначальвае епіскап Лідскі і Смаргонскі Парфірый (Праднюк).

Святарамі пры супрацоўніцтве з органамі ўлады, свецкімі ўстановамі вядзецца плённая праца па праваслаўнай асвеце насельніцтва. У сувязі з гэтым праводзіцца шэраг духоўна-адукацыйных і культурных мерапрыемстваў. Напрыклад, між’епархіяльны фэст спеваў "Слава ў вышніх Богу", "Рамонкавы фэст" да Дня сям'і, кахання і вернасці, конкурс дзіцячага малюнка "Сустракаем Вялікдзень", пленэр мастакоў "Прыгажосць Божага свету", фэст "Скарбніца", "Калядная ёлка".

На працягу мінулых дзесяці гадоў на базе чацвёртага філіяла Лідскай раённай бібліятэкі нясе духоўнае святло епархіяльная бібліятэка. Акрамя тэматычнай перадачы на Лідскім тэлебачанні "Святло веры", духоўная асвета вядзецца ў Інтэрнэце: у Інстаграме ёсць рубрыка "Пытанне святару".

Шмат робіцца па рамонце дзейсных і ўводу ў эксплуатацыю новых храмаў. За час існавання епархіі былі асвечаны 10 храмаў і дзве капліцы. Усяго на дадзены момант дзейнічаюць 56 храмаў, у якіх служаць 47 святароў.

У снежні 2017 года па дабраславенні епіскапа Лідскага і Смаргонскага Парфірыя быў пакладзена пачатак заснаванню архірэйскага жаночага падворка ў гонар вялебнага Паісія Святагорца - невялікага манаскага селішча ў адасобленым маляўнічым месцы недалёка ад вёскі Ольжава Лідскага раёна.




Вялікая колькасць вернікаў, якія прыйшлі на святочнае набажэнства, нягледзячы на працоўны дзень і непагодлівае надвор'е, - сведчанне дзейснай працы духавенства епархіі, што аб'ядноўвае людзей не проста верных, але гатовых спагадаць і дапамагаць блізкім, выхоўваць сваіх дзяцей у адпаведнасці з традыцыйнымі хрысціянскімі і маральнымі традыцыямі.

Таксама на мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі Гарадзенскага абласнога і Лідскага раённага выканкамаў. Яны прыбылі, каб павіншаваць усіх




датычных да свята, а таксама ўручыць падарункі. Ігар Булаўко, начальнік галоўнага кіравання ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама, уручыў епіскапу Лідскаму і Смаргонскаму Парфірыю Ганаровую грамату аблвыканкама з нагоды юбілею епархіі. Аляксандр Вярсоцкі, старшыня Лідскага райвыканкама, выказаў падзяку за плённае супрацоўніцтва, накіраванае на падтрыку ўзважаных настрояў у грамадстве і запэўніў, што ў далейшым гатовы аказваць усялякую падтрымку ў рэалізацыі як традыцыйных, так і новых праектаў.







Пасля заканчэння набажэнства Патрыяршы Экзарх звярнуўся да вернікаў са словамі навучання. Уладыка Веніямін павіншаваў вернікаў з пасадным святам сабора і юбілеем епархіі.

***Church.by.***

***Станіслаў Суднік***

# 200 гадоў лідскага краязнаўства

Выданнем часопіса "Лідскі летапісец" № 4 (108) завяршаецца, але яшчэ не завяршыўся 2024 выдавецкі год ПУП "Пружмень".

Гэты год прайходзіў пад знакам 200-годдзя лідскага краязнаўства. Канешне, сказаць дакладна, што ў гэты год, у гэты месяц ці ў гэты дзень пачалося лідскае краязнаўства, будзе не зусім карэктна. Краязнаўчы працэс можа ўключаць 50 гадоў пошуку і збору інфармацыі, пакуль з'явіцца нейкая публікацыя.

Той жа Тодар Нарбут зацікавіўся гістарычнымі артэфактамі яшчэ перад вайной 1812 года, падчас будаўніцтва Бабруйскай фартэцы, але гэта далёка ад Лідчыны.



KROTKI RYS
PIERWIASTKOW
NARODU
LITEWSKIEGO
z Roźnych dawnych Autorow
ZEBRANY
PRZEZ
JUSTYNA NARBUTTA
Drukowany w Grodnie Roku 1820

У 1818 г. у Гародні выйшла з друку першая кніга Юстына Нарбута "Кароткі нарыс першавытокаў ліцвінскага народа..." ("Krotki rys pierwiastkow narodu litewskiego, z roznych dawnych autorow zebrany"), якая змяшчае звесткі пра пра гісторыю і міфалогію. Гэтая невялікая кніга мае 56 старонак, аўтар пазначаны крыптонімам "J. M." Невялікі наклад кнігі хутка разышоўся, і ў 1820 г. выйшла яе другое выданне, якое мела тую самую назву, але на гэты раз імя аўтара кнігі было пададзена.

У 1842 г. у Вільні выйшла другая кніга Юстына Нарбута "Унутраная гісторыя літоўскага народа з часоў Яна Сабескага і Аўгуста II..." ("Dzieje wewnotrzne narodu litewskiego z czasow Jana Sobieskiego i Augusta II, krolow panujacych w Polsce; wyciag z roznych notacyow i manuskryptow." Т. 1-2, 1842 г., 2-е выд. 1843 г.). - Л. Л.

У 1820 Тодар Нарбут адкрыў ямнае пахаванне непадалёку ад в. Шаўры Лідскага пав. Апісаў руіны цвярдыні на Нёмане каля в. Лыскава Гарадзенскага павета. Адносіў яцвягаў да скіфскіх плямён. Даследаваў Лідскі замак. Збіраў і вывучаў помнікі археаграфіі. Аўтар "Гісторыі літоўскага народа" (т. 1-9, 1835-41; давёў падзеі да 1569), у 1-м томе якой змясціў табліцу сваіх знаходак. Падаў 1180 год як дату заснавання г. Ліды, што ў прынцыпе пацвердзілі раскопкі 1930-х гадоў. Увёў у навуковы ўжытак "Хроніку Быхаўца" (1846). Ён пісаў не гісторыю дзяржавы, як было прынята ў той час у польскай і расейскай гістарыяграфіі, а менавіта гісторыю народа.



*Тэадор Нарбут*

Меў багатую калекцыю археалагічных матэрыялаў. Апублікаваў шэраг артыкулаў пра Ліду, Наваградак, Індуру і інш. Займаўся пытаннямі старажытнай міфалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыкі.

Такім чынам недзе тады, каля 1820-х гадоў, і пачалося лідскае краязнаўства, якое перарасло ў сапраўдную навуку (2 тамы Юстына Нарбута, 9 тамоў Тэадора Нарбута).

Следам за Нарбутамі ішоў Вандалін Шукевіч і іншыя краязнаўцы больш дробнага калібру (Уладзіслаў Абакановіч, Каміла Юрэвіч з Нарбутаў, Мірон Браніслаў Нарбут, Аляксандр Макрэцкі, прафесар Літоўскай семінарыі І. Юркевіч, памочніца Міхала Федароўскага Лідзія Падул, І.В. Любарскі, Альжбета Табенская, Апалонія Серакоўская з Далеўскіх, Амелія Даравінская - Бірута, Уладзіслаў Вярыга, Яўстах Шалевіч, айцец Леў



*Вандалін Шукевіч*



*Каміла Юрэвіч з Нарбутаў*



*Мірон Браніслаў Нарбут*



*Альжбета Табенская*



*а. Леў Савіцкі*



*Амелія Даравінская - Бірута*

Савіцкі ...).

Завяршаецца гэтая эпоха разам з канцом XIX стагоддзя. Перадаў эстафету новаму пакаленню Вандалін Шукевіч, які пражыў да 1919 года.



*Уладзіслаў Вярыга*

Другі этап лідскага краязнаўства разам з пачаткам XX стагоддзя пачынаюць малады яшчэ Міхал Шымялевіч, які выдаў у 1905 годзе артыкул "Горад Ліда і Лідскі замак" (1905) і Алена



*Міхал Шымялевіч*



*Алена Іваноўская*

Іваноўская, якая перад 1-й Сусветнай вайной сабрала, а ў 1914 і ў 1924 гадах выдала ў Англіі два зборнікі фальклору з Лідскага павета. Гэты этап ішоў да 1939 года.

У 1926 годзе ў Гародні выйшла паэма "1919 год або Песня пра літоўска-беларускія дывізіі" Камілы Эміліі Макрэцкай, у 30-х гадах з'явілася краязнаўчая паэма "Сукурчы" Вітольда Пілецкага, а вяршыняй гэтага працэсу стала выданне краязнаўчай газеты "Ziemia Lidzka" ("Лідская зямля"), дзе тон задавалі Уладзіслаў Абрамовіч (рэдактар), пасталеўшы на 20 гадоў Міхал Шымялевіч, Аляксандр Снежка і Антон Гржымайла-Прыбытка.

На пачатку 1938 года Лідскаму краязнаўчаму асяродку прысвяціла артыкул віленская газета "Слова". Аўтар артыкула Мечыслаў Ліманоўскі ставіў нашу газету "Лідская зямля" ў шэраг лепшых выданняў такога кшталту: *"Ліда не з'яўляецца ўніверсітэцкім горадам, не мае навуковай і артыстычнай эліты. Таму цешымся, што каля фабрычных комінаў, фурчашчых у небе самалётаў і вулічнага тлуму ёсць ася-*



*Вітольд Пілецкі*



***Рэдакцыйна-выдавецкі камітэт "Ziemi Lidzkaj": Аляксандр Снежка, Антоні Грымайла-Прыбытка, Міхал Шымялевіч і Уладзіслаў Абрамовіч. Шымялевіч узвышаецца, ён вышэй за астатніх на паўгалавы, у акулярах***

*родак, які выдае "Лідскую зямлю". Мы выдатна ведаем... які гэта цяжкі "цукар" - выдаць 13 нумароў у правінцыі. ...Калі думаеш пра вялікіх лідзян, успамінаеш Вандаліна Шукевіча і выкапаныя праз яго курганы, Тэадора Нарбута, які быў адным з заснавальнікаў нашай гістарыяграфіі, Юндзіла, у якога на надмагіллі было напісана, што быў "гісторыі натуральнай у краі знаўца". ..."Лідская зямля" ўзнаўляе гісторыю, геаграфію, успаміны нашых паўстанцаў... Госці горада бачаць эканамічную актыўнасць жыхароў... Ліда зараз ёсць цэнтрам малога самастойнага арганізму... ...Зараз маем выданне, якое інфармуе пра тое, што робіцца на берагах Дзітвы і Лебяды, і не лічыць чужым Шчучын. Маем выданне, якое ёсць на варце святога агню"* .

На пачатку жніўня 1939 г. "Кур'ер Віленскі" паведамляў: *"Лідскі аддзел Краязнаўчага таварыства працуе. Краязнаўчае таварыства, выкарыстоўваючы жаданне нашых гасцей з розных частак краю адпачыць летам на нашай зямлі, пачало інтэнсіўную прапаганду краязнаўчай ідэі. Сябры таварыства чытаюць лекцыі ў месцах адпачынку, знаёмяць слухачоў з нашай*

*прыгожай гісторыяй, з яе помнікамі, культурай і сучасным станам гаспадаркі"*. Тады ж краязнаўцы пачалі рыхтавацца да ўстаноўкі памятнай дошкі па Вандаліну Шукевічу ў Нацкім касцёле.

Лідскія краязнаўцы другой генерацыі, якія гурталіся вакол "Лідскай зямлі", зрабілі велізарны, неацэнны ўнёсак у справу пазнання гісторыі нашага краю. Як і ў кожнага чалавека, які піша, у іх павінна была застацца вялікая колькасць ненадрукаваных тэкстаў, тэкстаў у працы, шматлікіх архіваў. На жаль, усё гэта загінула.

Пачынаў краязнаўчую дзейнасць у гэты час і Уладзімір Урбановіч, які паспеў два разы надрукавацца ў "Ziemi Lidzkaj".



***Уладзімір Урбановіч***

Пасля заканчэння 2-й Сусветнай вайны ўзнялася 3-я генерацыя лідскіх краязнаўцаў. Мост паміж другой і трэцяй генерацыямі перакінуў выдатны знаўца нашай гісторыі, аўтар шэрагу грунтоўных тэкстаў, стваральнік музея ў Валеўцы Наваградскага раёна Уладзімір Урбановіч. Напісалі грунтоўныя кнігі і шэраг артыкулаў Юзаф Кардаш, Анатоль Кулеш, Аляксандр Жалкоўскі, Мікола Герасімовіч, Фёдар Кардаш, Янка Жамойцін. Выдаў фальклорны зборнік Земавіт Фядэцкі. Напісала і выдала кнігу “У цяні замка Гедыміна” Яўгенія Ярмантовіч. Да гэтай пляяды можна аднесці і Міколу Дзікевіча, які быў чалавекам той эпохі, але публікавацца пачаў ужо ў новы час. Быў напісаны шэраг мемуараў. Перыяд савецкага краязнаўства быў няпросты. Вельмі цяжка было з публікацыямі. Кніга Анатоля Куляша была рэдкім выключэннем.



***Анатоль Кулеш***



***Фёдар Кардаш***



***Юзаф Кардаш***



***Аляксандр Жалкоўскі***



***Мікола Герасімовіч***



***Земавіт Фядэцкі***



***Яўгенія Ярмантовіч***



***Мікола Дзікевіч***

Можна лічыць, што новае дыханне яшчэ на савецкім этапе лідскае краязнаўства атрымала ў 1990 годзе, калі адрадзілася "Ziemia Lidzka". З'явіліся краязнаў-



***Аляксандр Колышка***



***Станіслаў Ушакевіч***

чыя тэксты рэдактара Аляксандра Колышкі, Станіслава Ушакевіча, Леха Макрэцкага, Леха Цехановіча, Ірэны Стасевіч-Ясюковай і іншых. Выдадзена 96 нумароў. Доктар габілітаваны Ірэна Стасевіч-Ясюкова заснавала ў гэты час серыю краязнаўчых кніг пра знакамітых лідзян. Каля дзясятка кніг выйшла на польскай і беларускай мове. Таму можна гаварыць, што прыйшоў час 4-й генерацыі лідскага краязнаўства.



***Ірэна Стасевіч-Ясюкова***

Галоўнымі дасягненнямі чацвёртай генерацыі з'яўляецца шматгадовае выданне часопіса "Лідскі летапісец" (часопіс выходзіць штоквартальна з 1997 года, зараз выходзіць ужо 108-мы нумар, рэдактар - пісьменнік Станіслаў Суднік) і стварэнне лідскага сайта "Павет" (pawet.net, з 1999 года, рэдактар сайта - пісьменнік Леанід Лаўрэш).



***Станіслаў Суднік***



***Леанід Лаўрэш***



***Валерый Сліўкін***



***Антось Савук***



***Леанід Віннік***



***Уладзімір Логаш***

У "Лідскі летапісец" і на "Павет" трапіла нарэшце шмат неапублікаваных раней тэкстаў Анатоля Куляша, Міколы Герасімовіча, Юзафа Кардаша, Фёдара Кардаша, Ірэны Стасевіч Ясюковай, Уладзіміра Логаша. Прайшла кніга Міколы Дзікевіча "Дзітрыкі. Згукі заснуўшай цывілізацыі". Ну і пайшлі пасляваенныя даследчыкі: Валерый Сліўкін, Антось Савук, Уладзімір Хрышчановіч, Уладзімір Круцікаў, Міхась Бурачэўскі, Станіслаў Карабан. Выйшлі дзве краязнаўчыя кнігі Леаніда Вінніка. З нумара ў нумар пачаў друкавацца Леанід Лаўрэш,



***Віктар Кудла***



***Анастасія Каладзяжная***

падключыўся Віктар Кудла. Раз-пораз з'яўляюцца тэксты рэдактара Станіслава Судніка пад уласным прозвішчам і пад псеўданімам Яраслаў Грынкевіч. Друкуюцца разавыя тэксты краязнаўцаў з Ліды і з усёй Беларусі, напрыклад, Сяргея Чыгрына са Слоніма, Ларысы Канчэўскай, Марыі Ганчар. Пасля 2010 года далучыліся Алесь Хітрун, Анастасія Каладзяжная, а таксама карэспандэнты "Лідскай газеты" Алесь Мацулевіч (пад уласным імем і пад псеўданімам Аляксей Круповіч), Людміла Петрулевіч і Вольга Яхантава. У "Лідскім летапісцы" быў надрукаваны шэраг мемуараў з розных эпох. Былі апублікаваны два тамы тэтралогіі Ежы Путраманта "50 гадоў успамінаў" у



***Сяргей Чыгрын***



***Алесь Мацулевіч***



***Алесь Хітрун***



***Протаіерэй Расціслаў Салаўёў***



***Ксёндз канонік Юрый Бяганскі***

перакладзе Станіслава Судніка, дзе ўтрымоўваецца вялікі краязнаўчы матэрыял пра Лідчыну. З'явіліся кнігі Ганаэфы Міхаловіч, ксендза каноніка Юрыя Бяганскага, протаіерэя Расціслава Салаўёва.

Далучыўся да лідскіх краязнаўцаў і Ян Казлоўскі з Варшавы (родам з вёскі Рылаўцы Лідскага раёна). Выдаў па-польску дзве ўласныя кнігі ("Успаміны з Лідскай зямлі", "Інтэлектуалы Лідскай зямлі" ў суаўтарстве з В. Сліўкіным), і тры кнігі Леаніда Лаўрэша ў перакладзе на польскую мову.



***Ян Казлоўскі***

Побач з "Лідскім летапісцам" выходзіць літаратурны зборнік "Ад лідскіх муроў", дзе друкуюць краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя тэксты Леанід Лаўрэш, Алесь Хітрун, Юрась Пацюпа, Наталля Анашкевіч. Таксама друкуюцца літаратурныя творы гістарычнай і краязнаўчай тэматыкі.



***Юрась Пацюпа***



***Наталля Анашкевіч***

Грандыёзны падарунак краязнаўцам будучага падрыхтаваў фатограф Ігар Пешахонаў-Міцкевіч. Ён выдаў дзевяць высокамастацкіх альбомаў, з іх тры пра Ліду і Лідчыну ("Ліда", "Лідскі край", "Лідскія краявіды").



***Ігар Пешахонаў-Міцкевіч***

Вялікі аб'ём краязнаўчых матэрыялаў надрукавала газета "Наша слова", у тым ліку ўсю кнігу Апалоніі Серакоўскай з Далеўскіх "Успаміны" ў перакладзе С. Судніка. Газета "Наша слова.pdf" працягвае традыцыі. Толькі што закончана публікацыя ў скароце кнігі Гіпаліта Корвін-Мілеўскага "Успаміны пра 70 гадоў" у перакладзе Л. Лаўрэша. Каля 8 гадоў таму назад запрацаваў сайт "Наша слова штодзень" (nslowa.by), дзе размяшчаецца ўся лідская краязнаўчая перыёдыка ў рэжыме pdf.

Часопіс "Лідскі летапісец", сайт "Павет", зборнік "Ад лідскіх муроў", газеты "Наша слова" і "Наша

слова.pdf", сайт Наша слова штодзень" (nslowa.by) паднялі краязнаўства ў Лідзе на такі ўзровень, што ў навукова-гістарычных колах Беларусі загаварылі пра "Лідскую краязнаўчую школу".

А на самой Лідчыне вялікую працу па папулярызацыі краязнаўчых ведаў вядуць біблітэкар СШ № 11 Тамара Зенюкевіч і галоўны бібліёграф Лідскай раённай бібліятэкі Галіна Курбыка, а таксама многія іншыя аматары краязнаўства.



*Тамара Зенюкевіч*



*Галіна Курбыка*

**Развіццём дзейнасці на паперы ёсць дзейнасць "на зямлі"**

Вялікі аб'ём краязнаўчых ведаў на Лідчыне паклікаў да жыцця жаданне іх акумуляцыі, захавання і практычнага прымянення. Традыцыйнай і прывычнай формай працы з краязнаўчым матэрыялам з'яўляецца краязнаўчы музей.

Лідскі музей быў заснаваны 28 траўня 1939 года ў якасці музея Польскага краязнаўчага таварыстваства, а з 22 студзеня 1941 года адкрыты паўторна як Краязнаўчы музей.

24 красавіка 1959 года музей быў адкрыты ў трэці раз, у адпаведнасці з пастановай Савета міністраў БССР, як Краязнаўчы музей.

Пад музей быў цалкам аддадзены будынак былога піярскага касцёла. Да 1964 года музей размяшчаўся ў цэнтральнай частцы былога храма, а затым яго перавялі ў двухпавярховую прыбудову (у цэнтральнай частцы будынка адкрыўся планетарый).

У 1999 годзе музей пераехаў у будынак салона сямейных імпрэз, дзе размяшчалася мастацкая галерэя "Лідзея". Рашэннем Лідскага гарвыканкама ад 27 студзеня 2000 года мастацкая галерэя і краязнаўчы музей былі аб'яднаны ў Лідскі гісторыка-мастацкі музей. У сувязі з рэканструкцыяй музея з 2000 года выставачныя плошчы былі зачынены для наведвальнікаў. Доўгі час супрацоўнікі музея праводзілі мерапрыемствы за сценамі музея. Была арганізавана серыя мерапрыемстваў "Дзень музея ў школе", вулічныя вернісажы, аднадзённыя і тэматычныя выставы. 8 кастрычніка 2008 года музей быў адкрыты для наведвальнікаў.

22 верасня 2010 года адбылося адкрыццё літаратурнага аддзела Лідскага гісторыка-мастацкага музея і мемарыяльнага пакоя паэта Валянціна Таўлая падчас рэспубліканскага свята "Дажынкі".

У снежні 2017 года была адкрыта выставачная экспазіцыя "Лідскі замак. Гістарычныя падзеі і постаці" ў паўночна-ўсходняй вежы Лідскага замка.

3 ліпеня 2020 года ў адрэстаўраванай паўднёва-заходняй вежы Лідскага замка адкрылася новая музейная экспазіцыя "Старонкі гісторыі. Ад XIV стагоддзя…".

У рамках культурна-турыстычнага праекта "Замкавы гасцінец" і Міжнароднага дня музеяў у Лідскім замку праводзіцца фэст агню "Магія агню і святла".

Сярод экспанатаў музея - мінералы, пудзілы жывёльнага свету Лідскага раёна, знаходкі з археалагічных раскопак старажытнага гарадзішча, Лідскага замка, друкаваныя выданні і абразы XIX - пачала XX стагоддзя, дакументы і матэрыялы пра Айчынную вайну 1812 года, паўстанне 1863-1864 гадоў, нацыянальна-вызвольную барацьбу ў Заходняй Беларусі, пра дзейнасць патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўленне эканомікі, гарады і раёна ў паваенны перыяд. Таксама прысутнічаюць экспанаты нацыянальнай адзежы, узоры дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва (разьба па дрэве, гафт, ткацтва), прадукцыя гуты "Нёман" і іншых прадпрыемстваў.

Паступова намаганнямі энтузіястаў пачалі ствараць школьныя краязнаўчыя музеі і музеі на прамысловых і ў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Адным з першых стварыў мясцовы музей "Зямля і людзі" дырэктар Эксперыментальнай базы "Ніва" Віктар Кудла. Музей размяшчаўся ў ацалелай вежы панскага палаца ў вёсцы Дворышча. На жаль, музей не перажыў разрухі 1990-х гадоў.



*Анатоль Крупа*

Адзін з першых школьных краязнаўчых музеяў стварыў дырэктар Бердаўскай школы Анатоль Крупа.



*Іван Гівойна*

У другой палове 1990-х гадоў быў створаны музей Ігната Дамейкі ў Крупаўскай сярэдняй школе Лідскага раёна, дырэктарам якой быў Іван Гівойна. Перад школай быў устаноўлены памятны знак Ігнату Дамейку. Праз некаторы час сюды быў дастаўлены вялікі набор

мінералаў з Чылі. Мінерала дамейкіта ў наборы не было.

На сёння музеі або музейныя пакоі ёсць практычна ва ўсіх школах, у некаторых па два. На Лідчыне на 2019 год налічвалася 35 школьных музеяў, і ўсе яны вядуць пэўную краязнаўчую працу, пра што дакладваюць на навуковых канферэнцыях, зрэдку даюць інфармацыыю ў друк.

З'явіліся музеі ці музейныя пакоі на многіх прамысловых прадпрыемствах. Найбольш вядомы і папулярны "Музей лідскага бровара" на Лідскім піўзаводзе.

Краязнаўчыя музеі або музейныя пакоі створаны ў большасці клубаў і бібліятэк Лідскага раёна

Але тэма лідскіх музеяў - гэта асобная і вялікая тэма. Кожны з іх патрабуе асобнага артыкула, а то і кнігі.

Яшчэ адна структура на Лідчыне ўносіць свой пасільны ўклад у развіццё лідскага краязнаўства. Гэта аграсядзібы. Найбольш плённа і грунтоўна працуе аграсядзіба "Вольны мельнік" у в. Дворышча Лідскага раёна, дырэктар Генадзь Конан.


*Генадзь Конан*

Тут сабрана вялікая калекцыя артэфактаў сялянскага і шляхочага жыцця, а таксама створана калекцыя муляжоў сярдня-вечнай зброі і прадметаў побыту. Краязнаўчы ўхіл мае аграсядзіба "Гасціна" ў Песках Лідскага раёна, гаспадар Віталь Карабач, і інш.

Адным з важных момантаў краязнаўчай дзейнасці стала праца па захаванні і аднаўленні месцаў гістарычнай памяці. Актыўная фаза гэтага працэсу пачалася ў 1990-я гады. Таварыства польскай культуры аднавіла некаторыя старыя і ўстанавіла новыя помнікі, значную ўвагу ўдзяліла Лідскім вайсковым могілкам

Таварыства беларускай мовы ўключылася ў гэтую працу ў 1995 годзе, пачаўшы з афармлення мемарыяла паўстанцаў 1863 года, дзе былі ўстаноўлены два новыя крыжы. Асноўным ініцыятарам гэтай працы быў Уладзімір Хрышчановіч.


*Уладзімір Хрышчановіч*

Былі ўстаноўлены крыжы на месцы расстрэлу ксендза Адама Фалькоўскага, мемарыяльныя крыжы ў Беліцы і Голдаве. Праведзена шмат іншых мерапрыемстваў.

Уключўся ў краязнаўчую дзейнасць скульптар Рычард Груша. Ён устанавіў мноства памятных знакаў па ўсёй Беларусі. У Лідзе гэта памятны знак Ігату Дамейку ў Крупаве, памятны знак на месцы расстрэлу ксендза Адама Фалькоўскага і шмат іншага.


*Рычард Груша*

Стварыў падзячны медальён князю Канстанціну Астрожскаму скульптар Вадзім Вераб'ёў.

Былі праведзены вялікія работы па рэканструкцыі старых праваслаўных могілак каля царквы Св. Георгія Пераможца сіламі прыхаджан гэтай царквы, а таксама вялікія работы па рэканструкцыі яшчэ больш старых каталіцкіх могілак па праспекце Перамогі сіламі розных грамадскіх арганізацый і ініцыятыў (Таварыства польскай культуры, Клуб вайсковых маракоў і інш.). Значны ўклад у гэтую працу ўнесла Галіна Лаўрэш.


*Галіна Лаўрэш*

На аснове сабранага багатага краязнаўчага матэ-рыялу ў 2014 годзе былі заснаваны Лідскія краязнаўчыя чытанні, якія неўзабаве атрымалі статус навуковай канферэнцыі. У 2024 годзе прайшла ўжо 11-я канфе-рэнцыя.

У 2017 годзе заснаваны фестываль спеўнага фальклору "Цёплыя вечары, ды халодныя ранкі" памяці Земавіта Фядэцкага. Прайшлі 4 фестывалі. У разрэзе фестываляў выдадзены тры фальклорныя зборнікі, якія самі па сабе вынік шырокіх краязнаўчых пошукаў.

Выдадзена шмат краязнаўчых кніг і зборнікаў. так, у 2019 годзе выдадзены зборнік усіх артыкулаў галоўнага прадстаўніка другой генерацыі лідскіх краязнаўцаў Міхала Шымялевіча. Выйшлі кнігі Леаніда Лаўрэша (звыш 20), Міколы Дзікевіча (2), Анастасіі Каладзяжнай, Наталлі Анашкевіч, Анатоля Крупы і інш. Раздрукоўваюцца матэрыялы Лідскіх чытанняў. Выходзяць краязнаўчыя календары ад розных устаноў. Распрацоўваюцца турыстычныя маршруты.

Па выніках краязнаўчых пошукаў і даследаванняў у спіс нематэрыяльнай спадчыны Рэспублікі Беларусь унесены лідскае белаўзорыстае ткацтва і абрад Тры Каралі з Ваверкі Лідскага раёна.

Краязнаўчы рух на Лідчыне развіваецца далей.

***Леанід Лаўрэш***

# Лідчына ў XVI стагоддзі

*XVI стагоддзе пачалося 1 студзеня 1501 г. і скончылася 31 снежня 1600 г.*

*У гэтым стагоддзі адбылося шмат цікавага, але ж, пэўна, мае сэнс вылучаць тут толькі нешта галоўнае. Коратка спынюся толькі на так званым "Залатым веку беларускай культуры"* [1]*. Аўтарства тэрміну належыць, як мяркуецца, пісьменніку і публіцысту таго самага "Залатога веку" Фёдару Еўлашоўскаму.*

**6 жніўня 1517 г.** Францішак Скарына выдаў сваю 1-ю кнігу Псалтыр. І пачатак "Залатога веку" звязваюць найперш з дзейнасцю Францішка Скарыны і з усебаковым росквітам ВКЛ. "Залаты век" таксама наўпрост знітаваны з Рэнесансам і Рэфармацыяй, з дзейнасцю такіх асоб, як Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Леў Сапега і іншых. У XVI ст. у Беларусі ўзнікла мноства навучальных устаноў. У Вільні, Нясвіжы, Берасці, Лоску, Любчы, Цяпіне ды Венграве паўсталі друкарні, вакол якіх утвараліся цэлыя літаратурныя школы. Прадукцыя гэтых друкароў карысталася шырокім попытам не толькі ў Вялікім Княстве, але і ў краінах Заходняй Еўропы.

Значнымі былі дасягненні нашых продкаў у навуцы. Асабліва развіваліся лінгвістыка, гісторыя, геаграфія, астраномія, матэматыка і медыцына. А юрыдычная думка Беларусі ў XVI ст., як вядома, дасягнула найвышэйшага ў Еўропе роўню. Ніводная з тагачасных краінаў не мела гэткага дасканалага заканадаўства, як Беларусь, аб чым красамоўна сведчыць змест Статутаў 1529, 1566 і 1588 гг. Эпоха Рэнесансу ў Беларусі таксама пазначана і небывалым узлётам мастацтва. У той час узніклі першыя прафесійныя тэатры, развіваецца музычнае мастацтва, з'яўляецца свецкі партрэтны жывапіс - прыкмета высокага роўню развіцця мастацкай творчасці. У XVI ст. удасканальваецца іканапіс, скульптура, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва і гравёрнае майстэрства.

У залатую пару нашае дзяржавы надзвычай хуткімі тэмпамі развіваецца горадабудаўніцтва і дойлідства. Менавіта тады былі пабудаваныя пярліны нашае архітэктуры: Траецкі касцёл у Ішкалдзі, Святадухаўская царква ў Кодзені, Барысаглебская царква ў Навагрудку, фарны касцёл у Гародні, касцёлы Святой Ганны і бернардзінцаў у Вільні, шэдэўры сусветнага дойлідства фартэцы-бажніцы ў Супраслі, Малым Мажэйкаве, Сынкавічах, рэфармацкія зборы ў Смаргоні, Заслаўі, Асташыне, абарончыя сістэмы замкаў у Міры, Нясвіжы, Навагрудку і г. д.

У эпоху Рэнесансу ў Беларусі адбывалася далейшае развіццё металургічнай і цагельнай вытворчасці, шматлікіх рамёстваў. Узнікла новая, больш дасканалая арганізацыя працы, утварыліся рамесніцкія цэхі, дзе існаваў прынцып спецыялізацыі і падзелу працы. Такім чынам "Залаты век" найперш вылучаўся багаццем творчага плёну, яго шматграннасцю, абсягам, пафаснасцю ўсяго створанага, светлай ідэяй Асветніцтва, высокім патрыятызмам і чалавекалюбствам[2].

Грыгарыянскі каляндар, па якім мы з вамі зараз жывём, быў аб'яўлены 21 лютага 1582 г. праз карэкцыю, якая палягала ў тым, што пасля 4 адразу наступала 14 кастрычніка 1582 года. У ВКЛ гэты календра адразу ўвёў Стэфан Баторы ў тым жа 1582 г. Праз два гады, 21 студзеня 1584 г. ён выдаў універсал па якім новы каляндар быў абавязковы толькі ў грамадскім жыцці[3].

**Падзеі пачатку XVI ст.**

Пасля смерці ў 1492 г. караля і вялікага князя Казіміра Ягайлавіча, паводле тастаманту каралём Польшчы быў абраны яго старэйшы сын Ян Альбрэхт, а вялікім князем ВКЛ сярэдні сын Аляксандр. Потым, у 1501 г. пасля смерці Яна Альбрэхта, вялікі князь Аляксандр быў абраны яшчэ і каралём Польшчы.

На пачатку XVI ст. ВКЛ бясконца ваявала. За першыя дзесяць гадоў XVI ст. толькі з Маскоўскім княствам ваяваць давялося два разы, у 1500-1503 і 1507-1508 гг. Толькі пасля вайны 1500-1503 гг., па падліках польскага гісторыка Л. Каланкоўскага, ВКЛ страціла каля 25 % тэрыторыі. Да Маскоўскай дзяржавы адышлі ўсе землі ў вярхоўях ракі Акі і Чарнігава-Северская зямля з гарадамі Чарнігаў, Старадуб, Пуціўль, Рыльск, Ноўгарад-Северскі, Гомель, Любеч, Почап, Трубчэўск, Радагошч, Бранск, Мцэнск, Любуцк, Сярпейск, Масальск. А таксама значная частка Смаленскай і Віцебскай зямель з такімі стратэгічна важнымі гарадамі як Дарагабуж, Белая, Тарапец. Пры гэтым даводзілася адбіваць пастаянныя набегі крымскіх татар (1502, 1503, 1505, 1506, 1508 гг.) і ўлічваць цяжкую палітычную сітуацыю ў балтыйскім рэгіёне[4]. У 1503 г. па выніках працяглай вайны з

[1] Гл: Акіньчыц Станіслаў. Залаты век Беларусі. Мінск, 2002.

[2] Саверчанка Іван, Санько Зьміцер. 150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мн.: рэдакцыя газеты "Звязда", 1993. С. 43.

[3] Wisner Henryk. Rzeczpospolita Wazlw. Slawne Panstwo, Wielkie Ksiestwo Litewskie. T. 3. S. 75.

[4] Шэйфер В. Мяцеж ці паўстанне? Выступ Міхала Глінскага падчас вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ у 1507-1508 гг. // Гістарычны альманах. 1999. Т. 2. С. 101.

Масквой, было заключана замірэнне на 6 гадоў[5].

У ліпені 1506 г. 20-тысячная Перакопская арда пад даводствам сыноў Мянглі-Гірэя Біці-Гірэя і Бурнаш-Салтана стала пад Клецкам галоўным табарам і разаслала загоны па ўсёй Беларусі: *"Того ж року знову 30000 татар вторгнуло в землю Литовскую, бурили, палили, а, пришедши до Клецка, стали там кошем и роспустили загоны"* [6].

Вялікі князь і кароль Аляксандр у чэрвені 1505 г. моцна захварэў. Яму паралізавала левы бок. Да лета 1506 г. Аляксандру стала так кепска, што яго медык - гнезненскі канонік Мацей з Блоня, параіў паклапаціцца аб выратаванні душы. 45-гадовы кароль перад тварам смерці прыняў рашэнне склікаць сойм і перадаць усе правы на княства і каралеўства малодшаму брату Жыгімонту. З-за наезду татараў Аляксандр абвясціў паспалітае рушэнне (народнае апалчэнне шляхты). Месцам збору была вызначана Ліда, як галоўны горад усяго нёманскага правабярэжжа. Аднак у Ліду з'ехалася толькі 3 тысячы шляхты, што было недастаткова для вайны з татарамі. Да таго ж, не было згоды ў тым, хто ўзначаліць рушэнне. Шляхта патрабавала, каб на чале рушэння стаў сам кароль. Зусім хворы Аляксандр у суправаджэнні жонкі Алены Іванаўны мусіў выехаць у Ліду. З ім прыйшло яшчэ 4 тысячы шляхты і драгунаў, але ўзначальваць войска ён ужо не мог, бо зусім абяссілеў. 24 ліпеня ў пакоях Лідскага замка кароль Аляксандр спавядаўся,



***Кароль і вялікі князь Аляксандр Ягялончык***

прычасціўся і падпісаў духоўны тастамант, паводле якога перадаваў уладу Жыгімонту. Тастамант быў падпісаны ў прысутнасці буйнейшых магнатаў ВКЛ і дробнай шляхты.

Вось што пра гэта паведамляецца ў беларускім летапісе: *"... пасля паланення зямлі Літоўскае бязбожнымі татарамі, прыехаў кароль і вялікі князь Аляксандр з Польшчы ў Вільню, вельмі хворы на немач паралітыкавую, і ўчыніў сойм у горадзе Лідзе. І калі быў ён з усімі панамі у Лідзе, прыйшла яму вестка, што царэвічы перакопскія Бітыс-Гірэй-султан ды Бурнаш-султан прыйшлі з дваццаццю тысячамі людзей к Слуцку і ідуць пад Новагарадок. Кароль жа, вельмі хворы, не ведаючы, што рабіць, паклікаў да сябе сваіх паноў-раду, і гетмана свайго Станіслава Пятровіча Кішку, і любімага свайго маршалка дворнага князя Міхайлу Львовіча Глінскага, і ўсю справу сваю гаспадарскую і справу земскую перадаў у іх рукі, сябе ж загадаў адвезці на насіліцах у Вільню. А паны-рада, гетман і маршалак князь Міхайла Глінскі з усімі людзьмі засталіся у Лідзе"* [7].

Сабраная ў Лідзе шляхта ВКЛ належала да дзвюх варожых груповак: старых ліцвінскіх нобіляў і прыхільнікаў Глінскіх. Гэтыя групоўкі маглі схапіцца не з татарамі, а паміж сабою. Таму Аляксандр паставіў на чале рушэння вялікага гетмана і маршалка гаспадарскага, у 1493 г. намесніка лідскага, Станіслава Пятровіча Кішку, а першым намеснікам быў прызначаны маршалак дворны князь Міхайла Глінскі. Гэтак было дасягнута адзінства войска.



***Станіслаў Пятровіч Кішка***

Татары спляжылі землі вакол Слоніма, Ваўкавыска і Ліды. На Лідчыне яны спалілі Беліцу, Збляны і Жалудок, паводле "Хронікі Быхаўца": *"Татары, прыйшоўшы да Новагарадка, неўзабаве пайшлі за Нёман, і, не даходзячы да Ліды, каля горада і за мілю ды за паўмілі ад горада нішчылі цэрквы Божыя ды двары вялікія, і вёскі падпальвалі, і людзей хапалі ды забівалі. Паны літоўскія ... з'ехаліся ўсе ў адно месца і, параіўшыся, сабралі дзесяць тысяч вояў*

[5] Хроника Литовская и Жамойтская // Полное собрание русских летописей (у далейшым ПСРЛ). Москва, 1975, Т. 32. С. 101.

[6] Там жа.

[7] Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997. С. 164.

*адборных, конных ды ўзброеных, - усё, што на той час магло быць, бо так хутка не магло больш людзей сабрацца … і ўсе як адзін вырашылі: узяўшы Бога на дапамогу … пайсці біцца з паганцамі. І, сваё рашэнне цвёрда і рашуча замацаваўшы, выбралі колькі чалавек, якіх паслалі ў разведку высачыць, дзе ворагі. І за мілю ад Ліды натрапілі яны на татараў і Божаю міласцю пабілі паганцаў, колькіх жывымі злавілі, а іншым галовы паадсякалі ды ў кайстры паклалі. Татары ж, бачачы, што не могуць супраць іх выстаяць, пабеглі. Воі ж літоўскія вязняў да паноў прывялі ды галовы адсечаныя ў кайстрах прынеслі. Тое пабачыўшы, паны ўзвесяліліся і радасцю напоўніліся і тады самі селі на коней і загадалі ўсяму войску пайсці з імі да Навагарадка. Татары ж, убачыўшы гэта, зразумелі, што людзі літоўскія ідуць на іх ды хочуць з імі ў бой уступіць, і пачалі яны з загонаў з-за Нёмана вяртацца"* [8].

5 жніўня 1506 г. 10-тысячнае ліцвінскае войска выйшла на войска татараў. Прачуўшы пра рух войска ВКЛ многія татарскія загоны кінулі рабаваць Беларусь і пачалі вяртацца пад Клецк да агульнага табару. Падчас паходу цяжка захварэў 60-гадовы Станіслаў Кішка: *"Гетман жа Станіслаў Пятровіч Кішка ў той час быў вельмі нямоглы, ніяк не мог на каня сесці і з вялікаю цяжкасцю загадаў сябе ў возе везці"* [9]. Гетман афіцыйна перадаў усё камандаванне войскам ВКЛ маршалку дворнаму князю Міхайлу Глінскаму. На Глінскага легла і ўся адказнасць за лёс бітвы і лёс краіны.




***Князь Міхайла Львовіч Глінскі***

"Хроніка Літоўская і Жамойцкая" коратка падсумоўвае вынікі той вайны: *"… Литва зобралася 10 000 и ударили на кош, который божию помощию взяли и станули в их коши, а … татаров з полонами, людми христианскими и быдлом, били и мордовали, и всех наголову поразили; а гетманом над литвою тоею на той час был князь Михаил Глинский. Того року кроль Александер Казимеровичъ, внук Ягейлов, умер в замку Виленском"* [10].

Менавіта тады пачалі складвацца перадумовы рокашу Міхала Глінскага супраць цэнтральнай улады.

Шляхецкі род Глінскіх бярэ сваю назву ад г. Глінска на Смаленшчыне, нададзенага гэтаму роду вялікімі князямі Літоўскімі[11]. Адзін з прадстаўнікоў роду Міхал Львовіч Глінскі па мянушцы Мажны (1470-1534) стаў фаварытам (1499-1506) вялікага князя Аляксандра Казіміравіча. Мацей Стрыйкоўскі сцвярджаў, што Глінскія трымалі ў сваіх руках амаль палову Вялікага Княства Літоўскага, што выклікала незадавальненне шляхты[12], ніводнае важнае рашэнне вялікі князь не прымаў без парады Міхала Глінскага[13]. Магчыма, што гэтае сцверджанне перабольшанае, але напэўна яно ў нечым выражае сутнасць справы.

Яшчэ юнаком Міхал Глінскі накіраваўся за мяжу, дзе пражыў 12 год, служыў пры двары германскага імператара Максіміліяна, прайшоў усе прыступкі вайсковай службы, вызначыўся ў войску саксонскага курфюрста Альбрэхта пад час вайны ў Фрызіі (Фрызія або Фрысляндыя - цяпер правінцыя ў Нідэрландах), затым вучыўся ў Італіі, дзе прыняў каталіцтва, і ў Германіі, быў у Іспаніі. На той час гэта быў па-еўрапейску добра адукаваны чалавек. Ён валодаў замежнымі мовамі, добра фехтаваў, меў прыгожыя манеры, добра танчыў. У 1497 г. Глінскі ўдзельнічаў у так званай чарнаморскай выправе польскага караля Яна Альбрэхта, брата Вялікага князя Аляксандра, а потым вярнуўся ў Германію. У канцы 1498 - пачатку 1499 г. назаўсёды вярнуўся ў ВКЛ. Першапачатковую кар'еру зрабіў з дапамогай брата Івана, які з 1495 г. быў намеснікам ожскім і пераломскім.

У 1499 г. Міхал быў ужо дворным маршалкам. Яго старэйшы брат Іван Львовіч Глінскі ў 1501 г. стаў маршалкам гаспадарскім, харунжым літоўскім, у 1505 г. кіеўскім ваяводам і адначасова быў намеснікам бельскім. Трэці з братоў, Васіль "Сляпы" з 1500 па 1505 г. быў намеснікам васілішскім і падстолім літоўскім, у 1505 г. ён стаў старастам і ключнікам берасцейскім[14].

Зараз ужо немагчыма вызначыць дакладную прычыну канфлікту Міхала Глінскага з высокапастаўленай асобай Янам Забярэзінскім[15]. Гербярштэйн, выводзіў канфлікт з дробязі: Забярэзінскі, быццам бы, пабіў слугу Глінскага, пасланага па збожжа для каралеўскіх коней[16]. Тым не менш, у 1503 г. Глінскі абвінаваціў Забярэзінскага ў арганізацыі замаху на яго жыццё і пагражаў яму і двум яго сынам.

Ужо ў траўні 1503 г. справа паміж ваяводам

[8] Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997. С. 164.

[9] Там жа. С. 165.

[10] Хроника Литовская и Жамойтская. ПСРЛ, Т. 32. С. 101.

[11] Kosinski A. Przewodnik heraldyczny. Krakow, 1877. Cz. II. S. 130-133.

[12] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, zmudska i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846. T.II. S. 322.

[13] Герберштейн С. Записки о Московии. Москва, 1988. С. 87.

[14] Шэйфер В. Мяцеж ці паўстанне? С. 102.

[15] Ян Юр'евіч Забярэзінскі (каля 1440 - 1508), дзяржаўны дзеяч ВКЛ, маршалак дворны (1482-1496), намеснік полацкі (1484-1496), кашталян троцкі (1492-1498) і адначасова намеснік навагрудскаі, ваявода троцкі і земскі маршалак літоўскі (1498-1505), намеснік гарадзенскі (з 1505) і ваўкавыскі (1506).

[16] Герберштейн С. Записки о Московии. С.188.

Забярэзінскім і Глінскім паўстала перад каралём, князь Міхал скардзіўся на Забярэзінскага, што той падкупіў забойцаў, каб пазбавіць яго жыцця і нават меў сведку. Аднак ваявода вельмі энергічна адмовіўся ад гэтага, таму кароль наклаў на іх заклад у суме дзесяці тысяч залатых і загадаў ім вечна жыць у згодзе - загадаў памірыцца.

У хуткім часе пасля гэтага кароль пад уплывам Глінскага адабраў Лідскае намесніцтва ў Ілініча, зяця Забярэзінскага, і перадаў яго ў 1504 г. сваяку Глінскіх, пану Андрэю Аляксандравічу Дрожджу (Дразду), што выклікала вялікае незадавальненне ў асяроддзі пануючай эліты ВКЛ. За няслушна пакрыўджанага Ілініча заступілася Літоўская рада на чале з Забярэзінскім, разам яны не дапусцілі Дрожджу ў Ліду[17].

Забягаючы наперад, скажу, што Ліда была вернутая былому ўладальніку толькі пасля правалу ўсёй авантуры Міхала Глінскага і ўцёкаў апошняга ў Расію. Лідскаму старасту Юрыю Ілінічу належала яшчэ і мястэчка Мір, дзе ў першай чвэрці XVI ст. ён пабудаваў велічны замак.

Андрэй Дрозд, ці больш дакладна - Дрожджа, або Дрожчыч, даводзіўся стрыечным братам Міхаілу Глінскаму. І магчыма, менавіта прызначэнне Андрэя Дрожджы на Лідскае намесніцтва, па звестках Хронікі Быхаўца, стала непасрэднай прычынай канфлікту Глінскага з троцкім ваяводам Янам Юр'евічам Забярэзінскім, які разам з іншымі магнатамі выступіў у абарону папярэдняга намесніка, свайго сваяка Юрыя Ілініча: *"У тым жа годзе* (1505 г. - *Л.Л.*) *кароль Аляксандр быў на сойме ў Берасці і ўгнявіўся на паноў без падставы. І вось чаму гэта адбылося. Па просьбе князя Глінскага даў ён Дразду Ліду, што была пад Ілінічам. А ў той час паслом у Кракаве, у караля, быў падчашы, намеснік бельскі Мікалай Мікалаевіч Радзівіл. І пан Ілініч звярнуўся да паноў-рады Вялікага Княства Літоўскага, да князя Войцаха Табара, біскупа віленскага, да Мікалая Радзівіла, ваяводы віленскага, да ваяводы троцкага пана Забярэзінскага, да пана Станіслава Яновіча, старасты жамойцкага, да ваяводы полацкага пана Станіслава Глябовіча, да пана Станіслава Пятровіча Кішкі, намесніка смаленскага. І ўсе тыя паны паводле прывілею свайго земскага, што ім кароль даў, калі садзіўся на вялікае княжанне, Ліды не саступілі Дразду, простаму чалавеку, а Ілінічу пакінулі, бо бачылі, што ў прывілеі напісана: гаспадар нікому не можа ўладанняў даваць, акрамя тых, хто з гербам. З таго кароль і ўгнявіўся. Пачуў пра тое Мікалай Мікалаевіч Радзівіл... Глінскі ж неадступна караля намаўляў, каб за тое панам літоўскім адпомсціў, асабліва Забярэзінскаму. І, будучы на сойме ў Берасці, Глінскі, маючы ласку каралеўскую, дамогся ад яго міласці, каб у Забярэзінскага Трокі забралі і далі горад сыну ваяводы віленскага Мікалаю Мікалаевічу Радзівілу, які быў падчашым у караля Аляксандра і намеснікам бельскім. Ілініча ж, старасту лідскага, кароль загадаў схапіць і ў вязніцу пасадзіць, а панам-радзе загадаў яму на вочы не трапляць..."* [18].

Як бачым, абражаны гэтым кароль у студзені 1505 г. на сойме ў Берасці, магчыма нават задумаў вынішчыць паноў сваёй рады. Вядома, што толькі каронны канцлер Ласкі здолеў адгаварыць караля ад сваёй задумы. У 1505 г. *"... восенню, на Кузьму і Дзям'яна, кароль Аляксандр прызначыў склікаць сойм у Радаме для паноў ляшскіх, на якім былі і паны літоўскія. А прыехалі паны літоўскія прасіць паноў ляшскіх высветліць прычыну каралеўскага гневу, які на іх, бязвінных, разглаваўся з намовы і па волі Глінскага. І паны ляшскія пра тое каралю гаварылі, і ён гнеў свой адпусціў"* [19].

Аднак кароль пацвердзіў Дрожджу Лідскае намесніцтва, а ў Забярэзінскага адабраў Троцкае ваяводства і аддаў яго падчашаму Мікалаю Мікалаевічу Радзівілавічу, Бельскае староства ўзяў князь Міхал Глінскі, ступіўшы на гэтую пасаду з Морацкага намесніцтва. Ад сакавіка 1505 г. ён фігураваў як дворны маршалак, Бельскі і Уцянскі намеснік і захаваў гэтыя пасады да смерці караля Аляксандра. Прывілеямі таго ж караля яму былі нададзены ў дзяржанне Тураў і Гонендз. У 1506 г. князь Міхал Львовіч Глінскі надаў фальварак Прытулянку свайму слузе Міколу Патоцкаму, а ў студзені 1506 г. у дадатак да Тураўскай воласці, якую кароль папярэдне надаў князю Міхалу і дзе той пабудаваў сабе замак, атрымаў уладу над тамтэйшымі баярамі. У траўні 1506 г. дворны маршалак, дзяржаўца Бельскі і князь Уцянскі, Міхал Львовіч Глінскі атрымаў ад караля дазвол на выплату даўгоў купцам за сукно з даходаў манетнага двара[20].

Але, верагодна, спрэчкі з-за пасады лідскага намесніка былі толькі адной з прычын канфлікту паміж магнатамі і манархам. Другая, больш глыбокая прычына хавалася ў адносінах да Мельніцкай уніі 1501 г. Па ўмовах уніі літоўская шляхта ўдзельнічала ў выбарах польскага караля, а Польшча ў выпадку небяспекі, павінна была дапамагчы ВКЛ. Але не ўся шляхта падтрымала унію. У гэтай сітуацыі на баку манарха і уніі апынуліся Міхал Глінскі, Міхал Заслаўскі і Юры Гальшанскі. Супраць выступілі біскуп Войцех Табар, Ян Забярэзінскі, Станіслаў Кішка, Станіслаў Яновіч (Кязгайла) і Станіслаў Глябовіч. Яны расцанілі акт уніі як пагрозу незалежнасці ВКЛ з боку Кароны. Далейшыя спрэчкі вакол Мельніцкай уніі прывялі да кампрамісу. Урэшце, у гэтай справе найбольш пацярпелі Юры Гальшанскі і Юры Ілініч. Не ўсе пасады былі вернуты і Яну Забярэзін-

[17] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. // Спадчына. 1993. № 2. С. 104-105.
[18] Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. С. 160-161.
[19] Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. С. 163.
[20] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. С. 104-105.

скаму. Пакуль жыў вялікі князь Аляксандр, канфлікт Забярэзінскага з Глінскім не перарастаў у адкрытае сутыкненне.

### Абранне Жыгімонта Старога

Пасля смерці вялікага князя літоўскага Аляксандра, яго брат Жыгімонт Стары (1467-1548) быў абраны панамі-радай 20 кастрычніка 1506 г. на велікакняскі пасад і 8 снежня 1506 г. на польскі пасад (нягледзячы на апазіцыю сенатараў з Малой Польшчы).

Жыгімонт I Ста-ры (1467-1548), унук Ягайлы, пяты сын Казіміра Ягелончыка, з 1506 па 1548 г. - вялікі князь літоўскі і кароль польскі. Манарх атры-маў добрую адукацыю, ведаў некалькі моў.




***Кароль і вялікі князь Жыгімонт Казіміравіч Стары***

Жыгімонт Стары імкнуўся ўмацаваць дзяржаву, але ваенныя і фінансавыя рэформы, спробы вяртання каралеўскіх і вялікакняскіх маёнткаў захопленых магнатамі, не мелі значнага поспеху, бо нават у 1537 г. супраць Жыгімонта Старога і магнатаў узняўся рокаш польскай сярэдняй шляхты - г. зв. "Курыная вайна". Баярства ВКЛ дамаглося роўных правоў для ўсяго вышэйшага стану і ў 1529 г. быў уведзены адзіны кодэкс законаў для дзяржавы - Статут Вялікага Княства Літоўскага. Для адбіцця нападаў крымскіх татараў на Украіне была створаная памежная варта з мясцовых жыхароў - казакаў, адносіны з якімі ў наступным стагоддзі стануць вялікай праблемай.

Падчас Жыгімонта I Старога ў Польшчы і ВКЛ распаўсюдзілася Рэфармацыя розных плыняў, што садзейнічала далейшаму ўздыму адукацыі. Жыгімонт I быў вядомым мецэнатам, меў вялікую бібліятэку, запрашаў да свайго двара вядомых скульптараў, архітэктараў, мастакоў. Нагадаю, што яго подпісам пазначаны дзве ахоўныя граматы для нашага першадрукара Францішка Скарыны. У часы кіравання Жыгімонта I пабудаваны сапраўдныя перлы беларускай архітэктуры - напрыклад, знакамітая інкастэляваная Маламажэйкаўская царква ў нас на Лідчыне. Фундатар гэтай царквы - Шымка Мацкавіч, верагодна, належаў да таго самага інтэлектуальнага кола, часткай якога быў і сам вялікі Скарына[21].

Другая жонка Жыгімонта Старога (з 1518 г.), - Бона Сфорца, адыгрывала пры ім значную ролю ў палітычным жыцці дзяржавы, намагалася забяспечыць пасады Польшчы і ВКЛ свайму сыну Жыгімонту Аўгусту, у 1529 г. адбылася яго намінальнае абранне другім вялікім князем літоўскім. Менавіта тады Жыгімонт I атрымаў мянушку "Стары" бо з'явіўся другі вялікі князь з такім імем.

### Рокаш Глінскага

Калі пасля смерці караля Аляксандра на пасад быў абраны Жыгімонт, канфлікт паміж Забярэзінскім і Глінскім разгарэўся з новай сілай. Ян Забярэзінскі пачаў адкрыта абвінавачваць Глінскага ў здрадзе, у імкненні заняць самому месца вялікага князя. Міхал Глінскі некалькі разоў звяртаўся да Жыгімонта, каб той разабраўся і зняў з яго такія цяжкія абвінавачванні, але вялікі князь усё цягнуў з апраўданнем[22].

Глінскі выклікаў Забярэзінскага на суд перад каралём і адначасна на суд Божы, г. зн. на асабістую размову, каб даказаць сваю невінаватасць. Калі кароль адцягнуў прызначэнне тэрміну дзеля вынясення прысуду па гэтай справе, Глінскі ў сакавіку 1507 г. паехаў да караля Уладзіслава Вугорскага з тым, каб выкарыстаць ягонае пасярэдніцтва. Вярнуўшыся адтуль з лістамі ён зноў стаў перад каралём, а калі і на гэты раз кароль зацягнуў справу і як быццам відочна патураў ягоным праціўнікам, Глінскі, пакідаючы каралеўскі двор, вымавіў з пагрозаю: *"Адважваюся на такую справу, пра якую ты кароль і я потым пашкадуем"*.

Пасля вяртання ў Літву, Глінскі ў Тураве пачаў збіраць вакол сябе прыхільнікаў і рупіцца аб ажыццяўленні сваіх смелых намераў па стварэнні ў Літве сваёй дзяржавы, саступіўшы пры гэтым частку тэрыторыі Маскве. Глінскі дамовіўся з вялікім князем маскоўскім Васілём Іванавічам, і той у чэрвені 1507 г. пісаў да сваёй сястры Алены - удавы вялікага князя і караля Аляксандра[23], каб тая трымалася грэцкае веры і сцвярджваў, што князь Міхал Глінскі ды іншыя скардзіліся яму на ціск на гэтую веру ў Літве. Адначасна Глінскі стараўся заручыцца дапамогай хана Мэндлі-Гірэя, з якім здаўна меў прыязныя адносіны[24].

Летам 1507 г. у Тураве ўзнікла змова, кіраўнікамі якой, апроч князя Міхала, былі ягоны брат князь Васіль Львовіч Глінскі, падстолі і староста Берасцейскі, таксама іх сваяк, намеснік Лідскі Андрэй Аляксандравіч Дрожджа. Другі брат Міхала, князь Іван Львовіч Глінскі, каралеўскі маршалак і Навагрaдскі ваявода, відавочна, далучыўся да бунту пазней. Інтрыгі Глінскага сталі ведамыя пры двары ў Кракаве, бо ў хуткім часе памянёныя вышэй князі, Васіль Глінскі і Дрожджа былі пазбаўленыя

[21] Гл: Лаўрэш Л. Л. Фундатар Маламажэйкаўскай царквы Шымка Мацкавіч і яго нашчадкі // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы. Гродна : ГрДУ, 2021. С. 299-305

[22] Шэйфер, В. Мяцеж ці паўстанне? С. 104-105.

[23] Гл: Скарбы каралевы Алены // Наша слова.pdf № 49, 7 снежня 2022.

[24] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. С. 82.

пасадаў (восень 1507 г.). У лістападзе 1507 г. маскоўскія войскі, падбухтораныя Глінскім, увайшлі на Літву і абла-жылі Мсціслаў і Крычаў, але з-за моцных маразоў мусілі адступіць з нічым. Кароль, даведаўшыся пра набліжэнне маскоўскага войска і падбухторванне Глінскага, прыбыў на Літву, але пасля адступлення непрыяцеля ў снежні 1507 г. вярнуўся ў Карону. І ягоны ад'езд стаўся прычынаю адкрытага бунту[25].

Вядома, што Глінскі яшчэ раней накіраваў ганца ў Маскву з лістом да Васіля III, у якім паведамляў, што калі вялікі князь маскоўскі дасць грамату з гарантыяй захавання ўсіх земляў і маёмасці, то ён гатовы перайсці на яго бок з усімі цвердзямі, якімі валодае і якія яшчэ захопіць сілай ці ўгаворыць здацца. Васіль III згадзіўся на ўсе ўмовы.

Міхал Глінскі пачаў распаўсюджваць па ВКЛ чуткі, што ўсіх праваслаўных збіраюцца перахрысціць[26]. Калі князь выязджаў з Навагрядка, ён сказаў натоўпу, які сабраўся яго праводзіць, што быццам Фёдар Калантаеў паведаміў яму - на будучым сойме усіх прымусяць прыняць рыма-каталіцкую веру, а тых, хто супрацівіцца, пакараюць смерцю[27]. Па словах Глінскага, Фёдар Калантаеў даведаўся пра гэта ад маршалка Івана Сапегі[28]. Глінскі казаў, што падчас вяселля ў Беліцы *"пришолъ ко мне Федоръ Колонтаевъ, а палъ передо мною крыжомъ, а рекъ "так поведаю тобе, княже Миха'ле, штожъ тыми разы на томъ нинешнемъ со'ме, што маетъ бытии въ Вильни о Громницахъ, всихъ насъ, Русь, маютъ хрестити въ Лядскую веру, а хто бы не хотелъ поити въ Лядскую веру, тыхъ маютъ стинати; а то мне поведалъ заисто панъ Иванъ Сопега"* [29]. Аднак 21 сакавіка 1521 г., падчас судовага разбору справы, на пытанне вялікага князя Жыгімонта, Фёдар Калантаеў адказаў: *"…штожъ де та тыхъ рече' ни которыхъ князю Миха'лу не поведалъ, ани того есми от пана Ивана Сопеги не слышал, ани на сумъненьи моемъ того не было"* [30]. Глінскі выдумаў беліцкі эпізод каб прыдаць свайму рокашу характар рэлігійнай вайны.

Рокаш пачаўся адразу пасля ад'езду Жыгімонта Казіміравіча на сойм у Кракаў з расправы над Забярэзінскім. 2 лютага 1508 г. Глінскі з 700 вершнікамі пераправіўся цераз Нёман і атачыў маёнтак Забярэзінскага пад Гародняй. Сябра Глінскага немец Шляйніц з людзьмі ўварваўся ў жылыя пакоі, яны схапілі Забярэзінскага і загадалі нейкаму татарыну забіць яго. Вось як гэта апісана ў Літоўскай і Жамойцкай хроніцы: *"Року 1507. Михаил Глинский скоро по от[ъ]езди короля Жигимонта з Литвы до Кракова, ведаючи, же ему ишло не но мысли его у кроля, удался ростиркови шкодливому, а напервей збунтовавши старых жолнеров и помочников своих в семисот ездных избранных, преправился през Немен з Лыскова и просто до Гродна в[г]ехал, маючи през шпиги ведомость, же там Ян Заберожанский, маршалок великий литовский, его головный неприятель в той час в дворе своем в Гродне мешкал. А так, оточивши двор, Глинский неcподеване, в постели лежачого, казал турчинови стяти, а забивши Забережанского, маючи при собе 3000 езды, розослал их часть по Литовской земли шукати литовских панов и казал их забивать, мордовать, а иншых панов литовских и руских обетницами и подарками о князство Литовское приобрел, роспустил теж загоны по всей Литве, огнем и мечем плюндруючи, Туров и Мозыр взял и своими людми осадил. Потом Иван Васильевичь, царь мос[ковский] прислал ему на помочь Евстафия Дашковича"* [31].

Пасля нарады ў Навагрудку Глінскія планавалі рухацца на Вільню і далей на Коўню, маючы на мэце вызваленне саперніка Мянглі-Гірэя Шых Ахмата, які знаходзіўся там пад вартаю і якога князь Міхал хацеў выкарыстаць у якасці сродку ўплыву на татараў[32]. У гэты момант Міхал Глінскі меў 2 000 узброеных людзей[33]. Але гэта павінна было быць потым, а покуль цэнтрам рокашу стала Тураўшчына, спадчыннае валоданне Міхала Глінскага, дзе яго войскі правялі тры тыдні. Каб выйграць час, Жыгімонт накіраваў у Тураў свайго пасла Яна Касцевіча, але Глінскія згадзіліся весці перамовы толькі з Альбрэхтам Гаштольдам і паведамілі Жыгімонту, што будуць чакаць яго да Саборнай нядзелі - да 12 сакавіка 1508 г.

Даведаўшыся аб падзеях у ВКЛ, Васіль III спешна накіраваў у Тураў свайго дзяка Мікіту Губу Маклакова, які ўжо бываў у ВКЛ з пасольствам у 1503 г. і добра ведаў сітуацыю. Дзяк перадаў ракашанам прапанову Васіля III перайсці на яго бок. Адказу ад вялікага князя ВКЛ Глінскія не атрымалі, палічылі сябе вольнымі ў адносінах да свайго гаспадара і накіравалі ў Маскву грамату з просьбай прыняць іх у сваё падданства і дапамагчы ў барацьбе з Жыгімонтам. Пасля гэтага войска Глінскіх з Турава рушыла ўглыб ВКЛ. Сваяк Міхала Глінскага, мазырскі ваявода Якуб Івашанцаў адчыніў браму Мазыра. У той жа час да ракашанаў прыбыў пасол ад Мянглі-Гірэя з прапановай перайсці на крымскую службу і абяцаннем Кіева.

Міхал Глінскі разлічваў на частцы тэрыторыі ВКЛ стварыць Вялікае Княства Рускае, і вырашыў мець рэальную дапамогу Масквы, чым абяцанні Крыма. Да таго часу Мікіта Губа Маклакоў прывёз станоўчы адказ ад Васіля III і паведаміў ракашанам пра пасылку на

[25] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. С. 82-83.
[26] Шэйфер, В. Мяцеж ці паўстанне? С. 104-105.
[27] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. С. 83.
[28] Шэйфер, В. Мяцеж ці паўстанне? С. 104-105.
[29] РИБ. Т. XX. Петербург, 1903. С. 1196-1197.
[30] Там жа
[31] Хроника Литовская и Жамойтская. ПСРЛ, Т. 32. С. 102.
[32] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. С. 84.
[33] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska. S. 346.

дапамогу ім маскоўскага войска пад камандаваннем Васіля Шамяціча. Цар абяцаў пакінуць за Глінскімі ўсе гарады, якія тыя захопяць. Пасля гэтага ў траўні 1506 г. Глінскія прынеслі прысягу на вернасць Васілю III. Пакуль ішлі перамовы, Міхал Глінскі захапіў Клецк, на яго бок перайшлі княжаты Друцкія і князь Міхал Мсціслаўскі.

10 сакавіка з Масквы на Смаленск выйшла галоўнае маскоўскае войска (50-60 тысяч чал.) пад камандаваннем Юрыя Захар'іна. На Полацкую зямлю ішлі наўгародскія палкі Д. Шчэні і Рыгора Захар'іна. З Северскай зямлі ў траўні на Літву выйшлі войскі маскоўскіх ваяводаў Васіля Шамяціча, Івана Адоеўскага і Івана Варатынскага. Да самога Міхала Глінскага быў пасланы невялікі атрад князя А. Ф. Алёнкі Алабышава з мурамцамі[34]. Як піша летапіс: *"... замки Глинский москвою осадил"* [35].

Аднак пад Менскам аб'яднанае з маскоўцамі войска беспаспяхова стаяла два тыдні, няўдача спасцігла Глінскага пад Слуцкам і пад Капылём.

Жыгімонт з Кароны накіраваўся ў ВКЛ. У канцы траўня ён быў у Бярэсці, у сярэдзіне чэрвеня накіраваўся ў Слонім, а потым - у Менск. Вялікі князь і кароль Жыгімонт энергічна збіраў вайсковыя сілы і ўжо ў траўні Канстанцін Астрожскі заняў Тураў. У Лідзе збіралася шляхецкае апалчэнне, сюды паспяшаўся і Жыгімонт з 3-4 тысячамі палякаў. Камандуючым аб'яднанымі сіламі (15-16 тысяч ваяроў) быў прызначаны Канстанцін Астрожскі[36]. *"... Жигимонт, кроль полский, початком шкодливой войне забегаючи, рушился сам зо всеми силами войска полского, литовского, руского и жомойтского против Глинского, который ся был выправил знову з великим войском московским в Литовскую землю. А гды учул Глинский, же кроль тягнет з великою потугою, упало ему зараз оное гордое его серце, и зараз оттягнул от Минска и от Борисова, и знову ся нааадь з великою трудностю и шкодою през Днепр переправил. Видячи то кроль, же Глинский пред ним утекает, зараз на коню в зброю з веселою поставою през Днепр переправился и тым рицерству своему серца доброго придал ..."* [37].

Пасля шэрагу сутычак, стала зразумела, што для працягу вайны ВКЛ не мела сродкаў. Жыгімонт вырашыў распачаць перамовы. Васіль III пагадзіўся. 19 верасня 1508 г. у Маскву прыбыло вялікакняскае пасольства на чале з полацкім ваяводам Станіславам Глябовічам. Паслы патрабавалі вяртання да межаў, якія былі пры Казіміры Ягайлавічы і Васілі Цёмным. 8 кастрычніка быў падпісаны "вечны мір", які замацоўваў адыход да Маскоўскай дзяржавы земляў, захопленых ёй падчас войнаў 1492-1494 і 1500-1503 гг.

Міхал Глінскі, яго браты Іван і Васіль "Сляпы", стрыечны брат, былы лідскі стараста Андрэй Дрожджа, князі Іван Азярэцкі, Зміцер і Васіль Жыжамскія, і шэраг іншых асоб уцяклі з ВКЛ на службу да Васіля III.

Вядома, што Міхал Глінскі, пасля сваіх уцёкаў у Маскву, стараўся падтрымліваць цесныя сувязі з Літвой, дзе пакінуў прыхільнікаў нават у асяродку вялікакняскай рады. За што кароль, прыбыўшы ў Вільню ў лютым 1509 г., загадаў асудзіць паноў, якія трымалі сувязь з Глінскім: навагрудскага ваяводу Альбрэхта Гаштольда, Марціна Храбтовіча, канюшага, швагра Глінскіх, падскарбія Федку Храбтовіча, Аляксандра Хадкевіча і князя Палубінскага, якія, адседзеўшы два з паловаю гады ў турме, 18 траўня 1511 г. выйшлі на волю[38].

**Удзел лідзян у бітве пад Воршай**

Бітва пад Воршай (1514 г.) была найбуйнейшай бітвай вайны 1512-1522 гг. Маскоўскай дзяржавы з Вялікім Княствам Літоўскім. Адбылася яна 8 верасня 1514 г. на рэчцы Крапіўне за 5 км ад Воршы.

Войска ВКЛ, якое падпарадкоўвалася вялікаму князю літоўскаму і каралю польскаму Жыгімонту Казіміравічу, складалася з прадстаўнікоў абедзвюх дзяржаў. Непасрэдна ў паходзе да Воршы і ў бітве пад камандаваннем князя Канстанціна Астрожскага ўдзельнічалі каля 30 000 чалавек з неакрэсленай колькасцю гармат. Лёгкую конніцу ўзначальваў Юры Мікалаевіч Радзівіл, польскіх наймітаў - Януш Свярчоўскі, надворнае каралеўскае войска і аддзелы паноў - Войцех Сампалінскі. Аснову ўзброеных сіл ВКЛ складала паспалітае рушэнне, якое склікалі напярэдадні ваеннай кампаніі. Кожны шляхціц, які меў зямельны надзел, абавязаны быў несці ваенную павіннасць.

24 траўня 1514 г. вялікі князь Жыгімонт загадаў выступаць у паход на дапамогу Смаленску. У яго грамаце адзначалася, каб усе *"были наготову на службу нашу на войну, и держали кони сытыи и зброи чистыи"*. У ёй даваўся і тэрмін, да якога павінна прыбыць земскае апалчэнне: *"...кождый со своим поветом, того ж часу, ничого не мешкаючи на кони воседали и до Менска тягнули, на рок, на день святого Ивана"*. Грамата была накіравана *"до князей, земян, бояр и панов"* пералічаных паветаў.

Меркавалася сабраць харугвы з наступных адміністратыўных адзінак ВКЛ: Віленскага ваяводства (ваявода Мікалай Мікалаевіч Радзівіл), Гарадзенскага і Ковенскага паветаў з Троцкага ваяводства (ваявода і надворны маршалак Рыгор Станіслававіч Осцікавіч), Жамойцкай зямлі (стараста Станіслаў Янавіч Гаштольд), Валынскай зямлі (маршалак Канстанцін Іванавіч Астрожскі), Дарагічынскага і Бельскага паветаў з Падляскага ваяводства (віцебскі і падляскі ваявода Іван Сямёнавіч Сапега), Берасцейскага павета (берасцейскі стараста Юры Іванавіч Ілініч), Уладзімірскага павета

[34] Шэйфер, В. Мяцеж ці паўстанне? С. 106.
[35] Хроника Литовская и Жамойтская. С. 103.
[36] Шэйфер, В. Мяцеж ці паўстанне? С. 106.
[37] Хроника Литовская и Жамойтская. С. 103.
[38] Вольф Юзаф. Князі на абшарах Вялікага Княства Літоўскага ад канца XIV ст. // Спадчына. №3-1993. С. 82-88.

(уладзімірскі стараста Андрэй Аляксандравіч Сангушка), Наваградскага павета (ваявода Ян Янавіч Забярэзінскі), Камянецкага павета (князь Сямён Чартарыскі), Гарадзенскага павета (ваявода Юры Мікалаевіч Радзівіл Геркулес), Менскага павета, Пінскага княства (пінскі князь Фёдар Іванавіч Яраславіч). Тут няма ўсходніх тэрыторый, бо да траўня-чэрвеня 1514 г. насельніцтва прыгранічных паветаў ужо паднялося на абарону.

У 1502 г. на сойме ў Наваградку вялікі князь Аляксандр сумесна з панамі-радамі устанавіў норму - 1 узброены вершнік з 10 службаў (з 20-30 сялянскіх двароў). На Віленскім сойме 1511 г. было вырашана, што адзін вершнік павінен выстаўляцца не з дзесяці службаў, а з дзесяці "дымоў".

У тыя часы Ліда павінна павінна была паставіць у войска ВКЛ 30 узброеных вершнікаў, Васілішкі - 8 (для параўнання, Менск - 20, Гародня - 20, Берасце - 150, Слонім, Ваўкавыск, Наваградак - па 20) .

З усіх лідзян нейкую інфармацыю пра ўдзел у бітве мы маем толькі адносна жалудоцкага дзяржаўцы князя Васіля Палубінскага ці Палубенскага (каля 1480 - 4.03.1551). Ужо 15 чэрвеня, г.з. за тыдзень да заканчэння тэрміну збораў, князь Васіль Палубінскі з'явіўся са сваім поштам у 50 вершнікаў (паводле перапісу 1528 г. ён выстаўляў 43 вершнікі) і адным з першых, з аддзелам у 526 конных (у тым ліку 94 "рацэі" і 100 "ляхаў Вольскага") і 100-115 пешых, прыйшоў у раён баявых дзеянняў[39].

Князі Палубінскія маюць наўпраставае дачыненне да Лідчыны, паколькі валодалі Мажэйкаўскім ключом, ды і назва лідскай вёскі Палубнікі паходзіць ад прозвішча гэтых князёў.

Паводле ўласнага радаводу Палубінскія выводзіліся ад князя Андрэя Альгердавіча, гэта ўскосна пацвярджаецца тым фактам, што бацька нашага героя Андрэй Палубінскі пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры побач з кіеўскім князем Уладзімірам Альгердавічам. Лявагам[40].

Князь Васіль Палубінскі перажыў свайго сына Льва Васільевіча, якога пахаваў у Кіева-Пячэрскай лаўры, і сам быў пахаваны там жа. Так што ў Лаўры спачывае не толькі найвышэйшы гетман ў бітве пад Воршай князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі, а і паўтысяцкі ў той жа бітве Васіль Андрэевіч Палубінскі.

Палубінскія - мабыць адзіны беларускі княскі род, прадстаўнікі трох пакаленняў якога ляжаць у Лаўры[41].

Тым часам, на расійскі пасад у 1533 г. пасля смерці свайго бацькі ўступіў чатырохгадовы Іван Васільевіч, будучы Іван Жахлівы. Яго апекункай-рэгентам стала маці - вялікая княгіня Алена, Алена Глінская - пляменніца Міхала Глінскага. Яна стала першай жанчынай кіраўніцай Маскоўскай дзяржавы, але не карысталася сімпатыямі баяр, бо была жанчынай не маскоўскіх, а еўрапейскіх нораваў і выхавання. Бліжэйшым саюзнікам Алены быў яе жанаты фаварыт, князь Целяпнёў-Аўчына-Абаленскі. Гэтая сувязь і ганарлівыя паводзіны яе каханка выклікалі незадавальненне ў баяраў, выразнікам гэтай незадаволенасці стаў сам Міхал Глінскі, за што і быў пасаджаны пляменніцай ў турму, дзе і памёр.

У той час два знатныя маскоўскіх баярыны, князь Сымон Бельскі і Іван Ляцкі - асобы спрактыкаваныя ў вайсковым мастацтве, стаялі з сваімі палкамі ў Серпухаве, рыхтуючыся да ўварвання ў Літву. Але, даведаўшыся аб пераменах у Маскве, збеглі ў Вільню. Яны расказалі пра намер новага расійскага ўрада весці вайну з ВКЛ і прысягнулі сваёй новай радзіме, за што былі надзелены значнымі маёнткамі. Нам цікава, што Ляцкі і яго сын атрымалі Жалудок у Лідскім павеце і Іван Ляцкі стаў пачынальнікам вядомага рода Ляцкіх у ВКЛ[41].

Пасля смерці Івана Ляцкага кароль Жыгімонт Аўгуст у 1552 г. перадаў Жалудок ленным правам яго сыну Івану Іванавічу Ляцкаму, падляскаму ляснічаму. З попісаў войска Вялікага Княства Літоўскага даведваемся, што ў 1567 г. пан Іван Іванавіч Ляцкі, ляснічы падляскі, са сваіх маёнткаў: Жалудка ў павеце Лідскім, Высокага Двара ў павеце Трокскім, Чэмераў і Носава ў павеце Берасцейскім, з сёл размешчаных на Русі - з Болача і Очыча з прысёлкамі, а таксама з прыкупленых Міткаўшчыны, Страмбоўшчыны павінен быў ставіць на попіс 40 коней, *але, памятаючы на каралеўскую ласку, паставіў 61 каня з вершнікамі ў панцырах і прылбіцах, узброеных сагайдакамі, шаблямі і рагацінамі, а звыш таго яшчэ 30 драбаў з рушніцамі і сякерамі*" [42]. Генеолаг Нясецкі гэтак піша пра яго: *"Муж ваенны і ў справах рыцарскіх спрактыкаваны, з Філонам Кмітам, старастам аршанскім, калі кароль Аўгуст быў пад Радашковічамі, мужна маскву граміў і землі іхнія пустошыў, уздоўж на 24 мілі, ушыркі на чатыры мілі; з Багданай Палубінскай нарадзіў дачку Тэадору, жонку пісара літоўскага Эльяша Пельгрымоўскага, ... і сыноў двух - Рыгора і Тэадора, абодвух праслаўленых справамі кавалерскімі"* [43].

Сын Івана Ляцкага - Іван Іванавіч Ляцкі вызначыўся падчас Лівонскай вайны, а яго ўнук Тэадор назаўсёды ўвайшоў у летапіс вайсковай славы ВКЛ. Сфарміраваная ім рота з двухсот крылатых гусараў, сярод якіх былі і шляхціцы з ваколіц Жалудка, вызначылася ў бітве са шведамі пад Кірхгольмам. У XVII ст. Ляцкія страцілі Жалудок, аднак памяць пра іх засталася ў назве вёсак Лядск і Высокі Лядск (сучасная Шчучыншчына)[44].

*(Працяг у наступным нумары.)*

[39] Лобин А. Н. Взятие Смоленска и битва под Оршей 1514 г. Москва, 2015. С. 35.

[40] Лаўрэш Леанід, Суднік Станіслаў. Князь Васіль Андрэевіч Палубінскі - паўтысяцкі ў бітве пад Воршай. Да 500-годдзя бітвы // Наша Слова. № 38 (1189), 17 верасня 2014.

[41] Narbutt Teodor. Dzieje starozytne narodu litewskiego. T. 9. Wilno, 1841. S. 194.

[42] Вашкевіч Андрэй. Жалудок - ад уладання вялікага князя да Чацвярцінскіх // Жалудок. Гісторыя нашага краю. Гродна, 2020. С. 27.

[43] Цыт па: Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 61.

[44] Вашкевіч Андрэй. Жалудок - ад уладання вялікага князя да Чацвярцінскіх. С. 27.

***Віктар Кудла,***
***дроздавец***

# ДРОЗДАВА
## *Віткі жыцця родзічаў і дроздаўцаў*

*(Працяг. Пачатак у №№ 70, 71, 92, 93, 99-100, 101,102, 103, 104, 105-106, 107..)*

**Раздзел № 12.**

**Віткі жыцця маіх родзічаў і драздаўцоў пасля акупацыі. Аднаасобнікі на гаспадарцы.**

Я шмат чаго памятаю з тых часоў. Маё дзяцінства прыпала на вайну. Былі гады жахлівай гітлераўскай акупацыі і жорсткай расправы акаўцамі, а потым не менш жахлівыя працоўныя пасляваенныя гады.

Маё дзяцінства працякала
Ў пасляваенныя гады.
Было ў ім радасці замала,
Хапала ж гора і бяды.
Ды я не памятаю злога,
Мо пасвядомасць не дае
У думках выцягнуць з былога
Тугу і крыўды ўсю мае.
Дзяцінства годы маладыя
У душы з пяшчотай берагу.
Падзеі сэрцу дарагія
Забыць ніколі не змагу.

10 ліпеня1944 года вёска Дроздава вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ваяўнікамі 17 стралковага корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П.К. Кашавога. Раён вызвалілі, але вайна працягвалася, пайшла ад нас далей на захад. Многія аднавяскоўцы ваявалі: адны з пачатку вайны, многія пасля мабілізацыі ў Чырвоную Армію пайшлі ваяваць пасля вызвалення Лідчыны.

Пад канец ліпеня Ганчарскі сельсавет узнавіў сваю дзейнасць. 20 верасня з ліквідацыяй Баранавіцкай вобласці Ганчарскі сельсавет у складзе Лідскага раёна перададзены Гарадзенскай вобласці.

Першым старшынём сельсавета быў прызначаны Трошын Андрэй Захаравіч, які ў атрадзе "Балтыец" быў кіраўніком гаспадарчага звяза, што праводзіў нарыхтоўку прадуктаў партызанам на вёсках. Андрэй Трошын аказаўся на ўзроўні. Сяляне, пры нагодзе, дзяліліся з партызанамі ўсім, чым маглі.

13 лістапада1944 года каля вёскі Вялічкі быў абстраляны і паранены акаўцамі Андрэй Захаравіч.

5 верасня 1944 года на перагоне Дроздава-Даржы былі праведзена акаўцамі-белапалякамі 4 падрывы, дзе былі пашкоджаны 4 звяны чыгуначнага палатна. Крушэнне цягніка ўдалося папярэдзіць.

У папярэднім нумары "Летапісца" складзены дакладны спіс дроздаўцаў, якія загінулі ад немцаў-фашыстаў і акаўцаў і вярнуўшыяся ўдзельнікі вайны.

Сын Трошына- Іван Андрэевіч 1926 г.н. загінуў ад акаўцаў у 1947 годзе.

Пасля Трошына ў 1947 годзе старшынём прызначылі Какашынскага Уладзіміра. Помню, як ён прышоў да нас у хату. Бацькі ў зале пасадзілі за сталом з гарэлкай і прысмакамі. Пасля зайшоў у спальню, а мы з братам сядзелі на печы і бачылі, калі ён зняў кашулю, на баку спіны была забінтована рана з крывёю. Праз некалькі месяцаў пайшлі чуткі, што ён арыштаваны як нямецкі сувязны.

Тату Ваню прызвалі ў ваенкамат, як удзельніка пачатку вайны, але не прызвалі на фронт, а выдалі заданне працаваць на лідскай чыгуцы. Нягледзячы на тое, што аднаасобнік і працаваў на сваёй гаспадарцы. Меў дзесяць гектараў ворыва, некалькі сенакосу і пашы. У Ліду ездзіў сваёю падводаю і працаваў на чыгунцы па перавозцы канём розных будаўнічых матэрыялаў і прымаў удзел у рамонце чыгуначных рэек і збудаванняў, якія былі разбураны бомбамі.



На кватэру засяліўся па вуліцы Энгельса ў старэнькай, вузенькай хатцы ў адзінокай старэнькай бабулькі. У суботу вечарам тата прыязджаў дахаты і да цямна гаспадарыў: рэзаў сечку жывёле, карміў карову, каня і авечак. Крыху паспаўшы і адпачыўшы з самай раніцы ў нядзелю працаваў на полі. А ў панядзелак раніцай зноў на падводзе на працу да дэпо.

Некалькі разоў тата браў з сабою маму і мяне з Ігарам. Добра памятаю, як засяляліся на кватэру. Праз вуліцу наведвалі капліцу і старыя могілкі. Ад чыгункі пастаянна ішоў паравозны грукат, і па ўсёй мясцовасці пахла вугальным дымам. Потым хадзілі каля касцёла і разбуранага замка, аж да захаваўшагася сабора. Вакол ні адной пабудовы - толькі валяліся кавалкі цэглы і папялішча, а з зямлі месцамі ішоў дым.



**З РАСКАЗАЎ МНОГІХ АДНАВЯСКОЎЦАЎ**

Пасля вызвалення Ганчарскай акругі ў Гарах (так называлася развілка шашэйных дарог з Ліды на Навагрудак і Беліцу) стаяў падбіты танк. А злева, каля самой дарогі, быў пясчаны кар'ер, дзе капалі жвір і вывозілі на шашу. На гэтым пясчана-жвіравым узвышшы было некалькі пашкоджаных нямецкіх танкаў і іншай тэхнікі, рознага жалезнага смецця і тол. У тых месцах дзетвара пасвіла хатнюю жывёлу, і пастушкі ад ветранай і дажджлівай непагоды хаваліся ў гэтых машынах. Некаторыя вясковыя мужчыны знаходзілі там патрэбныя для гаспадаркі жалезкі і рабілі здольнымі рукамі з трафейнага хламу алюміневыя лыжкі, міскі, чыгункі, вёдры і іншыя прадметы хатняга ўжытку.

Вяскоўцы прагнулі заканчэння вайны, маліліся. Чакалі вяртання з фронту жывымі і здаровымі сваіх родных і сваякоў. Шукалі спосабы наблізіць яе канец і вось з'явіліся "святыя лісты". Ніхто не ведаў, хто іх пісаў, адкуль прыходзілі. Змест аднаго ад іншага мала адрозніваўся, але патрабавалася:"Перапішы з дзесятак лістоў і перадай іншаму". Гэты святы ліст з малебнымі апавяданнямі шчыра абяцаў заканчэнне вайны і ўзрушыў вяскоўцаў ды прывёў у рух. Ліст патрабаваў за адну ноч напрасці нітак і наткаць ручнік, зрабіць і паставіць крыж і павязаць яго новым ручніком.

Ліст знайшоў водгук у сэрцах людзей, і праца закіпела. У ёй прымалі ўдзел, верагодна, усе працаздольныя. Працавалі ўсю ноч.

Раніцай на краі вёскі пры вуліцы быў пастаўлены новенькі крыж з новым ручніком. Гэта быў свайго роду пабожны ўклад аднавяскоўцаў у Вялікую Перамогу!

Адразу пасля вызвалення Лідчыны восенню1944 года дзеці з Дроздава і навакольных вёсак нахлынулі ў Жучкоўскую пачатковую школу. Школу абсталявалі ў драўлянай хаціне (былы ўладальнік Ненартовіч Франак з’ехаў у Польшчу). Вучні розных узростаў ад 7-мі і нават да 15-ці гадоў пачалі вучыцца ў двух пакоях і ўмоўна дзяліліся на класы. Актыўныя бацькі зрабілі з дошак парты. А акрамя партаў уздоўж сцен паставілі доўгія лаўкі, папярок якіх палажылі дошкі. Падчас вусных урокаў дзеці сядзелі на лаўках, а на пісьмовых уроках - станавіліся на падлогу на калені і так пісалі. Вучыла тады Зоя Іванаўна Шуціла з вёскі Супраўшчына, якая была замужам за Анатолем Васільевічам Кудлам, які таксама крыху настаўнічаў, але потым закончыў медустанову і працаваў доктарам.

Настаўнікамі потым былі: Дзікевіч Мікалай Мікалаевіч, Козел Іван Міхайлавіч (Міхалюкоў), потым Кожураў Васіль Іванавіч, мажліва, партызан. Жыў з жонкай Верай, падчарыцай Рэняй і сынам Шурыкам у сярэдняй частцы будынка школы.

Вершаваны аповяд Георгія Іванавіча Раіка:

*Вайна, зламаўшы ўсё наўкола,*
*ужо на захад вяла шлях.*
*Тады адкрылася зноў школа*
*ў нашай вёсачцы Жучках.*
*З тае пары ў вясковай хаце,*
*(аб чым прыемна ўспамінаць)*
*Магчымасць кожнаму дзіцяці*
*была навуку пазнаваць.*
*Даўно сышлі часы былыя,*
*у школе той, як і ў другіх:*
*Адзін пакойчык на два класы-*
*адзін настаўнік на ўсіх!*
*Зусім другімі былі дзеткі,*
*ішлі па веды, што ў паход:*
*Паміж "маляўкамі" - падлеткі*
*дзесь па 15-ць добрых год!*
*На увесь раён тым часам Лідскі*
*настаўнік наш адметным быў:*
*Дзікевіч, Козел і Шуціла,*
*а потым Кожураў вучыў…*
*Навукі цяжкая дарога -*
*(тут не праскочыш напрасткі?!)*
*І вось нарэшце - Перамога.*
*Браты вярталіся і бацькі…*

**Татава дваюрадная сястра Вольга Германовіч расказала:**

*"Аб Вялікай Перамозе, 9 мая паведамілі са званіцы царкоўныя званы. Урачысты набат гучаў над усімі навакольнымі вёскамі. Радыёпрымачоў у насельніцтва, мажліва, не было, але бацюшку Усціновічу Мікалаю неяк удалося прыхаваць гэты цуд сувязі, і ён першым у Ганчарах даведаўся і з дапамогай царкоўных званоў апавясціў усю паству аб радаснай падзеі. У царкве прайшлі ўрачыстыя набажэнствы. Усе ад малога да вялікага былі бязмерна радыя Вялікай Перамозе.*

*І, нягледзячы на тое, што такая вялікая радасць прыйшлася на вясну, калі ў полі і на гаспадарцы асабліва шмат клопатаў-, ніхто не працаваў, усе святкавалі!."*

Германцы далёка не ў адзіночку, вераломна ўварваліся на тэрыторыю СССР у гады вайны. Вось надрукаваны вынікі ўдзелу ў ваенных дзеяннях саюзнікаў фюрера і як яны дапамагалі немцам ваеннай тэхнікай.




Так ужо склалася, што ўспаміны аб удзеле ў вайне, ці знаходжанні ў рускім палоне захаваліся толькі з нямецкага боку, ніхто з іх саюзнікаў з гэтай нагоды ніякіх мемуараў не напісаў і не распавядаў.

А вось США і Англія ўдзельнічала ў вайне і па ленд-лізу многа ваеннай тэхнікі і рознай прадукцыі выдзяляла Савецкаму Саюзу:

13 тысяч танкаў, 14 тысяч самалётаў, 8 тысяч трактароў і 400 тысяч джыпаў і студабеккераў-грузавікоў, 2,7 мільёнаў тон нафтапрадуктаў (паліва для самалётаў, грузавых аўтамабіляў і танкаў).



***На фатакартцы студабекер, якіх і пасля вайны многа працавала на Лідчыне***

Амерыканцы паставілі таксама 15 мільёнаў пар армейскіх чаравікаў, амуніцыю, коўдры, вінтоўкі, порах, медзь, сталь, алюміній, медыкаменты, палявыя радыёстанцыі, радары, кнігі і іншую прадукцыю.

За гады вайны ЗША ў рамках ленд-лізу адправілі ў СССР 2,1 мільярда (!) банак свіной тушонкі! Гэта ў пяць разоў больш, чым за гады вайны было выраблена кансерваў у самім Савецкім Саюзе.

Пасля вайны амерыканскія мясныя кансервы сталі сапраўдным культавым прадуктам. Гэта быў адзін з лепшых мясных прадуктаў, даступных савецкім вайскоўцам. Бацька з Ліды прывозіў кансервы, адкрывалі прымацаваным да банкі ключыкам. Была вельмі смачнай, звычайна елі з грэчкай і аўсянай кашай, з дабратой ўспаміналі іх смак і дзесяткі гадоў пасля. Мы потым захоўвалі гэтыя банкі, як сувеніры. І лічылі гэта сваім "дзіцячым багаццем".

Несумненна, чалавек значна лепш раскрываецца менавіта на сваёй гаспадарцы. Тут усё сваё, родненькае, палітае потам продкаў. Таму мы лёгка раскажам пра гаспадарчую сям'ю. Мужчынская рука - гэта стрыжань хаты, яе знешні выгляд. Але ўнутраны камфорт, аўру цеплыні, спакою і гармоніі стварае жанчына. Яна надае хаце жыццё, як жыццё дзіцяці. Казалі: "Гумно плача без гаспадара, а хата без гаспадыні". Нас, помніцца, з дзяцінства вучылі любіць родную зямлю, працу, Бацькаўшчыну. Згадваю яшчэ аповед маёй бабулі Алесі пра пасаджаныя ліпы каля хаты і пры шашы каля гумна яшчэ з дзядулем Іванам, якія за гэтыя гады выраслі тоўстымі і вялікімі….

Стары хлеў для жывёлы адрахлеў, прагніла страха, стаяў ён каля самай вуліцы. Па польскім патрабаванні сцены былі атынкаваны і бяліліся. Але стаяў ён за два сажні паралельна старэнькай хаце Ашмяноў і засланяў кухоннае акно. Каб болей не парушаць цяжкія санітарныя патрабаванні і суседскія крыўды ад пахаў гною, бацька з памочнікамі Гросам Вадзям, Хрышчановічам Міхасём (на фатакартцы) за тыдзень разабралі хлеў, перанеслі вышэй на гумнішча. Фундамент зрабілі з буйнога булыжнага камення. На каменныя валуны ўлажылі вянок, першыя бярвёны, падабраныя патаўсцей, бо ім больш трываць, а затым улажылі разабраныя вянкі, ва ўсю шырыню і даўжыню сцяны.





Спераду і ззаду хлява паставілі вушакі, над імі камлюкі і на завесах дзверы. Унутры ўстанавілі катухі для свіней, а збоку прыбудавалі курнік, адрыну і стайню для двух коней.

Страху праз некалькі месяцаў накрыў бацька дранкаю, якую ў хаце вечарамі расколваў з нарэзаных

тоўстых сасновых смалістых калодак. І ў хляве па-нова-му размясцілі кароў з цялятамі, пару свіней і дзясятак авечак.



***Перабудаваны хлеў, а праз вуліцу хатка за дашчатым плотам, ліпамі і чаромухай…***

Па ўспамінах бацькі за польскім часам"пры Ганчарскай школе ён прайшоў"Курсы па гаспадарцы ральнічай". Там вывучалі асновы навуковай працы ў земляробстве і жывёлагадоўлі. Пра стан сялянскай на-вукі для паляпшэння ўмоў працы рольнікаў на той час сведчыць захаваўшаяся ў бацькі ксёнжка-падручнік. І многае з тых рэкамендацый бацька шчыра і актыўна прымяняў пры вядзення гаспадаркі.

Так, ад вясны да восені жывёлу і авечак пасвілі на сваёй аселіцы, там на выгане навязвалі коней. Для кармлення жывёлы ў зімовыя дні на сваім сенакосе на-рыхтоўвалі сена і сячкарняю рэзалі аўсяную салому на сечку.

Жывёлу падсцілалі пасля абмалоту збожжа жытняй саломай, і пад весну ў хляве збіралася многа гною. Гэты гной з калу жывёлы ў злучэнні з саламяным падсцілам змяшчае ў сабе тую пажыўную сілу, якая і патрэбна глебе. Надыходзіў час "гнаявіцы". Праца не вельмі ахайная, бо вельмі пахучая, але затое яна найваж-нейшая для нашых зямель: калі поле з дзярмом - то поле з дабром. Гной скідаўся з вазоў сахарамі на палях і раскідваўся. Потым запрагалі каня, і плуг падымаў і пераварочваў адрэзаны пласт зямлі.

*"Куды гной адвязеш, адтуль і хлеб прывязеш.*

*Як гной кладзеш густа, то ў свіране не будзе пуста."*

Для корму жвачных жывёл важнае значэнне ма-юць якасць і пажыўнасць кармоў: салома, мякіна, сена з сырадэлі, з канюшыны. Асаблівая ўвага надаецца кар-няплодам, іх колькасці ў сутачным рацыёне для каровы: бульба, буракі, морква і бручка. Безумоўна, для высокіх надояў каровы ў зімовы перыяд патрабуецца і сумесь мукі з зерня ячменю, аўсу, пшаніцы, салодкага лубіну. Абавязкова ў рацыёне патрабуюцца мінеральныя да-баўкі: соль, кармавы мел, рыбная мука…

Усё не апісана, але дасканала вядома, што такая навука ў бацькавай гаспадарцы вельмі спрыяла гра-матнаму догляду за каровамі і атрыманню высокіх надояў.

Увесну па халоднай і вязкай глебе прыходзілася сеяць яравыя авёс і ячмень. Першае месца аўсу-дабрадзею. Авёс корміць галоўнага працоўнага, гэта значыць, коніка, корміць ды і саміх гаспадароў аўсянай кашай і блінамі. Чым даўжэй гадуецца конь на аўсе, тым больш у ім сілы. Сенам конь трыбух набівае, а пры аўсе і гной лепшы, і новаму хлебу зручней, без жывёла-гадоўлі няма земляробства.

*Калі ж у чэрвені з усходу*
*Прыйшлі Саветы зноў да нас,*
*То для тутэйшага народа,*
*Настаў другі складаны час.*

*Саветы людзям і прыродзе*
*Нямала шкоды прынясуць.*
*Другіх Саветаў у народзе*
*Перыяд гэты назавуць.*

Па некалькі разоў наведваў нашу гаспадарку фінагент Касяк, уручаў заданне па здачы дзяржаве сель-гаспрадукцыі: зерня, бульбы, малака, масла, яек.


МІНІСТЭРСТВА ФІНАНСАЎ СССР

ПАДАТКОВАЯ КВІТАНЦЫЯ

Серыя БП №709941

| | Руб. | кап. |
|---|---|---|
| Надоімка мінулага года | 183 | |
| Плацяжы бягучага года | — | |
| Пені | 17 | |
| Усяго | 200 | |

Бацькі здавалі ды столькі, што ў хаце мала што заставалася. Эканомілі, галадалі, усяроўна не ўдавалася выканаць дзяржплан. Уводзілі грашовую нядоімку.

І вось восенню 46-га года бацьку Ваню, мажліва, як не здзейсненага "кулака" і за гадавыя нядоімкі арыш-тавалі і вывезлі ў Карэла-Фінскую АССР на лесанарых-тоўкі ў паселішча Ліжма, каля горада Кемь, побач з Белым морам.У пісьмах бацька распавядаў пра цяжкую працу ў лесе асабліва ў зімовыя, суровыя дні.

Цэлы год пры адсутнасці бацькі мама і бабуля працавалі на гаспадарцы ад світання да пацёмкаў.

Вясною прыязджалі маміны пляменнікі Куляшы Ваня і Валодзік са сваёй кабылай. Дапамагалі араць коньмі палеткі, баранавалі, сеялі збожжа ўручную з сявенькі.

Вялася праполка ўсіх культур уручную.

Тое ж было і з ільном, радаваліся, калі ўчастак жыта, ячменю, лёну быў травяністым. Касілі, рвалі зел-ле, выносілі посцілкамі на плячах, сушылі на гумнішчах, бруднае, ірванае зелле папярэдне мылі ля калодзежа. Так нарыхтоўвалі зімовы корм для жывёлы. Пачалі эканоміць пакінутыя запасы збожжа, мукі, а праз нека-торы час не было з чаго пячы хлеб. Гэта быў цяжкі пе-рыяд у жыцці нашай сям'і…

Праз год тата Ваня вярнуўся дахаты, сустрэўся, цёпла абняў і пацалаваў нас. Паказаў запісаны дзённік



штодзённай працы ў лесе, расказаў пра спілоўванне соснаў сярод гранітных горак, абрэзку сукоў і загрузку ў трактарны прыцэп. Некалькі разоў ад прастуды хварэў. На заробленныя грошы купіў для сябе і сям'і на 1115 рублёў: боты, галёшы, шапку, бялізну, куфайку…

Уручыў нам падарункачкі з адзення, пачак цукру, манку, булачкі. Цікава расказаў, як у Ленінградзе пры перасадцы на пасажырскі поезд за цэлы дзень наведаў Ісакіеўскі сабор і Петрапаўлаўскую цвердзь і паказваў там зробленную фатакартачку.



Вялікі ўплыў на фарміраванне майго характару і нават светапогляду аказала наша бабуля Алеся Вікенцьеўна. Паводле афіцыйнай тэрміналогіі, яна заставалася непісьменнай - гэта значыць не ўмела ні чытаць, ні пісаць. Затое яна валодала розумам рэдкай праніклівасці, багатай жыццёвай мудрасцю.

Мудрая бабуля Алеся была глыбока веруючым чалавекам, яна імкнулася выхоўваць унукаў - Ігара і мяне - з ранняга дзяцінства ў рэлігійным духу.

Гэта адзначалася рытуальным дзеяннем: прачнуўся - пералагнайся, садзішся за стол - пералагнайся, выканай малітвенны шэдэўр "Ойча наш". Яна вучыла нас любові да ўсяго існага, вучыла не толькі глядзець пад ногі, але і на нябёсы...

Акрамя таго, яна валодала незвычайнымі якасцямі - умела рыхтаваць смачную яду.

Ежа была натуральнай, здабытай уласнай працай. Харчаваліся, можна сказаць, па сезоне. Увесну, як толькі з'яўлялася шчаўе, крапіва - рыхтавалі на першае бурачнік на салёнай мясной костцы. Калі была яшчэ квашаная капуста - капусту, бульбяны суп, засмажаны кубікамі сала, супы з фасолі, пярлоўкі, бульбы і мучных клёцачак. Рыхтавалі бульбяную кашу, засмажаную кубікамі сала, і змяшчалі ў гарачую печ аж да румянай скарыначкі. Калі надойвалі малака, рыхтавалі малочныя супы: ячменны панцак, крупнік, зацірку мучную, ячменны з фасоллю або гарохам.

Калі пачыналася цёплае надвор'е, усе малочныя супы пасля гатавання выносілі ў камору для астуджэння і елі халоднымі. На халаднік бралі кіслае малако, трохі разбівалі лыжкай, у яго клалі парэзаны дробнымі кубікамі агурок і зялёны ўкроп - халаднік быў смачны для ўжывання.

Наша бабуля Алеся любіла загадваць нам пра печ - галоўную, амаль жывую істоту ў хаце, бо ў ёй пяклі хлеб, штодзённа гатавалі ежу, на ёй спалі, сушылі вопратку, абутак. Мне таксама пашчасціла часта яшчэ паспаць на бабулінай печцы. І пра такі цёплы сон сніцца мне праз усё жыццё. Ля печы быў пячны рыштунак: качарга, чапяля, вілкі. Супраць яе размяшчаўся кут, дзе стаялі вёдры, ды кадушкі…

**Мая хросная мама Тамара расказвала:**

*"Добра жылі з суседзямі: Ашмянамі Валодзем і Ванем, з іх маткаю - Маняй Нікадзімаўнай (Грос.)*

*Валодзя Белавус - Веркі брат,калі прыязджаў з Праважы падхожваў да прыгожай суседкі Ніны Ашмяновай. Казалі, яна была ўкахана з маладосці ў дзядзю Ваню.Чаму не пажаніліся, не ведаю - можа яе бацькі ці браты мелі злосць, што былі асуджаны за крадзёж снапоў з Ванюшкава поля. А неяк Ігар расказваў, што бацька Ваня часта сустракаўя на падворку з Нінаю Ашмяновай і многа гаварылі пра гаспадарку, пра росшых дзетак… Мажліва, па-гэтаму радзіўшагася свайго сынулю яна назвала Ванем"…*



Усе добрае і высокае ў чалавека набываецца працай; праца ведзе ўперад людзей.

Праўдзівая праца толькі там, дзе чалавек здабывае хлеб у поце твару, а не там, дзе імкнецца ўзбагаціцца без працы. З беларускага чалавека атрымоўваецца самы трывалы і самы працавіты.

На шырокім гумнішчы вялікае на восем тарпякоў гумно было пабудавана яшчэ пры царызме. За гэтыя гады на стрэхах гумна давялося мяняць салому, бо месцамі спаўзла, месцамі правалілася.



Перад гумном, на гумнішчы была выкапана студня, глыбінёй сем кольцаў.

Добра памятаю, як да нас прыехалі падводай маміны сваякі Юхна Гэнік і Юзік (на фатакартцы).За некалькі дзён разабралі на гумне старую падгніўшую салому. А для страхі бацька падрыхтаваў многа кулёў жытняй саломы. Салому ўкладвалі на жэрдкі, прывязвалі да тонкіх жардзінак лазовымі пруткамі.





Быў выпадак, гуляючы на гумнішчы, я па высокіх лесках забраўся аж на страху, дзе сваякі ўкладвалі кулі, але спалохаўся на ніз злазіць, закрычаў, і падскочыўшы Гэнік на спіне апусціў мяне на зямлю…

Калі пачыналася летняя пара ўборкі ўраджаю, усе ад мала да вяліка ўсведамлялі свае абавязкі і строга іх выконвалі. Каб у час справіцца з працай, жаць выходзіла ўсё сямейства і радня, усе, хто ўмее трымаць серп.

Добра памятаю, як мама Верка, бабуля Алеся, Тамара Грос, Рэня Белавус, сярпамі жалі жыта,вязалі ў снапы і складвалі ў дзесяткі.

Больш нізкія зернавыя, такія як авёс, бацька касіў касою. Прыемна было бачыць, як роўна, быццам стужка, ляжаць на полі сцяблы аўсу. Мы з Ігарам падбіралі скошаныя сцяблы, вязалі іх у снапы і ставілі для сушкі ў дзясяткі. Калі з палёў убіраліся ўсе культуры, мы, зграбалі і падбіралі астатнія каласкі. Гэта быў закон земляроба: каб ні адно зярнятка не прапала. Хлеб - гэта святое.

Цяжкая праца хлебароба. Бывалі дні што надвор'е не радавала, але прырода заўсёды падкажа выйсце. Толькі трэба быць уважлівым да яе. Бацька не раз звяртаўся да народных прыкмет. Напрыклад, надвор'е стаіць добрае, а ён кажа: "Трэба ехаць на поле і звозіць сухія снапы ў гумно, бо хутка пойдзе дождж". "Вецер дзьме густы, моцна шумяць дрэвы". І сапраўды - ноччу дождж пайшоў…У такія пераддажджлівыя дні мы стараліся і адпраўляліся ў поле па снапы. Звозілі возам у гумно і складвалі ў тарпякі.

Пры гаспадаранні аднаасобнікам мой бацька восенню аж да зімы праводзіў малацьбу збажыны. Падросшых Ігара і мяне прывучылі паганяць пугамі двух коней, запрэжаных у дышлі да прывада і па коле круцілі манеж, які праз доўгі жалезны вал (трансмісію) круціў малатарню.







У гумне мужчыны з тарпоў бралі жытнія снапы і запускалі ў гарлавіну малатарні.

Ішоў шумны, гулкі абмалот, збажына ссыпалася з мякінаю, і іх адсоўвалі ў бок, у кучу.

Тут жа ў гумне абмалочаную салому складзіравалі ў стог, а збожжа ачышчалі на арфе. Былі цэлыя дні, калі мужчыны круцілі ўручную арфу, вычышчалася зерне некалькі сартамі і засыпалася ў мяшкі, а мякіну заносілі ў хлеў для жывёлы.

Вось гэтыя на фатакартцы нашыя гаспадарчыя агрэгаты: конны манеж у разобраным стане, малатарня, арфа будуць экспанатамі "Музея рарытэтнай тэхнікі і сялянскага быту".



Збожавы свіран для захоўвання зерня быў драўляны на высокім падмурку, накрыты кулявой саломай, адрамантавалі да восені, і ўжо ўраджай збажыны па відах размясцілі па засеках.

Вось якія жывыя, магутныя біямагніты былі ў роднай маёй вёсачцы! Памятаю я і той пясок, у якім поўзаў галышом. Загартоўка на ўсё жыццё! Згадваю і мячык з воўны, якім гулялі мы ў лапту на тым гумнішчы, дзе я нарадзіўся ў палукашку…

### З РАСКАЗАЎ МНОГІХ АДНАВЯСКОЎЦАЎ ПРА ВЁСКУ

Вясковая дроздаўская хата пачыналася з сенцаў. Пасля сенцаў праз парог пачыналася жыллё: кухня, спальня, камора. У кухні справа ці злева стаяла вялікая хлебная печ, з процілеглага боку невялікі столік для перакусу. За печчу была асноўная частка жылля, якая ў некаторых дамах аддзялялася невялікай перагародкай, у іншых абыходзіліся без яе. Каля паўночнай сцяны, дзе не было вокнаў, стаялі ложкі, ля печкавай сценкі - палок, лавы. Вокны звычайна размяшчаліся з двух бакоў дома. У нашай, Ванюшкавай, хаце з перагародкай у кухні, было адно паўночнае акно з відам на Пазнякоў.

Уздоўж сцен паміж вокнамі стаялі лавы ў асноўным дубовыя ці кляновыя. Пад столлю на сцяне, ад вугла да дзвярэй, размяшчалася паліца, на якую ставілі гарлачыкі, слоікі, карцы…

Было ў хаце і святое месца, якое нашы продкі называлі покуць, або чырвоны кут. Тут віселі абразы - іконы, абцянутыя вышытымі ручнікамі.

А якая ж хата без казачна-дзівоснага куфра? Там у мамы-гаспадыні былі рэчы ад вясельнага пасагу, ручнікі, кашулі, абрусы, фіранкі.

Ложкі былі драўляныя, папярок выкладзеныя дошкамі. На гэтыя дошкі рассцілалі кулявую жытнюю салому, яе накрывалі зрэбнай ільняной дзяружкай і на такім сянніку спалі. У цёплы час такой жа дзяругай накрываліся, а ў халоднае - "коўдрай". Гэта дзве пашытыя ўручную дзяружкі, запоўненыя ільняной кудзеляй. Для тых, хто спаў на палку і лаўках, таксама сшывалі дзяружкі і запаўнялі мяккай саломай або сенам і называлі цэннікам. У асаблівых выпадках салому перыядычна мянялі. У драўляных ложках, у шчылінах сцен вадзіліся насякомыя: блохі былі амаль у кожнай вясковай хаце, былі і ў нашай.

Хатняя драўлянае начынне было ў большасці добрых гаспадароў: вялікія і малыя бочкі для капусты, агуркоў, куфэркі для сала і мяса, нейкія кублы з вечкам, хлебныя дзежкі, даёнкі, кадушкі для вады, карыты, драўляныя лыжкі, пранікі для качання адзення. Сваё месца займала і маслабойка, у ёй білі масла.



***На фота: экспанаты былога музея "Зямля і людзі"***

Балеі і начоўкі выкарыстоўваліся для мыцця адзення і людзей. У каго мала было мыла, то драўняны попел (паташ) залівалі гарачай вадой і нейкі час настойвалі. Затым настой злівалі і вопратку замочвалі ў балеі, а мылі ў начоўках, а жанчыны мылі галовы. Мужчыны і дзеці самі мыліся ў бочках ці ў балеях. Добра было асабліва летам. Балею выносілі на двор, вада награвалася ад сонца, і можна было плёскацца ў задавальненне. У нядзельныя дні некаторыя мужчыны і хлопцы хадзілі купацца на рэчку Дзітва каля Лупеніцы.

Жыхары вёскі Дроздава любілі працаваць і дзяцей сваіх таксама прывучалі да працы. Кожнае дзіця было занята справай, зыходзячы з яго ўзросту і сілаў. У некаторых сем'ях мужчын не засталося, па-гэтаму ўсё лягло на плечы жанчын і дзіцячыя рукі. Дзеці разам з дарослымі хадзілі ў поле, саджалі бульбу "пад матыку" палолі лён, грады ў агародах, пасвілі хатнюю жывёлу: кароў, авечак, а самыя меншыя - курэй.

Да канца жніва рвалі, сушылі, малацілі лён, каб паспець разасланць яго на вылежку пад жнівеньскія росы. Падбіралі яго дзесьці да канца верасня.

Самы прыемны і радасны для нас, дзятвы, быў перадапошні і апошні дзень копкі картафлянішча - палілі вогнішчы, а ў пяску пад вогнішчам пяклі бульбу. Выграбалі печаныя бульбіны з пяску шумна, весела елі такое смакоцце - наш ласунак.

Праца селяніна падобна на канвеер - усё мае сваю чаргу. Пасля завяршэння работ у полі дзеянне пераносілася ў памяшканні.

У сем'ях, дзе былі дарослыя мужчыны і падлеткі,

праца кіпела ў гумнах на таках: у большасці вяскоўцы малацілі збожжа цапамі, уручную веялі зерне. У сем'ях, дзе мужчын не было, гэтую цяжкую працу выконвалі жанчыны і іхнія падлеткі.

У другой палове верасня пачыналі падборку ільняной трасты, і працягвалася гэтая праца і ў кастрычніку. Затым лён сушылі, хто, як хто здолеў. Сушылка ў вёсцы была адна ў Юстыновых. Для сушкі лёну ёю карысталіся суседзі, блізкія сваякі . Астатнія няпроста, але спраўляліся - сушылі на сваёй печы, ля сцен уздоўж печы, на прыпечку.

Затым лён церлі на церніцы, трапалі плоскай драўлянай трапашкай, затым вычэсвалі металічнымі шчоткамі аж да кудзелі. Вычасаны лён пераліваў сізашэрым колерам - знак вышэйшай якасці. Ён ішоў на пражу, з якой ткалі палатно для ніжняй бялізны, ручнікі, абрусы, святочныя дзяружкі. А кудзеля першага гатунку ішло на пражу для паўсядзённых дзяружак, верхніх спадніц. З кудзелі ніжэйшага гатунку ткалі мешкавіну. Некандыцыйнае валакно ішло для розных гаспадарчых патрэб: рабілі путы, вяроўкі, уцяплялі вокны, шчыліны ў сценах і г. д.

Зіма. Жанчыны прадуць лён, воўну, робяць пруткамі. Мужчыны вядуць рамонт барон, плугоў, колаў і іншай збруі. Як толькі пасвятлела, павялічыўся дзеньжанчыны ладзяць кросны, каб зімовую пражу ператварыць у тканіну. Ходзяць адна да адной, раяцца, дапамагаюць адна адной перабіраць і заводзіць ніты. Галоўная знясільвальная праца кроснамі выткаць з ільняных нітак палатно. Вытканае льняное палатно разразалі на доўгія адрэзкі і папярэдне замачыўшы ў вадзе, высцілалі на траву на гумнішчах, ці аселіцы для адбельвання. Была цікавая карціна, чые гумнішчы з вуліцы ці дарогі прагляdaліся: белыя палоскі палатна чаргаваліся з зялёнымі палоскамі травы.

Гэта працягвалася да таго часу, пакуль гаспадыня не вырашала што палатно выбелілася. Потым, высушыўшы і выкачаўшы, яго выкарыстоўвалі для сподняй бялізны, на ручнікі, абрусы, дзяружкі для паўсядзённага карыстання.

Перш, чым ткаць з ўзорамі - ніткі фарбавалі натуральнымі фарбамі.

З авечых ваўняных нітак ткалі на кроснах святочныя дзяружкі з прыгожымі рознакаляровымі ўзорамі, а з ваўнянай тканіны шылі верхняе адзення.



Для дзяцей знаходзіцца таксама праца. Размотвалі скруткі нітак у клубкі, з клубкоў сукалі цэўкі…

Штодзённае адзенне было ў асноўным даматканае: звычайныя спадніцы, розныя камізэлькі, пінжакі і касцюмы мужчыны насілі з вытканай прыгожай ваўнянай тканіны, шылі з яе і паліто.

Мужчыны і жанчыны зімой насілі кажухі, пашытыя з аўчыны. У некаторых былі буркі або бурносы з капюшонамі, пашытыя з нейкай шчыльнай таўставатай ваўнянай тканіны. Апраналіся ў халоднае дажджлівае надвор'е. Гэта адзенне бераглі. Апраналі ў далёкую дарогу, у госці і далей.

Вязалі з ільняных нітак карункі для бялізны, ручнікоў, абрусаў, падушак, летнія блюзачкі, а з ваўняных нітак - свэтры, спадніцы, сукенкі, панчохі, шкарпэткі, рукавіцы, хусткі. У некаторых трохі было і фабрычнага святочнага адзення.

У гады адзінаячнікаў драздоўскія сем'і ў большасці не галадалі - толькі некалькі сем'яў. Мяса елі ў розным выглядзе практычна круглы год, выключаючы пасты. Улетку акрамя малочных прадуктаў, часам кавалачак сала, каўбаскі, паляндвічкі, асабліва гэтая ежа была неабходная тым, хто выконваў цяжкую працу. Мяса было не толькі свіное. У многіх сялян былі авечкі, увосень іх рэзалі, і таксама цяляты ішлі пад нож на смачнае мяса. На сале пяклі курыныя яйкі, з яек, малака, мукі яечню - амлет. Ва ўсе поры года па раніцах пяклі бліны. З вечара цёртую бульбу ставілі ў цёплае месца для закваскі, раніцай сыпалі ячменную або грэцкую муку, пяклі ў печы. У зімовы час бліны мазалі, у асноўным, здорам (унутраны свіны тлушч), а ў каго былі авечкі - лоем (авечы тлушч), шмальцам (гусіны тлушч). У малочны перыяд елі з маслам, смятанай або з памачушкай (вымешаны тварог, смятана, малако). Улетку елі шмат агуркоў жыўцом, зялёнай цыбулі, морквы. Бліжэй да восені - бручкі. Некаторыя саджалі рэпу, значыць, елі і яе. У гарачую пару любілі піць маслёнку. Памідоры з'явіліся ў некаторых вяскоўцаў адзінкавымі экзэмплярамі дзесці да сярэдзіны 40-х гадоў. З пачатку восені ў яду дадаваўся гарбуз. Варылі з гарбуза малочныя супы і кашы. Семачкі сушылі і хавалі да зімовых святаў, як ласунак.

**Па дадзеных гаспадарчай кнігі Ганчарскага сельсавета за 1948 год вяскоўцы-адзіналічнікі запісаны па нумарах:**

**Першымі** з боку Ліды ў пачатку вёскі з левага боку вуліцы жылі засяліўшыяся "Талкі" з гаспадаром Махначом Міхаілам Аляксандравічам - 1895 г.н., жонка Соф'я Фёдараўна - 1896 г.н., сын Мікалай - 1936 г.н.+ жонка Надзя, Валянціна - 1943 г.н., Ганна выйшла замуж у Баравічы за Грыня.

Міхась, прышоўшы ў прымы з Дакудава пабудаваў у1948 годзе новую драўляную хату, а хлеў і адрына былі з1923 года.

Мелі зямлі 6 га, ворыва - 4 га, ніжэй ад пабудовы на аселіцы - 2 га выгану. Актыўна вялі гаспадарку.

Запісаны: плуг, барана, воз, сані, сячкарня. Трымалі кабылу, карову, цялё, двое свіней і трое авечак.

**№ 2.** Дзявятая Ганна Казіміраўна (Манька Драпячыха) - 1874 г.н., нягграматная. Муж Андрэй памёр рана. Час ішоў, старэлі людзі, старэла хата. На правым баку вуліцы, каля самай шашы ў курнай хаце 1880 года, з адным акном, каля старой глінянай печы драўляны стол і зэдлікі. Жылі бедна, не мелі за што жыць. Зямлі мала - 1,86 га, а ворыва толькі 30 сотак і трымалі толькі адну кароўку ў дашчатым паднавесе.



Аднекуль за польскім часам да дочкі Марыі Андрэеўны - 1897 г.н. прыбіўся зяць Ватава Гераім Іосіфавіч - 1904 г.н. Размаўляў па-польску, крыху дапамагаў гаспадарыць. З пачаткам германа-польскай вайны прызвалі і быў у Арміі Андэрса. Ваявалі праз Іран у Італіі і Афрыцы. Вярнуўшыся пасля вайны крыху працаваў сцэпшчыкам на чыгунцы, але за тое, што быў харужым у Арміі Краёвай, арыштавалі і вывезлі ў Калугу. Сын Валяр'ян Гераімавіч - 1929 г.н. пасля вайны быў з белапалякамі. Калі забілі Дзімку Міся (Альжбецінага ўнука) разам з Кубарчыкамі, Валера быў арыштаваны, і яго з маці Марыяй вывезлі.



Засталіся галадуючыя дзеці Ватава Іра - 1940 г.н., Жора - 1942 г.н. Каб штосці мець для яды працавалі ў аднавяскоўцаў. Аднойчы і я -Віця - з імі збіраў на полі ў вёдры каласкі жыта… Зерне потым малолі на жорнах і з мукі пяклі хлеб, патрэбны для яды.

Бабуля іхняя - Ганна Казіміраўна - памерла 20 лістапада 1948 года.

**№ 3.** Козелы ("Кубарчыкавы"). Жылі на краі вёскі ў старэнькай з 1884 года хатцы, і быў яшчэ хлявушок. Бедна жылі: трымалі толькі каня і кароўку. Запісана: зямлі - 1,70 га., ворыва толькі - 13 сотак, астатняе-сенажаць, выган, кустарнікі, няўдобіца.



Пасля Першай Сусветнай вайны Козел Міхаіл прывёз з Расіі, дзе былі у бежанцах, жонку Пелагею Антонаўну і памёр рана, а яе забілі акаўцы.

Сын Козел Віктар Міхайлавіч - 1923 г.н. Зяць суседкі "Драпячыхі" Гераім зацягнуў яго ў "белыя" партызаны, але пасля вызвалення раёна прызвалі на фронт. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі, прыгожы Кубарчык ажаніўся з Нінай Жамойцінай, але не жылі - разышліся, пераехаў на радзіму маці ў Расею. Сюды не прыязджаў, баяўся, бо была прычына - гібель Альжбецінага ўнука …

Яго брат Мікалай -1929 г.н.- таксама чымсьці папамагаў акаўцам. Пасля вайны быў у зняволенні і там памёр ад туберкулёзу.

Самы малодшы брат Юзюк - 1938 г.н. - пасля вайны пераехаў да сваякоў маці Палагеі.

Застаўшыйся адзінокім Уладзімір Міхайлавіч 1932 г.н. ажаніўся і ўзяў Машу - расейскую бежанку. Яе сястра Анюта таксама выйшла замуж за Іосіфа Кудлу (Унучкава) - была бездзетная, але добра працавала на гаспадарцы на хутары за шашой.

**№ 4.** Козел Юлія Міхайлаўна -1887 г.н. (Юлька), хата з 1925 года ў вёсцы перад Махначыхай Лізай. Зямлі мелі толькі 1,51 га, ворыва - 50 сотак, на аселіцы сенажаць - 50 і выган - 30. Трымала мерына, жарабё, карову і свінку. Сын, Іван Мікалаевіч -1921г.н. - быў жанаты з Надзяй Кудлай (Кастусёвай) - 1915 г.н., іхняй дочцы Марыі быў адзін годзік і памерла 6.07.46 г., а праз 20 дзён ад туберкулёзу і бацька Ваня адышоў з жыцця.

Роднага брата Юлькі - Говара Лёню з Масявічаў - расстралялі белапалякі. Брат Міхаіл працаваў ў горадзе шафёрам на палутарцы,часта заязджаў, і з жыўшым у сястры расіянінам бежанцам Бурдзеем Ваням працавалі на гаспадарцы.

**№ 5.** Махнач Елізавета Мартынаўна ("Трусы") - 1892 г.н., у вёсцы старыя пабудовы з пачатку веку. Зямлі было 6,80 га, ворыва - 3,80, сенажаці - 1,39, няўдобіцы- 0,44, палявая дарога - 0,28.

Муж Павел Міхайлавіч - 1892 г.н. У гады вайны вяскоўцам многа балбатаў, хваліў немцаў за парадак,

што гаспадарства добрае, а пры першых Саветах было ерунда. Пасля вызвалення раёна, з прыходам улады быў ў жніўні1944 года арыштаваны, і памёр у турме.

Дочкі: Ганна - 1931 г.н., Вольга - 1933 г.н., Вера-1938 г.н., Міхаіл -1935 г.н. добра працавалі на гаспадарцы. Трымалі мерына, карову, цялушку, свіней і авечак.

Збіраліся ў Махначоў на малалікія вячоркі. Засталіся ў вёсцы ў асноўным дзяўчаты, бо хтосьці з маладых хлапцоў загінуў, жывыя пайшлі на фронт ваяваць.

**№ 6.** Шут Канстанцін Сямёнавіч - 1915 г.н. На фатакартцы з сынам Лёням - 1943 г.н.



У "Лідскім летапісцы" № 107 апісана, як 25 чэрвеня 1944 года забілі акаўцы родных Шута Косці - бацьку Сямёна, маці Ганну і першую жонку, Зою, якая нарадзіла ў 1940 годзе дачку Ніну, а сына Лёню ў 1943 годзе. З нашым Ігарам, сумесна па сяброўску, Ніна хадзіла вучыцца ў школу.

Другая жонка Марыя Лявонцьеўна -1916 г.н. ("Кочманіха") нарадзіла дачку Тамару - 1947 г.н. Мелі хату з хлявом і адрынаю 1890 года, зямлі - 6,69 га, ворыва - 5,61 га, на аселіцы выган - каля гектара.

**№ 7.** Кахаоўскі Міхаіл Феліксавіч - 1882 г.н., католік у прымах з вёскі Гарні да дроздаўскай жонкі - Шут Соф'і Аляксандраўны - 1899 г.н.

У гаспадарцы хата1924 года, хлеў і гумно 1900 г. Зямлі - 4 га, ворыва - 2,48 га, сенажаць - 1,16 га. Каровы - 2, цялё, свінчо і авечкі.

Займаючыся ўсёй сям'ёю актыўным вядзеннем гаспадаркі, бацькі многа працавалі і падросшых дзяцей сваіх таксама прывучалі да працы. Дзеці разам з дарослымі хадзілі ў поле: палолі бульбу, лён, градкі ў агародах, пасвілі свойскую жывёлу: кароў, авечак, а самыя меншыя - курэй.

Захавалася плацёжнае паведамленне Кахаоўскаму Міхаілу Феліксавічу аб высокім на той час, гра-



Народный Комиссариат Финансов СССР

Райфинотдел Лидском Форма № 6-а

АССР, край, область Гродненская

Сельсовет Гончары дер. Дроздова

Платёжное извещение № 6929

Гр-ну Кохановски Михаил Ф. (фамилия, имя и отчество)

На основании Указа Президиума Верховного Совета СССР от 29 декабря 1941 г. „О военном налоге" Вы и члены Вашего хозяйства, достигшие 18 лет, обязаны уплатить военный налог в размерах и в сроки, указанные на обороте извещения.

Бл аб 1801-10. ЛТ УП-1. Зак. № 5299



| Фамилия, имя и отчество каждого плательщика | Причитается к уплате военного налога | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Оклада 194 г. | | | | Кроме того | |
| | Всего | В том числе по срокам уплаты | | | Недоимка прошл. года | Пеня на недоимку прошл. г. |
| | | 15/III | 15/IV | 15/VI | | |
| Кохановски Мих. Ф. | 210 | 70 | 70 | 70 | | |

За просрочку платежа взимается пеня в размере 0,2 процента за каждый день просрочки

Старший налоговый инспектор

(м. п.) Налоговый агент

Платёжное извещение вручил ——— 194 г. ——— (подпись)

ОТМЕТКИ О СЛОЖЕНИИ НАЛОГА

| Фамилия, имя и отчество плательщика | Дата и № извещения райфо о сложении | Сложенная сумма | Подпись налогового агента |
|---|---|---|---|
| | | | |

Налог вносится налоговому агенту рай(гор)финотдела.

Жалоба на неправильное обложение подается заведующему рай(гор)финотделом не позднее месячного срока со дня вручения платёжного извещения.

Подача жалобы не приостанавливает взыскания налога.

шовым падатку - 210 рублёў.

Дочка, Ражнова Ядвіга Міхайлаўна, перадала для гісторыі, знайшоўшы ў сваякоў, гэтую фатаграфію 1929 года.



***Бацька Міхаіл Феліксавіч трымае на руках дачку Рэню - 15.08.27 г.н., маці Соф'я на каленях трымае нарадзіўшуюся Лёдзю - 27.02.29 г.н., стаіць сын Бронак - 16.01.26 г.н., а каля сцяны старой хаты - маці Соф'і - Шут Ганна.***

**Ядвіга Міхайлаўна напісала:**

*"Пасля выгнання немцаў з Лідчыны, 8 ці 9 ліпеня сябры з маім братам Браніславам пілі, закусвалі, галдзелі. Штосьці абмяркоўвалі. Радасці і шчасцю не было канца. Моладзь пачала ажываць. Збіраліся на "вячоркі": пралі, вязалі, разматвалі ніткі і г.д. На жаль, колькасць "вечэрнікаў" была невялікай.*

*Многа дроздаўцаў прызвалі на фронт. Шут Генадзь быў абраны сакратаром Лідскага гаркама камсамолу, а праз пару дзён - 12 ліпеня 44 года загінуў.*

*Наша сям'я не бедавала, хоць зямлі было мала. Бацька, Міхаіл Феліксавіч, быў таленавітым краўцом. У яго былі свае пастаянныя кліенты, сем'і, якіх ён абшываў. Усе яны былі ў сяброўскіх адносінах з татам. Плацілі за працу натурай: збожжам, мукой. Апошнія гады здароўе бацькі не дазваляла яму шмат працаваць, і кола кліентаў стала кароткім. Асобныя засталіся верныя і часта наведвалі нас. Сярод іх - бліжэйшы сябар таты Шут Сяргей (Баравы). Ён жыў у бары над Нёманам і пачаў настаўнічаць у вёсцы Агароднікі. Яго прыезду мы чакалі. Ён прывозіў свежую рачную рыбу, мёд і іншыя прысмакі для дзяцей. Паступова моладзь пачала ажываць. Збіраліся на "вячоркі": пралі, вязалі…. Часцей збіраліся ў нас, паколькі былі падрошшыя дзве сястры: Рэня і Лёдзя, і па вячарах - добрыя лямпы.*

*Брат Бронак быў знаходлівым, цікавым падлеткам. Пра гэта сведчыць той факт, што да яго цягнуліся не толькі яго аднагодкі, але і хлопцы старэйшыя*



***Грынь Гена, Кудла Жэня і сядзіць Вася Дзяваты (Хведараў)***

*за яго. Наш дом быў поўны моладзі. Па вечарах прыходзілі дзяды і дзядзькі, якім ён чытаў услых, а па нядзелях дом запаўняла моладзь. Сярод іх: Жэня Кудла (Юстынаў) Юзік Шут (Мікалайка) Вася Максімовіч, Ваня Козёл (Міхалюкоў), Ваня Козёл (Агацін), Віця Шут (Мацалок), Віця Козел (Кубарчык) і іншыя - усе старэйшыя за Браніслава.*



***Стаяць Каханоўскія Лёдзя і Ядзя, і сядзяць Якіменкі Фрузя і Маруся, Зінкевіч Юзя з Кабыльнікаў***

*Тады былі вясёлыя вячоркі: гулялі ў карты проста на выйгрыш, без грошай, у "дурня", "падкіднога". Былі дзве шашачныя дошкі і гулялі ў шашкі. Адны гулялі, іншыя "хварэлі", затым - наадварот. Было шумна, весела, шмат жартавалі. Бацька заўсёды заставаўся дома і прымаў актыўны ўдзел у гэтых гутарках. Мне ўсё гэта было вельмі цікава.*

*Калі не атрымлівалася збірацца ў нас, збіраліся гэтай кампаніяй у Вані Агацінага (у маці была прасторная хата з земляной падлогай). Здараліся застоллі, але рэдка.*

*Да старэйшай сястры Рэні прыходзілі сяброўкі: Вера Дзяватая (Салаткава), Маруся Кудла (Юльчыкава), Маня Козел (Міхалюкова), Ніна Шут (Зянонава). Зрэдку прыходзіла з Жучкоў Ванда Жучкевіч (будучая жонка Сені Шута). Дзяўчаты ў хаце доўга не заседжваліся, ішлі на вуліцу, садзіліся на што прыйдзецца і хораша спявалі.*

*Былі ў яе яшчэ шчырыя сяброўкі, якія прыходзілі да яе не толькі ў святы, нядзелі, але і ў будні вечара,*

*калі выдавалася свабодная хвіліна.*

*Успамінаецца як летам, на ўзыходзе сонца, будзіла мама: "Уставай, пара каровы выганяць! Вунь, (пералічвае імёны ці мянушкі), ужо пагналі". А спаць так хацелася. У нашай гаспадарцы былі цяжкасці з пашай. Блізка была "Аселіца" - балота, метраў так 200 ад хаты, але з гэтай адлегласці ўсяго метраў 30-40, але такой багны, што каровы завязалі па самы жывот, гнаць туды іх было небяспечна. Прыходзілася гнаць іх у акружную - праз вёску і г.д. Гэта ўжо былі кіламетры. Па-гэтаму пасвілі, дзе прыйдзецца. Амаль да першага снегу пасвілі з босымі нагамі. Ногі былі сінія. Чакаеш каровінай ляпёшкі - тады рай, станеш у яе - цёпла. Затым чакаеш мачы. Падсоўваеш ногі пад струмень - і цёпла, і ногі чыстыя.*

*Мы, пастушкі, чакалі вясенняй і асенняй пары, калі пасвілі жывёлу цэлы дзень. Тады яе гналі за Дзітву - там была агульная паша. Там мы былі свабодныя. Кожны знаходзіў занятак па душы. Хлопцы рэзалі дубцы, дралі карані і з гэтага плялі кошыкі. Гулялі ў карты, дзяўчаты ў асноўным гулялі ў каменьчыкі, а некаторыя з хлопцамі ў карты. Я чытала. Кнігі заўсёды былі са мной. Палілі кастры, пяклі бульбу, сала на дубчыках. У гэтай калектыўнай справе завязвалася цесная дружба паміж намі. Узрост наш быў у той час ад 8 да 14 гадоў. Назаву некалькі імён: Маня Шут, Ліда Данэйка, Зіна Грынь, Лёдзя Дзікевіч, Міша Кудла (утапіўся ў Дзітве), Коля Курыла, бежанкі Тамара і Жэня (жылі ў Пазняка І. і Ашмяны), Косця Жамойцін і я.*

*У вольны час збіраліся кампаніямі. Любімая наша гульня была лапта.*

*Мама і старэйшая сястра Ірына ў летне-восеньскі перыяд хадзілі ў заробкі - палолі, рвалі лён і г.д. Часам сястра выяўляла недапушчальную рашучасць. Яе густыя доўгія валасы нялёгка было прамыць. Цяжка было даглядаць такімі валасы.Тады не было шампуняў, і галоўным мыйным сродкам быў настой попелу - луг. Гэтак попел залівалі вадой, і нейкі час ён настойваўся. Аднойчы вярнулася ад сяброўак, трымаючы ў руках свае косы. Дома быў сапраўдны перапалох, але яна ўсё выстаяла. Ёй тады было гадоў дзевятнаццаць.*

*Бацька , Міхаіл Феліксавіч пасля доўгай хваробы памёр 8.05.48 г. Усёй сям'ёй, сваякамі і суседзямі пахавалі на магілках вёскі Агароднікі, каля васькаўскага касцёла, які ў вайну разбамбілі".*

**№ 8.** Кудла Іван Іванавіч (Ванюшкавы) - 1908 г.н.

МаціАляксандра Вікенцьеўна - 1882 г.н., жонка Вера - 1920 г.н. Сыны: Ігар - 14.10.1939 г.н., Віктар - 17.10.1941 г.н., Жэнечка - 20.12.1948 г.н., жыў да 25.12.49 г. Хата з ранейшага зруба зроблена ў1920 годзе, хлеў старэнькі і адрына, гумно, свіран. Мелі плуг, бораны, малатарню, манеж, веялку, сячкарню, воз, калёсы, сані, саначкі.

Мелі зямлі 15,40 га, ворыва - 10 га, сенажаці -1,53 га, выган - 2,56 га, агарод -1,05 га, няўдобіцы - 0,20 га.

Сеялі: жыта - 1,75 га, лубін - 1 га, лён - 2 га, пшаніца - 25 сотак, ячмень - 10 сотак, авёс - 40 сотак, грэчка -10 сотак, горох - 10 сотак, пялюшка - 20 сотак, бульбы -50 сотак, канюшыны - 20 сотак, гарод - 4 соткі.

Мелі: 2 кабылы, 2 каровы, 2 цялушкі, 2 свінні, 7 авечак.

Радыё з навушкінамі было ў таты Вані.

Аселіца. Балотца. Бацька ў шапцы прыносіў качыныя яйкі.

Першае маё знаёмства са школьнай прыладай: хімічны аловак мачыў у губах і на картонцы выводзіў: "КУДА", што значыць: "Кудла". Ад бацькі вучыўся маляваць дрэвы, кветкі, сонца, воблакі… Па вечарах, распакаваўшыся на цёплай печы, бацька і бабуля расказвалі нам байкі, казкі. Старэйшы брат Ігарчык пры лучыне рыхтаваў урокі, чытаў вершы, апавяданні. У спальным пакоі склалі для абагэву кафельную печку. На ўсё жыццё запомніўся саладкаваты пах смалы і дыму ад лучыны, якой асвятлялася хата зімовымі вечарамі. Потым больш здатнымі для асвятлення ў хаце былі газавыя лямпы. Праўда з газай не заўсёды быў дастатак. Прыходзілася хадзіць да суседзяў, каб пазычыць хоць на вышыню пачка ад запалак у бутэльку газы.

У працоўных буднях падыходзіла восень 1948 года. У сям'і рыхтаваліся да радаснай падзеі - нара-



джэння трэцяга сыночка. У сувязі з гэтым першая школьная мая падрыхтоўка прайшла на хутары Праважа з восені, бо цяжарная мама не хацела, каб халадамі і снежнымі днямі я дабіраўся дзве вярсты ў Жучкі і вырашыла адвесці на радзіму.

Там у бабулькі Еўкі на шырокім хатнім зале быў першы клас школы, а іншыя класы ў Латушкаў.

Я апынуўся ў акружэнні вясковых хлопчыкаў. Сядзелі на партах па дваіх, дзяўчынак было толькі дзве. З Асіповічаў прыслалі Соф'ю Дзмітрыеўну Рабцаву і яна - добрая настаўніца - расказла аб школьнай абстаноўцы, вяла ўрокі па раскладзе. У зімовыя дні, будучы ў бабулі, я і Ігар вучыліся тут. Падручнікаў, сшыткаў не было, былі рады любому шматку паперы. Чарніла не было, яго рабілі з чырвоных буракоў, але такое чарніла прыдатнае было толькі адзін дзень, потым - закісала. На наступны дзень рабілі новае чарніла. Падручнікі былі толькі ў настаўніцы.

Добра памятаю як выводзілі літары ў сшытку ў



***На фатакартцы 80-ых гадоў захаваўшаяся хата Белавус Еўкі з прыбудаванай конскай стайняю, свіным хлявом, аўчарняю і курнікам***

касую лінейку ручкай з пяром, мачаючы у бутэлечку з чарнілам. Ручку рабілі з драўлянай палачкі прывязвалі пяро ніткаю. Для сшыткаў лісты наразалі з мяшочнай паперы. У школьную праграму ўвайшло вывучэнне Закона Божага, якое раз у нядзелю праводзіў сабакінскі святар.



***Бабуля Еўка Белавус і ўнучка Соня***

Там з бабуляй жыла і цёця Надзя (Кур'ян) з дочкай Соняю ад сына Дмітрыя Белавуса загінуўшага 22.09.38 г.

Пад самы Новы год, 20.12.1948 года, нарадзіўся трэці сыночак.

На падтрымку родаў прыходзіла вясковая "акушэрка-павітуха" Агата. Нараджэнне хлопчыка лічылася шчасцем і Божым дабраслаўленнем.



***Мама Верка і Агата Козел***



Праз тыдзень яго паспяша-ліся ахрысціць, і для гэтага абавязкова бацькі з хрышчонымі: Рэняй Белавус, Сяргеем Германовічам завязлі ў Ганчарскую царкву і бацюшка здзейсніў над імсакрамант хрышчэння і даў імя Яўген…

Праляцелі дні і непрыкмерна навучальны год закончыўся і бацька прыехаўшы падводаю падзякаваў настаўніцы і бабульцы і мяне адвёз да хаты, і з верасня 1949 года я пайшоў у Жучкі ў другі клас.

Амаль да года ма-ма карміла малога з грудзей сваім малаком, а ў гаршчочку варыла манную кашу і лыжачкай давала ў роцік.

Ахвотна наядаўся сыночак, не песцілі, стаў падрослым і сытым і набіраўся сіл. Падняўся на ногі, стаў цвёрда хадзіць і талкова ўсё разумець.У спальні малыш ляжаў накрыты дзяружкай у калысцы, што вісела падвязаная да бэлькі. Над ёй маці часта спявала свайму дзіцяці калыханкі, потым, падросшы, ён ляжаў у качалцы. Мы з Ігарам з ім забаўляліся, бо ён ужо размаўляў, тупаў па падлозе… Роўна праз год нечым захварэў, паднялася тэмпература, бацька адвёз ў Ліду, і яго з мамай палажылі ў бальніцу. І літаральна праз пару дзён маці вярнулася адна і плачучы расказала, што сыночку фельчарыха-дурачыха дала ўкол, ды так, што Женечка адразу памёр 25.12.49 года.

Мы заплакалі, бо не стала роднага малодшага браціка. У царкве бацюшка адпяваў. Пахавалі ў маленькай труне каля магілкі дзядулі Івана Зыдаравіча.



14 кастрычніка, на Пакровы ("Пакроў Прасвятой Багародзіцы") у ганчарскую царкву прыязджала шмат бацюшак, збіралася шмат народу з бліжэйшых і далёкіх вёсак, збіралася і моладзь. Каля царквы гандлявалі марожаным, баранкамі, булачкамі, півам і іншымі смакоццямі. Дзецям больш за ўсё падабалася марожанае (лёды). Прыезджыя пасля заканчэння службы ў царкве разыходзіліся па сваяках, знаёмых у госці.

Мясцовая моладзь наймала музыкаў, арганізоўвала танцы, на якія запрашалі хлопцаў і дзяўчат і з іншых вёсак.



***Каля царквы цёця Надзя Кулеш (старэйшая сястра мамы) з дочкаю Рэняю і мамачка Верка. Сыны Ігар і Віця падстрыжаныя на гала "пад Катоўскага" ў школьнай форме на шэсць гузікаў, пашытай мамай з картовага палатна.Старэйшы Ігарок ў новых камашах, а боты перайшлі мне - малодшаму Віцьку***

З малых годоў мы з братам Ігарам мелі абавязак палоць гарод і бульбянішча, набраць зелля для свіней, адпасвіць калейку кароў і авечак.

Копку бульбы пачыналі з пачатку верасня. І ў залежнасці ад надвор'я капалі доўга, каля месяца. Былі палеткі на полі, там з раніцы канём і плугам выворвалі барозны, а затым, разграбаючы зямлю рукамі, а сям-там і матыкай, паўзком на каленях выбіралі бульбу рукамі ў кошыкі.

Гонар і слава грэчцы за добрую дапамогу. Бацька дагаварыўся з Курылам Сяргеем пасеяць на яго пясчаным полі грэчкі. Апрацавалі суперпясчаную зямліцу запрэжаным конікам з ворчыкам, са спружыноўкай і пад канец траўня высеялі ўручную сявенькай насенне.





За летнія дні вырасла грэчка, сцяблы побурэлі, пачалі адліваць цёмна-чырвоным колерамі, і пчолы на кветках збіралі няктар і пыльцу для мёду.

Пад восень тата касою скасіў грэчку, злажыў на воз і прывёз у гумно. Малаціць давялося цэпам, правеялі, і добрай грэчкі выйшла з дзесятак мяшкоў. У каморы амаль увесь год стаяла грэчка, з якой па некалькі разоў рыхтавалі смачную грэцкую кашу. Яшчэ была страва з кіслага тлустага малака, якое ўзбівалі да цягучай масы, у якую засыпалі грэцкую муку, размешвалі і елі. Называлася гэтая страва калбатушка.

**№ 9.** Пазняк Іосіф Аляксандравіч - 1898 г.н. прыйшоў у прымы з Князюкоўцаў да Шут Вольгі Сямёнаўны, якая нарадзіла сына Толю ў 1931 годзе і выхавала, але праз дзясятак гадоў у 1939 г. памерла. Бацька Юзаф узяў у жонкі з Бенявіч Зінаіду Андрэеўну Чырвоную і яна нарадзіла ў 1942 годзе Дзёму.



***Пазнякі: Юзюк, Дзёма, Зіна***

Наш блізкі сусед - дзядзя Юзюк - часта сустракаўся з татам, абмякроўвалі выгадныя правіла вядзення гаспадаркі і пра прыезджага ў вёску яўрэя з гандлем таварамі і прадметамі шырокага ўжытку: соллю, газай, мылам, іголкамі, ніткамі, гузікамі, фарбай для афарбоўкі самаробных ільняных тканін і тканін з воўны і іншай дробяззю. Часта прывозілі акрамя прамысловых вырабаў харчовыя тавары: булачкі з макам, пернікі ў выглядзе фігурак, розных баранкаў, цукеркі-падушачкі, ды іншыя ласункі. Усё гэта вабіла і нас - дзяцей. Куплялі іх і нашы мамачкі звычайна за курыныя яйкі, бо грошай у сялян, як назло, не вадзіліся. Прапаноўвалі яўрэі і паслугі: нава-

стрыць сякеры, нажы да сячкарні, затачыць зубы пілы. Добра яны займаліся і іншымі рамёствамі патрэбнымі сялянам…

**№ 10.** Ашмяна Уладзімір Іванавіч (Якоўчык) - 1908 г.н. (7.12.48 г., роспіс на гаспадарчым лісточку папольску: *Aszmiana*).

Жонка Кудла Ніна Юстынаўна - 1924 г.н.

Дзеці: Ваня -1945 г., Валя - 1947 г., Таня - 1948 г., Гена - 1950 г., Галя - 1955 г.

Хата пабудавана ў 1936 годзе, а пасля вайны яе раздзялілі папалам з братам Ваням.



***Летам 1944 года адбылося вяселле Ашмяны Валодзі і Кудлы Ніны. На фатакарцы: маладыя Ашмяна Валодзя, Ніна Кудла і сваты пад'ехалі на падводзе да царквы вянчацца***



***Сваццяя Быстрыцкая Вера з мужам Косцям, сват Германовіч Сцяпан, дружкі Кахаnоўская Рэня, Кудла (Салькоўская) Валя, Данэйка Ніна, Германовіч Вольга. Дружбанты: Кудла Жэня і два сваякі***

У кнізе запісана: зямлі - 6 га, ворыва - 2,50 га, сенажаці - 1га, выган - 0,30 га, неудобіцы - 2 га.

Мелі кабылу, карову, свінню, авечку.

Сеялі ў 1948 годзе соткамі: жыта - 75, пшаніцы - 8, ячменю - 5, аўсу - 30, грэчкі - 35, пялюшкі - 3, ільну -3, бульбы - 20, гарод - 2, махоркі - 5, лубіну - 35, лубіну зялёнага - 30.

**№ 11.** Ашмяна Іван Іванавіч (Гураль) - 1913 г.н., маці Марыя Нікадзімаўна Грос - 1874 г.н., жылі ў старой хаце і вялі гаспадарку.

Сын Ваня закончыў 4 класы польскай школы ў Ганчарах. Удзельнічаў у спаборніцтве, і 31 жніўня 1937 года яму выдалі спартыўны значок 3 класа першага



ŚWIADECTWO
PAŃSTWOWEJ ODZNAKI SPORTOWEJ
Nr. 925 | rok 1937
strzel. Oszmiana Jan
(nazwisko) (i imię)
UZYSKAŁ PRAWO DO NOSZENIA PAŃSTWOWEJ ODZNAKI SPORTOW[EJ]
KLASY III trzeciej STOPNIA 1 pierwszego, NA PODSTAW[IE]
DECYZJI WOJEWÓDZKIEGO KOMITETU WYCHOWANIA FIZYCZNE[GO]
I PRZYSPOSOBIENIA WOJSKOWEGO W NOWOGRÓDKU
DNIA 31. VIII. 1937 R. L. DZ. 108/37
Z WAŻNOŚCIĄ DO DNIA 31 GRUDNIA 1938 ROKU.
PRZEWODNICZĄCY POWIATOWEGO KOMITETU WYCHOWANIA FIZYCZNEGO I PRZYSPOSOBIENIA WOJSKOWEGO
STAROSTA POWIATOWY
(podpis)
(Tadeusz Mikłoszewski)
(Pieczęć)
Ważne przy jednoczesnem okazaniu dowodu osobistego

ўзроўню на падставе рашэння ваяводскага камітэта фізічных і вайсковых удзельнікаў у Наваградку з правам нашэння…



Ашмяна Ваня быў у Польскім Войску з 1937 года і пасля нападу Германіі на Польшчу ў 1939 годзе трапіў у германскі палон з Кумпяком Юзікам з Жучкоў і Карабачом Мішам з Баравіч. Ваню прымусілі працаваць у германскім горадзе Гумбінен. У апошнія гады вайны ўдалося ўцячы і дабрацца да радзімы.

Пасля вызвалення Лідчыны Ваню прызвалі 4 лютага 1945 года ў Чырвоную Армію.

У баях за Савецкую Радзіму чырвонаармеец 339 дзівізіённай часткі Ашмяна Іван Іванавіч 13 сакавіка



СССР
ВОЕННЫЙ БИЛЕТ
Серия Б № 221901
Фамилия Ошмяна
Имя и отчество Иван Иванович
Год рождения 1913
Личная подпись владельца Ошмяна
Выдан ... военным комиссариатом.
М. П.
(Подпись военкома, фамилия)



IV. Краткие сведения о прохождении службы в кадрах Красной Армии, Военно-Морского флота, пограничных и внутренних войск Министерства внутренних дел
(Указать время прибытия в часть, осн. подразделение, специальность, должностные квалификации и время увольнения в запас)
10. Призв. по моб. ...
4-II-1945 г.
II-1945 г. - XI-1945 г.
146 Зап. ...
Демоб. на основ. Указа ... СССР
... 25.09.45 г. - 22.XI.45



1945 года быў паранены кулямі ў правое сцягно з пашкоджаннем нярвовай тканкі. Быў на лячэнні ў Віленскім ваенным гарнізонным шпіталі да 15 лістапада 1945 года і вярнуўся дахаты. Усе пасляваенныя гады як халасцяк вёў гаспадарку, але з-за ранення мала працаваў, бо застаўся ў ране асколак да канца жыцця...

Хата вельмі часта



Форма № 16 УВВ

СПРАВКА

Дана красноарм. 399 дн частн (воинское звание) (наименование войсковой части)

тов. Осмянову (фамилия)

Ивану Ивановичу (имя) (отчество)

в том, что означенный тов. Осмянов Иван Иванович (фамилия и инициалы)

находится на излечении в Виленском воен. гарнизон. госпит. (наименование медицинского учреждения)

с 16 августа 1945 г. по 22 Ноября 1945 г.

по поводу (писать по-русски) заживш. рана пр. бедра ... пул. ранен. ... тканей. Травматического повреждения ... (подробный диагноз ранения (болезни, травмы и т. д.)

перательралася ў хлеў для ўтрымання жывёлы. Зімой пад печчу ўтрымліваліся куры. На ноч уваходны лаз закрываўся драўлянай загародкай, а днём куры гулялі па хаце. Так у хаце зімавалі куры, авечкі, цяляты. Жыццё ў такіх антысанітарных умовах было вымушаным: неабходна было зберагчы ўсё пагалоўе жывёлы для атрымання грашовага прыбытку, які ішоў на пагашэнне ссуды за зямлю.

**№ 12**. Данейка Міхаіл Лук'янавіч (Лукаш) - 1904 г.н. Хата, хлеў, гумно пабудаваныя бацькам Лук'янам у 1905 годзе паміж забудовамі Ашмяны Вані і Пазняк Ганны. Зямлі - 5,58 га, ворыва - 2,02 га, сенажаці -1,74 га, выгана - 1,34 га, няўдобіцы - 2,4 га. Не меў каня, а толькі карову і цяля. Міхась Данейка любіў радыё слухаць, палітыкай цікавіўся, абмяркоўваў з вяскоўцамі пра зверства акаўцаў да праваслаўных. За гэта белапалякі яго маці Ганну Андрэеўну - 1875 г.н. і жонку Серафіму Міхайлаўну - 1910 г.н. арыштавалі і расстралялі ў Беліцы. Праўда, дачку Лідзію акаўцы адпусцілі, дзяўчынцы было толькі 12 гадкоў, а бацька Міхась схаваўся пад свірнам. Уратаваўся, застаўся жыць, і ўдалося ўцячы і перабрацца праз агародніцкі мост за Нёман ў партызаны, і да вызвалення там удзельнічаў у гаспадарчых работах партызан.

Пасля вызвалення Лідчыны Данейка Міхаіл Лук'янавіч ўзяў у жонку Чэх (Козел) Ніну Міхайлаўну (Міхалюкову) - 1921 г.н. з яе сынам Чэхам Мішам - 1940 г.н.

**Грос Тамара:** *" Я сябравала з Лідзечкай, і яе маці Ганна была харошая і добрая. Нехта наводзіў акаўцам на сям'ю Міхала Данэйкі." У Беліцу завезлі. Там забілі ўсіх і засыпалі у яму. За што?"*



***Злева направа-дочка Лідзія, Верка і Косця Дзявятыя і Чэх Ніна Міхайлаўна***

**№ 13.** Бяляўскі Канстанцін Іосіфавіч (Нюшкін)- 1907 г.н. з Агароднікаў, у прымах у жонкі Ганны Іосіфаўны - 1906 г.н., была бяздзетная, яе сястра - Верка (Андрэіха) Кудла.

У кнізе запісана: Канстанцін не граматны- рабіў роспіс "тры крыжыкі". Зямлі - 5,29 га, ворыва-1,27 га, сенажаці - 1,39 га, выган - 2,57 га. Трымалі каня і карову. На чыгунцы каля палустанка Ганчары з іншымі вяскоўцамі перакладваў пад рэйкамі шпалы.

На вузкім падворку каля Ашмяны Валодзі - старая вузкая хатка і хлеў.

Давялося пад зіму ўцяпляць жыллё-хаціну: абсыпаў падмурак, латаў дзіры ў страсе, абкладваў сцены шыльнікам, сабраным і прывезяным з сасновага лесу, ды рабіў многа іншага.

Не браўся толькі перашкліць трэснуўшыя вокны. Добра, што гэты недахоп гаспадара ўзяўся выконваць заезджы яўрэй. Майстар выразаў шкло і ўстаўляў на месца разбітага. Гэтае шкло акуратна замацоўвалася цвічкамі ў раме. Зрабіўшы замазку- кіт, запаўняў усе, нават самыя невялікія шчылінкі.

Расказвалі, з якой асалодай заўсёды гэта выконвалася яўрэямі!

**№ 14**. Пазняк Ганна Афанасьеўна - 1899 г.н. Пасярод вёскі з правага боку на ўзвышшы добрая, але невялікая хатка і хлеў з 1920 года. Муж, Міхаіл Аляксандравіч -1906 г.н., родны брат Юзюка. Зямлі - 6 га, ворыва - 4 га, сенажаці - 2 га.

Трымалі для працы на гаспадарцы вялікага мерына, карову, цялушку, двое свіней і авечкі.

Міхаіла Александравіча ў гады акупацыі немцы прымусілі працаваць кандуктарам, а потым машыністам паравоза. Каля станцыі Ганчары партызаны арганізавалі крушэнне цягніка, загінула шмат фашыстаў.

Параненым быў і кандуктар дроздавец Дзявяты Міхаіл (Каласок), які некалькі тыдняў лячыўся ў нямецкім




шпіталі і выжыў. Сярод трупаў і параненых не знайшлі Пазняка Міхаіла, і больш яго не бачылі. Утварылася вясковая легенда, што, мажліва, уцёк за мяжу, але ніякіх сведак не было.

Дочка Вера Міхайлаўна - 1936 г.н., вучылася ў Ганчарскай школе.



***Злева направа сядзяць: Германовіч Вольга Кандратаўна (Ганчары), Пазняк Вера Міхайлаўна, Кучынскі Мікалай Мікалаевіч - настаўнік, Шут Зінаіда Канстанцінаўна (Драздова). Стаяць: Святаслаў Пяткевіч(Ганчары), Ліпскі Вадзім (Жучкі), Дзяваты Іван Іосіфавіч (Дроздава)***

Весці гаспадарку без бацькі было цяжка, і маці Ганна з дачкою Веркаю пасля вайны пераехалі ў Ліду і там працавалі.

**№ 15.** Кумпяк Надзея Аляксандраўна, дочка солтыса Аляксандра Васільевіча (Кажаша) ў гады акупацыі служыла нянькай у Быстрыцкай Вольгі (Вітчыхі).

У “Лідскім летапісцы” № 107 апісана, як уся сям’я загінула… Пасля вайны Надзя выйшла замуж ў Калодзішчы каля Менска.

**№ 16.** Кумпяк Міхаіл Вікенцьевіч (Вінцуковы) - 1930 г.н. Жонка Надзея Іванаўна - 1929 г.н., дочка Аляксандра Міхайлаўна - 8.09.48 г.н.

Брат Коля, аднагодак - 1930 г.н., падшпаркам, купаючыся ў Дзітве, утапіўся.

Другі брат Косця - 1934 г.н. пераехаў у Ленінград, там вучыўся і працаваў.

Старэйшы брат Віктар - 1922 г.н. быў партызанам і падарваўся на міне пры закладцы пад рэйкі. За яго партызанку бацьку Вікенція і маці Юлію акаўцы забілі ў Беліцы.

**№ 17.** Козел Агафія Антонаўна (Агата) -1888 г.н. Забудова пасярод вёскі з 1880 года. У зале земляная падлога, у кухні старая хлебная печ. Затым стаяў доўгі дашчаны стол (абрусамі накрывалі толькі ў святы). Уздоўж яго стаялі лаўкі. У спальні стаялі дзве лаўкі з парэнчамі, іх называлі канапкамі. Стаялі лаўкі і ўздоўж свабодных сцен.



На гарышчы, паводле народных павер'яў, жылі духі памерлых продкаў. І калі знахарка Агата лячыла каго-небудзь у хаце, яна пачынала стукаць венікам у столь - клікаць на дапамогу хвораму духа-заступніка сям'і.

Потым шырокія сені і камору перарабілі пад спальню Жамойціну Косцю, які пакінуў на хутары старэнькую хатку.

Бацька Міхаіл жыццё пакінуў даўно.

Маці Агата жыла з дочкамі: Вера - 1926 г.н., Вольга - 1929 г.н., Надзя - 1932 г.н., з сынам Ваням - 1920 г.н. і актыўна вялі гаспадарку. Мелі зямлі 14 га., ворнай - 10 га, выган - 2,69 га, сенажаці - 0,70 га.

Запісана, што ў гаспадарцы мелі плуг, барану, калёсы і сані, сячкарню. Трымалі кабылу, а карова здохла, то гадавалі цялушку. Свіней не было, толькі авечкі.

Сына Івана Міхайлавіча ў 1944 годзе прызвалі ў армію. Ваяваў на фронце пад Кёнігсбергам і на Одары. Узнагародзілі ордэнам Славы і медалём за ўзяцце Кёнігсберга. Пасля дэмабілізацыі хату з зямельным участкам выкупіў у Пазняк Ганны і ажаніўся з Геняй з Бенявіч.

**№ 18.** Дзякевіч Канстанцін Фёдаравіч -1910 г.н. Пасярод вёскі добрая хата накрытая кулявой саломаю ў 1925 годзе, хлеў і гумно старэнькія з1900 года.

Зямлі - 7,38 га, ворыва - 3,47 га, сенажаці -3,08 га, выган - 0,25 га. Сеялі соткамі: жыта - 80, пшаніцы -5, ячмяню - 8, аўсу - 15, бульбы - 70, гародніны - 2, махоркі

-1. Трымалі мерына, карову, цёлачку, дзвюх свіней, дзвюх авечак.

Маці Кацярына - 1864 г.н. (Кася), жонка Сцепаніда Паўлаўна - 1904 г.н., дочка Лёдзя - 1937 г.н., сын Валодзя -1940 г.н.

**Канстанцін:** *"Вясною 1941 года быў прызваны на ваенныя зборы за Гародняй кіламетраў шэсць у Гожы. Разам там быў Кумпяк Сямён і Дзікевіч Ціхан з Дзітрыкаў. Прыязджалі нас адведаць мая жонка Сцепаніда, Кумпякова Вольга (Сымонкава) і Коля Дзікевіч. У тую ноч я быў дзяжурным на палатцы. І ў тую раніцу над Гародняй пайшла нямецкая бамбардзіроўка. Над вайсковым лагерам Гожа пранесліся два самалёты з тупымі чырвонымі насамі, ды так нізка,што падняліся над лесам. Высока ў небе кружыла нямекая рама - напэўна, карэкціравала стральбу артылерыі. Але камандаванне толькі ў шэсць гадзін гукамі трубы заігралі пад'ём.З палатак выбеглі голыя па пояс, хтосьці ў кашулях, вайскоўцы і пашыхталіся на пляцоўцы каля лесу. Сыгралі баявую трывогу. І да мяне прыбегла жоначка Стэфка, абняліся і крыху пагаварылі аб жыцці родных. Падышлі некалькі воінаў у касках, з вінтоўкамі і на рамнях патронамі. Сказалі, што з граніцы ідзе германскае войска, і я жонку адпусціў, каб уцякала дахаты. На працягу двух тыдняў вялі абарону, стралялі ў бок немцаў мінамётамі. Але да баявой пазіцыі на ўзгорку з даліны рынуліся танкі. Камандзіры вырашылі групамі прабірацца на ўсход. Дабраліся да ракі Котры, і камандзір групы загадаў : "Кідайце вінтоўкі ў рэчку, самастойна дабірайцеся дадому". Так закончыўся для мяне ўдзел у савецкай арміі і пры акупацыі гаспадарыў дома".*



***Прысеўшы, Косця Дзякевіч з Вольгаю Кумпяк (Сымонкавай), сядзяць на лаўцы Пазняк Вера і дочка Дзякевіч Лёдзя, стаяць Данэйка Лідзя, Грынь Зіна, Козел Надзя (Агаціна)***

**№ 19.** Быстрыцкі Іван Якімавіч (Ясь) - 1877 г.н., малаграматны. Пры дарозе на выгане за вёскай старыя хата з каморай, хлевушок і свіран.

Зямлі - 14,54 га, ворыва - 6 га,сенажаці - 7 га, выган - 0,80 га, няўдобіцы - 0,58 га. Для вядзення гаспадаркі мелі дзве кабылы, дзве каровы, свіней і авечак.

Жонка ў гады акупацыі захварэла і адышла з жыцця. Уся жаночая праца лягла на трох сыноў і бацьку. У сялянскай сям'і ўсім хапала справы, кожны павінен не сядзець без працы - бо будзе грэшна і сорамна. Сялянская жыццё цяжкае, дзень паляжаць - тры страціць. Толькі той, хто папрацаваў, мае права паесці. Наколькі сяляне шануюць работнікаў, відаць з таго, што вясковых хлопцаў стараліся жаніць маладымі. Як толькі падыдуць законныя гады, яму адшуквалі нявесту - чужога чалавека работніцай ў свой дом.

Праз некалькі месяцаў невядома, як загарэлася хата. Сыны выскачылі праз акно, а бацька Ясь кінуўся ў дзверы, а там моцна гарэла ў тамбуры. Там і загінуў.

Тады старэйшы сын Быстрыцкі Коля - 1920 г.н., першым пайшоў у прымы да драздоўкі Веркі Лукашэвіч.

Аляксандр - 1923 г.н., прышоўшы з арміі, актыўна працаваў на гаспадарцы, але кухонная забота моцна тармазіла сялянскую працу. У вёсцы ўдзельнічаў у вячарынках, танцаваў, знаёміўся з дзяўчатамі і вось рашыў пасватацца да прыгожай і актыўнай працаўніцы Ірыны Каханоўскай.

Ядвіга Міхайлаўна Каханоўская расказала: *"Неяк вечарам у нядзелю да нас прыйшоў прыгожы, рослы, прыстойны і працавіты малады чалавек - Быстрыцкі Шурык (Аляксандр) сватаць старэйшую сястру Ірыну - было ёй каля 17 гадоў.*

*Ён нядаўна вярнуўся з фронту. Сям'я Быстрыцкіх была паважаная ў вёсцы, але складалася толькі з чатырох мужчын: бацькі і трох сыноў. Мой бацька Міхаіл Феліксавіч пагаварыў з ім прыемна, але адмовіў: "Дочанька Рэнечка маладая, яшчэ рана ёй замужжа". А прычына на самай справе была ў тым, што гэтую вялікую мужчынскую сям'ю трэба па жаночаму абмываць, накарміць, даіць каровы,вясці агарод і г.д. Тата пашкадаваў дачку і не аддаў у гэтае "мужыцкае пекла". На жаль, гэта не зберагло яе ад далейшага нялёгкага лёсу".*

Не адкладваючы жадаемае сямейнае жыццё, Аляксандр наведаў са сватам сям'ю Дзевятых (Каласкоў). Гаспадар Міхаіл Антонавіч ветліва сустрэў гасцей, усадзіў за стол. Гаспадыня Вера Іванаўна накрыла стол закускаю. Сват паставіў на стол бутэлечку самагонкі, пачыналася смачнае ядзэнне і гутарка. Дочка Аля каля стала не прысутнічала, яна знаходзілася ў каморы. Бацька нявесты ведаў, што сабой уяўляе жаніх Саша, якая ў яго гаспадарка, і бацькі вырашылі выдаць сваю дачку….(З іхняю Аляю ранней дружыў Дзіма Місь, але чамусці вяскоўцы яго пакалечылі да смерці).

Праз некалькі тыдняў згулялі вяселле і правялі вянчанне ў царкве. Так Быстрыцкі Аляксандр - 15.11.46 г.н. ажаніўся з добрай гаспадыняй, ды і вядомай прыгажуняй Аляксандрай Міхайлаўнай - 1929 г.н., і пайшло новае жыццё, нарадзілася дочка Зіна - 18.09.48 г.н.

Малодшы Віктар - 1926 г.н. вырас як малайчына, добры працаўнік назапасіў грошай, агледзеў сабе нявесту - Рэню Быстрыцкую (Перадойкі) з Масявіч, накуп-

ляў падарункаў, пасватаўся і атрымаў згоду. У дзень гэтай згоды, які называецца змовіны вызначылі дні вяселля, запрошаных сватоў і дружбантаў.

Віктар запрасіў майго тату Ваню сватам. Добра памятаю, як мяне на абсталяваным вазочку, бацька пасадзіў на пярэднюю лавачку, а на задняй сам з маладым, і я кіраваў лейцамі сваю кабылку Жучку з шаластунамі. Ззаду ехалі дружбанты і музыканты на брычках, упрыгожаных рознакаляровымі стужкамі і кветкамі.

У Масявічах вазок паставілі на вузкім падворку Быстрыцкага (Перадойкі). Бацькі маладой сустрэлі гасцей з хлебам і соллю і запрасілі ў хату. Малады з усёй дружынай селі за стол. Дружкі супраць дружбантаў. Кожная дружка прышпіліла кветку дружбанту, які ёй дастаўся, і парамі гулялі разам да канца вяселля.

Налівалі першую чарку, дружкі накрывалі чарку хусцінкай, а дружбанты наверх клалі цукеркі. Там для ўсёй вясельнай кампаніі праходзіла вяселле смачнымі стравамі: смачна елі, гарэлкі пілі мала, было шмат шуму, гумару, песень, музыкі і танцаў. Госці пілі, елі, а маладыя трымаліся, бо паедуць вянчацца, ім патрэбна будзе прычашчацца. Пасля застолля маладую Рэню паставілі па пасаг. На падлогу кінулі вывернуты кажух, і маладая стала на калені і падзякавала бацькам, пацалавала абраз і паабяцала перад Богам быць чэснай, добрай жонкай і маткаю для дзетак.

Праз гадзіну сабраліся маладыя і вясельнікі ехаць у Ганчарскую цэркву на вянчанне. І з песнямі выйшлі з хаты. Маладая з усімі развіталася і пайшла да падводы. Бацька тры разы дабраславіў падводы.

На наш вазок ззаду на палукашку селі маладыя Віктар і Рэня ды сват-тата і сваццяя. Я лейцамі трымаў стаячага коніка. Музыканты гралі музыку, моладзь спявала і раптам прагрымеў гучны стрэл з дубальтоўкі, ды так, што конь спалохаўся і раптам рвануў наперад у бок. Вазок заднімі коламі зачапіўся за слупок варот, і дышаль разламаўся так, што задні вазок з сядзелкамі ўпаў на зямлю. А конік у аглоблях з перадком і лейцамі мяне пацягнуў за вёску. Там на канаве ад болі ног пасля валачэння па дарозе я зваліўся на траву. Так для мяне закончылася гэтае вяселле…

Пасярод вёскі пад **№ 20** жыў з сям'ёй засяліўшыся Быстрыцкі Віктар Міхайлавіч (Віткавы). Нарадзіўся 28 сакавіка 1909 года. З бацькамі ў Першую Сусветную вайну бежанцамі выехалі ў Расею. Там у Алтайскай губерні вучыўся ў школе імя Ф. Энгельса, за адзін год закончыў поўны курс і атрымаў добрая веды і патрэбнае агульнае развіццё. Старшыня школьнага савета і сакратар выдалі Пасведчанне 19 траўня 1923 года.

Нягледзячы на добрае гаспадарчае жыццё, усё ж такі вырашылі вярнуцца на радзіму. Маючы ўжо добрую рускую навуку, актыўна вучыўся ў Публічнай Ганчарскай школе і атрымаў пяцёркі па ўсіх прадметах на польскай мове за чацвёрты клас.

Пасярэдзіне вёскі адбудавалі хату ў 1939 годзе, а старэнькія хлеў, гумно і свіран былі з 1900 года і захаваліся ў гады бежанства.

Аднаасобнік меў зямлі 8 га, ворыва - 4 га, сена-


Удостовѣреніе
№ 66


Rzeczpospolita Polska
Publiczna Szkoła Powszechna 2 klasowa
w Honczary
Świadectwo Szkolne
Bystrzyckiego Wiktora


Ostateczny wynik postępu z końcem roku szkolnego.
Kierownik Szkoły
UWAGA

***Школьнае пасведчанне ад 15 лютага 1924 года***







***Уся сям'я на фатакартцы, а каля сцяны - Трошын Андрэй і жонка з сястрой Вольгаю***

жаці - 3 га, выган - 0,30 га. Запісаны прылады для гаспадаркі: воз, сані, сячкарня, малацілка, веялка, манеж, плуг, барана. Сеялі жыта 120 сотак, пшаніцы - 15, ячменю - 40, аўсу - 30, грэчкі - 15, гароху - 4, ільну - 9, бульбы -4, гародніны - 3, махоркі - 2 соткі. Трымалі кабылу, карову, цяля, свіней - 2, авечкі-3.

За польскім часам Віктар ажаніўся з Вольгай Антонаўнай - 1906 г.н. Нарадзіліся дзеткі: Валя - 1940 г.н., Толя - 1945 г.н., Тамара -1948 г.н.

**№ 21.** Кудла Вера Іосіфаўна (Андрэіха) -1874 г.н. (Стышкова).

Хата1933 года на падворку ў вузкай палосцы каля Юстынаў. Зямлі каля 5-ці га,ворыва - 3,5 га і выган на аселіцы. Кабылка, карова і два парсюкі, дзясятак курэй.

Муж Андрэй - родны брат Івана Мікалаева яшчэ пры Польшчы выехаў у Аргенцінцу і добра зарабіў грошай, але захварэў на ногі і вярнуўся.Суседзі дзівіліся, як купляў дарагія цыгарэты ў Жучкевіча Люціка і многа курыў. Сын Валянцін Андрэевіч - 1921 г.н., жонка Зінаіда Іванаўна - 1915 г.н. Дочкі: Соф'я Валянцінаўна - 1941 г.н., сын Уладзімір - 1946 г.н., Валянціна -1948 г.н. І ўсёй сям'ёй з'ехалі ў Расею.

Забралі падворак Карабач Вася і Фаня Дзявятая. Разабралі старую хату, будавалі падвал для новай хаты і знайшлі парэшткі нейкага трупа.

**№ 22.** Кудла Юстын Аляксандравіч (Алесеў) - 1890 г.н. Бацька Аляксандр Юр'евіч - 1868 г.н.

Гаспадарка поўная, зямлі - 15,43 га, ворыва -8,24 га, сенажаці - 2 га, кусты і неўдобіца - каля 5 га. Мелі плуг, бораны, малатарню, веялку, вазы, сані, прывад-манеж, сячкарню. Прыстасаваннем круцілі вяроўкі з канопляў для гаспадаркі і частку прадавалі сялянам.

Жонка Надзея Сямёнаўна - 1891 г.н нарадзіла і вырасціла здаровых сыноў.



***Яўген Кудла***

Сын Яўген - 1922 г.н, пасля вайны працаваў на чыгунцы стрэлачнікам ажаніўся з Бугель Уладзяй з Мінойтаў, дачка Жэні Валя выйшла замуж за Ягоўдзіка ў Ёдкі.

Часта прыходзілі аднагодкі Бронака Каханоўскага: Косця Дзявяты (Салаткоў), Толя Пазняк (Юзюкоў), Толя Кудла (Юстынаў).

Анатолій - 1929 г.н. за крадзёж снапоў быў арыштаваны 31.10.46 г. і праз год вярнуўся і разам з дроздаўцамі працаваў у Лідзе на чыгунцы.



***На фатакартцы ў працоўнай форме: сядзіць Кудла Толя, стаяць Дзявяты Косця і Пазняк Толя***

Ніна Юстынаўна - 1924 г.н. выйшла замуж за Ашмяну Уладзіміра Іванавіча.

**№ 23.** Хрыстук Юзэфа Канстанцінаўна - 1899 г.н. полька. Муж Міхаіл памёр у канцы вайны.

Зямлі мелі 6 га, ворыва - 3,26 га, выган - 2 га., а падворак - аж 73 соткі з маленькаю старэнькаю хаткаю 1900 года.

Трымалі толькі карову і свінню.

Сын Уладзімір Міхайлавіч - 1937 г.н.

Дачка Ірына Міхайлаўна - 1942 г.н.

**№ 24.** Кудла Елізавета (Альжбета) Юльянаўна -1888 г.н. Муж Канстанцін памёр раней.

На краі вёскі хата і хлеў 1930 года. Зямлі - 3,36 га, ворыва - 1,88 га, выган - 1,06 га. Сыны-партызаны Іван і Валодзя загінулі ў гады вайны. *(Апісана ў "Лідскім летапісцы" № 107).*



***Злева направа: Дзявяты Ваня, Хрыстук Валодзя, Жамойцін Косця***

Брат Місь Васіль з Дакудава, разумны, адукаваны, хараша спяваў. Пры першых Саветах выступаў, нешта не так добра пра ўладу сказаў. Арыштавалі, пасадзілі ў турму,з пачаткам вайны вярнуўся, а з-за пляменнікаў-партызанаў забілі акаўцы ў 1944 годзе.

Дзімка Місь - сын Васіля прыехаў з Расеі. Шухарны быў, кудравы, гарачы, высокі, сімпатычны, сябраваў з Алечкай Дзевятай (Каласковай). Пасля вайны яго з яе рук забралі і забілі. Ляжаў на полі. Алечка ўсіх забойцаў бачыла. Прыгразілі, каб маўчала. Віктар Юльчыкаў сказаў: *"Я бачыў, Дзімка ляжаў на зямлі, грудзі прабіты нажом, а галава, напэўна, з абрэза".*

Пасля вайны 1947 годзе з Дакудава прыйшлі сястра Альжбеты Серафіма і брат Яўген і вялі гаспадарку.

Віктар Кудла:.*"Альжбета: прыветлівая, добрая, жыла з сястрой і братам у невялічкай хатцы з адным пакоем. Мы пужаліся часта ад стуку ў акно: "Адэмкні!" Мама Вера вадзіла нас да Альжбеты, якая выкочвала пярэпалахі дзецям. Худзенькая,рукі шурпытыя, вочы ясныя. На чыгунную патэльню насыпала попел. Я, распранушыся, клаў ручку ў попел. Яна з ножыкам каля кожнага пальца збірала попел і выкідвала. Гаварыла нейкія пацеры. Потым на грудзях выкачвала яйка і высмоктвала грудзі і сплёўвала. Вынік быў добры, дахаты ішоў здаровенкі"…*

**№ 25.** Шут Зянон Іосіфавіч, мянушка "Дзескаць да". Хата і пабудовы былі каля шашы на канцы вёскі. Апісана ў "Лідскім летапісцы", як ў гады вайны за тое, што сыны Жорж і Віктар кінулі партызанства і немцы прыбралі іх ў паліцыянты, партызаны падпалілі хату, застаўся падворак і агарод з садком. Сыны Віктар і Жорж з вайнаю трапілі на Захад, а пасля кудысьці перабраліся ў Аўстралію.

Пасля вайны пражыўшы да зімы ў паветцы суседа, Зянон пераехаў у Ваўкавыск, на радзіму жонкі Зіны з малодшым сынам Косцям. Тады дачка Ніна не была замужам, як настаўніца жыла у Бярозаўцы.

Зянон там уладкаваўся на працу, скончыў курсы дзесятнікаў-будаўнікоў, потым нават працаваў старшынём брыгады. Калі жарсці ўляглюся, Зянон пачаў пісаць скаргі, патрабаваць, каб яму заплацілі за спаленую хату, каб пакаралі падпальшчыкаў, каб прызналі яго "заслугі" і ўзнагародзілі належным чынам. Ён ваюе, змагаецца, прычым, намаганні свае накіроўвае не на "што-небудзь, а хоча "дамагчыся праўды". Паводле яго ж слоў, за апошнія гады ён адправіў у розныя інстанцыі не менш за пяцьсот лістоў. Спачатку яго скаргі цярпліва правяралі і ветліва адказвалі, што яны неабгрунтаваныя. Ён піша зноў, ужо абвінавачваючы цяпер інстанцыі ў перадузятасці… У архіве "Гарадзенскай праўды" знайшліся лісты ад Зянона Іосіфавіча. Вось вытрымкі з іх: *"Я стары бальшавік, усё сваё жыццё вёў агітацыю за савецкую ўладу і асабістым прыкладам жыцця сваёй сям'і паказаў, як трэба жыць свабоднаму чалавеку. Адно толькі прашу партыю і ўрад: кампенсацыю мне за сродкі прычыненных страт, спаленай вясковай бандай маёй маёмасці".*

Прыязджаў у Дроздава, заходзіў і да нас, Ванюшкавых. (В.К. *"Памятаю яго: даволі поўны мужчына, лысы, буйны твар, маршчыністы лоб, трывала пасаджаныя вочы, адрузлыя ад узросту шчокі. Рукі вялікія выпрацаваныя, з вузлаватымі пальцамі, мажліва за сваю гаспадарчую працу рукі трымалі конскі плуг, цэп пры малацьбе, касу пры сенакосе і рыдлёўку на агародзе... Цяпер часцей мае справу з пяром, гаваркі, многа рассказваў пра вясковых партызанаў, перадаў няўрымслівыя свае вершыкі"*). Адзін з іх называўся "Грудзі бандыта ў медалях".

Увесь гэты жыццёвы ўклад драздаўцаў- аднаасобнікаў з уздымамі і спускамі ў розныя гады, якія залежалі ад знешніх абставінаў, працягваўся да канца 1949 года, да арганізацыі калгаса ў вёсцы Дроздава.

Большасць нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат, каб не ўступаць у калгас, падаліся на працу ў Ліду. Вёска размешчана паблізу чыгункі і станцыі Ганчары, што давала магчымасць некаторым раніцай з'язджаць на працу, а ўвечары вяртацца дахаты. Многія ўладкаваліся працаваць на чыгунцы.

Пад канец саракавых гадоў з бацькамі мы наведваліся на лідскі рынак, дзе прадавалі гаспадарчыя прадукты і штосці куплялі для сям'і.

На тратуары каля галоўнай брамы рынка "кучкавалася" шмат інвалідаў, пакалечаных вайной. Хто без рукі, хто без нагі, а то і без абедзвюх. Сядзяць проста на зямлі або стаяць, абапіраючыся на мыліцы, жабравалі, гандлявалі грабянямі і іншымі няхітрымі рэчамі. Мінакі для падтрымкі іхняга здароўя, за ўдзел у вызваленні Радзімы, кідалі ў іхнія шапкі медзякі. Потым прайшло не так шмат часу, і не стала іх больш відаць на вуліцы: нехта памёр, многім дзяржава знайшла выйсце - загрузілі ў вагоны і за некалькі дзён вывезлі.

Для напісанне гэтага "Вітка жыцця" выкарыстаны расказы маіх родных: таты Вані, мамы Веры, бабулькі Алесі, а таксама ўспаміны, запісаныя на дыктафон, фатакартачкі драздаўцаў і дадзеныя гаспадарчай кнігі Ганчарскага сельсавета за 1948 год.

*(Працяг у наступным нумары.)*

***Віктар Кудла,***
*54 гады на другой малой радзіме - у Дворышчы*

# ДВАРЫШЧАНСКІЯ ХРОНІКІ

**№ 1. Кудла В.,Суднік С. Дворышча. Лідскі летапісец № 35. 2006 год.**

**№ 2. Сліўкін В. Маёнтак Дворышча-1520-1850, Лідскі летапісец № 91. 2020 год.**

**№ 3. Сліўкін В. Маёнтак Дворышча 1850-1870. Лідскі летапісец № 92. 2020 год.**

**№ 4. Сліўкін В. Маёнтак Дворышча 1870-1915. Лідскі летапісец № 93. 2021 год.**

**№ 5. Кудла В. Пачатак XX стагоддзя. Першая сусветная вайна і яе след у гісторыі Дварышчанскага краю. Лідскі летапісец № 105-106. 2024 год.**

**№ 6. В. Кудла. За польскім часам. Частка I. Лідскі летапісец № 107. 2024 год.**

## № 7."За польскім часам" Частка II

Вёсачка Эйтуны раскінулася па полі, уздоўж аселіцы з плыткімі сажалкамі. Здалёк вёсачкі здаваліся цёмнымі купкамі, па вуліцы па баках паблізу яе стаялі хаты, хлявы, дзесьці студні, свірны са збожжам і іншым хатнім дабром. У глухіх месцах іх нават не замыкалі.

Хаты тады бярвеністыя, ад часу пачарнелыя, унутраным побытам вельмі падобныя, вонкавым выглядам кожная вызначаецца. Вялікай часткай запушчаныя, абламаныя і неахайныя; у самых бедных асунуліся ў зямлю і сталі падобнымі на хлявы. Коміны драўляныя, абгрызеныя і абкурадымленыя; акенцы пакрывіліся, дзверы на баку і, адчыненыя вонкі. Дахі месцамі спаўзлі, месцамі праваліліся, асабліва крытыя дошкамі.

Бывала пад хатаю з тракельскім ксянзом збіраліся вяскоўцы, нават з дзеткамі. Нагодаў для сустрэч было шмат: і надыходзячыя святы, і набажэнствы ў касцёле, і навядзенне парадку на могілках.



**Дзе радзіўся, там і прыгадзіўся!**

**Арэхава (Шмайла) Люцыя** з вёскі Эйтуны расказала:



*"Яшчэ пра назву вёскі ад расказаў сваіх продкаў помню. Калісьці даўно ў Дворышчы жыў і гаспадарыў паніч Айтун (Гайтун). Вельмі любіў коней і раз'язджаў то на брычцы, то зімою на санках. Як ехаў да касцёла ў Тракелі, яго пры сустрэчы віталі вяскоўцы:"Прывітанне - Айтун, Айтун!!! Так і з'явілася тады назва вёскі - Айтуны, Гайтуны, цяперашнія Эйтуны.*

*Пра другі варыянт назвы Эйтуны, яшчэ можна шмат часу ламаць галаву, але "расшыфраваць", што ў слове хаваецца, які яго сэнс, не ўдасца.*

*Праз мокрую грэблю ішлі людзі, і хтосьці тануў ды закрычаў: " Эй ,тану!" І калі першыя дзве літары- "Эй" - яшчэ нагадваюць вокліч, то астатнія -"тану" - нейкая абракадабра.*

*Цяперашнія людзі, што жывуць у гэтым паселішчы Дварышчанскага краю, да назвы сваёй вёскі ставяцца вельмі памяркоўна.*

*У майго дзядулі, у сям'і Шмайлы Станіслава было шэсць дзяцей: Адэля, Наталя, Яня, Тофіль, Вацік і Міхась (мой тата), самы малодшы. Шмайла Станіслаў, займаўся сельскай дзейнасцю і меў свой надзел зямлі, досыць вялікі для таго часу, яго ніўка цягнулася аж да Тракель. Аднаасобнікі, серадняки добра вялі сваю гаспадарку.*

*Бабуля Стэфанія кухарыла, гатавала сваю страву, і настаўнікі дзяліліся сваёй польскай кухняю. Напярэдадні Каляд (Раства Хрыстова) калолі парсюка. І пасля свята ішоў мясны перыяд. Яшчэ рыхтавалі юшку. Бралі кроў, лілі ў гаршчок, у яго крышылі хлеб, варылі, елі. Было вельмі смачна. Нарыхтаванай крыві хапала, і рабілі каўбасу-крывянку. Узімку і пасля пастоў з цёртай бульбы са скваркамі і цыбуляй у спецыяльных чыгунах пяклі бульбяную бабку. Гэты перыяд доўжыўся да велікоднага посту.*

*З жонкай Стэфкаю жылі ў ладзе і ў дастатку, але чамусьці памерла рана, у тракельскім касцёле правялі паніхіду і пахавалі там на могілках.*

*Бацька Станіслаў пачаў вельмі клапаціцца пра дзяцей.*

*Тры дачкі, цяжкую працу рабілі: вязалі, шылі з ільнянога палатна бялізну, ручнікі, абрусы, падушкі, летнія блюзкі, а з ваўняных нітак - свэтры, спадніцы, сукенкі, панчохі, шкарпэткі, хусткі.*



*Мой тата - Шмайла Міхаіл Станіслававіч нарадзіўся 6 студзеня 1913 года ў вёсцы Эйтуны. Рана страціў маці Стэфку. Але нягледзячы ні на што, атрымаў адукацыю - 8 класаў у дварышчанскай польскай школе.*

*Яго бацька паклапаціўся пра падрослага сына Мішу і зладзіў яго ў чаляднікі да печніка, каб памагаць, мясіць гліну, падаваць цэглу. Міхаіл хутка асвоіў гэтую справу і стаў майстрам муравання па кладцы пячэй па Лідчыне. Печкі ставіў у хатах, у школах, бальніцах па ўсёй акрузе.*

*Але акрамя таго здольны быў і да работы з дрэвам і бляхай, умела спраўляўся і будаваў хаты.*

*У 14 гадоў пайшоў да Вільні, да Кальварыі, і на каленях адолеў 35 стацый Крыжовага шляху Езуса Хрыстуса. "Май хлапчук жаданне, як будзеш жаніцца, то каб дзяўчына была маладой і прыгожай." І мара здзейснілася, жаніўся, жонка Яніна - 18-гадовая прыгажуня, з вёскі Такары, з багатай сям'і, дзе ў хаце трымалі школу, настаўнікі былі з Польшчы.*

*Тата Міхась прызваўся ў польскае войска ў кастрычніку 1934 года, стаў жаўнерам. Падчас службы прымаў удзел у пахаванні сэрца Пілсудскага на могілках ў Вільні.*




*R.S.* 12 траўня 1935 года памёр Юзаф Пілсудскі ва ўзросце 68 гадоў ад раку, яго цела пахавалі ў Кракаве. Забальзаміраванае сэрца ў крышталёвай урне, зробленай на шклозаводзе ў Бярозаўцы, павёз жалобны цягнік па шляху да Вільні.

Вечарам у нядзелю 31 траўня 1936 года, цягнік падышоў на перон Лідскага вакзала. Быў цёплы вясенні вечар. На пероне сабралася мноства гараджан і жыхароў навакольных вёсак, вайскоўцаў, школьнікаў. Прайшла жалобная ўрачыстасць, адзванілі званы касцёлаў, у небе прагрымеў салют.



У Вільні на могілках Росы сэрца Пілсудскага пахавалі каля маці пад магільнай гранітнай плітой з надпісам: "Маці і сэрца сына".

Вось так з вялікімі ўрачыстасцямі прайшло пахаванне сэрца знакамітага маршала - кіраўніка польскай краіны.

*Пасля службы тата Міхась вярнуўся на радзіму. Аднак пасля нядоўгага прабывання дома пачалася вайна 1939 года, і яго прызвалі ў польскую армію да ваенных дзеянняў супраць германцаў, да ўдзелу ў польскай абарончай войне".*

Жыхарка горада Ліды **Ірына Іванаўна Шарыч** напісала пра лёс свайго дзядулі ў Эйтунах - Вейкуця Вацлава Каятанавіча, яго братоў, сям’ю і родзічаў…



Перагортваючы старонкі альбома з пажоўклымі ад часу чорна-белымі здымкамі, лідзянка Ірына Шарыч заўсёды са слязамі на вачах распавядала гісторыю сваёй радні. І хоць прайшло шмат гадоў з той пары, як скончылася вайна, загаіла свае раны зямля, не зацягваюцца яны ў членаў яе сям'і: бо занадта шмат было гора ад загінуўшых пры акупацыі… Ірына Шарыч упэўненая: сямейны альбом яна абавязкова перадасць як спадчыну сваім дзецям і ўнукам, і ўспаміны пра радню будуць у "Лідскім летапісцы".

*"Мой дзядуля Вацлаў Каятанавіч Вейкуць нарадзіўся 12 лістапада 1912 года ў вёсцы Эйтуны. Да яго ў бацькоў было 12 дзяцей, але на жаль, усе яны памерлі ў маленстве.* (Вось такая медыцына тады была!) *Вацлаў стаў першым выжыўшым дзіцём у сям'і. Потым нарадзілася яшчэ трое хлопчыкаў. Гэта былі яго браты. Міхаіл нарадзіўся ў 1915 годзе, Андрэй - у 1918 годзе і Аляксандр - у 1921 годзе.*

*На жаль, у 1924 годзе памёр іхні бацька Каятан, і гадавала сынкоў маці Эмілія. (Чамусьці яе*

*фатакартцы не захавалася). Дванаццацігадоваму Вацлаву прыйшлося стаць старэйшым гаспадаром у сям'і. На фатакартцы - Вейкуць Вацлаў.*



*Браты-дзеці малыя, малая і меншыя! Уявіце, што ў такім узросце давялося рабіць непасільную працу. У той час у іх былі два кані і кавалак зямлі.*

*Вацлаву, як самаму старэйшаму давялося араць плугам, баранаваць драўлянаю бараною, сеяць сявенькаю, касіць сенажаці, памагаць маці жаць збажыну. Потым жыта малацілі цапамі і вазілі на млын у Дворышча.*



***Фатакартка ад 7 жніўня 1937 года. Па сярэдзіне Вейкуць Вацлаў Каятанавіч, злева - Шымчык Броня Мар'янаўна - любімая дзяўчына, справа вясковая суседка Бурак Эдальфіна (называлі ў вёсцы Адольця).***

*У гумне былі жорны, круцілі рукамі, і на іх таксама малолі ячмень на корм жывёле. Малодшых братоў прывучыў хадзіць з рэзгінамі па сена, каб карміць жывёлу і даглядаць коней і дапамагць выконваць усю работу па гаспадарцы.*

*Сярэдні брат Андрэй вывучыўся ў Вільні на майстара па рознай мэблі, а Вацлаў ужо быў добры сталяр. Сумесна асвоілі спецыялізаваныя заняткі сталярствам, як разьба па дрэве, струганне, пляценне. Дрэва было найважнейшым матэрыялам для вырабу разнастайных прылад для гаспадарчай працы,такіх як калёсы і нават на зіму сані і саначчкі. А для хатняга ўжытку выраблялі простую мэблю, сталы, лавы, вешалкі.*



*У гумне ( на фатакартцы) стаяў варштат і прылады да сталярных работ. У цёплыя дні Вейкуці-майстры на двары пад паветкай ставілі варштат сталярны і іншыя вытворчыя прыставанні, інструменты: гэблік, рубанак, фуганак, шархебель, адборнік, адкоснік…*

*Для пэўных стругальных работ выкарыстоўваліся інструменты: сякера, стамеска, долата, цесла, плешня - для даўбення; доўбця, малаток, чакуха - для забівання; свярдзёлкі, корба - для свідравання; піла, пілкі, затор - для пілавання, лінейка, цыркуль, шаблоны, вугольнік, рэйсмус, ватэрпас, адвес - для вымярэння і вызначэння неабходных прапорцый.*

*Зімой у хаце выраблялі посуд, шафкі,этажэркі, плялі лапці, кошыкі і іншае. Частка вырабаў прызначалася для аднавяскоўцаў, жыхароў суседніх вёсак ці збывалася на вараноўскіх кірмашах. Майстры-гаспадары трымалі некалькі падсобных рабочых, якіх навучылі, і разам рабілі кросны, зэдлі, бочкі, цэбры, дзежкі і іншыя прылады працы.*

*Бывала адпраўляліся ў суседнія вёскі, у большасці ў Тракелі і Мігуны, каб сялянам рамантаваць калёсы, сані, плугі, акучнікі….*

*Разнастайнасць заняткаў і спецыялізацыя маіх родзічаў адлюстроўваюць шматграннае багацце вытворчых прыёмаў і навыкаў і сведчаць пра высокі ўзровень рамеснай тэхнікі.*

*Міхась вывучыўся таксама, дзесці ў Вільні на краўца і ў хаце на швейнай машыне "Зінгер" шыў марынаркі з тонкага сукна на самаробнай падшэўцы.*

*Порткі шыў з паўсукна на зіму і зрэбныя порткі на лета.*

*Вопратка ў хлапцоў на той час была нешматлікая. Зімою ў санную дарогу надзявалі кажух, а ад дажджу ці мокрага снегу - бурнос з башлыкам і самаробныя валёнкі з галёшамі. Летам хадзілі ў белых зрэбных кашулях ці рубашках, надзявалі чаравікі, радзей купленыя туфлі. Каля хаты ў гразь абувалі трэпы. На галаву шыў кожнаму брату розныя шапкі са старога адзення.*

*Самы малодшы Сашка (а звалі Голясь) працаваў на гаспадарцы, даглядаў жывёлу, карміў свіней і курэй, а ад вясны да зімы пасвіў каровы на выгане і навязаных коней. Дапамагаў маці даіць дзве каровы, а потым у бойцы збіваў масла.*

*Прыйшлі годы добрага сяброўства, і ў 1938 годзе двадцацішасцігадовы Вацлаў Каятанавіч ажаніўся з Броняй Шымчык, якую ён многія гады вельмі кахаў.*



*Да Вацлава прызямлілася і цёшча - Шымчык Марыя, якая нарадзілася15 траўня1897г.(на фатакартцы).*

*Яна расказала, што ў іхняй сям'і Шымчыкаў было многа дзяцей. Хтосьці на сваёй гаспадарцы пасвіў каровы,але ў большасці працавалі ў багатых асаднікаў. Сама Маня раней некалькі гадоў служыла ў пана Палячка ў Лідзе.*

*Гадавала іхніх дзетак, кухарыла на кухні, мыла бялізну і прыбірала дом. Палячак плаціў залатымі манетамі, і яна аддала іх Вацлаву.*

*Брат Шымчык Казік з Грыцаём Антонам і яго сястрою Стэфкаю паехалі на заработкі ў Амерыку. Добра працавалі, падружыўся з украінкаю, ажаніўся і там застаўся. А вось Антон і Стэфка ўсё ж такі вярнуліся на радзіму.*

*У 1939 годзе, 15 жніўня ў іх нарадзілася дачка Рэгіна (мая мама). А неўзабаве праз два тыдні правяі хрысціны Рэгіны. Цёшча Марыя, як добрая і здатная гаспадыня карміла ўсю сям'ю. Гатавала клёцкі з дранай бульбы, квашаніну-халадзец, юшку з крыві, а вясною збірала шчаўе і рыхтавала халаднік.*

*29 жніўня, дзядулю Вацлава прызвалі, як ваеннаабавязанага ў Войска Польскае, і ўжо 1 верасня на Польшчу напалі немцы.*

*Да гэтага ў Войску Польскім адслужыў некалькі гадоў і яго брат Міхась (адзіная яго фатакартка), але на вайну яго не паспелі прызваць, бо 17 верасня ўвайшло войска Чырвонай Арміі - пачалася Другая сусветная вайна.*




***Вацлаў Каятанавіч - польскі жаўнер***

**Піута Андрэй (Гэнюсь) Іванавіч** 1929 г.н. расказаў:



***На фатакартцы: бацька Піута Ян Усцінавіч***

*"Бацька Яська Усцінавіч, як і ўся радня, быў праваслаўным. Акрамя актыўнага вядзення сялянскай гаспадаркі, быў краўцом - шыў кажухі, бурносы, марынаркі, галіфэ.*

*Таксама працаваў у пана фальварка латыша Амберга. За актыўную работу добра атрымліваў злотыя, ды яшчэ патрэбныя прылады працы.*

*Цікавы быў выпадак. На могілках, каля помнікаў сядзелі пажылыя вернікі- Кадзіс, Пенда, Бурак, Белагрывы, Пляцкоўскі - яны былі парабкамі ў пана і кавалём быў Багуслаўскі* (на фатакартцы).



***Каваль Багуслаўскі***

*Неяк пад капліцу*

*штосьці падьехала і з грукатам загула машына, так што старыя ад шуму пападалі. Сыны Аўгуста - Вернер і Саша выскачылі з кабіны і спалоханым лежакам расказалі, што бацька Аўгуст для сыноў купіў дзерыжанку, і яны толькі што прыгналі...*

**Піута Андрэй:** *“Часта на пашы я даглядаў коней, пярэднія ногі спутаны цуглямі. Але аднойчы жарэбчык пераскакаў на пасевы ячменю. Прышлося запыняць каня дубчыкам па спіне. І неяк вар’яваты конік лягнуў заднім капытом па назе, і я ўпаў.*

*Хтосьці з хутаран заўважыў, прыбег, падняў і данёс да хаты. З нагі ішла кроў, і я цярпеў болі. Назаўтра бацька падводаю адвёз мяне ў Ліду ў шпіталь.*

*Палажылі на голы ложак, знялі пусты саламяны матрац. Назаўтра бацька падвёз 2 кулі саломы.*

*Доктар Казубоўскі налажыў швы на раненую нагу і забінтавалі.*

*Выпісалі рэцэпты (на фатакартцы-3), і бацька расплаціўся з доктарам і за лякарствы.*




***Рэцэпты***




***Панствовы банк рольны. Павет Ліда. Гімбуты-Піута Яну***

*У бальніцы за лячэнне бралі па 20 злотых у дзень. За 5 дзён 100 злотых. Гэта роўна 6 пудам зерня, бо за адзін пуд плацілі 1,80 злотага .*

*Некалькі тыдняў бацькі давалі лекі, і я ляжаў на тапчане і нават не мог ступаць на гліняную падлогу.*

*На нізкім узроўні знаходзілася медыцынская дапамога, хаця ў Лідзе былі дзве невялікія бальніцы: дзяржаўная на 85 і прыватная на 18 шпітальных ложкаў. Большасць захварэўшых не магла атрымаць*



***1938 год. Галоўны ўрач Лідскай супрацьэпідэмічнай бальніцы Казубоўскі С.С. з лекарамі каля ляжачага хворага***



***Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў Вялікіх Князякоўцах***

*своечасова медыцынскую дапамогу, бо не мела грошай на аплату доктара за знаходжанне ў шпіталі.*

*Так, захварэўшы старэнькі бацька Яська Усцінавіч некалькі тыдняў ляжаў дома на цёплай печы і ўсё ж такі памёр у 1935 годзе і пахаваны ў Князякоўцах".*

З "Лідскага летапісца": *"Вядомы ў горадзе чалавек Стэфан Казубоўскі- доктар медыцыны працаваў галоўным ўрачом гарадскога шпіталя з 1921 да 39 года.*

*Цікавы факт тагачаснай праваахоўнай хронікі. У ноч з 26 на 27 кастрычніка 1930 года невядомыя злачынцы абрабавалі дом сям'і Казубоўскага па вуліцы Школьнай. Былі выняты дзве шыбы верхняй паловы дзвярэй, якія вялі ў сад.*

*Там былі скрадзены восеньскі плашч, гумовая палярына і 400 злотых. Акрамя таго, была ўкрадзена (на 300 злотых) вопратка хатняй работніцы Казубоўскіх".*

**Некраш Францішак Антонавіч** -1927 г.н.

*"Успаміны аб сваёй вёсцы Такары, аб тых жыццёвых падзеях я ніколі не забываў. Старэйшы на тры гады брат Вацэк, здаровы хлапчук дапамагаў бацьку Антонію ў гаспадарчай працы, а я больш за ўсё летам пасвіў жывёлу на такарскім балоце, навязваў каня і нават ноччу даглядаў.*



*Да ўстанаўлення хутарской сістэмы, якая была праведзена пасля сусветнага крызісу трыццатых гадоў, сялянская зямля знаходзілася ў так званай шнуравой цераспалосіцы.*

*У выніку падзелу зямлі паміж роднымі братамі пры выдзяленні пасагу, некаторыя загоны сталі настолькі вузкімі, што, як гаварылі сяляне, "калі сабака ляжа ўпоперак загона, то галава і хвост яго лажацца на суседнія загоны". І з-за гэтага ў вёсцы адбываліся пастаянныя сваркі і нават бойкі з-за неасцярожнага або наўмыснага заворвання суседняй паласы зямлі, якая ў аднаго гаспадара цягнулася на 1-2 вярсты, перасякаючы ворныя і лугавыя месцы.*

*Вось якую карціну назіраў гадамі. Арэ селянін сваю доўгую палоску зямлі шырынёй 4 або 5 метраў. З аднаго і з другога боку такія ж палоскі зямлі яго суседзяў, ці далёкіх сваякоў, падзеленыя толькі баразной. А межамі раздзяляліся толькі шырэйшыя ўчасткі зямлі. Бывала, хтосці мімаволі, ці з-за прагнасці прыворваў плугам да сваёй палоскі палоску чужой зямлі. Тады ўзнікала сварка, якую спрабаваў уладзіць солтыс вёскі, бо справа магла даходзіць да суда.*

*Гэта спадчына неразумнай зямельнай палітыкі, перажытак грамадскага валодання зямлёй, уведзенага даўно з прыгонным правам.*

*Такая доўгая і вузкая палоска зямлі, на якую трэба было канём завезці возам гной. Потым пераараць, забаранаваць, засеяць, затым зжаць сярпамі, улажыць снапы ў дзясяткі. Гэта каштавала селяніну многа непрадукцыйнай працы і нязручнасцяў.*

*Жанчыны цэлы дзень ў полі, сагнуўшыся пад гарачымі сонечнымі праменямі жалі сярпамі збажыну. Дадому на абед падсілкавацца яны ў большасці не хадзілі. Нават дзяцей-немаўлятак пасадзіўшы пад дзесяткам снапоў, прыкрыўшы ад сонца дзяружкай, трымалі пры жніве. Тут жа на месцы па некалькі разоў адпачывалі і з'ядалі малако з булкаю…*



*Каля Такароў з вярсту ў бок леса працавала цагельня Бжажынскіх. Сыны Роберт ды Томаш і гімбуцкі сябра Піута Андрэй (Генюсь звалі )наймалі вясковых мужыкоў. Станкевіч з вёскі Крыніцы ўзяў у асадніка Жука Бернарда ў арэнду 2 га зямлі, там і жыў у хаце ў канцы вёскі. У кар'еры каля школы капалі гліну, яе размешвалі конным манежам і раскладвалі ў дашчатыя формы. Потым вымалі і падсушвалі цэглу.*

*Мужыкі такарскія, загрузіўшы сыраватую цэглу, фурманкамі вазілі ў Шайбакі на цагельны завод, дзе абпальваннем рыхтавалі будаўнічую цэглу. Добра плацілі нарыхтоўшчыкам сырой цэглы."*

**Круповіч Яніна Іванаўна** - дачка Клемянціны Жук. Запісаў В. Сліўкін 13.03.2004 г.

*"Мой дзед Драб Мацвей з Мяргінцаў прыйшоў у прымы ў Юравічы да Жучыхі. У вялікай сям'і Жукоў было чатыры сыны і па дамоўленасці чамусці бацьку Драбу Івану Мацвеевічу (1893 -1968) запісалі прозвішча Жук.*

*Бацька Ваня іграў і цікавіўся музыкай, лячэбнай справай, нават вучыўся на доктара, але не скончыў. Бацька не піў ніколі.*



*Маці мая - Жук (дзявочае Пілевіч) Клімянціна Мартынаўна са Сцеркава 1916 г.н. Яе брат Пілевіч пасяліўся ў Навапрудцах. (Толькі дзве жыхаркі Лідчыны мелі імя Клемянціна.)*

*Маці выдатна скончыла сем класаў у польскай школе, мела кніжкі і па вячарам пры лучыне чытала. Нанялася і працавала ў пана Радкевіча ў Кір'янаўцах.*

*Як каталічка, потым у касцёле тракельскім у хоры спявала.*

*Рыхтавалася выйсці замуж за чыгуначніка Антона, які прыязджаў і сябраваў .*

*А ўсё пайшло па-іншаму. Неяк Іван Жук, мужчына ва ўзросце, прыехаў купляць коней у Сцеркава да Пілевічаў. Яго пазнаёмілі са старэйшай сястрой Клемянціны, тая яму не спадабалася, а пазнаёміўся з малодшай, і Клемянціна лягла на сэрца.*

*Жук Ваня тады меў зямлі 30 дзесянцін і цяжка працаваў. Гараў палеткі плугам запрэжаным жарабцом і валом.*






*Усё ж такі праз два гады прыехаў сватацца, а Клемянціна ўжо мела заручыны з Антонам. Бацькі пачалі яе ўгаворваць: "Жук багацейшы, зямлі шмат, добрая гаспадарка." З дому не выпускалі, пакуль не пагадзілася. Антон напісаў ліст пра запрашэнне, але не перадалі. Потым прыязджаў у Сцеркава, угаворваў.*

*Але бацькі адмовіліся, і тракельскі ксёндз падтрымаў іх выснову …*

*Жук Іван і Клемянціна ажаніліся ў1936 годзе, запісаліся і павянчаліся і заручальнымі пярсцёнкамі ў Тракельскім касцёле абмяняліся. Вяселле новай сям'і правялі спачатку ў Сцеркаве, а на другі дзень пад вечар пераехалі на хутар Юравічы. Прайшло добрае застолле, актыўныя песні і танцы, цікавыя розмовы…*

*На вяселлі былі родныя і сваякі - Пілевічы, Драбы, Жукі. Падарылі многа маладой сям'і святочнага адзення і пасцельнай бялізны.*

*Іван і Клемянціна пачалі жыць у хаце і весці гаспадарку.*

*Мелі дом, які падзялілі, адзін бок хаты адышоў брату, другі бацьку. Па прызбе-падмурку хата была вялікая, а таксама вельмі вялікі хлеў і гумно. Студня на два дзясяткі кольцаў. Хутар ад шашы з паў вярсты, пабач паляна, лес, сажала. Яшчэ бліжэй хатка Жыдзісаў.*

*Умацаваўся новы польскі злоты. У гарадах сярэдняя дзённая плата паднялася да 2-3 злотых, у спецыялістаў да 6-9. Цэны на прадукты харчавання пачалі патрохі падымацца.*

*У 1933 г. бульба каштавала 30 грошаў за пуд, жыта - 2 злотыя за пуд, карову можна было купіць за 25 злотых.*

Успаміны пра родзічаў і вяскоўцаў напісалі: **Віршала Уладзіслава Канстанцінаўна** і дочка **Ганна Станіславаўна**. (на фатакартцы).



*"Вёска Ячанцы за польскім часам налічвала 19 двароў, сем'і: Аўсейкі - тры, Каспяровічы - два, Матулевічы - два, Бартошы, Банцэвічы, Лемантовічы, Казінскія, Кібішы, Грыгелі, Струкоўскія, Хаміцы, Юрэвічы, Некрашы, Звонікі.*

*Пражывала 110 чалавек з іх - 41 дарослы і 69 дзяцей. Усе сем'і мелі зямлю і гаспадарку. Доўгі час судзіліся з Аняй Філіпавай з-за лесу; толькі незадоўга да вайны выйгралі справу.*



*Мой бацька - Лемантовіч Канстанцін Тамашавіч, 1906 г.н. у 18 гадоў застаўся без бацькоў, але, нягледзячы на маладыя гады, спраўляўся з гаспадаркай, выдаў трох сваіх сясцёр замуж (даваў пасагі). Пасля гэтага ў 1929 годзе ажаніўся з Пташынскай Янінай Канстанцінаўнай 1910 г.н. родам з вёскі Подзі.*

*Бралі шлюб ў Осаўскім касцёле.*

*Пасля шлюбу жаніх Канстанцін пасадзіў нявесту Яніну ў сваю брычку, і вясельны картэж заязджае ў вёску Подзі ў хату бацькоў Пташынскіх. Нявестка каля свайго дома пачаставала дзяцей і ўсіх прысутных аднавяскоўкаў цукеркамі. Вяселле ў нявесты гулялі два дні. Было шмат песень, музыкі і танцаў. На вяселлі гасцей частавалі грунтоўнай ежай: елі парасячае мяса, яечню ў гліняных місках, сыр у алеі, з прывітаннем пілі гарэлку, але мала... На другі дзень адорвалі маладых рознымі падарункамі і злотымі. Вяселле ад пачатку да канца вялі і сват, і сванька.*

*Пасля дарэння маладых, вяселле пераехала ў Ячанцы дом жаніха Лемантовіча Канстанціна. З нявестай прывезлі пасаг: поўны куфар разнастайнага дабра, падушкі, коўдры, і нявеста адорвала бацькоў і блізкую радню жаніха падарункамі. У жаніха гулялі таксама два дні. Вяселле заканчвалася, госці раз'язджаліся, а ў маладых пачыналася новае жыццё, трэба было актыўна весці гаспадарку.*

*І вось 02.01.1933 года нарадзілася я - Уладзіслава. Правялі хрысціны ў жырмунскім касцёле.*

*Сям'я мела за польскім часам 10 гектараў зямлі і 7 гектараў лесу. Трымалі тры каровы і двое каней. Працаваць даводзілася шмат, як і ўсім, але знаходзілі час і для адпачынку. Па нядзелях і каталіцкіх святах наведвалі Касцёл Святога Крыжа ў Жырмунах.*

*У маці Яніны былі 2 малодшыя браты: Віктар і Часлаў Пташынскія.*

*Віктар - 1914 г. н., у 1938 годзе быў прызваны ў Польскую армію (на фатаграфіі ён на кані).*





*У 1939 годзе трапіў у палон да немцаў, да вызвалення знаходзіўся ў палоне (працаваў на ферме ў немцаў). Пасля вайны застаўся жыць у Польшчы ў горадзе Волін-Паморскім. Там і памёр у 1995 годзе.*



***У палоне***

*Дзеці ячанскія хадзілі ў чатырохкласную школу ў вёску Гярвенікі.*

*Для навучання дзяцей паляк Кеса Браніслаў Рэфаілавіч -1894 г.н. і жонка Стэфанія Адамаўна, 1889 г.н. палову свайго дома аддалі пад польскую школу.*

*Першы клас вёўў нежанаты настаўнік, родам недзе з Жырмун. Роварам па палявой дарожцы праз Ячанцы дабіраўся ў Гярвенікі. Патрыётам быў. Пачынаўся ўрок, заходзіў настаўнік, усе вучні дружна ўставалі і гучала малітва "Ойча наш". Навучаў польскай грамаце па некалькіх прадметах да чацвёртага класа. Вучняў было нямнога, каля дваццаці, займаліся адразу два класы - першы і трэці, у другую змену - другі і чацвёрты. За вучобу не плацілі. Падручнікі, сшыткі, чарніла і пер'і да самаробных ручак бацькі куплялі дзесьці ў Лідзе. Была чыталка ў школе на польскай мове, дома размаўлялі па-беларуску. Хто не зрабіў хатняе заданне, на ўроках круціўся меў пакаранне. На грэчку ставілі, прама ў куце класа, перад усімі, пасля ўрокаў пакідалі. Прымушалі вучыцца ўсіх разам. Аднойчы хлопчык з Аўсядава не напісаў дыктант. Давай лапу! Руку выставіў,а настаўнік з размаху і лінейкай мятровай па парце, бо вучань руку паспеў прыбраць. Тады па плячах пачаў біць.*

*Потым вяла ўрокі маладая настаўніца Каранік Браніслава (адразу пасля вайны яе і маленькага сына забілі бандыты).*

**Рубель Баляслаў Канстанцінавіч.** Запісаў Сліўкін В.В. 16.12.1998 г

Болек нарадзіўся 14.10.1917 г у вёсцы Пашунцы. Бацька - Рубель Канстанцін Іосіфавіч, паляк - 1879 г.н., маці - Станіслава Сцяпанаўна -1882 г.н. з вёскі Гільвінцы. Нарадзілі 7 дзяцей і, слава Богу, выжылі 6. Марыя -1914 г.н., замуж не выйшла, жыла ў Пашунцах. Ганна -1932 г.н. - з Лук'яном мелі двух дзецюкоў. Яня была замужам за Шамрэем, іх сын Баляслаў. Броня жыве ў Бастунах выгадавала хлопца і дзяўчынку. Вацлаў - 1937 г.н.- служыў у войску, застаўся ў Іркуцкай вобласці ў г. Усолле, жыве з жонкаю і дзвюма дочкамі, на радзіму ні разу не прыязджаў.



***Старэнькая хатка***

*"Пры паляках бацькі мелі 3 гектары няўрадлівыя, зямля-пясок-жаўцяк. Раскапалі кар'ер для жвіру, які падводамі высыпалі на ямкі дарогі. Зрабілі ўручную так званую меліярацыю каля вёскі на жыжмянскім балотцы. Кожнаму з вёскі даручана было пракапаць участак, крыху асушылі, торф бралі для падкормкі поля з бульбаю. Працавалі ў людзей, чужую зямлю, засявалі, аралі, жалі, потым атрымлівалі злотыя…*

*Бацькі мелі сваім жыццёвым абавязкам выхаваць у дзяцей лепшыя чалавечыя якасці працоўнага выхавання. Сям'я вучыла дзяцей сумленным адносінам да працы, павазе да старэйшых родзічаў і суседзяў.*

*З дзяцінства хлопцы прывучаліся да земляробчай працы: канём з плугам араць, потым баранаваць.*

*Дзяўчынак вучылі вырошчваць агародніну, даглядаць жывёлу, нават даіць карову, летам сярпом жаць збажыну, прасці, ткаць, шыць, гатаваць ежу.*

*У гарачую вясенне-восеньскую пару карысталіся вялікім попытам сельскагаспадарчыя прылады якія рабілі самі: косы, сярпы, драўляныя граблі, матыкі ды іншае.*

*Звычайна восенню, калі надыходзілі халады пастухам клалі ў торбачку бутэльку малака з хлебам і кавалачак сала. Дзень паясі - дзень галодны…*

*Я, Рубель Баляслаў, вучыўся сем гадоў. Польская школа была ў Кабыльніках за вярсту ад Пашунцаў. У першы клас пайшоў у 1924 годзе. Гэта быў драўляны будынак. У ім былі два класныя пакоі, настаўніцкая і кватэра для настаўніка. У гэтым будынку вучыліся толькі пачатковыя класы. З усіх вёсак хадзілі дзеці пяшком. Вясной разліваліся раўчукі, дарога рабілася дрэнная, каб дабрацца да школы не было добрых ботаў.*

*Зімой трэба было ў што-небудзь цёплае апрануцца. Таму ў зімовыя дзянькі, калі былі снежныя заносы і не было відаць дарогі, бацькі, у каго былі свае коні, па чарзе падвозілі дзяцей у саначках.*



***Саначкі, экспанат у Лідскім музеі***

*Заняткі вяліся на польскай мове, але дзеці паміж сабою нават на ўроках шапталі па-беларуску. А вучыла наш клас "пані навучыцелька" пісаць і размаўляць на польскай мове. Да настаўніцы мы звярталіся*

*са словамі: "Prosze Pania." Прозвішчаў настаўнікаў я не ўспомніў, а засталася ў памяці ўважлівая і сімпатычная настаўніца з чацвёртага класа. А вось помню, як за парушэнне дысцыпліны дырэктар бярозавымі дубчыкамі, смеючыся, нібы гуляючы, пацягваў па мягкім месцы.*

*Галеча многім не давала*
*ў школах веды набываць,*
*На гэта часу не хапала -*
*на хлеб патрэбна зарабляць.*

*Значная колькасць вучняў школу наведвала дрэнна. Большасць сялян лічыла, што для іх сыноў і дачок дастаткова пачатковай адукацыі, якая была абавязковай. Восенню трэба было дапамагаць бацькам па гаспадарцы. Асабліва гэта тычылася дзяўчатак. Бацькі меркавалі так: літары ведаеш, чытаць і лічыць да ста можаш - ну і хопіць хадзіць. Бо рыхтаваць ежу каля печы вялікай граматы не патрэбна.*

*Мой сябра Грыцай Пеця, 1907 г.н., з хутара Лясное Дворышча - называлі Ясвілы, на некалькі гадоў раней пайшоў вучыцца. Закончыўшы чатыры класы, праз пяць гадоў гаспадарання, лідская камісія запрасіла на вайсковую вучобу шаснаццацігадовым. Пасля некалькіх гадоў навучання прысвоілі званне, выдалі пасведчанне і прызвалі служыць у польскім войску.*



***Грыцай Пётр***

*У польскую армію мяне, Баляслава, не ўзялі, хаця некалькі разоў праходзіў камісію, бо ў мяне вага была толькі 48 кг, а з вагой да 50 кг не бралі…*




***Узор пасведчання аб заканчэнні падафіцэрскай (сяржанцкай) школы***

**В.К.** Вось дадзеныя пашунскіх вяскоўцаў, хто прайшоў навучанне і закончыў некалькі класаў польскай школы да 1 верасня 1939 года.

**Барыла Франц Вітольдавіч**, 1920 г.н. - 6 класаў, сёстры: **Яніна**, 1928 г.н., **Генуэфа**, 1930 г.н. - па аднаму класу;

**Кузюк Уладзімір Баляслававіч**, 1924 г.н. - 4 класы, жонка **Яніна Віктараўна**, 1928 г.н.; **Лукаш Уладзіслава Станіславаўна**, 1909 г.н.; **Драб Іосіф Казіміравіч**, 1890 г.н. - па два класы;

**Лук'ян Стэфаній Вікенцьевіч**, 1928 г.н., брат **Станіслаў**, 1925 г.н.; **Лукша Іосіф Вацлававіч**, 1910 г.н., сястра **Браніслава**, 1912 г.н. - па тры класы.

**Каўчуга Баляслаў Іосіфавіч**, 1894 г.н., сын **Баляслаў**, 1922 г.н.; **Каўчуга Іван Іосіфавіч**, 1903 г.н. жонка **Сабіна Антонаўна**, 1902 г.н. і дочкі **Вера** і **Геня**; **Ётка Ганна Матвееўна**, 1907 г.н.; **Гурскі Пётр Іванавіч**, 1895 г.н., дочка **Ядзя**; **Лук'ян Юльян Клеафасавіч**, 1928 г.н.; **Лукаш Ігнацій Каятанавіч**, 1898 г.н., жонка **Антаніна Антонаўна**, 1898 г.н., дочка **Уладзіслава**; **Новакумскі Браніслаў Ф.**, 1893 г.н., сыны **Мар'ян**, 1925 г.н., **Каятан**, 1932 г.н.; **Дайлідка Францішка Каятанаўна**, 1930 г.н., сястра **Уладзя**, 1932 г.н.; **Кавальчук Станіслаў Каятанавіч**, 1887 г.н., дочка **Веля**, 1932 г.н. - толькі па аднаму класу…

**Ермаковіч Уладзімір**, 1881 г.н. атрымаў адукацыю 6 класаў рускай школы ў бежанцах.

**З вёскі Кабыльнікі.**

**Жук Казімір**, 1900 г.н., **Адэля Адамаўна**, 1906 г.н.; **Жук Тэафіль Уладзіміравіч**, 1921 г.н., жонка **Леанарда Канстанцінаўна**, 1922 г.н.; **Жук Іосіф Матвеевіч**, 1919 г.н., жонка **Ванда Браніславаўна**, 1921 г.н.; **Жук Вікенцій Матвеевіч**, 1906 г.н., брат **Казімір**, 1900 г.н.; **Нехнядовіч Віктар Юр'евіч**, 1928 г.н.; **Залога Ева Іванаўна**, 1909 г.н.; **Залога Віктар Іосіфавіч**, 1895 г.н., дочка **Леакадзія**, 1930 г.н.; **Усель Аляксандр Іванавіч**, 1892 г.н., жонка **Монія Іванаўна**, 1906 г.н.; **Усель Канстанцін Іванавіч**, 1893 г.н., сын **Зянон**, 1930 г.н.; **Усель Станіслаў Міхайлавіч**, 1918 г.н. - тры класы, брат **Уладзіслаў**, 1912 г.н., жонка брата **Ядвіга Мацвееўна**, 1928 г.н. - два класы.

**Більдзь Мацвей Адамавіч**, 1896 г.н., **Усель Тэафіль Іванавіч**, 1905 г.н., жонка **Ева Вікенцьеўна**, 1921 г.н., **Залога Боляслаў Іосіфавіч**, 1905 г.н., **Залога Аляксандр Аляксандравіч**, 1907 г.н., брат **Станіслаў**, 1909 г.н. - па два класы.

**Барыла Мацвей Юр'евіч**, 1892 г.н., сын **Казімір**, 1905г.н.; **Барыла Браніслава Стэфанаўна**, 1931 г.н., **Бучынскі Канстанцін**, 1902г.н., жонка **Юзэфа Аляксандраўна**, 1913 г.н., **Бучынскі Іосіф Віктаравіч**, 1932 г.н., **Бучынскі Браніслаў**, 1904 г.н., **Дудзіс Іосіф Іосіфавіч**, 1903 г.н., сын **Францішак**, 1929 г.н., дочка **Яніна**, 1931 г.н., **Звярко Бранісаў Вікенцьевіч**, 1899 г.н., дочка **Валерыя**, 1929 г.н., **Анацкая Анастасія Іосіфаўна**, 1928 г.н., брат **Мар'ян**, 1930 г.н., **Лыскаўка Эдуард Іванавіч**, 1930 г.н., **Яскель Міхаіл Міхайлавіч**, 1903 г.н., сын **Антон**, 1928 г.н., **Мацвей**, 1931 г.н.; **Яскель Антон Міхайлавіч**, 1928 г.н., - чатыры класы; **Генрык**, 1932 г.н.; **Яскель Зыгмунд Антонавіч**, 1905 г.н., жонка **Генуэфа Адамаўна**, 1911 г.н.; **Станкевіч Вацлаў Баляслававіч**, 1919 г.н. - толькі па аднаму класу польскага навучання.

Хаця з дзесятак сем'яў не былі запісаны, бо неадукаваныя…

У школе дзяцей вучылі толькі на польскай мове. Польскія ўлады зняважліва ставіліся да беларускай мовы, звычаяў, праваслаўных свят. Можа, з-за гэтага частка сем'яў зусім не праходзіла навучанне, гаварылі на простай, беларускай мове, але з вялікай колькасцю

польскіх слоў.

*Але не ўсё было адмоўна,*
*калі па шчырасці казаць,*
*Было пры Польшчы ўсё грунтоўна,*
*у тым ліку добра навучаць.*
*Не толькі грамаце вучылі:*
*ну, там лічыць,пісаць,чытаць,*
*Палякі шмат чаго рабілі,*
*каб навучыць лепш працаваць.*

Усе 18 гадоў - з 1921 па 1939 год - дварышчанскія сяляне, пражылі ў складзе Польшчы - дзяржавы, якая многім стала бліжэй за ўсё па духу, мове і рэлігіі.

Польскі ўрад праз органы самакіравання арганізаваў Саюз сельскай моладзі, у задачу якога ўваходзілі не палітычныя лозунгі, а шырокая агранамічная адукацыя сялян, у прыватнасці па ўкараненні ўгнаенняў, пра якія многія вяскоўцы і паняцця не мелі.

У вёсках чулі аб арганізацыі ў Лідзе клуба "Змаганьне", дзейнасць якога была накіравана ў асноўным на палітычнае выхаванне працоўных. “Змаганьне” вяло барацьбу супраць палякаў і агітавала на гэта народ. Лозунгі “Змаганьня” знайходзілі водгук у людзей асабліва на фоне цяжкага падаткавага прэсу, замены натуральных падаткаў на грашовыя. Эйтунскі Вайтовіч Баляслаў Іосіфавіч быў у адной з такіх арганізацый. Працягваючы традыцыі Грамады, ён змагаўся за ажыццяўленне тых самых задач, але выступаў больш паслядоўна і мэтанакіравана. У вёску Тракелі прыязджаў Балінь Станіслаў Казіміравіч з Бянеяк, выступаў каля касцёла, расказваў аб тым жыцці, якое, мажліва, будзе пры Савецкай уладзе. Гаварыў, што гэтае жыццё трэба заваяваць.


URZĄD GMINY

Asygnata przychodowa Nr. ......

Rok obrachunkowy 19 ...... / ......

Kwit Nr. 1103

na otrzymane od ......

| Tytułem | | Nr. nakazu płatn. | Należytość | Kary za zwłokę | Kosztów egzekuc. | Razem |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Złote i grosze | | | |
| Podatku państwowego od gruntów | Zalegl. z lat ub. | | | | | |
| | I rata r. | | 10 10 | - 50 | – | 10 60 |
| | II rata r. | | | | | |
| Gminnego podatku wyrów. ...wczego | Zalegl. z lat ub. | | | | | |
| | I rata r. | | | | – | |
| | II rata r. | | | | | |
| Specjalnej opłaty drogowej | Zalegl. z lat ub. | | | | | |
| | I rata r. | | 3 01 | | | 3 16 |
| | II rata r. | | | | | |
| Opłat zamieniających naturalną pow. podwod. | Zalegl. z lat ub. | | | | | |
| | I rata r. | | | | | |
| | II rata r. | | | | | |
| Razem . . . . | | | | | | 19 31 |

Słownie ......

...... dn. ...... 193 r.

Wójt Gminy

(m. p.)

***Квітанцыя на спагнанне падаткаў з жыхара Эйтунаў Вінцэнта Мікавоза***

У 1938 годзе пры анексіі Гітлерам чэшскіх зямель, Польшчы была кінута нікчэмная костка - кавалачак Сілезіі за ракой Ользай, так званы Шлёнск Заальзянскі.

Польшча здзейсніла гэтую палітычную памылку і пачала абгаворваць эканамічную выгаду, штосьці атрымаюць жыхары Усходніх крэсаў ад уваходжання Сілезіі ў склад Польшчы. Калі б жывы быў Ю. Пілсудскі, то Польшча не здзейсніла б гэтага палітычнага глупства. Гітлеру лёгка ўдалося справакаваць польска-чэшскі канфлікт і непрыязнь аднаго славянскага народа да другога. Сляды гэтай непрыязні заставаліся доўга.

Аднака наспяваў канфлікт Польшчы з самой Нямеччынай, і была зусім незразумелая гэтая "выгада", атрыманая з рук Гітлера.

Палітычная абстаноўка ў 1938 годзе была напалена да мяжы. Захоп Германіяй вольнага горада Гданьска і літоўскай Клайпеды, патрабаванне Гітлера даць калідор, які злучае асноўную частку Германіі з Усходняй Прусіяй і іншыя яго нахабныя дамаганні.

Усім было зразумела, што гэтыя нахабныя патрабаванні калідора - ні што іншае, як здзек з Польшчы, бо *“і гузіка не аддамо”*.

Пачалася вайна…

*"Марш, марш Дамброўскі*
*З землі ўлоскай да Польскі,*
*За тваім пшэводам*
*Злончымся з народам".*

У верасні 1939 года для заходніх беларусаў адбыліся лёсавызначальныя падзеі: уз’яднанне Беларусі ў адзіную дзяржаву …

*У гэтую частку нарыса “Дварышчанскія хронікі” ў асноўным падалі расказы і фатакарткі актыўныя землякі: Арэхава Люцыя Міхайлаўна, Гойдзь Аляксандр Браніслававіч, Віршала Уладзіслава Канстанцінаўна, Вейкуць Яніна Вацлаваўна, Тумілевіч Станіслаў Станіслававіч, Рамук Станіслаў Мацвеевіч, Некраш Францішак Антонавіч, Шарыч Ірына Іванаўна, Круповіч Яніна Іванаўна, Енза Пётр Станіслававіч, Піута Андрэй Іванавіч, Рубель Баляслаў Канстанцінавіч.*

Яны ўсе паабяцалі перадаць расказы, фатаграфіі і дакументы і ў наступныя нумары “Лідскага летапісца”.

**Выкарыстаныя матэрыялы:**

1. Гісторыка-архіўныя даследаванні н.п. Дварышча.
2. “Лідскі летапісец”.
3. Кс. Юрый Бяганскі. Мінулае і сучаснае Дварышча.

*(Працяг у наступных нумарах.)*

***Юзаф Кардаш***

# Ліда праўдзівая*

*(Працяг. Пачатак у папярэдних нумарах.)*

**Цыганы**

*І калі Бог даведаўся пра ўчынак Каіна, ён асудзіў яго і прыгаварыў да вечных бадзянняў. У праўнука забойцы былі тры сыны, першы з якіх стаў патронам людзей, якія жывуць у намётах, і пастухоў. Другі - бацькам тых, хто грае на арфах і іншым "музычным начынні". Трэці апекаваўся рамеснікамі па медных і жалезных вырабах. Усе яны далі пачатак цыганскай нацыі, якая дагэтуль не мае ўласнай дзяржавы і характарызуецца схільнасцю да бадзянняў па свеце.*

Спачатку над ракой былі рэдкія зараснікі і хмызнякі, паміж якіх павырасталі рэдкія алешыны. Затым, аж да месца, дзе ў вёсцы Колышкі зліваюцца рэчкі Лідзейка і Дзірванка, расліннасць станавілася ўсё больш пышнай, і ў некаторых месцах над рэчышчам раслі алешыны са стваламі дыяметрам да 70 сантыметраў. Гэта былі сапраўдныя гушчары, дзе хаваліся чароды дзікіх качак, асабліва ў паваротах ракі. Ранняй вясной, вібрацыяй сваіх крылаў захоплена "бляялі" бякасы, палохаючы маленькіх дзяцей, а ўвечары ў балотах грымелі дзеркачы, за якімі ганяліся большыя хлопцы. Улетку ў крышталёва чыстай вадзе ракі, нібы ў люстэрку, адлюстроўваліся гронкі чырвоных ягад і чорнай парэчкі, што звісалі з кустоў. Вясковыя дзеці, якія збіралі спелыя ягады, пратоптвалі сцежкі ў траве каля рэчышча, на што наракалі дарослыя. Цяжка перадаць прыгажосць пейзажу ў той час, калі квітнелі шматлікія дрэва-кусты белай чаромухі.

За паўкіламетра на поўнач ад вёскі Малэйкаўшчына на рацэ стаяў вадзяны млын пад назвай Чэхаўскі. Ён належаў маёнтку Чэхаўцы і арандаваўся яўрэйскімі партнёрамі, сімпатычным Іршкам і некалькі панурым Бэнчам. Да вайны яны таемна гандлявалі махоркай. У курца не заўсёды хапала грошай на цэлы пачак, таму яны прадавалі яе, дзелячы напалову ці нават на чатыры часткі. Пасля таго, як немцы забілі яўрэяў, арандатарам стала праваслаўная сям'я Коршуля. Яго сын Мікалай (звычайна яго называлі Колька) быў вясёлым гулякам, але працавітым, старанным, прыязным, добрым суседам і сябрам. Ад нараджэння ў яго была крыху крывая шчака. Ён заляцаўся да Нюсі Сарокі з вуліцы Віленскай, якая працавала разам пры немцах у рабочым бюро ў Лідзе.

Гэты млын быў пабудаваны з добра апрацаванай, прыгожа абчасанай драўніны. У 1957-1958 гадах старшыня калгаса імя Свярдлова, расеец па прозвішчы Х...коў, разабраў яго і пабудаваў сабе прыгожы драўляны дом. Акрамя таго, гэты вандал загадаў спілаваць чатырнаццаць прыгожых адзінокіх хвой, якія раслі за 2-10 метраў ад жылога дома на сядзібе мясцовага сяляніна. На поўнач ад млына, на левым беразе ракі, раслі густыя зараснікі арэшніку. Восенню жыхары з бліжэйшых вёсак прыходзілі збіраць туды арэхі, а маладыя хлопцы беглі па тонкія парасткі, з якіх рабілі вуды або пруты для пляцення кошыкаў. Чым бліжэй да крыніц, тым больш уздоўж ракі і на балотах расло вярбы.

Паміж зараснікамі арэшніку ля млына і мостам каля маёнткавых будынкаў, якія ляжалі далей на поўнач, распасціралася прыгожая, злёгку ўзвышаная раўніна, падобная на пагорак. З усходняга боку сцяной рос стары сасновы лес. Улетку гэта было ўлюбёнае месца для школьных экскурсій, скаўцкіх і моладзевых лагераў. Да вайны на ўзгорку часта станавіўся лагерам цыганскі табар. З бліжэйшых хутароў, а таксама з блізкіх вёсак цыганы запрашалі моладзь.

- Пане, пусці сына да нас на вечар. Хай правядзе час з цыганамі, хай пазнаёміцца і палюбіць нашых дзяцей. Мы прывядзём яго дадому.

Яны прапанавалі Станіславу К. (старэйшаму) з суседняй вёскі аддаць аднаго са сваіх чатырох сыноў, які быў высокі, вельмі прыгожы і цёмнавалосы.

- Аддай яго нам, у табар, мы ажэнім яго з найпрыгажэйшай цыганкай, купім яму карэту, дамо пару коней і хай едзе з намі. Ён не будзе адчуваць галечы і голаду і спазнае людзей і свет.

Бацька не пагадзіўся, ды і сын не хацеў станавіцца цыганам.

Цыганская моладзь, здавалася, была абавязана танцаваць і спяваць вакол вогнішча ўвечары па некалькі гадзін, часта да позняй ночы. У забавах удзельнічалі таксама малыя цыганы, танцуючы з голымі пупкамі і растрапанымі валасамі. Стары цыган Вайдаловіч граў для іх на сваёй таксама старой двурадцы "Саноры", якую часта рамантаваў вядомы майстар музычных інструментаў Пуцята са Слабодкі ў Лідзе. Над ракой, дзе пачынаў падымацца шэры туман, а ў кустах пасвіліся спутаныя коні, плылі прыемныя цыганскія мелодыі старых рамансаў, песень і вальсаў, пераплятаючыся са

* *Пераклад Станіслава Судніка з кнігі: Jozaf Kardasz, “Lida prawdziwa”, Agiencja Wydawnicza, “Remix”, s.c., Olsztyn, 1997 r.*

спевамі танцуючай моладзі. Пасля забавы табар засынаў. Часам завішчыць парася, прывязанае пад цыгаскім возам, або забрэша сабака. Касцёр згасаў, але ў вушах усё яшчэ гучаў шум табара, фырканне коней, канцэрт салаўёў і крыкі дзеркачоў. Цішыня і цяпло летняга вечара хілілі да сну.

Як прыгожую паэзію слухалі з вялікай прыемнасцю варажбу старой цыганкі. Дарослы юнак, стоячы ў шарачковых портках і зрэбнай кашулі, убіраў кожнае слова, якое цыганка чытала і прамаўляла з малюнкаў на пацёртых старых картах.

- Тваё жыццё пойдзе двума шляхамі, але гэтыя шляхі будуць сплеценыя разам, як два шнуры. Вялікае шчасце будзе пераплятацца ў тваім жыцці з яшчэ большым няшчасцем. Твая вялікая слабасць да прыгожай паловы прынясе табе шмат шчасця, а ёй - няшчасце. О, - цыганка паказала на даму каро ў руцэ, - гэтая дама побач з табой - твой лёс, і яна прынясе табе задавальненне і прынясе плод, але ты не захочаш яго бачыць; ты ўцячэш ад яго і больш ніколі не ўбачыш. Два казённыя дамы стаяць побач з табой і чакаюць цябе. Уцякаючы ад свайго шчасця, ты з радасцю пойдзеш у адзін з іх, але гэты дом пачне разбурацца. Ты пакінеш яго, але і ў родны не вернешся. На зваротным шляху ты заблудзішся і ўвойдзеш у другі, і паколькі ты любіш спаць позна і не любіш уставаць на світанні, то само сонца падыдзе да цябе і пакажа табе шлях у вечнасць. Ссунь карты. Але не пужайся іназірай. Побач з табой пікавая дама, твая верная і міласэрная сяброўка з-пад пустыннага сонца, якая шчыра цябе кахае. Яна не адпусціць цябе ў вечнасць; яна дасць табе ваду жыцця, яна аддасць табе сваё шчырае сэрца, і ты будзеш піць салодыч кветак у яе садзе. Ты зменіш свой дом і пасадзіш пад сонцам два дрэвы, але ты лянівы і распешчаны. Ты не захочаш паліваць гэты сад, хоць у ім ёсць крыніца жыватворнай вады; адно дрэва засохне. Пікавая дама будзе паліваць другое, пакуль яно не вырасце і не прынясе плады. Ты пакінеш яе сад, а ты ўжо слабейшы і менш знаходлівы. Тваё сэрца добрае, але зменлівае; што яно аднойчы ўбачыла, яно палюбіла, бо ў ім вялікае каханне. Ссунь карты. Ты зменіш краіну і людзей, страціш сонца і пакінеш пікавую даму, бачыш, як далёка яналяжыць ад цябе. Ты прыклеішся да дамы трэф, але, як тая карта са зламаным рогам, так яе лёс і цела зламаныя, але гэта цябе не турбуе, і табе спатрэбіцца любоў да чалавецтва, захаваная ў яе сэрцы. Ты нецярплівы і прагны, ты забярэш у яе гэтую любоў, будзеш блізкі да яе, аддасі ёй часцінку свайго ўжо халоднага сэрца і не будзеш асабліва атрымліваць асалоду ад яе цяпла, але яна будзе паліваць вашы два агульныя дрэвы вадой жыцця, пакуль яны не прынясуць пладоў. Вада з яе студні больш не будзе смачнай для цябе, але ты будзеш назіраць, як растуць твае дрэвы. Узнікне ў табе і выбухне нянавісць да свайго лёсу. Ты пачнеш лятаць, як стары матылёк, вакол падвялых кветак, шукаючы больш салодкі нектар, якога ўжо не знойдзеш.

Выцягні карту. Глядзі, дама трэф адышла і ўжо далёка ад цябе. Гэтая найслабейшая карта ўцягне цябе ў гульню, бо ты страціў чалавечае жыццё праз сваю неабдуманасць. Цяпер ты прайграеш усё з-за дамы вялікага горада, бо з ёй ніхто не выйграваў. Яна асляпіць цябе і ноччу ўвойдзе ў твой дом. Твае суседзі будуць праклінаць цябе і здзіўляцца, чаму ты страціў розум і вочы. Яна дасць табе есці ў смярдзючай пасудзіне, ты страціш усё і пакінеш свой дом. Ты пакінеш вялікі горад і будзеш блукаць, як сабака. Ссунь карты і дай мне залатоўку.

- Няма.

- Добра, прынясеш. Тваё жыццё цікавае, і я скончу варажыць. Бачыш гэтую даму. Ты ўбачыш яе са свайго шляхетнага дрэва аж у чужым краі. Багатая і прыгожая, яна страціла караля трэф, і яе сэрца сумнае і тужлівае. Яна ўзнагародзіць цябе за ўсе твае жыццёвыя пакуты, і твае цяжкасці пры ёй будуць забытыя. Але ў цябе цяжкі і зменлівы характар. Твая слабасць засталася з табой. Ты здрадзіш ёй. Цяпер будзь асцярожны, бо, дзе здрада, там і смерць. Ты будзеш прагнуць убачыць сваё дрэва пад пякучым сонцам. Тваё жаданне спраўдзіцца. Ты кінеш усё, каб паглядзець на яго, ты паедзеш туды і знойдзеш яго, і яно трохі супакоіць тваё сэрца. Ты вернешся, выйдзеш на вуліцу, перадумаеш і назаўжды пакінеш сваё шчасце. Твае два дрэвы схіляцца над табой, ты памірышся з дамай трэф, і хоць ты не думаў, зноў злучышся з ёй. Ты застанешся з ёй назаўжды і больш не будзеш шукаць змен у сваім жыцці.

- Дай залатоўку.

- Няма.

- То і варажыць далей не буду.

Некалькі зім сям'я Вайдаловічаў жыла ў здымнай кватэры ў раёне Малэйкаўшчыны, вядучы аседлы лад жыцця. Іх сын Казік нават хадзіў у школу. За некалькі гадоў да вайны жыхар Жалудка атрымаў у спадчыну ад сваякоў са Злучаных Штатаў прыгожую канцэртную гармонію. Ніхто з музыкаў у навакольных вёсках не мог на ёй іграць. Вайдаловіч, вандруючы па свеце, даведаўся пра тую гармонію. Ён агледзеў яе і прапанаваў гаспадару купіць. Той пагадзіўся прадаць інструмент. Цыган прадаў коней, воз, пярыны, старую "Санору", усю сваю цыганскую маёмасць, напазычаў грошай і купіў гармонію. Ён даволі доўга вучыўся іграць на ёй. Быў сталым слухачом грамафонных пласцінак у музычнай краме ў Лідзе. Кліенты, купляючы пласцінкі, праслухоўвалі іх, а цыган з настаўленым вухам уважліва слухаў. У яго быў талент; праз год ён ужо граў на забавах, а праз некалькі гадоў заявіў, што можа граць з аркестрам. У яго не было вялікага пальца на правай руцэ, і ён граў толькі чатырма пальцамі. Аднак, наколькі я памятаю, такога музыканта ў ваколіцы не было. Ён браў ад дваццаці пяці да пяцідзесяці злотых за ігру адной партыі. Неўзабаве ён разлічыўся з даўгамі і пачаў досыць заможна жыць са сваёй сям'ёй.

Яго сын Казік таксама навучыўся іграць. Ён сядзеў так, што яго амаль не было відаць з-за гармоніі, толькі ліліся прыгожыя мелодыі старых вальсаў і танга, спачатку сольныя, а з часам гучалі акордамі. Любіў

іграць сучасныя мелодыі таго часу, падслуханыя ў музычнай краме з пласцінак, такія як: "Я больш ніколі не пачую мелодыі тваіх слоў...", "Звычайна восенню так бывае, што каханне, як кветка вяне..." або "Гэта апошняя нядзеля, сёння мы расстанемся...". Нядзеля, якая трагічна прыйшла разам з вайной.

У 1941 годзе ўвайшлі немцы, і разам з імі пачалася "ліквідацыя непатрэбных элементаў". Сярод іх былі не толькі яўрэі, інваліды, псіхічна хворыя і партызаны, але і цыганы. Калі ў 1942 годзе немцы вялі сям'ю на расстрэл, стары цыган ішоў у слязах з маленькім дзіцем на руках. Немцы прапанавалі яму выратаваць жыццё, калі ён сыграе для іх у казіно. Ён адмовіўся; хацеў быць са сваёй сям'ёй. Загінуў і сямнаццацігадовы цыган Казік, таленавіты, вясёлы і ветлівы хлопец, магчыма, будучы артыст. Гармонію забралі літоўцы, бо яны разам з уласаўцамі расстрэльвалі цыганоў. Яны прадалі яе восенню 1943 года нейкаму селяніну за 120-кілаграмовага вепрука і два літры самагонкі.

**Цыганская малітва**

*Цыган варожыць на картах.*
*Цыган жыве з карт.*
*Цыган моліцца па картах.*

*Раскажу гісторыю, якую я калісьці чуў пра цыгана, які маліўся па картах.*

Некалькі цыганоў служылі ў вайсковым палку. У роце быў цыган. Салдаты з казармы арганізавана хадзілі ў касцёл па нядзелях на ранішнюю імшу. Хадзіў і цыган. У касцёле салдаты даставалі з кішэняў малітоўнікі і маліліся па іх.

Цыган не ўмеў ні чытаць, ні пісаць, таму даставаў з кішэні калоду карт і, тасуючы іх, шаптаў нешта сабе пад нос. Салдаты, якія стаялі побач, бачылі гэта, але нічога не казалі. Агульнавядома, што цыган ніколі не пакідае сваіх карт і заўсёды нешта задумаў. Адзін салдат, нібыта самы набожны, данёс камандзіру роты, што цыган не моліцца падчас набажэнства, а гуляе ў карты. Даносчык лічыў, што цыган у хрысціянскай святыні абражае Бога, бавячыся з картамі. Камандзір загадаў цыгану прыйсці з рапартам. Калі цыган гэта зрабіў, камандзір пагражаў арыштаваць яго, калі ён не раскрые, чаму бавіцца з картамі ў касцёле. Цыган далажыў, што не гуляе ў карты, а моліцца па іх.

- Як можна маліцца па грэшных малюнках? - строга спытаў камандзір.

Каб пазбегнуць арышту, хацеў ён таго ці не, цыган мусіў расказаць камандзіру, як выглядае яго малітва па картах.

- Пан камандзір! Я не ўмею ні чытаць, ні пісаць, бо, вандруючы па свеце, я не хадзіў у школу, і не ўмею маліцца па малітоўніку, як іншыя, і малітваў не вывучыў, але магу прачытаць па картах не толькі лёс чалавека, але і малітву да Бога.

- Дык вось, цыган, раскажы мне, як выглядае твая малітва па картах.

Цыган выцягнуў калоду карт з кішэні і перад камандзірам пачаў перакладаць карты адну за другой.

- Бачыце, пан, пане камандзір! Тут чатыры масці, і самая моцная з іх чырвоны колер, колер агню і святла, колер цяпла, радасці і любові да Бога, людзей і ўсяго, што стварыў Бог. З масцяў самая моцная карта - джокер. Для цыгана чатыры масці ўвасабляюць чатыры поры года, а джокер - адзінага ўсемагутнага Бога, стваральніка Сусвету і нашага пазнавальнага, матэрыяльнага і блізкага да чалавека Бога - Зямлю, якая ўзнікла і нарадзіла найвялікшы цуд прыроды - жыццё, а ўнутры яго - чалавека, цела і постаць якога - найвялікшая дасканаласць сусветнай гармоніі. Зямля дае чалавеку ежу, усе багацці і радасці жыцця.

І гэтак жа, як воды акіянаў выдзяляюць пару, з якой утвараюцца хмары, і дождж, які падае на зямлю, які абліваецца пякучым сонцам, каб ён даваў багаты ўраджай, каб карміць усё, у тым ліку і чалавека, потым сцякае па рэках да мора і пастаянна паўтарае адно і тое ж, выклікаючы кругазварот вады ў прыродзе, так і ўсё жывое, створанае Богам, таксама падпарадкоўваецца кругазвароту.

Усё, у тым ліку і чалавек, нараджаецца, каб жыць, потым паміраць і ўваскрэснуць праз сваіх нашчадкаў, тым самым завяршаючы кругазварот жыцця ў прыродзе. Так, пане камандзір! Чалавек уваскрасае ў сваіх нашчадках, і Бог ёсць Богам жывых, а не мёртвых.

Цыган жыве найбліжэй за ўсё да прыроды, будучы яе маленькай часткай, таму ён у Богу, а Бог у ім. За гэтае прыгожае жыццё, за святло і цяпло Сонца, гэтай "ліхтарні і розуму свету", за святло месяца, нашага "цыганскага сонца", я дзякаваў Богу, перакладваючы гэтыя карты. Гэтыя чатыры поры года, сваімі разнастайнымі спосабамі, абдорваюць маё жыццё сваёй прыгажосцю і багаццем.

Няхай паглядзіць пан, пане камандзір, на вясну, якая пабуджае ўсё да жыцця. Цыган бачыць і адчувае гэта найлепш. Гэтая вясновая зеляніна і пах лісця зялёных бяроз, майскі гул хрушчоў вакол іх, спеў салаўёў, кукаванне зязюль і булькатанне крынічнай вады ў ручаі. "...і там рай, дзе музыка вады", гэтыя туманы над ракой, гэты прастор і свабода, гэты шум ветру ў лесе, а ў ім рэха цыганскіх скрыпак і песень - усё гэта музыка, якую грае аркестр Пана Бога, музыка, якую цыган чуе і разумее найлепш, і за якую ён дзякуе Богу па картах.

Урачыстая песня: *"Хваліце квяцістыя лугі, горы, зялёныя даліны, хваліце цяністыя гаі, крыніцы і звілістыя ручаі. Гэта вянец Божых спраў, карона над усім узнятая. Хваліце Зямлю, Гаспадыню свету, на якой жыццё пляце вянок"*, - у ціхі, цёплы маёвы вечар плыве сваёй мелодыяй над лугамі, гаямі і палямі праслаўляючы Вялікага Цудатворцу.

А вось чатыры тузы, падобныя да чатырох бакоў свету, кожны з якіх квітнее боскім жыццём. Дзякуй Табе, Божа, за тое, што цыган можа арыентавацца, у які бок свету ён можа падацца, каб зарабіць на хлеб варажбой, успрымаць прыгажосць узыходзячага і заходзячага сонца, яго вялікую сілу святла і цяпла, без якіх не было

б жыцця і магчымасці сну і адпачынку, калі яно знікае за гарызонтам.

Тут у калодзе пяцьдзясят дзве карты, гэта столькі, колькі тыдняў у годзе, а ў іх - нядзель для малітвы, пра якія без карт цыган не ведаў бы і не меў бы магчымасці пачуць Евангелле - Слова Божае - пазнаць Бога, славіць Яго і жыць паводле Яго.

Вось чатыры каралі. Трое з іх нагадваюць тых з часоў Хрыста, якія, як зямныя каралі, першымі пакланіліся каралю нябёс, немаўлю Езусу. Чацвёрты - Ірад, які загадаў выразаць нявінных дзетак, каб сярод іх загінуў кароль нябесны. Я малюся за ўсіх іх, тых высакародных і богабаязных людзей, і за Ірада, каб Бог дараваў яму гэтае злачынства, бо Маці Божая-Зямля і яго таксама прыняла ў сваё ўлонне.

Цыган узяў у руку даму.

- А дамы, пане камандзір! Усе чатыры - гэта сімвал святых жанчын. Найсвяцейшая Панна Марыя, маці Хрыстуса наведала святую Лізавету, калі яна была ў дабраслаўлёным стане, яна зносіла боль болесці ўкрыжаванага сына; святая Вераніка выцерла скрываўлены і збалелы твар Езуса, калі ён упаў пад цяжарам крыжа, а святая Магдаліна памазала цела закатаванага Хрыста духмянымі алеямі пасля таго, як Яго знялі з крыжа. Марыя Магдаліна, Марыя, маці Якуба, і Саламея суправаджалі Яго, калі Ён быў у Галілеі, і здалёк назіралі за Яго смерцю.

Пане камандзір! Жанчына - гэта цуд жыцця, найпрыгажэйшая кветка ў свеце. Нават распусніца аблівала Яго ногі слязьмі, выцірала іх валасамі, цалавала іх і намазвала духмяным алеем. Тады Хрыстос сказаў ёй: "Я не асуджаю цябе. Ідзі і адгэтуль больш не грашы". Карта раскажа табе ўсё, карта скажа табе праўду. Божа, даруй і мне.

Цыган пашукаў у калодзе і выбраў усіх чатырох валетаў. Аднаго з іх адлажыў пад ніз калоды.

Гэтыя тры валеты падчас імшы ў святыні нагадваюць мне распятага Хрыста з двума разбойнікамі, адзін з якіх выказаў раскаянне і пашкадаваў аб сваіх грахах, просячы ў Езуса прабачэння.

- Яшчэ сёння будзеш са мной у раі, - сказаў канаючы Езус, і гэтым ён суцешыў разбойніка, распятага разам з ім.

- Езу, дай і мне, беднаму цыгану, суцяшэнне ў маёй бядзе!

- А што азначае той валет, якога ты паклаў пад ніз калоды карт? - спытаў камандзір крыху больш лагодным тонам.

- А гэта, пане камандзір, сімвал Юды Іскарыёта, які выдаў Езуса габрэйскаму натоўпу для распяцця, і сімвал таго салдата, які стаяў побач са мной у царкве і данёс пану камандзіру, што я гуляю ў карты, за што я маю трапіць пад арышт. Але я не гуляў у карты; я думаў пра мукі Панскія, і таму я маліўся па картах, бо карта раскажа табе ўсё, карта скажа табе праўду. Я ўмею чытаць малітвы па картах, нават калі сам я чытаць не ўмею. Каралі, дамы і валеты - гэта дванаццаць фігур, якія абазначаюць для мяне, цыгана, дванаццаць апосталаў, і сімвалізуюць дванаццаць месяцаў года.

Цыган перамяшаў карты і, адчуўшы крыху больш смеласці, папрасіў камандзіра выцягнуць карту з калоды. Трапілася сямёрка.

- Семёрка, - працягваў цыган далей, - гаворыць пра вялікую творчасць і працу Бога Айца, які стварыў Свет за шэсць перыядаў і сёмы адвёў для адпачынку, каб людзі маглі маліцца і славіць Яго вялікую і, для цыгана, незразумелую працу - створаны Свет, у цэнтры якога Ён паставіў чалавека, каб той мог лягчэй бачыць усё, што ёсць на ім, у ім і над ім. Семёрка нагадвае нам пра сем галоўных грахоў, якіх трэба пазбягаць, каб заслужыць на усё дабраславенне ад Бога.

Цыган пачаў грэбціся ў картах і выбраў дзясятку.

- Чатыры дзясяткі, - разважаў цыган, нібы абдумваючы разлік, - гэта сорак вочак, якія распавядаюць цыгану пра саракадзённы пост Хрыста ў пустыні, куды ён пайшоў, каб пазбегнуць усялякіх спакус. "Адыдзі прэч, сатана, і не ўводзь нас у спакусу!" - сказаў Хрыстос, калі сатана, спакушаючы Езуса, запатрабаваў, каб ён пакланіўся яму, узамен на што абяцаў даць яму зямное каралеўства. Я стараюся пазбягаць усіх спакус і кланяцца толькі Пану Богу.

- А калі сатана схаваецца ў тваёй руцэ, што нам рабіць? - спыталі верныя Хрыста.

- І там біце яго, - адказаў Ён.

Кожная дзесятка нагадвае мне, цыгану, пра дзесяць Божых запаведзяў, каб я жыў паводле іх, якія цыган імкнецца выконваць, акрамя сёмай. Цыган часта парушае яе, і таму я малюся тут больш горача, бо вялікая міласэрнасць майго продка дала цыганам звычку красці. Калі Хрыста прыбівалі да крыжа, у натоўпе апынуўся цыган, якому стала шкада распятага. Цыган наблізіўся да катаў, жадаючы ўкрасці цвікі, але яму ўдалося ўкрасці толькі адзін, таму абедзве нагі пакутніка былі прыбітыя адным цвіком. Няхай Бог даруе нам і крадзяжы, якія часам здараюцца з цыганамі.

Потым цыган пачаў тлумачыць, адну за адной, малітвы, якія ён узносіў да Бога па астатніх картах.

- Дзявятка, пане камандзір, загадвае мне дзякаваць Богу за тое, што, як Найсвяцейшая Панна, так і мая жонка, і кожная цыганка, носіць плод кахання, задавальнення і жыцця ў сваім улонні ўсяго дзевяць месяцаў.

Тады цыган узяў у руку васьмёрку.

- Васьмёрка - гэта дзень ахвяравання Дзіцяці Богу, надання Яму імя Езус і правядзення рытуалу абразання, які з'яўляецца гігіенічнай працэдурай супраць пэўнай хваробы ў цёплым клімаце. Карта раскажа табе ўсё, карта раскажа табе праўду. Пасля ўрачыстага дня свята Божага Цела адзначаецца актава гэтага свята, падчас якой на працягу васьмі дзён працэсіяй і малітвай вернікі ўшаноўваюць і пакланяюцца Святой Эўхарыстыі.

Пяцёрка паказвае, што ў пятым перыядзе стварэння стомленасць Бога прывяла да няўдач у некаторых справах. Першы чалавек, якога Ён стварыў, быў часткова падобны на малпу, і да таго ж гарбаты. Убачыўшы гэта, сам Бог міжволі вылаяўся. Паважаючы Бога,

гарбун лагодна спытаў:

- Пане Божа, ты стварыў усё так прыгожа, а паглядзі на мяне, гарбатага, як я выглядаю?

Пан Бог трохі нерваваўся, але коса зірнуў на сваё няўдалае стварэнне і сказаў:

- Як на гарбатага, то і так добра.

Пяцёрка - гэта пяць касцельных запаведзяў, праз якія чалавек сам павінен удасканальвацца, каб быць сапраўдным вернікам у сваім касцёле.

Пятніца - дзень пакутаў Панскіх. На пяты дзень тыдня Хрыстос быў распяты. Гэты дзень - дзень посту і роздуму пра пакуты Панскія.

- Шасцёрка, як я ўжо казаў, - гэта дзень Божай працы па завяршэнні стварэння Свету і Яго найвялікшай справы - стварэння чалавека, чыя дасканаласць заключаецца ў тым, каб узняцца да боскай годнасці, каб ён мог удасканаліць свет. Я баюся Бога, стараюся не лаяцца, каб не пакрыўдзіць Яго і не быць праклятым. У Яго Духу ёсць вялікая сіла, і яна кіруе лёсам чалавека, у што я, цыган, цвёрда веру.

Калі я адкрываю чацвёрку, - працягваў цыган, - яна кажа мне, што было чатыры апосталы і евангелісты: святы Марк, святы Мацвей, святы Лука і святы Ян. З дапамогай гэтай карты я прашу Бога даць мне ўважліва і пільна слухаць Евангелле ў святы дзень, а не азірацца па святыні, каб падглядваць за іншымі, як і чым яны моляцца, каб я мог жыць і дзейнічаць паводле яго вучэння, шанаваць і праслаўляць Бога і Яго цудоўную працу - створаны свет і жыццё ў ім, каб я мог быць чалавекам, які шануе Слова Божае. Тройка падобная да Найсвяцейшай Тройцы Бога Айца, Сына Божага і Святога Духа. Таму я малю Святую Тройцу заўсёды слухаць мае малітвы, выратаваць і абараніць цыгана ад усяго зла ў маім жыцці, а цяпер і ад непазбежнага арышту.

Цыган на хвіліну змоўк, выглядаючы стомленым. Здавалася, ён спрабаваў перавесці дыханне, а потым сказаў:

- Я скончыў, пане камандзір!

Камандзір, які слухаў, нібы ачуняў ад задуменнасці і спытаў:

- А двойка, чаму ты забыўся пра яе і адмаўляешся ад яе?

- Двойка, самая слабая карта, - гэта непазбежны закон у свеце, дабро і зло, дзве супрацьлегласці, дзве супярэчнасці, якія змагаюцца адно з адным з пачатку свету, прычым то адна атрымлівае перавагу, то другая. Гэта натуральны рэгламент Свету, створанага такім чынам. Двойка - гэта Сонца і Зямля, як сям'я, як шлюб, які падтрымлівае жыццё ў свеце. Двойка - гэта цень і святло, як мір і вайна, як мудрасць і глупства, як жыццё і смерць. Двойка - гэта мы таксама двое, пане: я, бедны, не ўмею чытаць і пісаць, і таму не ўмею маліцца па малітоўніку, цыган, які дрыжыць ад страху перад табой, уладным камандзірам, бо я малюся не так, як усе астатнія, а па вобразах грэшных карт, за што мушу панесці пакаранне і трапіць пад арышт. Але без цыганскіх карт я не прачытаю такую малітву, пра якую я табе расказаў. Толькі карта ў руцэ цыгана праўдзіва скажа табе і выснуе малітву. У мяне ногі трасуцца і баляць ад стаяння навыцяжку, бо цыган да гэтага не прызвычаены. Дай мне, пане камандзір, лёгкі арышт. Цыган - дзіця прыроды, любіць свабоду і павінен жыць свабодна, а ў няволі і заключэнні ён загіне, і цыгана больш не будзе. Дазволь мне, пане, працягваць маліцца па картах, бо без іх я не адгавару ніводнай малітвы. Прабач беднаму цыгану, пане. Цыган змоўк і баязлівым, поўным просьбы паглядам то пазіраў на камандзіра, то апускаў зрок у зямлю.

Камандзір парушыў цішыню.

- А скажы мне, цыган, чаму на картах няма адзінкі?

- Адзінка ў картах, - растлумачыў цыган, - падобная да туза, і іх цяжка было б адрозніць. Адзінка абазначала б яшчэ не парваную, але астатнюю струну на скрыпцы, сімвал чалавечага жыцця, на якой для чалавека грала б толькі смерць, а смерць грае неасцярожнана, і ў той момант, калі гэтая струна парвецца, жыццё чалавека скончыцца.

- То паваражы мне, цыган, - звярнуўся да яго камандзір.

- Ці даруеш ты мне арышт, пан камандзір? - спытаў цыган, неяк асмялеўшы і з іскрай надзеі ў вачах.

- Калі ты скажаш мне праўду, я дарую табе арышт, бо твая малітва па картах таксама гарачая, поўная веры і багатая на веды пра хрысціянства, адну з універсальных рэлігій свету.

* * *

Камандзір дараваў арышт і ў душы дзівіўся яго, як на цыгана, значнымі рэлігійнымі ведамі і моцнай верай.

Цыган прадказаў, што камандзір стане высокапастаўленым афіцэрам, што і спраўдзілася.

**У Чэхаўцы**

Мы пакінем Цыганскую горку і ўспаміны пра яе. Пяройдзем па мосце на другі бок ракі. Адразу за мостам стаялі каменныя руіны былога піваварнага завода. У 1940-41 годзе бальшавікі цалкам разабралі яго, выкарыстаўшы камяні для будаўніцтва аэрадрома. На правым баку рэчышча стаяў "палацык". Гэта быў цагляны будынак какава-малочнага колеру з пяццю пакоямі на першым паверсе і трыма на паддашку. Побач з ім быў даволі вялікі, ладны сад, у якім рос адзін дуб, дыяметрам каля двух метраў, узрост якога ацэньваўся ў 400 гадоў. У ясныя дні руская армія расстаўляла пад яго кронай сталы, арганізаваўшы сталовую на сто чалавек. Да вайны палац і маёнтак плошчай больш за 200 гектараў належалі Яну Петрусевічу, але ўсім маёнткам кіравала сястра яго жонкі, Караліна, якую празвалі "паненкай". Петрусевіч працаваў у горадзе, а яго дзеці, Аля і Людак, таксама вучыліся там у школе. Яны прыязджалі на лета, каталіся на байдарках і стралялі з пнеўматычнай вінтоўкі. Калі пачала набліжацца вайна,



**Вёска Чэхаўцы**

у 1938 годзе Петрусевіч прадаў мясцовым жыхарам пяцьдзесят гектараў зямлі з лесам (урочышча Буслава), размешчаным у паўночна-заходняй частцы маёнтка. Паўднёва-заходнюю частку, паміж алеяй і млынам, выкупіла дзяржава для палявога аэрадрома. У жніўні 1939 года тут было каля 15 біпланаў, некалькі лёгкіх самалётаў і два "Карасі". У 1940 годзе бальшавікі пачалі яго разбудоўваць.

З маёнтка ў бок вёскі Стругі на паўднёвы захад вяла прыгожая алея, абсаджаная бярозамі, верагодна, часоў Кацярыны II. Масіўныя бярозы, з якіх амаль да зямлі звісалі "косы" з тонкіх галін, велічна стаялі, як белыя калоны, што падтрымлівалі свае зялёныя кроны. У 1940 годзе, пашыраючы аэрадром, бальшавікі прыбралі іх і выраўнялі рэльеф мясцовасці. Саветы прымушалі жыхароў навакольных вёсак, якія перавозілі зямлю, выраўноўвалі і ўбівалі пляцоўку. Ім даводзілася выконваць усю працу без механічнай тэхнікі. Кажучы праўду, рускія нібы трохі плацілі, але гэта былі грашы.

Вернемся яшчэ да палацыка. У 1940 годзе расіяне стварылі там прытулак для пажылых людзей і інвалідаў. Немцы дадаткова размясцілі там параненых бальшавіцкіх нявольнікаў, якія будавалі аэрадром у Начы, на паўночны захад ад Ліды. Сярод іх былі Жураўлёў, Святлоў, нейкі Яшка, армянін Ялдаш і некалькі іншых. Яшчэ ў 1942 годзе некаторыя з гэтых мужчын належалі да падпольнага руху пад кіраўніцтвам лейтэнанта Грышкі Водзіна, якога прыняла сям'я Янкоўскіх з вёскі Доўкні. Яны кантактавалі з апісанымі раней расіянамі з вёскі Гервянікі ў Пасеках, пра якую гаварылася раней. За рабаванні і забойствы мясцовых жыхароў Армія Краёвая пачала ліквідацыю некаторых з іх. У чэрвені 1944 года знайшлі над Лідзейкай у трохкутніку паміж маёнткам Чэхаўцы, вёскай Кольшкі і засценкам Чэхаўцы застрэленага Святлова. Астатнія некуды зніклі.

Згадаем таксама аэрадром. Немцы абаранялі яго з траўня па 8 ліпеня 1944 года. У іх распараджэнні былі дзве зенітныя гарматы. У той час на аэрадроме знаходзілася дзевяць знішчальнікаў: адзін штурмавік і адзін двухкорпусны самалёт. У ноч з 5 на 6 ліпеня рускія бамбілі гэты раён. Адна бомба ўпала побач са штурмавіком, параніўшы некалькіх немцаў, а другая - побач з баракам, дзе размяшчаўся штаб, разбіўшы толькі некалькі даховак асколкамі. Дзве 50-кілаграмовыя бомбы ўпалі на лугі каля русла ракі. 8 ліпеня 1944 года расійскія войскі ўвайшлі і збілі нямецкі двухкорпусны самалёт. Да позняй восені 1944 года на аэрадроме знаходзілася больш за 70 двухматорных расійскіх бамбардзіроўшчыкаў, якія лятalі бамбіць Усходнюю Прусію. Пілот па імені Віктар распавёў мне, што калі эскадрылля была гатовая да ўзлёту, з аднаго з бамбардзіроўшчыкаў адчапілася цалкам падрыхтаваная бомба. На шчасце, яна не выбухнула, бо знішчыла б дзевяць самалётаў.

Прыкладна за дзвесце метраў на захад ад будынкаў маёнтка, дзе пачыналася бярозавая алея, калісьці былі невялікія вясковыя могілкі, якія састарэлі і знікалі з часам. Яшчэ да Першай сусветнай вайны там стаяла драўляная капліца, прысвечаная святому Антонію. Аднак з часам яна згніла, як і дрэвы вакол яе.

Мама расказвала, што ў 1920 годзе ў Лідзе камуністычныя актывісты разам з габрэямі забілі каля дзясятка польскіх салдат (нібыта дзевяці і аднаго ўнтэрафіцэра). Іх целы некаторы час былі пахаваны на гэтых невялікіх могілках. Бацька дадаў, што падчас баёў за Ліду ў 1920 годзе некаторыя габрэі не спрыялі польскім войскам, таму нашы рваліся "пагуляць", але гэта было строга забаронена.

Ад могілак дарога вяла на поўнач праз вёску Чэхаўцы. Там жылі Казлоўскія, Романы, Палубінскія, Хрулі, Грыгуць, Чарнавус і Вайсят. Юзаф, Стэфан і Вацлаў Казлоўскія былі добраахвотнікамі, удзельнікамі вайны супраць бальшавікоў. У 1943-1944 гадах маладзейшае пакаленне належала да Арміі Краёвай; усяго каля 15 хлопцаў. Варта ўзгадаць некаторых з іх. Янак Палубінскі, сын Уладзіслава, хоць і быў юнаком, быў у вышуку бальшавікоў, таму некалькі гадоў хаваўся. Цяжка паранены і схоплены супрацоўнікамі НКВД (Смерш), ён сарваў з сябе бінты ў шпіталі, каб пазней

не падвяргацца катаванням, як многія іншыя. У 1946 годзе ён памёр у пакутах.

Падчас баёў на Паморскім валу загінуў Янак Роман, сын Станіслава, сведкам гэтага быў яго стрыечны брат Вітак, які пасля заканчэння вайны прыехаў з Польшчы на адпачынак у сваю родную вёску Чэхаўцы. Вітак Роман быў арыштаваны бальшавікамі як АК-авец і пасаджаны ў турму на дзесяць гадоў. Разам з ім былі арыштаваны Костак Казлоўскі з Чэхаўцаў, Юзак Звярынскі з Верхліды і Эдак Банцэвіч са Стругаў. Іх выдаў жыхар суседняй вёскі А. З., якім з маладосці апекаваўся Гермес, але ў рэшце рэшт кінуў яго, і А. З. трапіў у рукі НКВД. Падчас следства ён спрабаваў абараняцца подла і ўхільна сведчыў, што дзейнічаў па загадзе АК-цаў, называючы іх імёны. Толькі Вітак вярнуўся з лагераў з цалкам зламаным характарам. Падчас сустрэч ён не хацеў вітацца і размаўляць нават з найбліжэйшымі калегамі.

Міхал Роман, брат вышэйзгаданага Янка, быў зняволены. Падчас сутычкі нейкі расійскі партызан указаў на Міхала, "што гэта бандыт". Апавядаў мне АК-вец Янак Б., што падчас строгага допыту Міхал выкінуўся з акна верхняга паверха і забіўся.

13 красавіка 1944 года насупраць вёскі Чэхаўцы, у заходнім кірунку, на дарозе, якая вяла з калоніі вёскі Верхліда ў вёску Стругі, знайшлі застрэленага ўначы нейкага Яблонскага. Хто ён быў, чаму ён тут знаходзіўся, што рабіў, хто і за што яго застрэліў - невядома. Магчыма, гэта быў яўрэй, даваенны кіраўнік кінатэатра "Маленькае" ў Лідзе?

Дакладна на поўнач ад маёнтка і на ўсход ад вёскі Чэхаўцы, прама на мяжы палёў і лугоў, ляжала так званая ваколіца Чэхаўцы. Там жыла засцянковая шляхта. Падчас канасацыі земель і прыбудовы калоніі у ваколіцы засталіся толькі тры сям'і: Юзафа Пацэвіча, Стэфана Пацэвіча і Марыі Вільбік (Кулікоўскай). Астатнія нашчадкі дробнай шляхты, Казімір і Станіслаў Пацэвічы, Францішак і Стэфан Бярцэвічы, Казімір і Леан Пядзевічы, а таксама Юзаф, Ян і Эдвард Вільбікі, атрымалі зямлю на паўночна-заходнім краі чэхаўскіх зямель, у бок чыгуначнай станцыі Гуды (так зв. урочышча "Амшары"). У 1943-1944 гадах у доме Юзафа Вільбіка размяшчаўся штаб Арміі Краёвай. Ужо пасля ўступлення рускіх у ліпені 1944 года я даставіў туды 160 кг збожжа, яек і сала, сабраных падчас адступлення немцаў. На заходняй ускраіне чэхаўскіх зямель жылі: Тамашэвіч, Комінч, Дудзіцкі і Пеця, які быў актыўным камуністычным агітатарам. Па нядзелях ён садзіўся на ровар і ехаў усюды, дзе мог знайсці нават невялікую групу людзей, каб "сеяць" прапаганду. Немцы расстралялі яго ў пачатку ліпеня 1941 года. У апошняй сядзібе вёскі Чэхаўцы, на скрыжаванні дарог, якія вядуць да вёсак Колышкі і Верхліда жыў Стэфан Пацэвіч. Падчас нямецкай акупацыі ён быў солтысам вёскі. У жніўні 1943 года камандзір нямецкага Kreislandwirtschaft (павятовага сельскагаспадарчага аддзела) вышэйзгаданы Белах кантраляваў сядзібы солтысаў і іх намеснікаў. У Стэфана ён знайшоў некалькі літраў малака, якое выліў на зямлю і, схапіўшы селяніна за валасы, удараў яго тварам аб лужыну разлітага малака.

Насупраць будынкаў солтыса на ўсход, на другім баку дарогі, стаяў хутар Яцкевіча. Гэты амаль стагадовы моцны стары, вядомы ў навакольных вёсках як Макаравіч, займаўся знахарствам. Ён лячыў людзей, молячыся над аплаткай, якую трэба было ўжываць раніцай і ўвечары. Ён таксама рэкамендаваў хворым станавіцца здаровымі і ачышчацца ад хвароб, "як хмары на небе" (я падслухаў яго). У маладосці ён быў гаёвым і вартаўніком лясоў і палёў маёнтка. Яго жонка нарадзіла яму дваццаць дзяцей, але выгадавалі толькі дзвюх дачок. Старэйшая нарадзіла траіх дзяцей, чацвёртага выкінула і памерла. Засталася толькі малодшая Зося, прыстойная і прыгожая дзяўчынаа. Калі яна адмовілася выйсці замуж за аднаго з каханкаў, ён падпаліў дом, але пажар патушылі ў зародку. Дужы стары дажыў да глыбокай старасці. Ён памёр у 1958 (1959?) годзе ва ўзросце звыш 110 гадоў.

**Верхліда**

Вёска Верхліда ляжыць на заходнім беразе разлеглых балот каля галоўнага вытоку ракі Лідзейкі. Гэтыя балоты, акружаныя хмызнякамі і пералескамі, кожную восень прыцягвалі вялікія чароды жураўлёў, якія адляталі ў цёплыя краі. У засушлівыя гады не раз торф у балотах загараўся, выдаючы пах гарэлага ўсю зіму. Пасля іх заставаліся выпаленыя ямы, якія з часам зарасталі пустазеллем, ствараючы небяспечныя трасіны (вокны). Цяпер балота асушана, і прыгожы, старажытны, некрануты ландшафт знік. Калісьці сярод балот у іх паўднёва-ўсходняй частцы знаходзіўся невысокі пясчаны пагорак памерам прыблізна два гектары. На гэтым пагорку яшчэ ў 1950-1960 гадах раслі вельмі старыя, магутныя дубы і бярозы вышынёй да 26 метраў. Лічыцца, што ў старажытнасці тут пакланяліся нейкаму боству русінскіх або літоўскіх плямёнаў. Да знішчэння гэтага святога месца на ўзгорку былі знойдзены сляды даволі глыбокіх вогнішчаў, а таксама шматлікія чарапкі гліняных гаршкоў і іншых пасудзін. Пасля вайны, да таго, як дрэвы былі высечаны, а расліннасць знішчана, на гэтым узгорку сярод кустоў хаваліся Станіслаў К. і Міхал Дурас, якіх шукаў НКГБ.

Жыхары вёскі Верхліда, верагодна, былі даўнімі вайсковымі асаднікамі: Бацяноўскія, Звярынскія, Вайтовічы, Гаўроны, Сарэлы, Сургіневічы, Шымковічы, Юршы, Лышы, Тажукі, Некрашы. Некаторыя з іх захавалі мянушкі, якія сведчаць пра іх немясцовае паходжанне (Каля, Рымша, Дабей, Лапшун, Шорла, Моргін). Узімку жыхар, які вяртаўся з лугоў, заўсёды хваліўся, што бачыў "сорак зайцаў". На дзвярах свіранаў дзвюх сядзіб я бачыў загадкавыя пазнакі, зробленыя з розных ліній. Варта тут згадаць польскую сям'ю Бацяноўскіх. Да вайны Антак і Боляк былі актыўнымі ўдзельнікамі "Кракусаў". Іх малодшы брат, Янак, які нарадзіўся ў 1927 годзе, удзельнічаў у аперацыях "Бура" і "Вострая Брама". Яго вывезлі ў Калугу, а цяпер жыве ў Тчэве.

У першыя дні вайны 1941 года рускія, якія ўцякалі, кідалі зброю і вайсковую амуніцыю. 27 чэрвеня, пасля таго, як фронт прайшоў, Казімір Звяжынскі (яго празвалі "Кухар"), каля 28 гадоў, і яго сябар вырашылі прайсціся па полі бою. Там яны знайшлі кінуты пісталет. Раптам аднекуль з'явіліся немцы і абшукалі іх. Яны пашкадавалі іх жыццё, бо валасы былі нястрыжаныя, а рукі, як у сялян, спрацаваныя. Іх зняволілі ў Лідскім замку, дзе яны ўтварылі групу ваеннапалонных і іншых падазроных асоб. Затым "Кухара" і яго сябра адвезлі ў лагер у Германію, дзе яны абодва загінулі. "Кухар" меў цудоўны голас і любіў спяваць. Ціхімі, цёплымі летнімі раніцамі яго песня лунала над шырокімі лугамі, адбіваючыся ад сцен гаёў, змешваючыся і пераплятаючыся з кукаваннем зязюль і галасамі разнароднага птаства.

Ён быў не адзіным забітым. На другі ці трэці дзень вайны быў застрэлены саветамі жыхар вёскі Верхліда Лыш. Ён нёс невялікі скрутак з разбомбленага горада, скарачаючы шлях цераз праваслаўныя могілкі. Чырвонаармеец загадаў яму кінуць скрутак.

- А што, гэта тваё? - адказаў Лыш.

Салдат стрэліў у яго. Казалі, што яго прызналі тым чалавекам, хто скраў некалькі бутэлек гарэлкі.

Сядзіба на паўднёвым баку вёскі належала Канстанціну Тамашэвічу. Яго старэйшы сын, Юзаф, хаваўся ад бальшавікоў з 1944 года. Яго віна была ў тым, што ён не ўступіў у польскую армію, арганізаваную ў СССР. 25 гадоў ён не адважваўся раскрыцца, хоць пасля вайны ён падпаў пад амністыю. Знясілены, вечарам наведаў суседа і выпіў некалькі чарак гарэлкі. Вяртаючыся дадому, ён заблытаўся ў калючым дроце на пашы і замёрз на смерць, бо было гэта зімой падчас моцных маразоў. У апошніх будынках у канцы вёскі жылі баптыст Алекса і сталяр Пятроўскі, а за імі, амаль у лесе, Матусевіч і Урбановіч.

Некаторыя з іх былі прымакамі з іншых вёсак, якія жаніліся з мясцовымі дзяўчатамі. На поўнач ад вёскі Верхліда цягнецца вялікі пагорак пад назвай "Дылеўскі". Гэта водападзел рэк Лідзейка і Жыжма. Гэты пагорак, які спускаецца на поўдзень сваімі падземнымі водамі, дае пачатак вытокам Лідзейкі.

На гэтым узгорку былі пастаўлены высокія пункты. На схіле ўзгорка стаялі адзінокія будынкі Сегеня, якія называліся фермай "Дылева". Старэйшы Сегень і яго сын Зэнак належалі да паўваеннай арганізацыі "Кракусы" (сельская кавалерыя), якая арганізоўвала вучэнні па нядзелях і спаборніцтвы летам, звычайна каля 29 чэрвеня або ў апошнюю нядзелю гэтага месяца.

**Аўсядава**

На захад ад хутара Дылева знаходзіцца вёска Аўсядава, а за ёй на паўночны захад - вышэйзгаданыя Гярвенікі. Жыхарамі Аўсядава былі Данілецкія, Казлоўскіх, Пілінкі, Брэйвы, Бальцэвічы, Апанасы, Гурскія, Здонец і Лаўкель, заможныя і згуртаваныя гаспадары. Няшчасці і трагедыі не абмінулі жыхароў і гэтай вёскі. У 1942 годзе тут успыхнула эпідэмія тыфу, памерлі: 22-гадовы Станіслаў Жук і 24-25-гадовы дародны мужчына Юзаф Юрша. Перад 1939 годам Браніслаў П. пры падзеле гаспадаркі і маёмасці забіў свайго брата Станіслава.

У працавітага і ашчаднага Міхала Насевіча быў добры конь і новы воз. Двое мясцовых разбойнікаў, І. і Б., у змове з трэцім з дальшай вёскі, ужо пасля вайны, уначы, скралі яго каня, воз, новы кажух і сала. Міхал накінуў на спіну старую бурку і, рызыкуючы жыццём, пайшоў за грукатам воза, а перад світаннем па слядах каня. Ён выявіў месца, дзе схавана нарабаванае. Вярнуўся, прыйшоў у сельсавет і патэлефанаваў у міліцыю. Разбойнікаў злавілі на гарачым. Гаспадар вярнуў свайго каня, воз і кажух.

А з чаго смяяліся аўсядаўцы? Адзін з іх пачаў курыць махорку ў шэсць гадоў, маці карміла яго грудзьмі да 12 гадоў, і да 16 гадоў насіў адну кашулю. Яго маці, дробная жанчына, не магла абараніцца ад здаровага дылды. ("Дай к... цыцку!") - і смактаў, паглядаючы з-пад ілба. Аднойчы ён сядзеў на мураванай ляжанцы каля печы, падпёршы калені пад падбародак, з расшпіленым выразам кашулі. Ён скруціў цыгарэту і запатрабаваў у маці вугольчык. Яна паслухмяна працягнула яму вугольчык на лапатачцы, але выпадкова стукнулася локцем аб вугал печы. Вугольчык упаў праз расшпілены выраз кашулі на яго палавыя органы. Сын завыў ад болю, закрычаў і рыкнуў на маці: "Ты, к…, як падаеш?" Ад тога часу і да сёння жыхары, бачачы таго Уладзіслава Б., гавораць: "О, о. Пайшоў гэты з асмаленымі прычындаламі".



**Вёска Аўсядава**

*(Працяг у наступным нумары.)*

***Яўстах Шалевіч***

# УСПАМІНЫ*

## Другая частка ўспамінаў[39]

***Мае навукі. Трэці клас. Чацвёрты і апошні клас. Лісты***

*(Працяг. Пачтак у папярэдніх нумарах.)*

З вялікай прыемнасцю бяру ў рукі пяро, каб выканаць пажаданне Найшаноўнейшай Пані[40] і занатаваць успаміны пра свае школьныя часы. Як я ўжо пісаў у папярэднім лісце, жадаю, каб пані гэтак жа шчыра працавала і надалей.

Прайшло ўжо 50 гадоў, як я пакінуў гэтыя мілыя для мяне навучальныя ўстановы, але і сёння соладка згадваю тыя часы. На працягу ўсяго жыцця толькі некалькі разоў снілася мне школа, і заўсёды пры гэтым я быў шчаслівы.

Маю ў Пецярбургу вельмі шляхетнага пляменніка, які мяне любіць і якому я хоць па кроплі, але расказваў пра сваё дзіўнае жыццё. У лісце я прасіў, каб ён прыслаў гэтую кніжку, у якой, уласна, я цяпер і пішу пра сваё дзіўнае авантурнае жыццё[41].

### Мае навукі

#### 1.

Чытаць па складах мяне навучыла маці. Да навукі чытання я вялікіх здольнасцей не выказваў, і таму вучыць мяне было складана. Пісьму і арыфметыцы навучыў бацька. Правай рукой мне заўсёды было цяжка рабіць дакладныя рухі, таму каліграфія была вартая жалю: давалася цяжка і псавала настрой так, што адчуваў я сябе нешчаслівым. Але да арыфметыкі ў мяне праяўляліся здольнасці. Любіў яе надзвычайна: цікава мне было рабіць разлікі. Дык вось, з трох гадоў маімі настаўнікамі былі маці і бацька. Калі мой брат скончыў лідскую пяцікласную павятовую школу, ён прыехаў дамоў і некалькі месяцаў рыхтаваў мяне да паступлення ў першы клас.

Навучыцца чытаць па-руску было нялёгкай задачай, да таго ж добрых падручнікаў я не меў. Не разумеў, што чытаю, і таму часта плакаў, бо быў надзвычай чулым дзіцём.

Граматыку, матэматыку, геаграфію і іншыя навукі я засвойваў хутка. Затое неабходнасць вучыць нешта на памяць была для мяне бядой. Мой брат, на шэсць гадоў за мяне старэйшы, у школе меў калегу Б.К., які потым стаў ксяндзом і дэканам у Лідзе. Будучы ксёндз меў уласцівасць: ён адразу запамінаў адзін раз прачытаны тэкст. А вось да матэматыкі ў яго здольнасцей не было.

Да ўзросту поўных дзесяці гадоў вучыцца мне было нецікава, але на адзінаццатым годзе невядома адкуль з'явілася вялікая ахвота да навук.

Калі мой брат Адольф на працягу некалькіх месяцаў жыў дома (у Васілішскай парафіі, было гэта ў 1853 г.), сусед, с. п. Ів., запрасіў яго гувернёрам да свайго сына. Як слыннаму ў акрузе настаўніку, плаціў яму вельмі добра - пяцьдзясят рублёў у год. Усе дзівіліся, бо звычайна заробак гувернёра складаў сорак рублёў у год. Раней, калі мой брат вучыўся ў школе і займаўся рэпетытарствам, дык браў па шэсць рублёў з вучня за гэты перыяд. А ў мае часы за такую працу бралі ўжо па дзесяць рублёў.

Пасля ад'езду брата да Ів. я папрасіў бацьку, каб ён і мяне аддаў пад руку Адольфа - рыхтавацца да першага класа, бо вельмі я жадаў вучыцца! Не хутка яшчэ бацька выбраўся да с. п.[42] Ів.і толькі амаль што праз паўгода прывёз мне радасную вестку, што я прыняты (рыхтавацца да школы - *Л. Л.*). Адбылося гэта ўвечары, каля агню. Мая радасць не мела межаў. У той жа вечар пры ложку я падзякаваў Пану Богу за яго вялікую ласку. Бацькі гэта бачылі і вельмі радаваліся. Тата завёз мяне да с. п. Ів., і там пад кіраўніцтвам свайго брата я з вялікай ахвотай і з запалам пачаў займацца навукамі. Меў розум лепшы, чым мае таварышы, якіх было там шэсць чалавек. Часам вельмі шкодзіў галаўны боль, ад якога я пакутаваў з дзяцінства.

---

* Пераклад і каментарыі Леаніда Лаўрэша.

[39] Гэта часта ўспамінаў раней ужо друкавалася, гл: Успаміны Яўстаха Шалевіча. Пераклад і каментарыі Леаніда Лаўрэша // Маладосць. 2020. № 5, С. 96-103.; № 6, С. 100-108.

[40] Тэкст напісаны Шалевічам пра просьбе Людвікі Зыцкай, якая не паспела яго надрукаваць, бо пачалася Першая сусветнай вайна, але перадала ў архіў і ўнесла ў каталог, што дазволіла мне знайсці яго ў Віленскім архіве. - *Л. Л.*

[41] Маецца на ўвазе вялікі блакнот, у якім Шалевіч пісаў свае ўспаміны.

[42] Святой памяці.

**2.**

Нарадзіўся я хворым і слабым, і адразу, як толькі нарадзіўся, пачаў хварэць, і хварэў усё жыццё, і ніколі не быў здаровы і шчаслівы - ніводнага дня, ніводнай гадзіны! Натура вытварала са мной нейкія выбрыкі, і за ўсё жыццё я быў шчаслівы, можа, некалькі хвілін. Маці распавядала, як паклала мяне малога на высокі ложак, а я з яго ўпаў на падлогу і моцна пабіўся.

Шмат працаваў, шмат вучыўся і быў ужо гатовы да першага класа. На вакацыі я прыехаў дадому і ў жніўні павінен ужо быў ехаць вучыцца (у Ліду - *Л. Л.*) - чакаў гэты дзень, як неба. Набліжаецца жаданая хвіліна, але раптам бацькі паведамляюць, што сёлета я ў школу не пайду, бо, можа, за год маё здароўе паправіцца[43] (да дзесяці гадоў я быў хворы і палову пражытага на той момант часу правёў у ложку). Як у гэтым вершыку: *"Хоць ён бледны і сухотнік, але да стрэльбы ахвотнік!"*[44] Гэтак і я на пачатку жыцця быў бледны і выглядаў, як сухотнік, але да навукі быў вялікі ахвотнік!

Вестка пра тое, што я не пайду ў школу, ударыла мяне як маланка. Нічога не адказаў я бацькам, а толькі схаваўся ў кут і заплакаў. А хутка новая бяда - эпідэмія халеры, і таму бацькі не жадаюць аддаваць мяне ў небяспечны горад. Але нарэшце надышоў чаканы дзень. Выбраліся да Ліды, прыехалі на паштовую станцыю Місявічы[45] і спаткалі там паштальёна, які ў гэтую хвіліну прыехаў з Ліды. "Што чутно ў горадзе?" - пытаецца бацька. Як вядома, часта людзі з камара могуць зрабіць мядзведзя, паштальён быў з гэтакіх і таму адказаў майму бацьку: "Дрэнныя навіны, штодзень у горадзе ад халеры памірае па дваццаць пяць чалавек"[46]. Бацька спужаўся і ўжо хацеў паварочваць назад, але я заенчыў - і ён вырашыў так: няхай, маўляў, пра тое, прыняць мяне ці не прыняць, думае школьны лекар. Едзем!

У Лідзе з кватэры мы выйшлі на вуліцу. Спаткалі шаноўнага скарбніка Крахельскага, начальніка майго брата, які тады служыў у скарбовай касе.

- Што ты тут робіш?

- Прывёз у школу хлапчука.

- А не баішся Пана Бога? Нашто прывёз гэтую худобу? Як пачне вучыцца - адразу памрэ[47].

Я адразу адчуў да Крахельскага вялікую непрыязнасць, і гэтае пачуццё доўга ў мяне не праходзіла. Было гэта ў 1855 годзе.

Мой бацька зноў пачаў хвалявацца. Да нас на кватэру зайшоў мой брат Адольф. Я адвёў яго ўбок і папрасіў, каб на міласць Бога мяне пакінулі ў Лідзе, бо я надта хачу вучыцца. Адольф угаварыў бацьку, і той вырашыў зняць для мяне кватэру ў сп. Цемахоўскай, дзе кватаравалі ён сам і прафесар Урбановіч. За стол і памяшканне гаспадыня згадзілася браць сорак пяць рублёў штогод. Багатыя людзі за кватэры для сваіх дзяцей-вучняў плацілі па пяцьдзясят рублёў. У першы год майго побыту ў школе плата за навучанне каштавала два рублі пяцьдзясят капеек, а на другі год падаражала да трох рублёў[48].

Дакупілі некалькі кніжак, адзежу брата перарабілі для мяне, і ўсё гэта разам каштавала для бацькі пяцьдзясят пяць рублёў (верагодна, з платай за кватэру - *Л.Л.*).

Лекцыі павінны былі пачынацца праз некалькі дзён, і бацька прапанаваў на гэты час з'ездзіць дахаты, але я, каб зберагчы сілы, адмовіўся. Знайшоў добрага таварыша - вучня чацвёртага класа Болеся Цемахоўскага, сына гаспадыні. З ім я хадзіў па горадзе, і ён растлумачыў і расказаў мне шмат цікавага.

Ён вучыўся ў чацвёртым класе, а я толькі што паступіў у першы, і таму паміж намі была розніца, як паміж генералам і простым салдатам, але мы мелі аднолькавыя погляды і зацікаўленасці і таму хутка пасябравалі.

З цікавасцю я разглядаў школьны будынак і думаў: "Калісьці я тут буду вучыцца, якое гэта будзе шчасце".

**3.**

Нарэшце надыходзіць гэтая мілая гадзіна, гэтая дарагая і жаданая хвіліна - пачатак заняткаў. Уваходжу я ў школу! Як тут усё прыгожа, урачыста, як усё цешыць вышэйшым сэнсам! Адразу палюбіў я ўсіх прафесараў,

---

[43] Тады можна было ісці ў першы клас хоць у дваццаць гадоў. - *заўвага аўтара.*

[44] У тэксце - па-беларуску.

[45] Паштовая станцыя паміж Лідай і Ішчалнай.

[46] Падчас той эпідэміі халеры ў Лідзе штодня памірала 3-4 чалавекі.

[47] Для параўнання, Ян Булгак пісаў пра той час: *"... сярод тагачаснай шляхты панавала даўняе, яшчэ даволі распаўсюджанае меркаванне, што навука дрэнна адбіваецца на здароўі. Прадузятасць паходзіла з таго, што моладзь мужчынскага полу, прызвычаеная да гарцавання на кані, да палявання і ўвогуле да руху на свежым паветры, без радасці садзілася за кніжкі, і ў школьным пакоі ёй было цесна і душна. Часта пасля некалькіх гадоў, праведзеных у гімназіі без аніякіх поспехаў, бацькі забіралі дадому вусатых сыноў, у якіх ужо не граматыка была ў галаве, а жаніцьба. Так было з братам маёй маці - дзядзькам Тадэвушам Хаціскім, які вярнуўся... з другога класа гімназіі ў Навагрудку, бо бацькі баяліся дрэнных наступстваў школы для яго квітнеючага здароўя. А хлопец быў ужо як дуб, проста са школы пачаў ездзіць у сваты і праз пару гадоў ажаніўся. Большасць тагачаснай моладзі не скончыла гімназіі: чатырохкласны школьны стаж ужо лічыўся сур'ёзным вынікам, а ўніверсітэцкі дыплом па-просту быў рэдкасцю"*. Гл: Булгак Я. Край дзіцячых гадоў / Я. Булгак. - Мінск, 2004. - С. 75.

[48] Аўтар не піша, за год ці за месяц.

пачаў паважаць іх як вышэйшых істот. Прэфекта (дырэктара) лічыў нейкім серафімам[49]. Лекцыі слухаў з надзвычайным запалам і замілаваннем. Дзіўна ўлюбіўся ва ўсе навукі без выключэння: ад рэлігіі да малявання і каліграфіі. Уважліва слухаў лекцыі прафесараў, глытаючы кожнае слова. Прапусціць хоць адно - было б для мяне вялікай стратай. Таму на ўроках паводзіў сябе ўзорна - па-анёльску. Жадаў, каб да мяне ставіліся, як да стараннага, працавітага, добрага вучня. Калі сустракаў прафесараў на вуліцы, саступаў ім дарогу. Здымаў перад імі шапку не толькі таму, што існавала такое правіла і гэта быў абавязак вучня, але і з-за сапраўднай павагі да іх. І мае высілкі на пачатку не прайшлі марна. Я заслужыў славу ўзорнага вучня.

У нашым класе стары прафесар Пігулеўскі выкладаў тры прадметы: рускую мову, арыфметыку і геаграфію. На школьным сходзе, у прысутнасці дырэктара, ён сказаў: *"Шалевич будет украшением нашего училища"* [50], - і хутка мне пасыпаліся чацвёркі і пяцёркі[51].

Пад адным дахам я кватараваў з прафесарам Урбановічам[52] (вучыў нас чыстапісанню, чарчэнню і маляванню). Гэта быў вельмі светлы чалавек, падобна, выхаванец былога Віленскага ўніверсітэта[53]. Усё жыццё пражыў нежанаты. Паходзіў з ваколіцы каля Нёмана, са шляхты Лідскага павета. Яшчэ ён быў музыкантам, добра граў на скрыпцы і кларнеце. Як мог, навучаў мяне музыцы. Быў вялікім аматарам навукі, збіраў да сябе хлопцаў і вучыў іх прыватна, часцей без усялякай аплаты, каб толькі пашыраць кола аматараў навукі і мастацтва. Акрамя вышэй згаданых прадметаў, ён у першым класе выкладаў геаметрыю, у другім - землямерную справу, а ў трэцім - архітэктуру. Трыццаць гадоў займаў пасаду прафесара ў Лідзе і лічыўся чалавекам выключных ведаў. Вынаходзіў новыя метады навучання і тлумачыў кожны прадмет зразумела і даступна. Вельмі цікава і меладычна кампанаваў музыкальныя фрагменты опер, як, напрыклад, кантрданс "Спеў гандальера", які я граю і цяпер і захоўваю яго нотны запіс. Вельмі цікавіўся ўсім новым, што ў той час з'яўлялася: тэлеграфам, паравымі машынамі і г. д. Не ведаў ён, што пасля яго смерці з'явяцца тэлефоны, грамафоны, друкаркі.

Гэты шляхетны чалавек і дасведчаны прафесар палюбіў мяне, як сваё дзіця, а я да яго ставіўся, як да лепшага бацькі. Казаў мне, каб я ў вольны час прыходзіў да яго. Правіў мае працы па фізіцы, касмаграфіі і натуральнай, рускай і агульнай гісторыі і г. д. Расказваў пра электрычнасць, маланку з бліскавіцаю, дождж, град, снег і шмат пра што яшчэ. Я ўсё гэта слухаў з вялікай увагай і захапленнем, бо ў першым класе пра гэтакія рэчы не расказвалі, і мае калегі пра гэта ніякага ўяўлення не мелі. Называў мяне "Яўсташак-душачка". Нарэшце прапанаваў перасяліцца ў яго пакой. Тады жыццё наша закіпела. Мы цэлымі вечарамі гралі, і, бывала, што я засынаў са скрыпкаю ў руках. Гулялі мы з ім па горадзе не як прафесар і вучань, а як калегі. Душы нашы былі адным цэлым. Прыватна вучыў мяне маляваць, і за год у мяне сабраўся вялікі стос папер, якія прыдаліся на экзаменах пры пераходзе з першага ў другі клас. Падчас агульнага збору ўсіх вучняў у адной зале дырэктар высока ацаніў мае малюнкі і ўсім прысутным паставіў мяне ў прыклад. На пасведчанні за першы клас дырэктар напісаў: *"Благодарю Шалевича за его успехи во всём. Благодарю ещё более за усердие к рисованию, выказанное им сверх прямых по классу обязанностей".*

Калі я пачаў працаваць разумова, адчуў, як хутка развіваюцца мае здольнасці, і таму працаваў усё больш і больш. Я быў узорным вучнем і пры пераходзе з класа ў клас кожны раз узнагароджваўся пахвальнымі кніжкамі.

Калі здаваў экзамены з першага ў другі клас, ішло ўсе так добра, што я прамаўляў два-тры словы - і "пяцёрка" была гатовая. Успамінаю іспыт па геаграфіі. Здаваў яго самому дырэктару. Ён любіў гэтую. навуку, бо раней быў прафесарам геаграфіі і гісторыі. Я таксама быў яго ўлюбёнчыкам, ён не раз гладзіў мяне па галаве. Я выцягнуў білет, але дырэктар пажадаў задаць мне свае пытанні. Кажа мне па-руску:

- Калі б мы пачалі капаць глыбокую яму, куды б мы нарэшце патрапілі?

- На другі бок зямнога шара.

- А праз які вядомы пункт Зямлі мы б прайшлі?

- Праз цэнтр Зямлі, - адказваю.

- Да цэнтра Зямлі мы б ішлі ўверх ці ўніз?

- Уніз.

Потым мой дарагі дырэктар пажадаў мяне трохі падлавіць, ці насамрэч я ўсё разумею, і, гледзячы ў кніжку, гартае яе старонкі і як бы між іншым кажа сам сабе:

- А пасля цэнтра зямлі мы таксама будзем ісці ўніз…

Я раптоўна здагадваюся і на ўвесь клас крычу:

- Не! Тады мы будзем ісці ўверх!

- Отлично, отлично! - таксама голасна гаворыць дырэктар і загадвае мне вяртацца на месца.

Прафесары ўсміхаліся, а ўвесь клас пільна за мнойназіраў.

Калі вяртаўся на лаву, радасці маёй не было межаў, і каб мне ў той момант хто прапанаваў атрымаць у падарунак палову Еўропы, для мяне гэта нічога б не значыла.

[49] У сэнсе "анёлам". Серафімы - вышэйшы чын анёлаў, асабліва набліжаных да Бога.

[50] Тут і далей, аўтарскі тэкст на рускай мове даецца ў сучаснай граматыцы.

[51] Адзнакі па пяцібальнай шкале.

[52] Настаўнік "чистописания, черчения и рисования, коллежский секретарь Иосиф Васильевич Урбанович". Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1858 г. - Вильно, 1858. - С. 42.

[53] Віленскі ўніверсітэт быў закрыты пасля паўстання 1831 года.

Хацеў тады прасіць свайго шаноўнага дырэктара, каб ён дазволіў мне яшчэ расказаць нейкіх цікавостак на гэтую тэму. Бо я мог растлумачыць яму, чаму пасля цэнтра напрамак руху змяняецца. Рукамі над галавой грэблі б пясок, і ён бы падаў на нас, а потым імкнуўся б да цэнтра зямлі. І мы самі павінны былі б упасці на цэнтр зямлі. Па геаграфіі я атрымаў "5", але мне хацелася падскочыць і расказаць, што ўсё гэта мне раней растлумачыў добры і шляхетны прафесар Урбановіч.

Гэткія "падскокванні" бывалі ў мяне не раз. Калі прафесар Пігулеўскі чытаў байкі Крылова, мне так спадабаліся досціпы аўтара, што я падскочыў і выказаў сваё задавальненне. Прафесар за гэта не пакараў мяне, бо зразумеў, чаму я так зрабіў, і быў нават задаволены маімі паводзінамі. На занятках па арыфметыцы я таксама рабіў падскокі - калі даведваўся пра нешта новае. Матэматыка мне заўсёды падабалася. Я захапляўся незвычайнымі людзьмі, якія яе прыдумалі. Тым больш што, напрыклад, геаметрыя яшчэ за 500 гадоў да нараджэння Пана Езуса стаяла надзвычай высока!

Прафесар Пігулеўскі, вельмі мілы і добры настаўнік, ладна выкладаў свае прадметы, але, як стары чалавек, калі-нікалі рабіў малыя памылкі. Неяк задаў вусна рашыць некалькі дзесяткаў арыфметычных задач. Сярэдні па здольнасцях вучань Ів. хутка, але няправільна адказаў на яго пытанне накшталт: "Чаму роўная гэтая сума?" Прафесар пагадзіўся з памылковым адказам. Мае амбіцыі былі прыніжаны тым, што гэты сярэдні вучань адказвае хутчэй за мяне. Я павінен быць заўсёды першым і лепшым! І мне здавалася, што гэты вучань памыліўся. Пачалі рашаць наступнае, а потым яшчэ новыя заданні, і не было мне часу падумаць. Вучні развязвалі задачы і адказвалі настаўніку. Тады я ўстаў і сказаў: "Здаецца мне, што мы тую задачу няправільна развязалі". Прафесар загадаў ісці да дошкі. Рашэнне выйшла па-мойму. Прафесар ухапіў мяне за галаву, пацалаваў, потым перад усім класам пахваліў і прызнаў памылку. Вялікая радасць тады ахапіла мяне.

У другім класе арыфметыка стала яшчэ больш складанай, але я ўсяроўна яе любіў. Вось толькі напаткала мяне вялікая да сябе непрыязнасць.

Прафесар Віткоўскі добра выкладаў гэты прадмет, але меў недахоп - нічога ў яго нельга было спытаць. Усе прафесары мяне любілі за тое, што я цікавіўся ў іх кожнай рэччу і пра ўсё выпытваў, а гэты не дазваляў задаваць пытанні - такі меў прынцып. А я не мог яму даравць, што ў такой важнай навуцы, як матэматыка, нічога нельга ўдакладніць ці спытаць.

Хоць я моцна любіў бацькоў і сястру, у школу я вяртаўся з вялікай ахвотай. Перад Божым Нараджэннем без памяці ляцеў са школы на кватэру, хутка сабраў свае скарбы - кніжкі - і быў гатовы ехаць дахаты. На шчасце, бацька сам прыехаў па мяне. Дахаты ехаў, як у рай. Назаўтра доўга парадкаваў свае кніжкі. Бацькі казалі, каб я адпачываў, бо маю слабое здароўе, але я іх не слухаў. Пасля свят заўсёды вяртаўся ў Ліду на два дні раней тэрміну, каб, барані Божа, ні хвіліны не страціць. У школу ішоў вясёлы і рваўся вучыцца! Тое самае было на Вялікдзень. Усе экзамены здаваў на "выдатна". Па ўсіх прадметах меў "5" і толькі па каліграфіі "4".

Апрача свайго звычайна слабога здароўя, у школе меў я цяжкую хваробу. З-пад левага рабра ў мяне пачаў вылазіць вялікі гуз і дайшоў да паловы жывата. Мяне лячыў ад гэтага знакаміты ў той час у Лідзе доктар Понсэ (Ponset). Загадваў ставіць на жывот п'яўкі, а калі ранкі ад п'явак трохі загойвалі, ставіў банкі. Здавалася што на пузе ў мяне з'явілася адна вялікая банка. Акрамя гэтага, даваў глытаць нейкія лекі. І хвароба прайшла … але я прапусціў пяць лекцый.

Хворы чалавек натуральна баіцца холаду. А паколькі я ўсё жыццё быў хворым, дык з маленства да старасці яго баяўся. У лідскай школе печы не надта палілі, імкнуліся, каб было нам не надта горача, і таму ўсе зімовыя месяцы я курчыўся ад холаду і дрыжаў. Так было на працягу ўсёй маёй вучобы, толькі ў Навагрудку стала лепш.

Калі прыехаў на вакацыі дахаты, дык адразу расклаў свае кніжкі і пачаў рыхтавацца да другога класа - вучыў рэлігію, геаграфію і іншыя навукі. Дарагі прафесар Урбановіч задаў мне на вакацыі вывучыць пяцьсот французскіх слоў, якія я потым яму пераказваў. Акрамя гэтага, я прачытаў духоўную кнігу - "Голас набожнай душы". У дзяцінстве і маладосці я вельмі любіў чытаць духоўныя кнігі і з адзінаццаці да дваццаці двух - дваццаці трох гадоў правёў над імі не менш часу, чым яўрэй над Торай.

У другім класе меў тую самую ці нават большую цягу да навукі, хаця галава балела болей, чым да гэтага. Я на той боль не звяртаў увагі. У першай чвэрці пасыпаліся "чацвёркі" і "пяцёркі", але потым я меў толькі "пяцёркі".

У другім класе адбылася такая прыгода. Неяк абвясцілі, што з пэўнай даты нашу школу будзе інспектаваць куратар Віленскай навучальнай акругі Урангель[54]. Нас навучылі, як яму адказваць, калі ён запытае, і як яго тытулаваць пры звароце. Наказалі нам, каб вопратка і абутак былі ў найлепшым стане. Я вучыўся дзень і ноч, каб добра адказаць куратару, калі ён да мяне звернецца. Але мой мундзір быў парваны, і я не меў часу занесці яго да краўца. Дзень за днём хадзіў у школу ў такім мундзіры, і калі з візітацыяй прыехала важная асоба, я пайшоў у школу з дзіркамі на мундзіры пад пахай.

Дайшла чарга да нашага класа. Куратар прапанаваў ксяндзу што-небудзь у нас запытаць. Ксёндз запытаў пра Хрыста. Хто адкажа? Усе сядзяць. Ксёндз задае пытанне яшчэ раз. Я ўстаю і адказваю. Потым куратар прыказвае задаць пытанне прафесару матэматыкі. Той выклікае мяне да дошкі. А я пачаў прыкрываць сваю дзірку пад пахай і так спужаўся, што ўсё ўва мне замёрла.

[54] Апякун Віленскай вучэбнай акругі, генерал-лейтэнант, барон Рыгор Пятровіч Урангель. Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1858 г. - Вильно, 1858. - С. 34.

Прафесар прадыктаваў мне задачу. Я стаю ля дошкі, як пафарбаваны слуп, і не маю паняцця пра задачу - думаю толькі: што будзе? Што будзе, калі я гэтай задачы не развяжу? Узношу думкі да Пана Бога: Божа міласэрны, змілуйся, змілуйся нада мною. У той момант я быў самым няшчасным чалавекам у свеце. Так нерухома прастаяў я некалькі хвілін - прафесар цярпліва чакаў. Пот з ілба градам ліецца па твары, а я стаю каля дошкі, каб ніхто не бачыў дзірку на маім мундзіры. І тут са мной нешта здараецца - як быццам прасвятленне находзіць. Раптоўна я разумею, як развязаць задачу. Збіраюся з думкамі і пішу на дошцы тое, што трэба. Куратар яшчэ пра нешта пытаецца, я адказваю, але твар у мяне ўвесь мокры ад поту. Куратар усміхаецца і кажа: "Совершенно вспотел!"- пасля чаго адпускае на месца.

Пасля пераводных экзаменаў з другога ў трэці клас я ўзяў пахвальную кнігу, і дырэктар напісаў мне ў ёй падзяку, але зместу гэтай падзякі не памятаю. Кніжку і пасведчанне доўга хаваў, як рэліквію, але пасля пэўнага выпадку яны загінулі.

Школьныя часы і ўсе тыя здарэнні мне добра запомніліся. Карціны таго жыцця і сёння стаяць перад вачамі. Да ўзросту пяцідзесяці гадоў ці яшчэ трохі болей я любіў расказваць пра час вучобы свайму сябру, арганісту з Жалудка Вінцэнту Ліхвяровічу, з якім мы сябравалі шмат гадоў. Расказваў і любімаму пляменніку, які цяпер жыве ў Пецярбургу. Ён лекар, капітан гвардыі і прасіў мяне, каб я апісаў яму ўсё сваё жыццё, а сталася так, што я, Найшаноўнейшай Пані, апішу хаця б свае школьныя часы. А можа, потым патроху і ўсё сваё авантурнае жыццё апішу.

**Трэці клас**

Трэці клас для мяне быў таксама шчаслівы. Па алгебры і каліграфіі меў "4", а па ўсіх астатніх навуках - "5". Алгебра мне добра не ішла, таму што прафесару Віткоўскаму нельга было задаць пытанні, а шмат якія тэмы цяжка было зразумець самому.

У трэцім класе, каля Вялікадня, у мяне моцна забалела галава, і падняўся ціск. Гэта адбылося таму, што я працаваў двое сутак і пасля нават не змог пайсці на заняткі. Але неяк ачуняў і гэты клас добра закончыў. Зноў атрымаў пахвальную кнігу, і дырэктар напісаў падзяку на пасведчанні.

У трэцім класе мне спадабалася маляваць карты. У лідскай школе амаль усе сцены былі завешаны геаграфічнымі і гістарычнымі картамі. Я заўсёды разглядваў іх з вялікай цікавасцю. Каб грунтоўна вывучыць Германскі саюз, хацеў перамаляваць карту гэтай краіны і прасіў нашага дарагога дырэктара дазволіць мне ўзяць яе дахаты. Дырэктар згадзіўся і сказаў, што іншаму ён бы не дазволіў. Я падрыхтаваў вялікі аркуш кардону, якога нельга было купіць у краме, наклеіў на яго белую паперу, паменшыў карту ў чатыры разы і старанна скапіраваў. Калі паказаў сваю карту дырэктару, той мяне вельмі пахваліў. Аднак потым я не мог яе забраць у Наваградак, бо мой брат ўзяў яе на захаванне і паклаў у шафу казначэйства, адкуль яна знікла. Другой картай, якую я вельмі старанна скапіраваў, была карта Віленскай губерні, але гэта было ўжо ў Наваградку. Прафесар геаграфіі Лэрывер прапанаваў, каб я пакінуў гэтую карту ў гімназіі, але я з ім не пагадзіўся: жадаў мець яе ў сябе.

У мой час рэлігію выкладалі па-польску. Дарэчы, на калідорах і ў класах на перапынках па-польску размаўляць дазвалялася, але польская мова не выкладалася. Аднак на запусты 1858 года яе выкладанне дазволілі[55]. Прафесарам польскай мовы стаў нейкі Бякеша. Як сёння, так і тады нашы вучні-палякі не надта імкнуліся вывучаць сваю мову. Таму шаноўны прафесар мусіў да іх звяртацца з прамовамі пра неабходнасць яе вывучэння.

Лідская школа па-руску называлася так: "Лидское уездное пятиклассное для дворян училище". Выкладаліся ў ёй наступныя навукі: рэлігія, мовы (руская, французская, пры мне нейкі час выкладалася польская), матэматыка, гісторыя Расіі і сусветная, маляванне, каліграфія, пачаткі каморніцтва, паняцце пра будаўніцтва (у трэцім класе) і заканазнаўства (у пятым).

Калі я вучыўся, дырэктарам лідскай школы працаваў Аляксандр Аляксеевіч Шахаў. На мясцовы манер яго назвалі прэфектам па-руску - "штатным смотрителем Лидского дворянского училища" [56].

Прафесарамі рэлігіі па чарзе былі тры ксяндзы: Віткоўскі, потым Драцэвіч і, нарэшце, Свірскі. Гэты апошні працаваў самы працяглы час.

Прафесар рускай мовы Гулін нарадзіўся ў Пецярбургу. Пры мне толькі адзін раз коньмі ездзіў у свой родны горад, чыгункі яшчэ не было. Прывёз адтуль здымак на срэбнай бляхе - першы фотаздымак, які я бачыў у жыцці.

Прафесар французскай мовы Баўблеўскі добра ведаў свой прадмет і прыгожа яго выкладаў.

Выкладчыкам нямецкай мовы быў немец-католік Ягор Фэглер. Вельмі маральная асоба, сімпатычны і мілы. Быў жанаты са сп. Сумарокавай. Я быў яго любімцам. Неяк ён узяў мяне пад руку, і так мы прайшлі з ім палову горада, да яго кватэры, дзе ён пасадзіў мяне каля сябе і мо паўгадзіны тлумачыў свой прадмет, а потым пазычыў вельмі важны падручнік па нямецкай

[55] У выніку рэформ Аляксандра II нейкі час цягнулася палітычная "адліга", былі памілаваны паўстанцы 1831 года, і інш. Аднак пасля паўстання 1863 года польская мова была цалкам забаронена ва ўсіх установах не толькі Беларусі, але і этнічнай Польшчы. Цяпер мала хто ведае, што пасля 1863 года выкладанне ў польскіх школах, гімназіях і Варшаўскім універсітэце вялося выключана па-руску. Ва ўсіх установах віселі шыльды з надпісам: "Говорить по-польски запрещено".

[56] Наглядчыкам павятовай дваранскай вучэльні ў Лідзе ў 1860 годзе быў надворны дарадца Аляксандр Аляксеевіч Шахаў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1860 г. - Вильно, 1860. - С. 39.

граматыцы, які немагчыма было купіць. Нямецкую мову выкладаў вельмі добра, і я любіў яго, як роднага бацьку.

Польскай мове нас вучыў Бякеша, працавіты і старанны настаўнік, але, як я ўжо пісаў, нашы вучні не надта жадалі карыстацца яго навукай.

Прафесар матэматыкі Віткоўскі добра выкладаў, але праблемай было тое, што яму нельга было задаць пытанне. Гэты настаўнік сапсаваў мне адзнаку па алгебры. На экзаменах ён нецярпліва бліскаў вачыма. Быў занадта строгі, недаступны і моцна лаяўся на вучняў.

Прафесарам геаграфіі ў старэйшых класах быў вельмі самавіты і прыемны чалавек - Мінейка. Калі ён з'ехаў, на яго месца прыслалі з Масквы нейкага Бутоўскага.

Гэты быў вельмі вучоны, казалі, што раней выкладаў у Маскоўскім універсітэце, але за нейкую палітычную справу яго выслалі ў Ліду. Быў добрым і нават вялікім прамоўцам. Гэтакіх прамоўцаў я ў сваім жыцці бачыў толькі два-тры разы. Нават прафесар Урбановіч такім не быў. Прамаўляў - як Богам натхнёны. Калі ён першы раз прыйшоў да нас у трэцім класе чытаць лекцыю па геаграфіі і распавёў пра Расію, мы адразу адчулі яго прамоўніцкі дар і глыбокія веды. Здавалася, што ў грудзях яго гарыць агонь, і хацелася стаць такім, як ён.

Бутоўскі быў у вялікай роспачы з-за ссылкі ў Ліду і такога свайго нізкага сацыяльнага становішча. На лекцыях мог сваволіць, бегаць па класе, падскокваць, рабіць страшныя міны, але заўсёды меў прыстойны выгляд, і ўсё гэта было яму да твару. Пры гэтым вучні глядзелі на яго са здзіўленнем і толькі трымаліся за лавы, а я звычайна знаходзіўся ў нервовым стане і да таго ж меў схільнасць да гумару, таму часам з-за смеху падаў з лавы на зямлю! Іншы раз у класе стаяў такі рогат, што ў суседнім чацвёртым класе немагчыма было праводзіць заняткі. Калі нехта не ведаў урока і адказваў няправільна, Бутоўскі звычайна казаў: "Попал пальцем в чернильницу!" Потым хапаў за руку і ўціскваў палец ў чарніліцу.

Няшчасным мучанікам у яго быў вучань Уладак Крахельскі, сын казначэя. Ён быў запісаны ў журнале першым, і таму яму заўсёды прыходзілася адказваць урокі, тады як астатнія адказвалі не гэтак часта. Крахельскі не быў добрым вучнем, яго палец не раз бываў у чарніліцы. Бутоўскі круціў яго палец ва ўсе бакі і часам хадзіў з хлопцам па класе пад ручку.

Неяк на лекцыі Крахельскі сказаў:

- В Орлеане памятник орлеанской дрове .

Настаўнік тут жа яго запытаў:

- Что такое дрова?

- Дровица, - адказаў Крахельскі.

- А что такое дровица?

- Паненка.

- А што такое паненка?

Вучань замаўчаў…

А настаўнік, разышоўшыся, адказаў за вучня: "Это высшее существо! Это сверхнепонятное существо! Это неестественное существо! Это благородное существо!.."

Нават дырэктар не смеў выступаць супраць Бутоўскага.

Урбановіч, як я ўжо пра яго пісаў, выкладаў каліграфію, маляванне, геаметрыю ў першым класе, каморніцтва - у другім, у трэцім - пачаткі будаўніцтва. Ён быў здольны педагог. У кожнай навуцы выдумляў свае метады і тлумачыў вельмі зразумела і даступна для вучняў. Гэта быў па-сапраўднаму важны чалавек, вялікі сябар навукі, прагрэсу і вынаходніцтваў. Я пазнаёміўся з ім, калі настаўнік меў пяцьдзясят шэсць гадоў. Бачыў яго дзённік - у маладосці Урбановіч пісаў гусіным пяром: ніводзін найлепшы почырк не можа быць прыгажэйшым. Стальных пёраў ён не цярпеў і не мог імі пісаць. Калі вучань прыносіў на заняткі стальное пяро, ён заганяў пяро ў лаўку: зломіць - і няма стальнога пяра.

На сваёй кватэры збіраў вучняў і праводзіў бясплатныя прыватныя заняткі, а калі хто плаціў, таму казаў: "Дзякуй". Прыватна вучыў усіх, хто сам гэтага жадаў. Мяне ён вельмі любіў і зняў мой партрэт. Гэта было ў 1856 годзе, пра фатаграфію ў Лідзе яшчэ мала хто ведаў. Ён мне не раз тлумачыў, як з дапамогай сонечнага святла здымаць партрэты і пейзажы. А свой першы фотаздымак ён, як і я, бачыў у Гуліна, калі той прывёз яго з Пецярбурга.

З прыватных вучняў Урбановіча самымі вядомымі і лепшымі былі Лойка і Шчотка. Для сабе ён зрабіў яшчэ і фотапартрэт Шчоткі. Звяртаючыся да вучня, называў яго "каралевічам", і таму яго самога звалі "каралём", а паколькі я быў яго фаварытам, дык і мяне "каралём" называлі.

Я кватараваў па вуліцы Крывой у доме Калясінскай. Адзін раз па гэтай вуліцы разам ішлі прафесары Бутоўскі і Урбановіч. Урбановіч прапанаваў Бутоўскаму зайсці да Шалевіча: "Гэта выдатны вучань, яму будзе прыемна, калі мы да яго зойдзем. Ён шмат працуе над геаграфіяй і цяпер чэрціць карту Германскага саюза". Бутоўскі адказаў: "Каб ён нават зоркі з неба здымаў, дык настаўнік і тады не павінен па-сяброўску заходзіць да вучня, заходзіць можа толькі па службе". Але ўсё ж адзін раз сам да мяне зайшоў.

Наш слаўны прафесар Бутоўскі - паяц, комік і фігляр, якога свет не бачыў, - быў рускім пісьменнікам[58], ён у Лідзе напісаў кнігу. Нарцыз Шаблоўскі, які сёння яшчэ жыве, перапісваў рукапіс гэтага твора, а выдалі яго ў Вільні. Праз дваццаць гадоў я ва ўсіх рускіх кнігарнях Вільні шукаў гэтую кнігу як памяць пра свайго прафесара, але не знайшоў[59]. Яна складалася з трыццаці

---

[57] Крахельскі пераблытаў словы "дева" і "дрова".

[58] Гл.: Бутовский, А. Рассказы детям о достопримечательнейших событиях истории России / А. Бутовский. -Типография Карла Крайя, 1851.

[59] Здаецца, гэтая кніга існавала толькі ў рукапісе. Слядоў выдання яе ў Вільні я не знайшоў.

дзвюх глаў, з якіх я памятаю толькі тры: "Грех скончался", "Правда осталась в Иерусалиме" і "Гостеприимство в бегах".

Наш шаноўны прэфект добра піў гарэлачку[60]. Вучань пятага класа Баляслаў Цямахоўскі, з якім я пазнаёміўся і пасябраваў у Лідзе, напісаў такія радкі пра свайго дырэктара:

Наш директор уж взбесился,
Это видно со всего,
Он и с совестью простился,
Верно, верно, уж давно!

Для него и грех скончался,
Как Аркадий наш сказал.
Он и с истиной расстался,
Это всякий замечал.

Все пороки в нём слилися,
Верьте, правду говорю,
Черти садом собралися
В черную его душу.

Ром и водку без разбора
Пьет, как воду, завсегда.
Знает Мала, Вера, Сара
Его, всякая корчма.

Кроме водочки, милее
Нет ему уж ничего.
Сердце бьёт его сильнее,
Лишь увидит он вино!

І, відавочна, пад канец сваёй працы ў школе гэты алкагалічны спецыяліст піў усё больш.

Памочнікам старых прафесараў быў Пігулеўскі, вучоны, лагодны і мілы стары. Ён выкладаў наступныя прадметы: рускую мову, арыфметыку, геаметрыю і (у другім класе) геаграфію. Нялёгка яму было ўтрымліваць сям'ю. Старэйшы яго сын вучыўся ва ўніверсітэце, і расказвалі, што вучыўся дрэнна. Два іншыя сыны хадзілі ў нашу школу, абодва былі вельмі неразвітымі. Пра яго дачок нічога не ведаю.

У нашай лідскай школе былі тры праваслаўныя вучні: Пігулеўскія і Ніканаў. Гэты вучыўся сярэдне, але меў прыгожы почырк.

Рускія выкладчыкі: дырэктар, прафесар рускай мовы Гулін і Пігулеўскі. Выкладчыкі-палякі: Баўмблеўскі, Урбановіч і Рудзінскі. Прафесар падрыхтоўчага класа Фэглер - немец-католік.

У падрыхтоўчым класе форма для вучняў была не патрэбна, і кожны хадзіў у цывільным адзенні. А ў павятовай школе і ў гімназіі мелася абавязковая форма: сурдут з цёмна-зялёнага сукна з пунсовым каўняром, пунсовымі выпушкамі і металічнымі жоўтымі гузікамі з гербам губерні, бліскучымі, у два рады. На шапцы (кепі - *Л. Л.*) з цёмна-зялёнага сукна былі пунсовыя паскі і такія ж выпушкі. Верхнім адзеннем служыў доўгі плашч з шырокай палярынай і вузкім стаячым каўняром - усё гэта з шэрага сукна. Форма мне вельмі падабалася, бо была зручнай і прыгожай. Калі я вучыўся ў трэцім класе, яе скасавалі і замест плашча ўвялі паліто, падобнае на сучаснае (верагодна, падобнае на паліто - шынель - гімназіста пачатку XX стагоддзя - *Л. Л.*). У мае часы ў школах яшчэ выкарыстоўвалі цялеснае пакаранне, скасавалі яго ў 1859 годзе.

Наш любімы Шахаў сек вучняў добра, даставалася ім, бывала, і па трыццаць розгаў, часам і кроў пырскала, але ён усё роўна рабіў сваю справу. Лупцавалі нават вучняў чацвёртага і пятага класаў, але я вучыўся добра, мяне ніколі не секлі.

Адзін чатырохкласнік, гувернёр Д. з кватэры Нарбутовай, сын шляхціца з ваколіцы В., вучыўся добра, але быў вялікі свавольнік. Неяк, калі ўжо празвінеў званок на лекцыі, ён бомбай уварваўся ў наш клас, кленчыў на стале і паказваў усім нам нягжэчную частку цела. І трэба ж было такому здарыцца, што ў гэты момант у клас, каб весці ўрок, увайшоў ксёндз. А тая частка цела якраз была накіраваная ў бок ксяндза. Небарака саскочыў са стала і думаў схавацца, але ксёндз усё заўважыў і паставіў яго на калені ў калідоры вучэльні - ніякія малітвы, абяцанкі і просьбы не дапамаглі. Дырэктар заўважыў на калідоры ўкленчанага Д. і прапісаў яму яшчэ розгаў. Атрымаў спадар гувернёр! Другі раз той жа самы Д. быў абвінавачаны прафесарам Урбановічам, і зноў яму розгаў мала не было!

Урбановіч у Лідзе на адным месцы працаваў выкладчыкам трыццаць гадоў. Чалавек гэты быў надзвычай скупы. Да канца жыцця ён назбіраў вялікія грошы і дажываў век разам з пляменнікамі ў ваколіцы Астравухі. Меў шчаслівую старасць. Не піў гарэлкі, піва

[80] *"Рускія людзі ў цывільнай адміністрацыі краю сустракаліся вельмі рэдка, большай часткай толькі ў губернскіх гарадах, у павятовых рускі чалавек уяўляў сабой выключную з'яву. Прытым тутэйшы рускі службовы люд быў зусім адмысловага гатунку. Карэнных выхадцаў з Расіі заносіла сюды якая-небудзь выпадковасць... Такія назіранні я вынес з вельмі многіх гарадоў Паўночна-Заходняга Краю, куды мяне кідаў лёс. Усяго даўжэй мне прыйшлося пражыць з батальёнам нашага палка ў горадзе Лідзе Віленскай губерні. Тут у цывільнай адміністрацыі, пачынаючы з гараднічага, усе былі тутэйшыя. Праўда, найшоўся адзіны рускі, наглядчык павятовай вучэльні, званы па польскай тэрміналогіі "панам прэфектам", ды і той быў горкі п'яніца. Гэта быў карэнны русак, але ў маральных адносінах зусім бесхарактарны. Відаць, яго схавалі ў гэтую глухмень за п'янства. Да сваёй вучэльні ён амаль не меў дачынення, і... настаўнікі выкладалі так, як хацелі, без усякага кантролю; балазе ў той час яшчэ не была ўсталявана, як зараз, сістэматычная рэвізія выкладання з боку акруговых начальнікаў".* Гл: Любарский, И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) / И. В. Любарский // Исторический вестник. - 1895. - Т. 59, № 3. - С. 818.

і наогул ніякіх алкагольных напояў у рот не браў. Не паліў ні люлькі, ні цыгары (папярос у той час яшчэ не было). Я бачыў яго карціны (ён сам іх намаляваў) такога зместу: сатана з рагамі, на курыных нагах, нахіляе галінку, на якой сядзяць курыльшчык, піток, аматар жанчын і карцёжнік. А вакол людзі рознага веку, стану і полу з вытарашчанымі вачыма імкнуцца да гэтай галінкі…

Другая карціна: д'ябал на курыных лапах, з рагамі, са страшным выразам твару трымае ў руках шыльду, на якой напісана: "Бяздзейныя, лянівыя, дзёрзкія - заходзьце!"

Урбановіч мяне называў "Яўстаф'юшка-душачка", а каго не любіў, на тых крычаў: "Ты скотина, подлец! Будешь, будешь целовать в косматую ручку, но пощады никакой не будет!" Гэта азначала: калі пойдзеш у пекла, дык будзеш касматую руку д'ябла цалаваць, але дарэмна - раней трэба было думаць.

Наша школа месцілася на вуліцы Віленскай, у прыватным доме нейкага Міцкевіча. Гэты дом яшчэ нядаўна існаваў, і калі я праходзіў каля яго, заўсёды успамінаў мілыя і светлыя часы маёй вучобы. А калі вокны былі расчынены, я з вялікай цікавасцю заглядаў у пакоі. Але не так даўно той дом згарэў, і на памяць пра яго застаўся толькі кавалак даху на паштоўцы[61].

Яшчэ раней за мяне ў Лідзе з'явіўся мастак Пятрусевіч. Ён акварэллю намаляваў партрэт выкладчыка Урбановіча. Партрэт скапіраваў добры малявальшчык-канцылярыст Віталіс Шаблоўскі. З Шаблоўскім я быў у сяброўскіх стасунках і выкленчыў у яго гэты партрэт. Захоўваў у сябе такую дарагую памяць пра свайго прафесара. Калі я ўжо вучыўся ў Наваградку, прафесар Фэглер прасіў аддаць яму гэты партрэт таварыша. Я не мог спрачацца з паважаным Фэглерам і з вялікім болем у сэрцы мусіў расстацца з дарагой для мяне рэччу. Лёс Фэглера быў сумным - ён памёр у Вільні, і пасля смерці абодвух дарагіх для мяне настаўнікаў я расшукваў той партрэт або яго копію, але не знайшоў.

Як сярод добрага зерня знаходзіцца насенне пустазелля, так і сярод вучняў бываюць нягоднікі, якія даюць прафесарам мянушкі. Так Урбановіча ўсе называлі Каралём і рэдка калі інакш. Вількоўскага называлі Віш, Фэглера - Флюк, Баўмблеўскага - Апалонік. Гэты звычай - даваць прафесарам мянушкі - мне надта не падабаўся. Пачуўшы іх, я выходзіў з сябе і гэтым здабыў сабе шмат непрыяцеляў сярод вучняў. Калі прапаноўвалі сарваць лекцыю, я, як вельмі правільны вучань, не згаджаўся, і злосць калег вылівалася на мяне. Аднаго разу яны нават хацелі закруціць мне галаву ў паліто і пабіць. А другі раз мяне выклікалі на двубой - кулачны паядынак. Я быў вельмі слабы і не паспеў літаральна нават адным пальцам паварушыць, як апынуўся на зямлі. Нічога не мог зрабіць са сваімі праціўнікамі - ні словам, ні сілай. Але мяне вельмі крыўдзілі іх зласлівасць і дурата, бо як жа можна не паважаць настаўнікаў, якія нас вучаць і да дабра вядуць.

І нарэшце пра знакамітага Рудзкага - вартаўніка нашай школы. Ён служыў тут 38 гадоў. Паколькі без розгаў у той час вучыць не атрымлівалася, менавіта ён і выконваў пакаранне. Вучні, якія прайшлі праз рукі Рудзкага, у мой час былі ўжо палкоўнікамі, генераламі, канонікамі, пралатамі і г. д. Неяк на пошце я сустрэўся з адным палкоўнікам, які атрымаў выхаванне ў нашай вучэльні. Распытваў ён мяне пра Ліду і школу. Між іншым, успомніў вартаўніка. "Рудзкі і цяпер служыць, - адказаў я палкоўніку. - Без яго ніяк". - "Шчаслівую меў руку… добра мяне стымуляваў", - уздыхнуў афіцэр.

**Чацвёрты і апошні клас**

Атрымаўшы пасведчанне за трэці клас, я паехаў дахаты. Тут з першага дня расклаў свае любімыя кнігі і пачаў рыхтавацца да чацвёртага класа. Праз тры тыдні атрымаў ліст ад брата пра тое, што Лідская школа закрыта, але замест павятовай вучэльні ў Наваградку створана сямікласная гімназія. Ён прапанаваў мне прыехаць у Ліду, каб потым далей вучыцца ў Наваградку.

Калі я прыехаў у Ліду, дык даведаўся, што заняткі ў Наваградку пачынаюцца толькі 15 верасня, і таму я маю цэлы месяц вольнага часу. Спадарыня З., з чыёй дачкой быў заручаны мой брат, папрасіла мяне, каб я гэты месяц папрацаваў настаўнікам у яе трох сыноў. Старэйшы намерваўся ехаць са мной у Наваградак. Я заўсёды быў нервовы, надзвычай чулы і сентыментальны.

У канцы месяца я пайшоў да дырэктара, каб атрымаць пасведчанне пра заканчэнне трох лідскіх класаў. Шаноўны дырэктар выправіў для мяне ў Наваградак пасведчанне з падзякай наступнага зместу: *"Ученик Шалевич во всех отношениях превосходный молодой человек. Как бы мне приятно было услышать, что гг. Боублевский и Феглер[62], его бывшие учителя, а мои товарищи, помогли ему в переводе в IV класс. А. Шахов"*.

Яшчэ ён напісаў да свайго школьнага калегі, інспектара Беляўскага, добры ліст пра мяне. З гэтакай рэкамендацыяй я не меў праблем, і мяне прынялі ў чацвёрты клас. У гэты клас запісалася ажно пяцьдзясят пяць вучняў, і таму ў ім было цяжка. Першымі вучнямі класа лічыліся Абламовіч і Стос. Абламовіч - сын багатага гаспадара маёнтка Парасека на восемдзесят дзевяць дымоў. Стос - сын каваля, праваслаўны. Абодва вучыліся толькі на "5". Пасля гімназіі Абламовіч вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, а Стос стаў прафесарам гісторыі, ён потым пісаў, што выхаваны ў польскім духу.

У нашым класе было восем татар, з іх Абрахам Улан і Мурэчучык вучыліся не надта добра. Усяго гімназія налічвала трыццаць татар. Акрамя аднаго вялікага

[61] Невядома, дзе на вуліцы Віленскай стаяў дом Міцкевіча. З тэксту бачна, што згарэў ён ужо пасля пажару 1891 года, верагодна, на пачатку XX стагоддзя, а яго дах бачны на нейкай з паштовак.

[62] Гэтыя настаўнікі былі пераведзеныя ў Наваградскую гімназію.

фігляра і штукара, усе яны нармальна вучыліся і былі разумнымі і спакойнымі хлопцамі, не схільнымі да глупстваў і дрэнных учынкаў.

У гімназіі выкладаліся наступныя навукі: рэлігія, мовы (руская, польская (часова, да паўстання 1863 года - *Л. Л.*), нямецкая, французская, славянская), арыфметыка, алгебра, геаметрыя, гісторыя Расіі, а таксама сусветная і натуральная, геаграфія Расіі і агульная, фізіка, хімія, астраномія.

Рэлігію выкладалі тую, да якой належаў вучань. Катэхізмы і маральную навуку нам выкладаў ксёндз Бядрынскі, потым ён быў пробашчам у Вільні. Пры мне на невялікі тэрмін пасаду дырэктара займаў Лебедзеў (рускі), а потым яго змяніў паляк Чашніцкі (ці Чэсніцкі, дакладна не памятаю). Інспектар Бяляўскі добра выкладаў фізіку і геаметрыю. Рускай мове вучылі: у старэйшых класах - Дзмітрыеў, а ў малодшых - Савельеў. Польскую мову выкладалі: у старэйшых - Каўчан (ён выкладаў і лаціну), а ў малодшых - Гайбовіч. Выкладчыкам французскай быў наш лідзянін Баўмблеўскі, нямецкай - на пачатку Гілберт, а потым Хэрмут. Алгебры вучыў стары спалячаны Васілеўскі. Натуральную гісторыю выкладаў вельмі мілы чалавек Кабецкі (караім). Агульную і рускую гісторыю - Чайкоўскі. Геаграфію - Лерывер, ён паходзіў з Францыі. Памочнікам старшых настаўнікаў быў Савельеў. Маляваць вучыў Пранкоўскі.

Для нашага любімага Фэглера месца адразу не знайшлося, і ён нейкі час лічыўся пры гімназіі пазашкольным наглядальнікам. Толькі праз некалькі месяцаў зноў стаў прафесарам гімназіі. Гэтага добрага чалавека ніхто ў Наваградку не паважаў, і ён павінен быў кожны дзень абыходзіць кватэры вучняў.

Акрамя двух, усе прафесары гімназіі вельмі добра выкладалі свае прадметы. Напрыклад, інспектар Бяляўскі. Калі ён тлумачыў геаметрыю, дык не было такога, каб нехта выйшаў з класа, не зразумеўшы тэмы. Ксёндз Бядрынскі, выслухаўшы нашы адказы, пачынаў наступную тэму, а калі заставаўся яшчэ вольны час, так добра расказваў нам анекдоты, што мы трымаліся за бакі ад рогату.

Шаноўны прафесар Каўчан добра выкладаў лаціну і польскую мову, і ад яго можна было шмат чаму навучыцца, але я ў той час быў вельмі хворы. “Бог стварыў мяне як генія ці вялікага чалавека, але хвароба ўва мне ўсе забіла!”

Прафесар Кабецкі выкладаў заалогію, батаніку і мінералогію. Хэрмут вучыў нямецкай мове па методыцы, якой у той час ніхто не карыстаўся. За гэта на яго абураліся некаторыя вучні са сваімі бацькамі і нават сам дырэктар. Выкладаў ён па методыцы, якая сёння ўжо прызнаная і агульнавядомая.

Наогул, усе прафесары добра выкладалі, і вучні наваградскай гімназіі вызначаліся добрай вучобай і прыкладнымі паводзінамі. Толькі потым з Ліды прыехаў адзін вучань, І. К., якога перад гэтым выгналі з Полацкага кадэцкага корпуса. Ён шмат што вырабляў і горш за ўсіх вучыўся. Адна авечка ўвесь статак псавала. Я з ім жыў на адной кватэры, але ён быў маім вялікім непрыяцелем і пераследаваў мяне.

З-за ўзмацнення хваробы мне прыйшлося пакінуць гімназію ў чацвёртым класе. Адбылося гэта 16 лістапада 1859 года.

Я прыехаў дамоў і пятнаццаць гадоў працаваў на гаспадарцы. Меў слабае здароўе, тым не менш працаваў фізічна. Каля 1875 года заняўся выкладаннем і так працую ўжо трыццаць шэсць гадоў. З маіх вучняў адзін выйшаў у інжынеры, другі стаў капітанам, ёсць ксяндзы і г. д. А самы галоўны вучань і сваяк, самы таленавіты ў маёй сям'і, стаў нашым першым студэнтам у Інстытуце шляхоў зносін. Але ён пакінуў гэты свет у маладыя гады. Яго бацька і мой родны брат не вытрымаў страты і хутка пасля сына таксама памёр. Я застаўся адзін.

У Наваградку я кватараваў у сп. Грыфін, якая палюбіла мяне як сына. Вечарамі часта хадзіў да яе паразмаўляць. Інспектару яна пра мяне заўсёды гаварыла добра. Яе муж вучыўся ў школе з Адамам Міцке-вічам.

Пасля гімназіі я сустракаўся толькі з адным маім прафесарам - з Васілеўскім, у Вострай браме.

Як у Лідскай прагімназіі, так і ў Наваградскай гімназіі сярод вучняў я меў сяброў і ворагаў. У першым класе ў мяне быў прыяцель Міцкевіч, сын эканома з маёнтка Грабоўскага[63], але ён хадзіў у школу толькі адзін год. У гэтым класе я таксама сябраваў з добрым хлапчуком Феліксам Яцінскім. Ён заўсёды быў каля мяне, і ўсе сваркі, бойкі і звады ў нас былі агульнымі. Рассталіся мы з ім у Лідзе ў 1858 годзе, зноў жа сустрэліся ў Эйшышках - толькі праз пяцьдзясят гадоў.

Калі я вучыўся ўжо ў другім класе, у першы клас паступіў Тэафіл Барклеўскі з маёнтка Ражанка, унук агародніка[64] Барташэвіча. Сірата, ён не меў ні бацькі, ні маці, гадаваўся добрым дзедам. Гэта быў спакойны хлопец, які старанна вучыўся і добра сябе паводзіў. З ім я сябраваў тры гады, мы разам выходзілі гуляць за горад і марылі пра далейшую адукацыю. Неяк выпадкова сустрэліся ў Наваградку, каля па-дамініканскага касцёла, і, як яўрэі пра гандаль, пачалі спрачацца пра астраномію. Я махаў рукамі і амаль крычаў: "Які гэты Сусвет вялікі: да Месяца - пяцьдзясят тысяч міль, да Сонца - дваццаць мільёнаў міль, да найбліжэйшай зоркі - чатыры більёны міль! А колькі ж да самай далёкай?! За гэтакай размовай не заўважылі, што да нас наблізіўся наш шаноўны дырэктар. Калі ён з намі параўняўся, мы як жаўнеры выцягнуліся і знялі шапкі, а ён нам гжэчна адказаў кіўком галавы. Было бачна, што дырэктар чуў нашу размову і яму было прыемна.

Меў я і двух ворагаў, якія пераследавалі мяне на кожным кроку: у першы год гэты былі Ігнат Каліноўскі (жыў з ім на адной кватэры) і Адам Баранцэвіч, з якім я мучыўся тры месяцы. Каліноўскага за нейкі ўчынак

[63] Верагодна, з Вялікага Мажэйкава.

[64] Агароднік - селянін, які апрацоўваў малы кавалак зямлі - агарод.

выгналі з Полацкага кадэцкага корпуса, і таму ён вучыўся ў Лідзе, а потым, на маю пакуту, у Наваградку. Я сварыўся з ім цэлы год - ён даводзіў мяне да таго, што я выходзіў на замкавую гару і біўся галавой аб камяні. Каліноўскі быў подлым хлопцам, неяк у Наваградку ён так штурхануў вучня Г., што ў таго ад удару аб сцяну з носа пайшла кроў. За гэта інспектар Каліноўскага пакараў.

Каліноўскі заўсёды глядзеў з-пад ілба і кожны дзень рабіў мне шкоду. У Лідзе адзін хлопец праз яго пайшоў на той свет.

У Лідзе маімі калегамі па вучобе былі сп. В. Ячыноўскі, І. Кяшкоўскі ды І. Ільцэвіч, цяпер у Вільні жыве Станіслаў Ёдка. Ксяндзамі сталі Мацей Гарасімовіч, Адам Сакалоўскі, Баляслаў Асецкі, Яўстах Карповіч, Аляксандр Рынкевіч і Пётр Казакоўскі.

Ксёндз Гарасімовіч старанна вучыўся і быў добрым школьным калегам. Служыў вікарыем і пробашчам па вёсках, потым быў рэктарам у Віленскай духоўнай семінарыі. Працаваў сакратаром біскупа Грынявіцкага, лічыўся яго дарадцам і правай рукой. Яны планавалі зрабіць ў дыяцэзіі шмат перамен, але біскупа выслалі, здаецца, у Яраслаўль[65].

Неяк прыязджаю я ў Ліду і сустракаю ксяндза Гарасімовіча ў касцёле вікарыем. Лячу да яго, каб выказаць сваё шанаванне (прыемна было сустрэцца, бо доўга не бачыліся). Што сталася? Чаму яго з рэктара семінарыі перавялі ў вікарыі, ды яшчэ да ксяндза Карповіча!?

Пасля Ліды ксёндз Гарасімовіч нядоўга служыў пробашчам у Новым Двары (Лідскага павета), потым заняў пасаду лідскага дэкана і пасля Ліды вярнуўся ў Вільню пралатам.

Паходзіў з дробнай шляхты з ваколіцы Кербядзі Лідскай парафіі. У школе быў ціхім, спакойным, працавітым вучнем. Як і я, з іншымі вучнямі не гуляў (у мяч ці іншыя гульні) і ўзорна сябе паводзіў. Калі я быў у Лідзе ў 1904 годзе, раптоўна да дэкана прыйшла тэлеграма: памёр ксёндз Гарасімовіч.

У адной школе з ксяндзом Адамам Сакалоўскім я вучыўся толькі год - ён у чацвёртым класе, а я ў першым. Але мы жылі ў адной гаспадыні. Пасля чацвёртага класа ён паступіў у семінарыю і стаў ксяндзом. Меў добры голас і спяваў у хоры біскупа Адама Красінскага. Сакалоўскі пачынаў служыць вікарыем у вясковых касцёлах, потым больш за трыццаць гадоў працаваў пробашчам у Начы. З-за хваляванняў у парафіі паміж начанамі і дубічанамі[66] яго перавялі. Здаецца, цяпер працуе пробашчам у Жырмунах. Мае сустрэчы з ім заўсёды былі прыемнымі - пакуль ён служыў у Начы, я часта бачыў яго, бо я жыў у той жа парафіі.

Баляслаў Асецкі - мой школьны калега і блізкі сусед. Пасвечаны ў ксяндзы ў 1863 годзе, ён павінен быў служыць у Жалудку. Дзесяць гадоў служыў вікарыем у Радуні, дзе потым - не ведаю. Закончыў сваё жыццё ў Паставах. Ксёндз Якалоўскі расказваў, што пралат Бядрынскі пасля смерці пакінуў у спадчыну 180 тыс. рублёў, 2/3 гэтых грошай былі запісаныя на яго сям'ю, але і ксяндзу Асецкаму належала атрымаць 17 тысяч рублёў. Казалі, што сабе ён пакінуў толькі 3 тысячы, а рэшту аддаў на дабрачыннасць. Калі гэта праўда, дык гошар яму і хвала!

Ксёндз Яўстах Карповіч - сын медыка з Жалудка, калега па школе і мой добры знаёмы з дзяцінства. Цяпер служыць пробашчам у Ракаве Менскай губерні. Ад пралата Бядрынскага таксама ў спадчыну атрымаў многа грошай. Нарадзіўся ў вялікай сям'і, меў шэсць братоў і пяць сясцёр.

Ксёндз Аляксандр Рынкевіч таксама нешта атрымаў ад ксяндза Бядрынскага. Дзе цяпер служыць - не ведаю.

Ксёндз Пётр Казакоўскі паходзіў з Радунскай парафіі. Усё жыццё правёў у Польскім каралеўстве. Калі пастарэў - прасіў, каб яго пахавалі сярод радунскіх сваякоў, што і было зроблена.

Пралат Бядрынскі[67] меў трохі больш за семдзесят гадоў, але быў яшчэ здаровы і, калі б не адзін выпадак, мог бы яшчэ доўга жыць. Аднойчы ён вяртаўся ад вясковага пробашча, коні панеслі, разбілі яго брычку, і Бядрынскі загінуў.

Адкуль пралат меў так шмат грошай - невядома. Я пра гэта думаў. Каб кожны год адкладаў па тысячы, дык трэба было жыць сто восемдзесят гадоў, а ён пражыў толькі семдзесят. Калі працаваў прафесарам у Наваградку, атрымліваў звычайны заробак, і пра яго вялікія грошы ніхто не чуў. Да таго ж лёкай пралата пасля смерці скраў з яго камода 12 тысяч рублёў (гэта акрамя тых 180 тысяч).

Ай, мая шаноўная пані, я добра ведаю, адкуль гэтыя грошы паходзяць.

Як вядома, адміністратар Жылінскі[68] пабудаваў на Коннай вуліцы вельмі прыгожую камяніцу. Казалі,

---

[65] Біскуп Караль Грынявецкі (1841-1929) у 1883 годзе быў прызначаны папам Львом XIII віленскім біскупам, а ў 1885 годзе сасланы ў Яраслаўль за супраціў русіфікацыі.

[66] Хваляванні былі выкліканы патрабаваннем летувіскіх вернікаў служыць імшу па-летувіску.

[67] Феліцыян Бядрынскі (Бядржынскі) - прэлат, кандыдат тэалогіі (не блытаць з сучасным кандытатам навук), схаластык вялікага Віленскага кафедральнага капітула, законанастаўнік Віленскай мужчынскай гімназіі і Марыінскага вышэйшага жаночага вучылішча, кавалер ордэна Св. Станіслава 3 ст., узнагароджаны залатым наперсным крыжам і медалём за вайну 1853-1856 гадоў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. - Вильна, 1875. - С. 136-137.

[68] Пётр Жылінскі (1817-1887) - кіраўнік Віленскай дыяцэзіі, пралат-прапазіт (кіраўнік манаскага ордэна) кафедры, доктар тэалогіі, кавалер ордэна Св. Станіслава 1 і 2 ст. з імператарскай каронай, кавалер ордэна Св. Уладзіміра 3 ст., узнагароджаны наперсным крыжам, медалямі за вайну 1853-1856 гадоў і задушэнне паўстання

што з усіх пробашчаў ён цягнуў добрую даніну - пробашч нават самай малой парафіі павінен быў даваць яму ў лапу 150 рублёў штогод.

Казалі яшчэ, што нейкі ксёндз нібыта прапаноўваў Жылінскаму за арэнду Вострай Брамы 50 тыс. рублёў штогод, але той не згадзіўся. Усе гэтыя грошы не аднаму Жылінскаму ішлі, іншыя пралаты таксама "сваё" мелі. Адзін спадар расказаў яўрэю, што Жылінскі прыгожую камяніцу пабудаваў. "Ай, я і не такую б камяніцу паставіў, каб гэтакую маці меў…"

Нейк, калі Жылінскі сядзеў у сакрыстыі Вострай Брамы, у касцёл прыйшоў нейкі селянін. Селянін запытаўся ў мясцовага хлопца: "Каму тут, паночак, на імшу даваць?" Жартаўнік адказаў: "Дай гэтаму ксяндзу (паказвае на Жылінскага), толькі папрасі яго, каб Жылінскаму грошай не даваў, бо той імшу не адправіць". Селянін падыходзіць, нізютка кланяецца, і, падаючы грошы, кажа: "Прашу, вяльможны ксяндзюлячку, прыняць за імшу, толькі Жылінскаму не давай, бо той імшы не адправіць!" - "Не дам. Не дам!" - адказаў Жылінскі[70].

У час вучобы майго брата ў Лідскай школе да мяне дырэктарам там працаваў нейкі католік Падзерня. Гэта быў вельмі шляхетны чалавек, так пра яго казаў мне Урбановіч. У яго час з рускіх там працаваў толькі выкладчык рускай мовы Лаўроў, быў яшчэ немец, выкладчык нямецкай мовы Гілберт, а усе астатнія - палякі[71]. Пры мне Гілберт выкладаў у Наваградку і так казаў пра чужую для яго мову: "Як у гэтых палякаў усё аднолькава: шкляны слоік, спявае слоік[71] і я слоік[72] ".

Тады яшчэ выкладалася латынь. Прафесарам латыні быў Заблоцкі, французскай мовы - Масіні, скрыпач, пры мне ён ужо быў на пенсіі і граў на скрыпцы з раніцы да вечара. Нейк ён сваёй музыкай давёў мяне да слёз. Урбановіч спытаў у мяне: "Каралевіч, чаго плачаш?" - "Спадар Масіні так прыгожа грае!"

У часы Падзерні ў Лідзе былі вучнёўскія спевы. У мае часы такога ўжо не было, але мы стварылі аматарскі калектыў. Мы збіраліся па чатыры-пяць (а часам і сем) чалавек і гралі, кіраваў намі Віталіс Шаблоўскі.

### Лісты

Шаноўны ксёндз-рэдактар!

З вялікай прыемнасцю бяру ў рукі пяро, каб выканаць жаданне спадара рэдактара і апісаць цяг свайго жыцця і свае працы па механіцы. Нават не для таго, каб гэта было надрукавана ў газеце, а проста, каб вы ведалі.

З шасці гадоў я ніколі не выпускаў з рук нажа. У дзесяць гадоў рабіў маленькія вазкі, домікі і г. д. У адзінаццацігадовым узросце, выслухаўшы расповед майго с. п. бацькі, зрабіў мадэль помпы, і яна добра пампавала ваду. Тады ж зрабіў малы ветраны млын з бразготкай, якую было чуваць на палову вярсты. Потым ствараў прыгожыя сэрцайкі, кошыкі і крыжыкі з паперы - паненкі і пані бралі іх сабе на памяць. Пасля зрабіў ткацкі варштат і ткаў стужкі, выдумляючы арнамент.

З-за вельмі слабога здароўя ва ўзросце трынаццаці гадоў я ледзь паступіў у першы клас прагімназіі ў Лідзе. Вельмі любіў навуку і сваіх настаўнікаў, яны таксама добра да мяне адносіліся.

У 1858 годзе тую прагімназію закрылі, і я пачаў вучыцца ў Наваградскай гімназіі. Там мяне надта зацікавіў вялікі мураваны ветраны млын, які стаяў на замкавай гары, недалёка ад маёй кватэры. Таму ў вольныя ад навукі гадзіны я прыходзіў да яго. Млынар быў надта злы і праганяў вучняў без цырымоній. Але да мяне ён ставіўся добра і дазваляў нават падымацца на вышэйшы паверх ветрака. Прыехаўшы дамоў на вакацыі, я зрабіў маленькі драўляны ветрачок з лопасцямі ў

1863-1864 гадоў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. - Вильна, 1875. - С. 136.

Масолаў А.: *"Некалькі пазней узвысіўся вілейскі дэкан П. Жылінскі, чалавек яшчэ не стары, але цалкам сівы, трымаўся, як каталіцкі біскуп - важна і стрымана. Ён атрымаў адзін з лепшых Віленскіх прыходаў - Вострабрамскі (каля гэтага касцёла - знакамітая брама з капліцай, пад'язджаючы да брамы па вузкай вуліцы, усё людзі здымалі шапкі) і прызначаны пралатам".* Гл: Мосолов, А. Н. Виленские очерки 1863-1865 гг. / А. Н. Мосолов. - СПб., 1898. - С. 117-118.

Пётр Жылінскі, пасвечаны ў святары ў 1842 годзе. Пробашч Віленскай Вастрабрамскай парафіі. У 1866 годзе і ў 1868-1883 гадах - адміністратар Віленскае дыяцэзіі ў сувязі са ссылкай у Вятку біскупа Адама Станіслава Красінскага. Выявіў сябе як актыўны прыхільнік русіфікацыі касцёла. У лістападзе 1869 года, падчас аўдыенцыі ў Аляксандра II, заявіў, што з'яўляецца сапраўдным патрыётам Расіі і гатовы ўсім ахвяраваць дзеля Айчыны і цара. У 1871 годзе даў дазвол на выданне расейскамоўнага катэхізму "Рымска-каталіцкі катэхізіс пра паслухмянасць і адданасць прастолу і Айчыне нашай Расіі або тлумачэнне 4-й запаведзі Госпада, якая датычыць начальства і яго ўлады". У 1876 годзе для паскарэння русіфікацыі касцёлаў былой Менскай дыяцэзіі падзяліў яе на два візітатарствы - Менскае і Слуцкае. Палітыка адміністратара выклікала рэзкі супраціў вернікаў і святароў. 23 студзеня 1878 года Жылінскі атрымаў ліст ад кардынала Кацярыні, у якім Ватыкан абвінавачваў яго ў самавольным уступленні ў кіраванне дыяцэзіяй, а таксама ў спробах пазбыцца лепшых ксяндзоў і ўвесці ў касцёл рускую мову. Рым патрабаваў ліквідацыі пасад візітатараў. Напрыканцы 1882 года Пётр Жылінскі выехаў у Ватыкан, дзе адрокся ад ранейшых "памылак" і атрымаў адпушчэнне грахоў. Зразумела, што такі "свой" чалавек меў поўную свабоду красці.

[69] Увесь гэты дыялог у Вострай Браме запісаны па-беларуску.

[70] У сэнсе - мясцовыя рыма-католікі.

[71] Скажонае "slowik" - салавей.

[72] Скажонае "czlowiek" - чалавек.

1,5 локця, з кашом і скрыняй. Засыпаўшы ў вятрак чыстага пяску, можна было назіраць усе этапы працы млына.

Слава аб маім млыне разышлася па акрузе. У той час па Жалудоцкай парафіі хадзіў механік, нейкі Адамовіч. Ён, пачуўшы пра мой млын, адмыслова заехаў да нас, каб яго ўбачыць. На жаль, мяне тады не было дома, і механік, агледзеўшы млын, сказаў бацькам: "Калі ваш сын пойдзе па гэтай дарозе, дык узнімецца высока".

Але я не пайшоў па гэтай дарозе і ўсё жыццё блукаў па бездарожжы ў міражах.

З трох гадоў я заўсёды адчуваў галаўны боль і праз гэта не змог вучыцца далей, не дайшоў і да пятага класа, і давялося мне пакінуць любыя навукі. Схіліўшы галаву, плакаў і маліўся перад абразом Маці Божай у па-дамініканскім касцёле ў Наваградку, слёзы капалі на падлогу. Але гэта не дапамагло, я пакінуў гімназію і прыехаў дахаты, каб заняцца гаспадаркай, але патроху і майстраваў.

У 1864 годзе зрабіў сабе маленькую, у палову локця, арфу. Зрабіў яе, не маючы ні варштатаў, ні прылад, ні хоць якіх інструкцый. З інструментаў меў толькі вялікую нязграбную сякеру, долата і пілку. Увесь час быў заняты гаспадаркай і сваю арфу рабіў вечарамі і па начах. Не маючы струн, зрабіў іх з моцных навошчаных нітак. Арфа атрымалася лепшай, чым я спадзяваўся, і служыла мне больш за год.

У 1865 годзе я прыняўся за новую (ужо вялікую) арфу. Варштат пазычыў у цеслі - добрага суседа, і на гэты раз меў адпаведны матэрыял: струны зрабіў з дроту, прыдумаў, як змайстраваць сапраўдны корпус і механізм нацяжэння струн. Гэтая вялікая арфа працавала пятнаццаць гадоў і цяпер яшчэ жыве, на баку яе надпіс: "1865 год". Акрамя гэтых дзвюх арфаў я зрабіў яшчэ чатыры. З іх адна ў 1871 годзе пайшла жалудоцкаму пробашчу ксяндзу Гайжэўскаму.

У той час я зрабіў некалькі машынак для чысткі бульбы. У 1866 годзе паставіў на полі малы вятрак, які працаваў тры гады. Усё гэта рабіў я з задавальненнем, але мне ніколі не хапала грошай.

Тры гады бесперапынна спаць не мог, усё думаў: як набіваць валікі для катрынкі? Але неяк раптам, бы хто малатком па галаве ўдарыў - гэтак стрэліла мне думка пра тое, як гэта можна зрабіць.

У Жалудку жыў арганіст Вінцэнт Ліхвяровіч, малады і вельмі здольны да рамёстваў чалавек. Ён быў сталяр-самавук і інструментальшчык, якіх мала. Выдатна дадаў галасы да гармоніі. Рабіў такія рэчы, якіх і ў Вільні не рабілі. Свой свайго заўсёды пазнае, і зразумела, што мы пасябравалі. Я навучыў яго нотам, і мы стварылі аматарскі музычны калектыў. Зрабілі мы катрынку, якая грала "Вітай Панна!", і потым радасна скакалі па пакоі. Я навучыў яго набіваць валік для катрынкі, і яна магла граць усё, што пажадаеш - нават і старасвецкі англез ці што іншае.

Я ўсё жыццё меў замілаванне да механікі. Як толькі канчаў рабіць адну рэч, дык адразу браўся за іншую. І покуль не зраблю - есці і спаць не магу, хаджу, як упыр, і грызуць мяне думкі пра новы праект!

Для маёй працы трэба было ўмець ліць латунь, і таму, калі я быў у Лідзе, зайшоў я да яўрэя-злотніка, які ліў бронзу. "Навучы мяне латунь адліваць", - кажу. Майстар паглядзеў на мяне і па маіх вачах зразумеў, як гэта мне неабходна! Вучыў мяне паўгадзіны, але я прыехаў дадому і адразу раздзьмуў горн, сабраў усё, што трэба, і адліў якасны латунны ключ.

Яшчэ ў 1865 годзе я, калі рабіў арфу, пазычыў у цеслі яго варштат і потым зрабіў сабе свой. З таго часу праца мая пайшла!

З самага дзяцінства я незвычайна любіў бляхарства. За некалькі гадоў цяжкай і мазольнай працы дайшоў да добрых вынікаў, бо зрабіў ажно чатыры бляшаныя самавары.

У 1868 годзе стварыў вялікі глобус, намаляваў на ім усе часткі сусвету, акіяны, моры, і ўсё гэта атрымалася прыгожа. Потым падарыў яго для навучання геаграфіі п. Стацкевічу. Другі такі ж глобус зрабіў праз дзесяць гадоў. Абодва былі з паперы, атрымаліся, як трэба: круглыя, гладкія, моцныя і ў сярэдзіне пустыя. Другі глобус маю ў сябе і сёння - ён добра прыдаўся мне для навучання.

У 1873 годзе міравому суддзі з Жалудка Байлатаву[73] зрабіў механічную лодку сваёй канструкцыі - круцілася воднае кола, і лодка, як параход, ішла па вадзе. Суддзя - малады яшчэ чалавек - працяглы час ездзіў на гэтай лодцы па вялікім ставе і добра бавіў час. Слава пра мой выраб дайшла ажно да Польскага каралеўства.

Каля 1875 года стрэліла мне ў галаву думка зрабіць паравую машыну. На чыгуначнай станцыі ў Аранах[74] прасіў машыніста, каб той раскрыў для мяне цыліндр і клапанную сістэму паравой машыны, і я мог зразумець, як яна працуе. На пэўных умовах машыніст-немец, хоць і са страхам, але ўсё ж паказаў мне тое, што трэба. Як толькі я вярнуўся дадому, пачаў збіраць усё належнае і рабіць паравую машыну - лакамабіль.

Цыліндр і іншыя штучкі адліў з волава, бо з гэтым металам ужо ўмеў працаваць. Кацёл зрабіў у стылі самавара са звычайнай белай бляхі. Калі ўсё было гатова, заліў вады, паклаў вугалю і дзьмухаў-хукаў, каб хутчэй распальвалася. Хацелася, каб як хутчэй. Нарэшце бачу: ёсць моцная пара. Хачу ўзяцца рукой за кран, каб пусціць пар у цыліндр, - рука не рухаецца, а сэрца гвалтоўна стукае. Не магу, не магу. Што будзе, што будзе?! А калі ўся мая праца марная?! Нарэшце сабраў усю сілу волі і адкрыў кран!

О Езус! Хрысце! Кола машыны хутка і шалёна закруцілася. Бегаю, крычу, скачу па доме як вар'ят! Усіх

[73] Васілій Іосіфавіч Байлатаў.

[74] Праз Ліду Палеская чыгунка прайшла толькі ў 1882 годзе, але па самай поўначы Лідскага павета праходзіла чыгунка "Пецярбург - Варшава". Таму Шалевіч і бачыў паравоз у Аранах (тады Троцкага павета).

напужаў і ўсё ў хаце перавярнуў.

Але мая машына была пабудавана са слабых матэрыялаў і нядоўга мне служыла. Цешыўся ёю толькі некалькі тыдняў. Потым закінуў у кут, дзе яна праляжала васямнаццаць гадоў.

У 1885 годзе з бляхі, на манер варшаўскіх машын, я зрабіў пырскалку, якая палівала вуліцы. Магла ўжывацца пры пажары, бо струмень вады з яе перабіваў цераз аднапавярховы дом.

Праз нейкі час ізноў прыйшла да мяне ідэя пабудаваць лакамабіль. Тады я ўжо меў лепшыя слясарныя і сталярныя інструменты, ды і нейкія грошы з'явіліся. Кацёл зрабіў з тоўстай меднай бляхі, цыліндр і ўсё патрэбнае да яго адліў з латуні - атрымалася надзейна і добра. Кола было хоць драўлянае і невялікае, але для вагі акутае волавам[75]. Кацёл меў мернае шкло і клапан бяспекі.

Калі падняўся ціск у катле, і паравая машына пачала круціць кола - для навукоўцаў праблема на гэтым была б ужо вырашана, але механікам патрэбна, каб машына рабіла нешта карыснае. Таму я зрабіў яшчэ малатарню, якая малаціла, сартавала і ссыпала зерне ў мяшок. Зрабіў і малы тартак, які пілаваў палена на дошкі. На катле меўся свісток, які было чуваць за паўвярсты.

Зрабіў яшчэ шмат механізмаў, напрыклад, у 1867 годзе - конную малатарню, якая служыла доўгі час.

Спрабаваў сябе ў шавецкім і рымарскім рамёствах. Шаўцом не стаў, а рымарская справа нават і пайшла.

Гадзіннік. Ён атрымаўся вялікі, некаторыя колышасцерні ў ім маюць памер добрага сподка. Усе дэталі драўляныя і зробленыя маімі рукамі без ніякага такарнага станка - кола выразаў сякерай. Як выразаць зубцы на колах - прыдумаў сам. Рабіў гадзіннік у вольны час, пры агні, па вечарах. Мазольна працаваў паўгода, і нарэшце 28 чэрвеня 1898 года мой гадзіннік пайшоў. Дакладна паказваў час і біў гадзіны. Віленскі гадзіннікавы майстар, яўрэй, сказаў мне: "Рабіць такі гадзіннік - катаржная праца". Да гадзінніка я зрабіў яшчэ шмат дадаткаў - ён і абутак на раніцу падаваў, і дзверы, калі трэба, адчыняў і г. д.

Некалькі гадоў таму, у 1905-м, я цалкам перастаў майстраваць. Гадзіннік і ўсе свае рэчы вынес на гарышча, дзе яны і спачываюць. Узрост. Механікай займаўся пяцьдзясят гадоў - меў такое жаданне канструяваць розныя рэчы, што падобна было на хваробу. Але маю такі ўзрост, што ўжо нічога добрага зрабіць не магу.

*18 лютага 1913 года.*

Шаноўная спадарыня!

Што пані можа сказаць пра вершык "На смерць Нарбута"? [76] Я, як вялікі знаўца літаратуры, яго вельмі люблю, бо добра памятаю той страшны час. Аўтара гэтага верша я ведаў асабіста[77], мы блізка жылі і часта сустракаліся. Ён з'яўляўся невычарпальнай крыніцай анекдотаў - на вячорках заўсёды быў душой кампаніі і ўсіх весяліў, але з'яўляўся вельмі мілым чалавекам і вялікім патрыётам. У тым няшчасным годзе ён, як і я, меў шмат маральных пакут. Хаця я нават, можа, і больш. С. п. Даніэль Камінскі меў хворыя ногі і памёр у 1868 годзе.

Наш народ вельмі цёмны! Зараз, здаецца, заблішчэлі іскры асветы. Неяк мой пляменнік прыехаў да свайго бацькі і прывёз з сабой ровар. Аднойчы ён ехаў роварам, а кабета ішла насустрач. Калі яна ўбачыла, што чалавек едзе на кійку, дык вырашыла, што гэта злы дух, і пачала жагнацца, а потым уцякла ў поле. Назаўтра ён зноў паехаў і на сваім шляху дагнаў селяніна. Той, убачыўшы, што чалавек едзе на двух колах, пачаў жагнацца і бараніцца імем Езуса.

Некалькі гадоў таму над нашым дваром з'явіўся паветраны балон. Кабеты, якія працавалі ў полі, пачалі кленчыць і маліцца, жагналіся самі, жагналі балон, бо палічылі гэта за нябесную з'яву, за якой прыйдуць голад, мор, вайна і пажары. Гэтыя людзі і цяпер жывуць.

Тры гады таму зноў над намі з'явіўся паветраны балон. Мае кабеткі ўжо не жагналіся, а толькі глядзелі з цікавасцю. Я ім шмат расказваў, што паветраны балон - гэта не цуд, а вынаходніцтва чалавека.

Я ведаў аднаго старога, які вучыў дзяцей чытаць і пісаць і не браў за гэта грошы.

*Пераклад і каментарыі Леаніда Лаўрэша.*

[75] Аднацыліндравай паравой машыне цяжкае кола патрэбна для інерцыі, каб зрушваць поршань з "мёртвай кропкі".

[76] Верш надрукаваны, гл.: Kaminski, D. Na zgon Narbutta / D. Kaminski // Ziemia Lidzka. - 2003. - № 3(55).

[77] Аўтар - Даніэль Камінскі з маёнтка Сапунцы пад Радунню.

***Леанід Лаўрэш***

# Лісты Тэадора Нарбута да Аніцэта Рэніера

## Лісты Тэадора Нарбута да Аніцэта Рэніера ў Вільню*

*(Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары.)*

**34.**

Шаўры, 28 студзеня 1845 г.

Маю просьбы да пана:

1) "Ундзіну" чакаюць мае падпісчыкі, яны незадаволеныя і наракаюць. 2) Дзякуй за "Тыгоднік", але ўмовы цяжкія - трэба толькі за тое, каб чытаць, заплаціць 6 рублёў у год, калі за 3 ці 2 рублі можна атрымаць магчымасць чытаць іх раз у квартал. Таму, я выпісваюся з суполкі, бо часы зараз цяжкія. Раней плаціў 8 рублёў, але за гэтыя грошы меў экзэмпляр, які ўжо нікому не быў павінен перадаваць і які ніхто не хацеў памяняць на нейкі іншы. 3) Кніжку Падберскага вазьму сабе і прашу 5 зл. запісаць на мой дэбет. Бо каму ты яе яшчэ зможаш прадаць? 4) За "Помнікі ўмысловы" Кіркора вялікі дзякуй, пасылаю трошкі матэрыялаў, якія могуць зацікавіць чытача. Такое выданне вартае падтрымкі. 5) Што Рубэн робіць з "Хронікай Быхаўца"? Пішу яшчэ і асобна Нарбуту. 6) Прашу пакетам адправіць сп. Маліноўскаму[70] кнігу, якую ён мне пазычаў. 7) Калі ласка, вазьмі для мяне ў Рубэна другі экзэмпляр "Вобразаў Літвы" (Ярашэвіча).

Да пабачэння, бо як толькі вырашу хатнія справы, хачу быць у Вільні.

Мне даручылі працу начарціць план фасада і г.д. касцёла, які маюць будаваць у Эйшышках. А таксама зрабіць разлік матэрыялаў, работнікаў і коштаў. Таму, нягледзячы на ўзрост, прыйшлося ўзяць у рукі цыркуль і пэндзаль. Удалося прыдумаць прыгожую форму для Панскай святыні, гатовыя ўжо малюнкі даслаў кс.-біскупу Каліноўскаму, а падлікі толькі ўчора закончыў. Паедуць яны ў Пецярбург.

Кінь ты гэты нязносны горад і прыязджай у госці.

Здароўя і ўсяго найлепшага.

Слуга,

Тэадор.

**35.**

Шаўры, 15 лютага 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Атрымаў экзэмпляр "Ундзіны". Дасылаю табе для рэдактара "Тыгодніка" неабходныя экзэмпляры, з 3-га па 7-мы ўключна, якія трэба ім даслаць з Вільні. Таксама тры апошніх экзэмпляра перадай і Вінцэнту Нарбуту. Ва "Ундзіну" даслаў артыкул - "Трошкі з гісторыі Друскенікаў". Па пошце атрымаў ліст з Гародні ад сп. Данілецкага. Ён піша, што гарадзенскі губернатар Васькоў хоча мець мае матэрыялы ў нейкай газеце "Гродзенскія губернскія ведамасці" і да ліста прыкладае копію надпісу на мармуровым нагробку, знойдзеным там у адным з садоў. Не маю часу адказаць, і па руску я не ўмею. У "Помнікі ўмысловы" даслаў артыкул: "Нарыс жыцця дабраславёнага Віта". [...]

Брашуру Падберскага даў сп. Сядлікоўскаму.

Нашы сяляне ўжо пакутуюць ад голаду. Я вырашыў паспрабаваць прыгатаваць румфордскі суп[71] і, перабіраючы кнігі, знайшоў цэлы трактат пра гэты дабрачынны суп. Перакладаю на польскую мову для Вільні: здаецца за 2 грошы кожны чалавек можна добра пад'есці. Хачу надрукаваць пра гэта брашуру і, каб лепш ведаць цэны ў Вільні, пасылаю запіску, у якую, калі ласка, у канцылярыі ратушы выпішы цэны і дашлі мне, я хутка дашлю рукапіс.

Я прасіў сп. Маліноўскага, каб ён напісаў Завадскаму пра тое, што кніга павінна быць не болей за некалькі друкаваных аркушаў.

Жадаю табе добра правесці Запусты.

Слуга,

Нарбут.

**36.**

Шаўры, 4 сакавіка 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Запусты прайшлі так добра, як толькі магчыма ў нашым стане. Увесь час у нас была сп. прэзідэнтава з Зосяй, таксама мы мелі і іншых мілых гасцей. [...]

З Пецярбурга нічога не атрымаў, здаецца, яны злуюцца на мяне за тое, што я спазніўся з "Хронікай". Таму, калі ласка, вазьміся за гэту справу і хаця б паведамляй мне пра тое, што адбываецца. Не магу знайсці брашуру пра познаньскіх сялян, напэўна нехта яе ўзяў, не сказаўшы, што бярэ. [...] Калясінскі ўжо прасіў яе.

Пра суп для сялян. Пробы былі паспяховымі, але

* Kronika Rodzinna. № 9 (1 maja 1888), S. 262-266.; № 10 (15 maja 1888), S. 294-300.; № 11 (1 czerwca 1888), S. 328-335.; № 12 (15 czerwca 1888) S. 356-359.; № 13 (1 lipca 1888) S. 393-398.; № 14 (15 lipca 1888). S. 425-430.

[70] Мікалай Маліноўскі (1799-1865), гісторык, выдавец. Пра яго гл: Маліноўскі Мікалай. Кніга ўспамінаў. Мінск: Лімарыус, 2014. - *Л. Л.*

[71] У 22-й главе першага тома "Капіталу" Карла Маркса чытаем: *"Пяць фунтаў ячменю, пяць фунтаў кукурузы, на 3 пенсы селядцоў, на 1 пенс (1 пенс = 1/240 фунта стэрлінгаў) солі, на 1 пенс воцату, на 2 пенсы перцу і зеляніны, разам на суму 20¾ пенса атрымліваецца суп на 64 чалавекі"*. Маркс прыводзіць гэты рэцэпт як прыклад таго, якімі спосабамі прагныя капіталісты імкнуцца танней пракарміць сваіх працоўных, і называе імя аўтара: *"Гэта Адзін амерыканскі кот-баюн, які атрымаў баронскі тытул - янкі Бенджамін Томпсан, ён жа граф Румфорд"*. - *Л. Л.*

я яшчэ не дапісаў рукапіс пра гэту міласэрную справу. Зраблю кароткае апісанне і аддам у газеты. Цяжка нават уявіць, покуль сам не ўбачыш, колькі можа даць гэтае вынаходніцтва Румфорда!

З дабрынёй і сапраўднай прыязню, з братнім сэрцам, жадаю ўсяго добрага пану Аніцэту.

Слуга,

Нарбут.

**37.**

Шаўры, 9 сакавіка, 1845 г.

Дарагі Аніцэт!

З ліста з Пецярбурга, напісанага 23 лютага, даведаўся пра смерць Нацэвіча (Анацэвіча) 18 лютага а 10-й гадзіне ў клінічным шпіталі. Хто ведае, куды пайшлі яго рукапісы? [...]

Я падрыхтаваў шмат артыкулаў непасрэдна пра гісторыю Вільні: 1) Новае пра жыццё віленскага біскупа Андрэя Васілы, з рукапісаў алькеніцкіх францішканаў. 2) Важныя заўвагі пра касцёл св. Мікалая. 3) Гісторыя касцёла св. Ганны. 4) Пра каменнае надмагілле Альбрыхта Гаштольда. 5) Пра царкву св. Параскевы ці Пятніцкую. 6) Пра студэнцкі бунт у Вільні 1644 г. 7) Пра тапаграфію Вільні - два апошніх з адшуканых рукапісных дзённікаў[72].

Што чутно пра наступны выхад "Рубона"? Я падпісаўся ў сп. Вольфганга, але нічога не ведаю. Зараз рыхтую другі том матэрыялаў па літоўскай гісторыі, 65 дыпламатычных актаў XIV ст. якія раней не выдаваліся. Але не хацеў бы мець справу з яўрэямі. [...]

Дзякуючы злосці Марціноўскага, з якім Вінцэнты сябруе, адкрылася ўся інтрыга. Зараз яны мне пішуць, што Анацэвіч яшчэ пры жыцці прадаў па падпісцы свае кнігі і за пэўныя грошы свае рукапісы, якія хацеў пакінуць мне. Бо калі да яго дайшлі віленскія плёткі, ён відаць, расчараваўся ўва мне і пайшоў на гэты крок. Каб пацвердзіць свае байкі, яны наўмысна затрымалі публікацыю "Хронікі". Калі я даведаўся пра гэта, дык напісаў Анацэвічу і Даўконту, але было ўжо позна, бо Анацэвіч ужо не мог сам прачытаць майго ліста, а калі яму прачыталі, дык узрадаваўся і шкадаваў, што паспяшаўся паверыць. Так зніклі набыткі гэтага чалавека. Ці ж гэта справядліва?

Будзь здаровы і заўсёды ласкавы да нас.

Тэадор.

**38.**

Шаўры, 11 ліпеня 1845 г.

Паведамляю, што атрымаў тры нумары "Ундзіны". Прапанаваў іх розным суседзям, але ніхто з іх не пажадаў купіць. Я па пошце атрымаў ліст ад пана Данілецкага, з якога даведаўся, што мае артыкулы для "Ундзіны" дайшлі і ён просіць дасылаць наступныя. У працы маю зараз артыкул "Гістарычная і праўдзівая навіна" з часоў Жыгімонта III, грунтуецца ён на рукапісе, які нядаўна дастаў. Будзе нядрэнны хоць і кароткі артыкул, спяшацца не магу з-за хатніх перашкод. З Вільні праз Глюксберга прыйшлі для мяне экзэмпляры "Ундзіны". З Вільні 3 ліпеня паведамілі, што Рубэн яшчэ бавіцца на кантрактах у Менску і што няма канца з "Хронікай". Бог ведае, калі яна будзе гатова.

Яўстах Тышкевіч 3 ліпеня напісаў да мяне з Барысава, што хацеў быць у Вільні і ў Шаўрах, але паедзе ў Украіну для закупаў збожжа на хлеб для сялян.

Пан Данілецкі піша, што мае для мяне нейкую бронзавую фігурку, знойдзеную ў зямлі, просіць дазволу даслаць яе ў наш музей. Буду прасіць: калі ён не можа сам яе пераслаць, каб перадаў табе, а ты мне дашлеш.

Будзь, дарагі пан, здаровы і заўсёды ласкавы.

Твой слуга,

Тэадор.

**39.**

Шаўры, 29 верасня 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Сумнай для мяне навіной стала смерць с. п. Юстына Нарбута, бо стары меў моцнае здароўе і хуткая дапамога добрага лекара магла б яго ўратаваць. Шляхетная Каміла 2 верасня (відочна, па юліянскім календары - *Л. Л.*) пісала мне, што яе бацька вось ужо 10 дзён як хворы, яна хацела ведаць, ці не гасцюеш ты ў мяне ў Шаўрах, і я парадзіў ёй паслаць па цябе ў Вільню. Развітаўся з нябожчыкам 14 верасня (27 верасня па грыгарыянскім календары - *Л. Л.*)

Тысячу разоў цалую ў прыгожыя бакенбарды.

Слуга,

Тэадор.

**40.**

Шаўры, 3 жніўня 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Нямала я знудзіўся бо не меў ад цябе інфармацыі.

Пра "Ундзіну": праз рукі Глюксберга мне даслалі 2 нумары - ні з Гародні ні з Друскенікаў па пошце нельга перасылаць кніжкі, бо гэта памежныя гарады[73]. Дасылаю мой артыкул і паэзію Бранislава Нарбута, перадай пану выдаўцу. З дасланых 3-х экзэмпляраў, 2 ужо размеркаваў, але грошай не атрымаў - адзін заплаціць, а другі абяцае купіць у калабарацыі са мной.

Быў у Вільні з 24 па 29 ліпеня. Памясцілі Людвіся і Алеся[74] ў сп. Рачковіча, настаўніка ланкастарскай школы. Для дзяўчат прымаем гувернантку, ужо дамовіліся ў Вільні з паннай Хоўвальд.

Азямблоўскі[75] Вострую Браму на камені выра-

[72] Рукапіс пра бунт студэнтаў 1644 г., і Нарбут зфальшаваў сам артыкул пра тапаграфію, магчыма, спасылаецца на таксама сфальшаваны Нарбутам, так званы "Дзённік Кібура". - *Л. Л.*

[73] Па загадзе цара з-за рэвалюцыі ў Еўропе. - *Л. Л.*

[74] Сын Тэадора Алозій-Аляксандр, 1835 г. н. афіцэр арміі, удзельнік абароны Севастопаля, захаваліся яго лісты з хадайніцтвам за бацьку і маці і адказ Мураўёва-вешальніка. У 1864 г. выйшаў у адстаўку ў чыне штабс-капітана. Далейшы лёс невядомы. - *Л. Л.*

[75] Юзаф Азямблоўскі (1805-1878), мастак-графік і гравёр. - *Л. Л.*

заў фальшыва, я мусіў сам па-новаму намаляваць, добра што з балкона ў доме Касабудскіх, дзе мы жылі было зручна яе назіраць. Азямблоўскі яшчэ раз, па майму малюнку выразаў яе на камені. Думаў у Яшчалда[76] выпрасіць відарысы Вільні Смуглевіча[77], каб Азямблоўскі зрабіў іх на камені, але Яшчалд так дрэнна ставіцца да літаграфічнага таленту нашага сябра, што і слухаць пра гэта не жадае. [...]

Будзь здаровы і ласкавы.

Слуга,

Тэадор.

**41**

Шаўры, 16 кастрычніка 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

[...] З Рубэнам прашу неяк ласкава заканчваць, хай ужо выдае "Хроніку" да майго прыезду. Даслаў значныя матэрыялы ва "Ундзіну". [...]

Пішу сп. Маліноўскаму, які даслаў мне нумар "Бібліятэкі Варшаўскай", у гэтым часопісе надрукаваны артыкул сп. Д. Шульца пра яцвягаў, які мне патрэбны бо дадае новае святло ў нашай гісторыі. [...]

Кланяюся пану і дзякую за памяць.

Заўсёды сапраўдны слуга,

Тэадор.

**42.**

Шаўры, 12 лістапада 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Адсылаю газеты і прашу падпісаць мяне, як і раней, ад слушных складкаў я не адмаўляюся. Не ведаю, як хутка буду ў Вільні.

Кажу, што з Рубэнам няможна давесці справу да канца. Хай будзе, як Бог дае. Зараз я не ў тым стане, каб напісаць новую прадмову, хай будзе ранейшая. Тытул таксама раней ужо напісаў: на першай старонцы як у рукапісе - агульная назва ўсяго выдання, на другой назвы сшытку, з якіх складаецца "Хроніка".

Мусіш ужо мець 6-ты сшытак "Ундзіны", бо мне піша сп. Данілецкі з Гародні, што яго даўно ўжо паслалі ў Вільню. [...]

Усе табе кланяюцца, і дасылаюць найлепшыя пажаданні

Слуга,

Нарбут.

**43.**

Шаўры, 26 лістапада 1845 г.

Дарагі Аніцэці!

Дасланыя табой газеты, адсылаю назад. Чаму ты так хвалюешся пра грошы. Я ніколі і нікога не падмануў на грошы і не быў камусьці вінен. Памятай, што я маю твой ліст, у якім ты дэкляруеш мне магчымасць паўгода магчымасць чытаць "Тыгоднік" без ніякіх прэтэнзій на грошы, на другое паўгоддзе такіх абяцанак не маю і таму пастаў гэтую суму на мой рахунак. За тваё старанне вакол "Хронікі" дзякую тысячу разоў, можа ўжо справа неяк будзе скончана. Можа ад Рубэна будзе нейкі ганарар, пра сумы я з ім не дамаўляўся і аддаю справу на той суд.

За Нясецкага прымі падзяку, не мала мяне ён уцешыў, бо пад літарай "Z" я прачытаў артыкул (раней не заўважаны), які пацвярджае мае даследаванні і думкі пра Літву. [...]

Слуга,

Тэадор.

**44.**

Шаўры, 6 студзеня 1846 г.

Прашу прабачэння, за тое што зацягнуў з лістом да гэтай даты. Усе планы мінулага года выкананы, засталіся праблемы з "Хронікай", яе выданне вельмі зацягнулася, але можа і яны закончацца. Я вельмі пакутую з-за гэтай затрымкі, каб ведаў, дык не абяцаў бы шматлікім годным людзям гэтую кнігу. Будзь ласкавы, калі ўсё ж кніга будзе гатовы падлічы з Рубэнам рахункі. [...]

Пан Вольфганг просіць артыкул пра Лішкаў, даслаў мне мае ж матэрыялы, каб я зрабіў з іх гэты артыкул. Напішу яго для "Ундзіны" наступнага года. Данілецкі вельмі шкадуе, што мы не сустрэліся, калі ён праязджаў праз Гародню. Зараз ён паведамляе мне, што ўжо выслаў у Вільню 7-мы нумар "Ундзіны", можа, будзе і для мяне? [...]

Данілецкі сам мной стала лістуецца і шмат працуе для "Ундзіны". Марціноўскі ўзяў у мяне скарочаныя да аднаго тома "Дзеі Літоўскія", каб надрукаваць, праз цэнзуру кніга яшчэ не прайшла, падобна што ён туды яе і не аддаваў[78].

Прашу прыняць віншаванні з Новым, 1846 годам, жадаю каб да 1946 г. з вамі былі вялікія ласкі Провіда. Вітайце ад мяне шаноўнага кс. Карыцкага, пазнаёміўся з ім, калі ў верасні быў у Вільні.

Заўсёды твой сапраўдны сябар і слуга,

Тэадор.

**45.**

Шаўры, 20 студзеня 1846 г.

Дарагі Аніцэці!

Ужо пачаў пісаць артыкул пра Лішкаў і знайшоў шмат цікавага па гэтай тэме і перш за ўсё агляд месца, план гары і выгляд вежы ў перспектыве - тое, без чаго гэты артыкул не будзе поўным. Але паколькі малюнкі - гэта не для "Ундзіны", было б добра стварыць часопіс па тыпу "Візярункаў". Я маю шмат матэрыялаў па гісторыі Літвы.

Атрымаў ліста ад сп. Валянскага з Быдгашча на

---

[76] Францішак Яшчалд (1808-1873), архітэктар, працаваў на Падляшшы. - *Л. Л.*

[77] Францішак Смуглевіч (1745-1807), мастак, заснавальнік беларускай нацыянальных школ жывапісу. - *Л.Л.*

[78] Пазней кнігу надрукаваў Рубэн Рафаловіч.

трох аркушах з гравюрамі, малюнкамі і г. д. Гэты чалавек з'яўляецца ледзь не першым археолагам-нумізматам у сучаснай Еўропе. Ён мае вялікую калекцыю манет. Варшаўскі ўніверсітэт купіў у яго польскія манеты на 1000 чырвоных злотых. Выдае кнігі з даследаваннямі пра манеты ў Польшчы і Літве (мусіць быць ліцвін!). Для яго адчынены ўсе археалагічныя скарбы Еўропы. Няма такой кнігі па яго тэме, якую б ён не меў пад рукой. Такія шырокі сувязі з вучонымі дазволілі яму паглыбіцца ў гістарычныя крыніцы. Чытаючы мае "Дзеі…", ён зрабіў некаторыя заўвагі і ў выглядзе рэцэнзіі, ён накіроўвае нас на шлях даследаванняў. Валянскі вельмі злы да недавяркаў, якія мяне шчыпаюць і нават падтрымлівае мае гіпотэзы. Хачу перадаць яго ліст у нейкі часопіс, але трэба рабіць гравюры. Можа ў "Рубон", калі ўжо няма надзеі на часопіс, які ты думаў выдаваць.

Убачыўшы копіі медалёў, дасланыя Валянскім, ты здзівішся прагрэсу ў мастацтве капіравання гэтых рэчаў. […]

О, Божа! Як тут на вёсцы глуха! Каб не кніжкі і адвечныя справы Боскія і людскія, згінуў бы ад нудоты ў гэтыя вартыя жалю часы.

Si vales bene est[79].

Тэадор.

**46.**

Шаўры, 11 лютага 1846 г.

Дарагі Аніцэці!

Дзякуй табе, сто разоў дзякуй за тое, што пакончыў з непрыемнымі клопатамі ў Рубэна. Рахунак састаўлены акуратна, але не памятаю, калі я браў 3-ці том "Вобразаў Літвы" Ярашэвіча, куды б яго мог падзецца, калі б атрымаў? Адзін экзэмпляр у маім зборы, другі даслаў сп. Даўконту наўзамен на "Хроніку Валынскую", а трэцяга не было.

Атрымаў ліст ад графа Яўст. Тышкевіча. Піша, што ў Кіеве набыў 8 вялікіх тэчак з рукапісамі, якія засталіся пасля Ігната Даніловіча, рукапісы, як быццам датычаць гісторыі Літвы. Ён збірае гістарычныя рэчы і хоча ў сэрцы Літвы - у горадзе Гедыміна, адчыніць музей. Мае быць у Вільні сам на кантрактах і хоча купіць дом для музея. Склаў нават статут музея. Я ўсе свае гістарычныя зборы перадам у яго музей. Калі гэты выдатны праект будзе мець вынікі - ён стане прыкладам патрыятызму[80]. […]

Ніколі не шкадую часу каб напісаць доўгі ліст чалавеку, якога па сапраўднаму, ад усяго сэрца люблю. Жадаю ўсяго найлепшага і цісну тваю далонь.

Тэадор.

**47.**

Шаўры, 1846 г.

Вярнуўся з Пецярбурга мой брат Фрэдэрык[81], прывёз лісты, кнігі, копіі рукапісаў па нашай гісторыі і адразу пачаў патрабаваць, каб я пачаў друкаваць дзённікі ці помнікі з нашай гісторыі.

Праект такі: выдаваць па 2 - 3 сшыткі ў адзін том, будуць раней ненадрукаваныя яшчэ хронікі, дзённікі, розныя справаздачы і дыпламатычныя акты, якіх у мяне вялікі запас. Я хацеў далучыцца да выдавецтва Пшаздзецкага і Грабоўскага, але мае мецэнаты - тыя, хто дае мне матэрыялы, на гэта не згодны. Яны толькі жадаюць, каб Літва была асобнай, бо палякі мелі ці маюць звычку ўзвышацца над намі, ліцвінамі, і нібыта прымяншаюць значнасць большай часткі нашых тэкстаў[82]. Хаця я не зусім у гэта веру, я не магу спрачацца з людзьмі, якія дапамагаюць мне ў працы. На жаль, я не магу хутка прыехаць у Вільню з-за дрэннай дарогі, а час ідзе. Таму я вырашыў прасіць тваю параду, што мне рабіць? Мне здаецца, што найперш трэба паразмаўляць з Завадскім. Калі ён не пагодзіцца з умовамі ці адразу адхіліць прапанову, дык тады з Глюксбергам і, нарэшце, з яўрэем. Паколькі выданне будзе разбітае на сшыткі, я б хацеў атрымаць ганарар па 5 рублёў за друкаваны аркуш, а друкар на сваю рызыку павінен атрымаць прыбытак з накладу і мне аддаць толькі 60 экзэмпляраў. Зрэшты, мог бы патрабаваць і меней, але не менш за 3 рублі срэбрам. Канчатковай карэктурай і памылкамі я заняўся б сам, і таму штотыдзень мне трэба было б прысылаць спецыяльнага ганца, якому б рэдактар плаціў па паўрубля. Для першага сшытка першага тома дасылаю "Хроніку Быхаўца" і пасля выхаду першага нумара, можна абвясціць падпіску. Мяне запэўніваюць, што падпісчыкаў з Санкт-Пецярбурга будзе шмат. Пшэслаўскі, рэдактар "Тыгодніка", наш сваяк, не адмовіць у дапамозе. Адным словам, абдумваю гэты праект. Мне самому немагчыма займацца рэдактурай. Апошнія ўмовы я напісаў.

Мой ласкаўца Даўконт жадае, каб кожная вокладка нашых "Помнікаў …" была аздоблена літаграфаванай гравюрай з выявай тытульнага фасада Вострай Брамы. Дзе гэта размясціць і як гэта зрабіць, пакідаю на ваша меркаванне. Можа ўверсе, на першай старонцы? Калі быў у Вільні, прасіў Азямблоўскага зрабіць малюнак. У свой час я сам намаляваў Браму, але малюнак недзе патраціўся.

Каб усе ведалі, паведамляю, што артыкулы будуць на лацінскай, нямецкай, польскай, чэшскай і славянскай мовах, у апошнім выпадку - рускімі літарамі, калі-нікалі можа і лацінскімі. Рукапісы павінны брацца толькі для друку і адразу вяртацца да мяне. Яшчэ адна

---

[79] Калі ў цябе ўсе добры, дык гэта добра *(лац.)*. - *Л. Л.*

[80] Гэты музей адчыніўся праз 10 гадоў у па-езуіцкіх мурах у Вільні. Прэзідэнтам таварыства быў Тышкевіч, а Нарбут адным з самых шаноўных членаў. Лёс гэтай інстытуцыі яшчэ чакае свайго даследчыка.

[81] Брат Фрыдэрык-Вінцэнт Нарбут, 1787 г. н., калежскі архіварыюс, у 1816 г. лідскі межавы суддзя, у 1832 г. ужо былы суддзя, удавец, уладальнік маёнткаў Нікадэнаў і Воранічы. - *Л. Л.*

[82] "Крыніцы да польскай гісторыі" (Zrzodla do dziejow polskich...), якія выдавалі Пшаздзецкі і Грабоўскі, а кіраваў Мікалай Маліноўскі, наогул не заслугоўваюць такіх ацэнак. Верагодна, "мецэнаты" нават не бачылі выданне, супраць якога выступалі.

заўвага, самае галоўнае: паколькі над Брамай ёсць Літоўская Пагоня, дык яна павінна выразна быць бачна на малюнку. Можна было б намаляваць толькі гэтую частку будынка і не зважаць на яго ніз. Гэта значыць паказваць толькі Пагоню з грыфамі пад карнізам і больш нічога. Калі б у мяне быў гэты малюнак, дык у Пецярбургу зрабілі б дрэварыт - нехта з тых, хто гравіруе віньеткі. Патрэбна парада і дапамога ад Азямблоўскага. Зрэшты, хто возьмецца друкаваць, з тым і дамовімся. Мне параілі нейкага пана Дамініка Ходзьку, перакладчыка віленскай цывільнай палаты, ён можа дапамагаць мне вычытваць карэктуры, ён паважаны чалавек і руплівым ліцвін.

На Грабоўскага ці на нейкага другога скардзяцца, што не пажадаў заплаціць 100 чырвоных злотых за, здаецца ўсе, аўтэнтычныя казацкія прывілеі.

Слуга,

Нарбут.

**48.**

Без даты.

Па-першае, дзякуй, за тое, што памятаеш пра маю справу і за тваю стараннасць. Трэці паўаркуш адсылаю ў "Дамашні музей", бо толькі 2-га бракуе. Меў бы поўны "Дзённік", каб былі яшчэ 2 нумары за 1820 г. - травень і верасень. Даслаў з Ліды для Завадскага заўвагі на кнігу Тышкевіча, якія ты карэктаваў, ці атрымалі? Я пісаў да гэтага графа, каб, калі захоча, пры тваім пасярэдніцтве, звязаўся са мной.

З Пецярбурга атрымаў адказ на свой ліст, напісаны ў снежні. У ім паведамляецца, што кніга якую хацеў выпісаць (Galet. Le corps de l'homme etc.), зараз у кнігарнях адсутнічае і мне трэба напісаць Белізару ў кнігарню на Неўскім праспекце, і тады ён увесну дастане мне тамы, якія патрэбныя. Кожны будзе каштаваць з гравюрамі па 45 рублёў асігнацыямі, калі гравюры не расфарбаваныя - дык палову гэтай сумы.

Кажуць, што ў Рыме ёсць важныя акты і матэрыялы па гісторыі Літвы, але дзе ўзяць сродкі на гэта? Жыхары Інфлянтаў пачалі складаць унёскі і 40 000 - трэцюю частку неабходнай сумы - ужо сабралі. Мы нават не думаем пра гэта.

Вучоныя кажуць мне, што трэба шукаць рукапісы літоўскага гербоўніка, напісаныя Дварэцкім, былым карэктарам Завадскага, які ўтрымлівае 9 000 літоўскіх радоў. Бабровіч з Ляйпцыга прасіў гэты матэрыял, але не атрымаў яго з-за падбухторвання нябожчыка Завадскага і з-за абяцання надрукаваць яго ў Вільні. Калі не надрукавалі ў Вільні, хацеў надрукаваць рукапіс за мяжой. Памёр невядома дзе, і разам з ім прапаў рукапіс. Адам Завадскі ці Ёхер могуць распавесці лепш. Трэба ўважліва прасачыць спадкаемцаў Дварэцкага.

30 гадоў таму Юльян Нямцэвіч[83] узяў з архіва Радзівілаў 24 тамы рукапісаў, якія тычыліся Літвы, і невядома, куды яны зніклі. Ты жывеш у вялікім свеце і можа нешта пачуеш пра гэта.

Жадаюць, каб я выдаў карту старажытнай Літвы, у дадатак да матэрыялаў, якія маю. Мне патрэбны маршруты тэўтонскіх нападаў у XIV ст., мне трэба атрымаць іх у Фойгта з Кёнігсберга. На гэта трэба шмат часу і грошай, але з Божай дапамогай, можа і атрымаецца. Археалагічная камісія хоча выдаць 8 тамоў Догеля. Гербоўнік Нясецкага аўстрыйскі імператар зацвердзіў і прыняў за ўзор. Перапіска з Завадскім цяжкая, ён ніколі не спяшаецца адказаць, бо малады і шмат бавіцца. Марціноўскі напісаў, што друкуецца X-ты том[84]. Неўзабаве буду супрацоўнічаць з Грабоўскім і даведаюся, што ў іх ёсць для мяне.

Думаю, як чытаць "Тыгоднік Пецярбургскі", маю зручнасць у тым, што для мяне хапіла бы і больш позніх датаў. Але не маю яго ўжо больш за год. […]

Будзь здаровы, і памятай пра нас.

Слуга,

Нарбут.

**49.**

Без даты.

Дарагі Аніцэці!

Дзякуй Богу, што да халадоў вярнуўся ў Вільню. У Друскеніках, відаць, нарэшце стала сумна, тым больш, што восеньскае надвор'е, вось ужо два месяцы, як значна сапсавалася.

Па справах я быў у Вільні і хацеў бачыць доктара Чарноўскага, які вярнуўся з Пецярбурга і меў да мяне пасылку ад А'Нацэвіча, але не сустрэў яго. Хацеў бы ведаць, ці ёсць ён зараз у Вільні, ці можа ён даслаць мне гэтую пасылку, бо інакш прыйдзецца ехаць у Вільню. […]

Яўрэі мяне атакавалі ў Вільні "за Нарбута" (як яны завуць маю гісторыю) і давалі па 15 рублёў срэбрам за экзэмпляр, але я не меў іх з сабой. Маю яшчэ у доме шэсць ці болей экзэмпляраў.

Мае зборы рукапісаў значна папоўніліся, маю гербоўнік Каяловіча, напісаны для Літвы - вялікі рукапіс з малюнкамі, ін-фоліо. Маю з Літоўскіх Метрык ледзь не ўсё, што я мог толькі жадаць - старанна перапісаны том ін-фоліо і іншыя дробныя рэчы.

Многія жадаюць каб я надрукаваў "Дон Кіхота". Трэба пагаварыць пра гэты з кім-небудзь.

Марціноўскі нічога не плаціць, не выдае X-ты том і яшчэ лае мяне за продаж маіх аўтарскіх экзэмпляраў. У нас кажуць, што ў кашарах, былым касцёле св. Ігнацыя, адбыліся нейкія цуды, якія вядомы ўсёй Вільні. Ці чуў пра іх? Пабожныя спевы, езуіцкая ютраня і г. д.[85]

Пан Маліноўскі дагэтуль жыве на вёсцы, і я не разу не сустрэў яго ў Вільні і не забраў у яго свае рукапісы.

Усе мае дамашнія жадаюць табе самага лепшага, і я разам з імі.

Слуга,

Тэадор.

[83] Юльян Урсын Нямцэвіч (1757- Парыж), нарадзіўся ў вёсцы Скокі, Берасцейскага павета, пісьменнік, палітычны дзеяч, гісторык. - *Л. Л.*

[84] Том не быў надрукаваны.

[85] Гэта быў касцёл і кляштар езуітаў, фундаваны ў 1622 г., пераароблены на кашары ў 1798 г. Падобна, там могуць быць знойдзены археалагічныя артэфакты.

# *Найбольш значныя гістарычныя выданні апошняга часу*




У Гароднi рэдакцыя газеты “Гродзенская праўда” выдала кнiгу “Сестры Хатыни. Гродненщина”. 248 ст. Наклад 500 асобнiкаў.




У Менску ў выдавецтве YMCA Беларусь выйшаў мастацкі альбом “Скарбы Панямонцаў”. 32 ст.




У Менску выйшаў фальклорны лiтаратурна-музычны камплект Iвана Кiрчука “Варажбiт.




У Менску ў НПП “Регула” выйшла кнiга Iвана Кiрчука i Кацярыны Кiрчук “Кветка Перуна. Каляндарна-абрадавы даведнiк. Тэатралiзаваныя гульнi, святы казкi”. 316 ст. Наклад 1000 асобнiкаў.




У Лiдзе ў выдавецтве ПУП "Пружмень" выйшаў слонiмскi лiтаратурны альманах “Паланэз”, № 2, 76 ст., А-4, 100 асобнiкаў.




У выдавецтве Ridero выйшлi “Вiленскiя ўспамiны доктара Юльяна Цiтыюса з дадаткам Уладзiслава Талочкi” (укладальнiк i перакладчык **Леанiд Лаўрэш)**, 68 ст.



***Скульптура вялікапакутніка і цаліцеля Панцеляймона перад храмам Усіх Святых па вуліцы Астроўскага ў Лідзе***